Валер Булгакаў



# Гісторыя беларускага нацыяналізму

Валер Булгакаў



# Гісторыя беларускага нацыяналізму

Валер Булгакаў



# Гісторыя беларускага нацыяналізму

Вільня
Інстытут беларусістыкі
2006

Кніга выдадзена пры
інфармацыйнай падтрымцы
фонду «Чалавек у нядолі».

EAN 80-86961-14-1

ISBN 978-80-86961-14-9

© Валер Булгакаў.

Надрукавана ў выдавецтве-друкарні С.Ёкужыса.
Літоўская Рэспубліка, ЛТ-93262, г. Клайпэда, вул. Нямуна, 139.

ПАМЯЦІ ЛЮБЫ ТАРАСЮК
(1953—2006)

# ЗЬМЕСТ

Прадмова .......... 8

Уводзіны: Этнічнасьць, каляніялізм і нацыяналізм .......... 14

I. Нацыя і нацыяналізм: дамадэрная і мадэрная парадыгмы .......... 47

Антычныя, сярэднявечныя і раньнемадэрныя нацыі .......... 47

Мадэрныя нацыі: дзьве эўрапейскія ідэі .......... 58

Чаму польская шляхта была рэакцыйная? Нацыяналізм ва Ўсходняй Эўропе і Расеі: XIX стагодзьдзе .......... 81

II. Першыя нацыяналісты .......... 106

Дамадэрнае паняцьце Беларусі. Беларусь
як зона польскага нацыятварэньня ........................ 106

Антыпольскі пераварот 1863 г.:
Беларусь як прыгнечаная этнічная нацыя .............. 137

Неспадзваны вынік канструяваньня новага
імпэрскага рэгіёну: узьнікненьне
беларускага нацыяналізму .......................................... 156

III. Ф. Багушэвіч і міт беларускага адраджэньня ........ 186

Прадмова да «Дудкі беларускай» ............................... 203

Прадмова да «Смыка беларускага» .......................... 229

Уводзіны ў паэзію Багушэвіча ................................... 237

Deus ex machina ............................................................ 255

Заключэньне ........................................................................ 265

«Сікавы бурбулік» і «власяковы жужаль»:
каляніялізм і нацыяналізм у беларускай
гісторыі XX ст. Пасьляслоўе ...................................... 306

# ПРАДМОВА

Працу над гэтай кнігай я распачаў па паступленьні ў асьпірантуру пры катэдры гісторыі беларускае літаратуры БДУ ў 1995 г. Мая тадышняя навуковая кіраўніца Люба Тарасюк пераканала мяне адмовіцца ад вывучэньня літаратуры беларускае эміграцыі на карысьць творчасьці Францішка Багушэвіча. Фігуру Багушэвіча замоўчвала афіцыйнае літаратуразнаўства, абыходзіла ўвагаю, што, без сумневу, было спосабам ідэалягічнага кантролю. Нават пасьля набыцьця краінай незалежнасьці і іншых лёсавызначальных для нацыі падзеяў першым і апошнім манаграфічным дасьледаваньнем, прысьвечаным ягонай творчасьці, застаецца надзвычай тэндэнцыйны опус Барысенкі[1], які па сутнасьці ня мае нічога супольнага з навукай.

Напісаная мною ў 1998 г. дысэртацыя пра Багушэвіча была малазьмястоўная і легла ў аснову шкалярскага артыкулу «Мой Багушэвіч. Дыялектыка клясычнага тэксту», надрукаванага ў 4 выпуску часопісу «Фрагмэнты». Зь іншага боку, у тагачасных умовах я ня мог яе дапрацаваць да памыснага ўзроўню. Усьведамляючы гэта, я вырашыў адмовіцца ад абароны і, больш за тое, пасьля няпоўнага месяца працы выкладчыкам у канцы 1998-га звольніўся з БДУ. Калі б не адзін прыпадак, які адкрыўся дзякуючы моладзеваму актывісту Алесю Міхалевічу ў канцы 1999 г., праца засталася б нясконченая.

У сьнежні 2000 г. я паступіў у асьпірантуру Інстытуту філязофіі НАН Украіны (аддзел гісторыі філязофіі Ўкраіны). Мая но-

---

[1] Барысенка В.В. Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Мінск: Выдавецтва акадэміі навук Беларускай ССР, 1957. С. 368.

вая навуковая кіраўнічка Аксана Забужка прапанавала мне зьвярнуцца да больш агульнай, гэтым разам ужо філязофскай праблематыкі — разгледзець творчасьць Багушэвіча на фоне нацыятварэньня і цыркуляцыі нацыяналістычных ідэяў у Эўропе[2].

Дарма што, здавалася б, дасьледчы ракурс зьмяніўся нязначна, рэалізацыя гэтай задачы запатрабавала карэннага ламаньня ранейшай мэтадалёгіі, якой я прытрымліваўся і, кажучы шырэй, перавярнула маё ўяўленьне аб навуцы. Спробы працаваць над новай тэмай з дапамогай старога мэтаду выклікалі абурэньне А.Забужкі; многімі інструмэнтамі гістарычнага і антрапалягічнага

---

[2] Як і нацыя, нацыяналізм застаецца праблематычным і ані ў якім разе не самадастатковым паняцьцем. Спэцыфічная асаблівасьць нацыяналізму палягае менавіта ў гэтай паняткавай элястычнасьці. У адрозьненьне ад лібэралізму альбо камунізму, нацыяналізм ня ёсьць дэталёва распрацаваным сьветаглядам — гэта хутчэй нешта накшталт ідэалу, альбо агульнай праграмы дзеяньняў, і таму ён можа паразытаваць на ўсіх ідэалёгіях. У гэтай працы тэрмін «нацыяналізм» выкарыстоўваецца на грунце традыцыі, паводле якой асноўным значэньнем паняцьця ёсьць «форма нацыянальнай сьвядомасьці», «працэс станаўленьня нацыяў, накіраваны на стварэньне палітычна самасьвядомага грамадзтва ў межах нацыянальнай дзяржавы», «пачуцьцё і ўсьведамленьне прыналежнасьці да нацыі», «мова і сымболіка нацыі», «сацыяльны і палітычны рух ад імя нацыі», «дактрына і/альбо ідэалёгія нацыі, агульная і канкрэтная» (Э. Сьміт), «лад мысьленьня, уласьцівы пераважнай большасьці людзей, які прэтэндуе на тое, што ён уласьцівы ўсім людзям; ён лічыць нацыянальную дзяржаву ідэальнай формай палітычнай арганізацыі, а нацыянальнасьць — крыніцай творчай культурнай энэргіі і эканамічнага росквіту» (Ганс Кон).

Залежна ад функцыянальнай ролі, культурнага кантэксту і г.д., адрозьніваюць моўны, рэлігійны, культурны, этнічны і іншы нацыяналізмы. На практыцы чыстых тыпаў нацыяналізму амаль не сустрэнеш.

У гэтай традыцыі «нацыяналізм» ня зводзіцца толькі да спараджэньня нацыяў альбо да «сьветагляду, які надае абсалютны прыярытэт каштоўнасьцям нацыі над усімі іншымі каштоўнасьцямі» (М. Грох); ён ня тоесны нацыянальнай сьвядомасьці і не вычэрпваецца ідэалёгіяй дасягненьня і адстойваньня палітычнай незалежнасьці нацыі, узятай у культурным, палітычным і іншым сэнсе.

Менавіта такое разуменьне гэтага фэномэну дазволіла Э. Сьміту сьцьвярджаць, што нацыяналізм і дактрына нацыянальнага самавызначэньня замацаваныя ў якасьці падставовых прынцыпаў у Статуце ААН.

аналізу я не валодаў, і праца зацягнулася на доўгія пяць гадоў. Толькі 21 сьнежня 2005 г., за два дні да інаўгурацыі прэзыдэнта В. Юшчанкі, я абараніў дысэртацыю ў Інстытуце філязофіі НАН Украіны. Аднак і пасьля абароны ў працы заставаліся нестыкоўкі й нацяжкі, і цэлы год я спрабаваў выправіць іх, дапрацоўваючы тэкст, выстаўлены цяпер на суд чытачоў.

Варта асабліва адзначыць, што, пачынаючы з 1998 г., праца рыхтавалася па-за навуковымі ўстановамі Беларусі, таму, відаць, самым важкім яе недахопам ёсьць няпоўная веда пра навуковыя публікацыі, якія выйшлі ў краіне на сумежную тэматыку.

Працуючы над кнігай, мне даводзілася абапірацца на мэтадалягічныя пабудовы і тэарэтычныя структуры заходніх навукоўцаў. Другую найважнейшую загану кнігі відно голым вокам: большыня тэарэтычных і мэтадалягічных падыходаў у працы пазычаныя і толькі адаптаваныя да яе структуры.

Нарэшце, трэці недахоп быў абумоўлены блізкасьцю ўкраінскага матэрыялу. Бліскучыя працы ўкраінскіх аўтараў (пераважна дыяспарных) на сумежную тэматыку спакушалі мяне браць зь іх ужо гатовыя формулы, і часам я ня мог даць рады гэтай спакусе.

Рамку працы ў яе цяперашнім выглядзе акрэсьліла Аксана Забужка, якая ўважліва і цярпліва перачытала некалькі яе працоўных рэдакцыяў на не зусім звыклай для яе беларускай мове. (Пра тое, наколькі жвава яна ўдзельнічала ў напісаньні кнігі, сьведчаць адносна частыя цытаты яе дасьледаваньняў, прысьвечаных праблематыцы нацыяналізму, якія чытач можа знайсьці ў гэтай кнізе.)

На добры лад яе можна лічыць навуковым рэдактарам гэтай кнігі. Ведама, віна за ўсе магчымыя памылкі і недахопы ў ёй ляжыць толькі на мне, бо апошняя рэдакцыя кнігі была падрыхтаваная мною самастойна.

Шырока вядомыя ідэі, якія сталі агульнымі месцамі ў тэорыі нацыі і нацыяналізму і сумежных сфэрах гуманітарнай навукі (Грабовіча, Саіда, Шкандрыя, Гелнэра, Гагена, Шульцэ і г.д.), падаюцца ў працы без спасылкі на першакрыніцу.

Першы разьдзел кнігі — «Нацыя і нацыяналізм: дамадэрная і мадэрная парадыгмы» — уяўляе сабой агульны тэарэтычны экскурс, што грунтуецца на заходніх дасьледаваньнях нацыі і нацыяналізму. Ён прысьвечаны пэрыпэтыям станаўленьня нацыі і нацыяналізмаў у дамадэрных і мадэрных грамадзтвах Эўропы і з гэтай прычыны асаблівай цікавасьці ў спэцыялістаў у дадзенай праблематыцы выклікаць ня будзе.

У разьдзеле «Першыя нацыяналісты» разглядаецца працэс канструяваньня паняцьця «Беларусь» у польскім і расейскім каляніяльных дыскурсах і ягонае ператварэньне ў этнакультурную катэгорыю. Безь яго немагчыма перайсьці да заключнага разьдзелу — «Ф. Багушэвіч і міт беларускага адраджэньня», які прапануе бачаньне літаратуры як дзейснага мэтаду мітатворчасьці і нацыяналістычнай мабілізацыі.

Структураваньне кнігі ў тры разьдзелы было паклікана палегчыць выкладаньне тэмы, якое адбываецца недастаткова лінійна, часам з паўторамі, з забяганьнем наперад і вяртаньнем назад, з кружляньнем па-над рознымі падтэмамі. Гэтая кніга — не тэарэтычная машына, ёй неўласьцівая прэтэнзія на арганічнасьць, таму я ня згладжваў гэтых момантаў і ня ўводзіў пастфактум строгае наратыўнае пасьлядоўнасьці. Яе складовыя часткі напісаныя ў розных мэтадалягічных рэчышчах і розных жанрах (ад бэлетрызаванага нарысу і да спробы выпрацоўкі новай канцэпцыі), а месцамі наагул бяз строгага мэтаду і з тэарэтычнымі непасьлядоўнасьцямі.

Я таксама зьвяртаўся да тэксталягічнага аналізу, пакліканага інтэрпрэтаваць складаную сацыяльную рэчаіснасьць на матэрыяле асобных тэкстаў, бо быў перакананы, што яны ёсьць застыглымі сьлядамі праблемных узаемадачыненьняў паміж уладай, грамадзтвам і гісторыяй.

Я сьвядома адмовіўся ад перанасычэньня кнігі зьвесткамі агульнага характару, найперш з сфэры літаратурнай гістарыяграфіі. Таму адэкватнае ўспрыйманьне работы прадугледжвае валоданьне ведамі пра беларускую нацыянальную культуру. Прысутная ў ёй тэма беларускай нацыянальнай сьвядомасьці разглядаецца вык-

лючна ў яе «мадэрнай» вэрсіі, выпрацаванай у канцы XIX ст. Таму, напрыклад, рэмінісцэнцыі нацыянальнай сьвядомасьці ў творчасьці Францішка Скарыны ў гэтай працы засталіся па-за разглядам.

Калі меркаваць па спасылках, праца не вытрымлівае стандарту строгае акадэмічнае работы. Гэта хутчэй навукова-папулярнае выданьне, да якога я імкнуўся даваць мінімум зносак. Часам хаатычнае цытаваньне крыніцаў і дасьледаваньняў, а таксама апора на навукова-папулярныя выданьні выкліканыя тым, што большасьць зь іх была першапачаткова недаступная на мовах, якімі я актыўна валодаю, і нярэдка адное і тое ж выданьне даводзілася чытаць (і цытаваць) на мове арыгіналу і пазьней перакладу. Частка спасылак мае няпоўнае бібліяграфічнае апісаньне, бо я вымушаны быў працаваць зь імі ў Інтэрнэце альбо зь нейкіх іншых прычынаў быў ня ў стане аформіць іх належным чынам. У сваё апраўданьне скажу, што гісторык ідэяў ня букваед і для яго важная сама ідэя альбо выказваньне, а не ягонае абсалютна дакладнае апісаньне.

Хоць у гэтай працы акрэсьлены эўрапейскі кантэкст, у яе цэнтры месьціцца чатырохбаковы беларуска-расейска-ўкраінска-польскі дыскурс. Шэраг выкарыстаных у ёй тэрмінаў — «нацыятварэньне», «мадэрны», «раньнемадэрны» і г.д. — хоць яшчэ не атрымаў правоў грамадзянства ў беларускай мове, але быў надзвычай неабходны для разьмежаваньня паняцьцяў. Тое ж самае датыкае тэрміну «рускі народ», які ў кнізе абазначае этнічную супольнасьць, зь якой у мадэрны час паўсталі беларусы і ўкраінцы. Напісаньне «Беларусія» было захаванае дзеля перадачы арыгінальнай мовы, ва ўсіх астатніх разох ужываецца напісаньне «Беларусь». Паколькі кніга разьлічаная на падрыхтаванага чытача, пэўныя вершаваныя фрагмэнты я падаваў па-польску, расейску і ўкраінску ў арыгінале, безь перакладу.

Назва кнігі ня цалкам адпавядае яе зьместу, бо яна прысьвечана перадусім перадгісторыі беларускага нацыяналізму. Я адмовіўся найперш ад ужываньня слова «перадгісторыя» ў назьве кнігі дзеля ягонай грувасткасьці і празьмернай амбітнасьці.

Праца адлюстроўвае цяперашні зрэз веды пра нацыю і нацыяналізм (якая борзда разьвіваецца) і, без сумневу, нават па невялікім часе будзе ўспрымацца анахранічна. Вялікім посьпехам будзе, калі яна зацьвердзіцца ў якасьці папярэдняга накіду будучай сынтэтычнай распрацоўкі гэтай праблемы.

Застаецца дадаць, што я загадзя прымаю абгрунтаваныя абвінавачаньні ў падступнасьці і чорнай няўдзячнасьці; а таксама падзячыць Аляксандру Адамянцу і Андрэю Дыньку, якія праглядзелі тэкст кнігі, перш чым трэ было аддаваць яе ў друк, і выказалі шэраг каштоўных заўваг на яе конт.

# УВОДЗІНЫ. ЭТНІЧНАСЬЦЬ, КАЛЯНІЯЛІЗМ І НАЦЫЯНАЛІЗМ

*Фармаваньне нашай нацыі адбываецца зь перапынкам у 400 гадоў, выкінутых з генэалягічнага дрэва... Трэба фармаваць нацыю наноў**.

Андрэй Клімаў, апазыцыйны палітык.

*У нас вельмі шмат людзей гавораць па-расейску. А калі гавораць па-беларуску, выхаваныя прапагандай людзі ацэньваюць, што гэта нейкія «адмарозкі». Ну, так у нас ацэньвае, як мне здаецца, большая частка насельніцтва**.

Валер Фралоў, апазыцыйны палітык.

*В кассах метро можно прочесть сообщение о том, что «з 20 снежня 2005 года тарыф на праезд... устаноўлен у памеры 460 рублеў... Падстава: Рашэнне Мінгарвыканкома». Даже если в этом объявлении нет ошибки, то неужели белорусский язык не настолько богат, чтобы в нем не нашлось более благозвучного для русскоязычного населения синонима, недоумевает читатель.*

Рекламно-информационная газета «Ва-банк» для минчан. Тираж 210 938. 2006. 2 февраля.

---

* Камэнтары для «Радыё Свабода». Этэр 4.08.2005.

На беларусаў цісьне цяжар няведаньня. У савецкай гуманітарнай навуцы такой задачы, як дасьледаваньне беларускага нацыяналізму, папросту не існавала. Беларускую сытуацыю было забаронена разглядаць у катэгорыях калянізатара і калянізаванага, а сьцьвярджэньні беларускіх нацыянальных патрабаваньняў больш як апошнія 100 гадоў высьмейвалі, перакручвалі, цэнзуравалі альбо лічылі іх бессэнсоўнымі.

Сытуацыя фактычна не зьмянілася і за 15 гадоў беларускай дзяржаўнасьці. Тэма беларускага нацыяналізму захоўвае свой паўпадпольны статус, а навуковыя развагі на ягоны конт набываюць камічную форму. Хоць пытаньні ўзьнікненьня нацыяналізму закраналіся ў шэрагу тэкстаў, да гэтага часу так і не было праведзена ягонага манаграфічнага дасьледаваньня. Беларускія аўтары агульнымі словамі гаварылі пра нацыянальнае адраджэньне і ахвотна вывучалі біяграфіі нацыянальных дзеячоў XIX ст. Стандартны інструмэнтар такіх дасьледаваньняў быў пазытывісцкі і апісальны, і сярод казённых тэзісаў нячаста прабівалася навука — акумуляцыя ведаў і пошук новага бачаньня і разуменьня тэмы дасьледаваньня.

Замежныя дасьледчыкі разважалі пра беларускую ідэнтычнасьць і шляхі разьвіцьця беларускага нацыяналізму без асаблівай глыбіні. Іх працы грашаць зьмяшэньнем ягонага зараджэньня, канструяваньня і матэрыялізацыі і неразуменьнем таго, калі і як беларуская нацыянальная сьвядомасьць набыла параўнальна апрацаваны выгляд і стала прэтэндаваць на масавы распаўсюд у грамадзтве.

З гэтай прычыны ў навуцы не існавала і не існуе кансэнсусу адносна таго, як і кім была распрацавана дактрына беларускага нацыяналізму[1], калі ўзьнікла беларуская ідэнтычнасьць і зьвязаныя зь ёю катэгорыі.

---

[1] Ня цяжка ўявіць, чаму рэпрэсавалася гэтая праблематыка. Зьвязаныя зь ёй катэгорыі, напрыклад, беларускай нацыянальнай сьвядомасьці, адлюстроўваюць той культурны кантэкст, які фіксуе «гарызантальную» палітычную актыўнасьць грамадзян.

Праз 15 гадоў пасьля набыцьця незалежнасьці Беларусь заставалася бадай адзінай ва Ўсходняй Эўропе краінай, дзе перамог каляніялізм і пацярпеў паразу нацыяналізм, дзе малакроўная грамадзянская супольнасьць дэманізуецца дзяржаўнай прапагандай, а нацыянальная мова і культура застаецца здабыткам меншасьці насельніцтва. Нацыяналізм тут па-ранейшаму застаецца жупелам, палітычны лад можна ахарактарызаваць як абсалютную манархію, а народ улягае перад дэспатам, які ўзурпаваў усю паўнату дзяржаўнай улады ў краіне.

Відавочна тэндэнцыйнае разуменьне нацыяналізму ўласьціва ня толькі ўладам і яе ідэолягам (возьмем хаця б пісаньні Якава Трашчанка альбо Ўладзімера Мельніка), але і лібэральна настроенай інтэлігенцыі. І першы, і другі бок, як правіла, падзяляе ягоную канфармісцкую і ідэалягічную трактоўку як нейкай аўтарытарнай ідэалёгіі этнічнай варажнечы, крыві і расы. (Пры гэтым улада настойвае на нармальнасьці цяперашняга палітычнага рэжыму, а лібэральная інтэлігенцыя вінаваціць у ейным узьнікненьні менавіта нацыяналістаў.)

Напрыклад, лібэральна настроены філёзаф Аляксандар Грыцанаў прапанаваў наступную інтэрпрэтацыю гэтага паняцьця:

> *Нацыяналізм — спэцыфічны стан сьвядомасьці этнасу і сацыяльна-псыхалягічных арыентацыяў людзей, а таксама зьвязаныя зь імі ідэалёгія, тэорыя і сацыяльная практыка... Сутнасьць Н. складае прапаведаваньне ўласнай нацыянальнай адасобленасьці і (альбо) выключнасьці, зь неабходнасьцю дапоўненае недаверам да (канкрэтна вызначаных) этнічных супольнасьцяў і (у скрайніх праявах) — адмовай ім у праве на існаваньне. Тыповы для цывілізацыяў лякальнага тыпу, чыя культура ўгрунтавана на восевай аксіялягічнай апазыцыі «Мы — Яны». Н. узьнікае як рэакцыя этнасу на дэструкцыйныя ўзьдзеяньні вонкавага асяродзьдзя (эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя працэсы, іншаэтнічныя ўзьдзеяньні). Н. як палітычны прынцып увасобіўся ў працэсах утварэньня нацыянальных дзяржаваў, рас-*

*паду імпэрыяў і адасабленьня калёніяў ад мэтраполіяў. Нацыяналізм... пераўзышоў і сусьветныя рэлігіі дакапіталістычных грамадзтваў, і дзяржаўныя ўтварэньні імпэрскага тыпу Новага часу*[2].

Цяжка ўявіць больш няўдалае вызначэньне нацыяналізму, якое затушоўвае выразную розьніцу паміж этнічнымі і нацыянальнымі катэгорыямі. Нацыяналізм узьнікае не адразу ва ўсёй этнічнай супольнасьці, а ў яе эліты, найбольш чулай да нацыяналістычных ідэяў. Вытокі нацыяналізму ляжаць у канцэпцыях індывідуальнай свабоды і рацыянальнага касмапалітызму, уласьцівых для эпохі Асьветніцтва. Нацыяналізм ставіць найперш унутраныя, а ня вонкавыя задачы — выпрацоўку адзінай агульнанацыянальнай культуры, здольнай выступіць асновай для ідэнтыфікацыі сяброў дадзенай нацыі, і зьвяртаецца да «прапаведаваньня нацыянальнай выключнасьці» пераважна на раньнім этапе пабудовы нацыі (для буйных эўрапейскіх нацыяў ён скончыўся яшчэ ў XIX ст.). Нацыяналізм ня мае неабходнасьці ў культывацыі недаверу да іншых народаў — наадварот, ён скіраваны на дасягненьне нацыяй такой кандыцыі, калі яна здольная на роўных канкураваць зь іншымі, ужо сфармаванымі і сьпялейшымі нацыямі ў галіне нацыянальнай культуры і жыцьцёвых стандартаў[3].

Амэрыканскі альбо швэдзкі нацыяналізм ужо на пачатку XIX ст. быў лібэральны, і было б ашуканствам прыпісваць яму намер зьмярцьвіць іншыя народы і культуры. Ён уласьцівы выключна аўтарытарным і таталітарным ідэалёгіям, што атрымліваюць палітычныя дывідэнды ад канструяваньня вобразу «іншага» як ворага

[2] Новейший философский словарь. Минск, 1999. С. 459—460.

[3] Адным з апошніх сур'ёзных тэарэтыкаў, які сьцьвярджаў, што пачуцьцё нацыяналізму выражаецца ў абыякавасьці альбо недаверы да людзей, якія знаходзяцца па-за нацыянальнай арбітай, быў Ганс Кон. Для Кона часоў выхаду ягонай «Ідэі нацыяналізму» (1944) усе нацыяналізмы на ўсход ад францускай мяжы былі аўтарытарныя і дэструкцыйныя. На пачатку XXI ст. такое мысьленьне не стасуецца з рэальнасьцяй.

(у тым ліку і сучаснаму беларускаму рэжыму, пры якім сэнсам дзяржаўнай палітыкі стаў уціск нацыянальнай мовы і культуры).

Нарэшце, восевая апазыцыя «Мы — Яны» ўласьцівая ўжо для сьвядомасьці этнічных групаў часоў фэадалізму (хаця нацыянальная сьвядомасьць пазьней таксама фармуецца праз стаўленьне да «іншага»)[4]. Для іх былі характэрныя таксама (1) супольная назва, якая судзейнічала ідэнтыфікацыі дадзенай групы[5]; (2) міт супольнай спадчыны, які зьмяшчае ідэю аб супольным паходжаньні і надае этнічнай супольнасьці пачуцьцё ўяўнага сваяцтва; (3) супольныя міталягізаваныя ўяўленьні аб супольным мінулым; (4) адзін ці болей элемэнтаў супольнай культуры (найчасьцей гэта рэлігія, звычаі і мова); (5) пачуцьцё прыналежнасьці да «радзімы», пэўнай тэрыторыі, не абавязкова зьвязанай зь фізычнай прысутнасьцю этнічнай групы на ёй, сымбалічныя сувязі зь «зямлёй продкаў» (напрыклад, у дыяспарных народаў); (6) пачуцьцё еднасьці (салідарнасьць, камплемэнтарнасьць) часткі альбо прынамсі пэўных групаў, што ўваходзяць у этнас[6].

На гэтай падставе паняцьце нацыі можна вызначыць як «супольнасьць людзей, што жыве ў родным краі, мае супольныя міты, супольную гісторыю, супольную нацыянальную культуру, адзіную эканоміку і адзіныя правы і абавязкі для ўсіх яе прадстаўнікоў», а этнас — як «супольнасьць людзей, зьвязаных з родным

---

[4] Кансалідацыі этнічнай сьвядомасьці судзейнічалі масавыя вайсковыя дзеяньні, якія мабілізавалі жыхароў розных рэгіёнаў той або іншай дзяржавы, а таксама калектыўныя грамадзкія працы, напрыклад, стварэньне ўнутрыдзяржаўных камунікацыяў усіх відаў, перадача інфармацыі і асабліва разьвіцьцё пісьменства, што выконвала свае інфармацыйныя функцыі нават у выпадку непісьменнасьці большасьці насельніцтва.

[5] Адзіная назва нацыі, узьніклая задоўга да зьяўленьня сучасных нацыяналізмаў, і той ці іншы досьвед уласнай дзяржаўнасьці, што сьведчыць аб перацяканьні нацыянальнай/этнічнай сьвядомасьці з адной формы ў іншую, а не пра поўнае адрозьненьне ў Сярэднія вякі і пасьля Францускай рэвалюцыі, пазьней стане адной з найважнейшых перадумоваў для пасьпяховага нацыятварэньня.

[6] Smith A. The Etnic Origins of Nations. Oxford: Cambridge University Press, 1993.

краем, для якой уласьцівыя характэрныя супольныя міты аб паходжаньні, супольная памяць, адзін ці болей элемэнтаў супольнай культуры і пэўная салідарнасьць, прынамсі, сярод эліт». Нацыі звычайна валодаюць айчынай, тады як этнічныя супольнасьці (накшталт жыдоў ці армян) могуць быць адно сымбалічна зьвязаныя з родным краем[7].

Пазьней нацыянальныя ідэолягі «разгорнуць» ужо існы ў этнічнай сьвядомасьці міт пра «залаты век», робячы стаўку на грамадзкі посьпех сакралізацыі гераічнага мінулага нацыі, бо яна, як нішто іншае, падкрэсьлівае нацыянальную выключнасьць і робіць стратэгію нацыянальнага адраджэньня асэнсаванай. У імя гэтага рэальнае паходжаньне нацыянальных супольнасьцяў часта падмяняецца выдуманым, г.зн. на гістарычным матэрыяле канструюецца міталёгія супольнага паходжаньня ўсёй уяўленай нацыі: мёртвыя мовы могуць быць адроджаныя, традыцыі вынайдзеныя, абсалютна міталягічная першапачатковая чысьціня адноўленая (Э. Гелнэр).

Проста скандальны характар мае зробленае Грыцанавым сьцьверджаньне, што рэфэрэнтным аб'ектам для нацыяналістаў ёсьць этнас, а ня нацыя. У адрозьненьне ад этнічнай сьвядомасьці, завязанай на этнічную групу — «блізкароднасную звышсям'ю», нацыяналізм апэлюе да нацыі як да нейкай мэтафізычнай субстанцыі, што выходзіць за межы будзённага досьведу, — з аднаго боку, вынайдзенай, уяўленай і гібрыднай катэгорыі, а зь іншага — як да сучаснай вэрсіі старадаўніх сацыяльных і культурных супольнасьцяў.

І нацыя, і этнас суадносяцца з калектыўнай культурнай ідэнтычнасьцю. Аднак этнічная супольнасьць ня мае палітычнага адценьня і не абавязкова жыве на сваёй «гістарычнай» тэрыторыі. Этнічная сьвядомасьць не валодае закончаным, «канцавым» характарам. У аснову вобразу ўласнай групы этнічная сьвядомасьць кладзе тыя ўласьцівасьці, якія адрозьніваюць яе ад іншых групаў. Тым самым

[7] Сміт Ентоні Д. Націоналізм. Теорія, ідеологія, історія. Київ: видавництво К.І.С., 2004. С. 19—20.

стабільнасьць існаваньня этнічнай групы абумоўліваюць ня столькі яе ўласныя ўяўленьні пра сябе, колькі яе ўяўленьні пра суседнія этнічныя групы і ўяўленьні гэтых групаў пра яе.

Этнічная сьвядомасьць ня тоесная з нацыянальнай сьвядомасьцю, хаця паміж гэтымі катэгорыямі існуюць адносіны пераемнасьці. Больш за тое, самую этнічнасьць можна разумець як выражэньне сацыяльнага разьмежаваньня. У адрозьненьне ад нацыянальных супольнасьцяў, разьвіцьцё этнічных групаў адбываецца не праз канструяваньне пэўных культурных і іншых адрозьненьняў, а праз правядзеньне сацыяльных межаў у адносінах да іншых грамадзкіх групаў, пры гэтым маркерам сацыяльнай дыстанцыі можа быць мова. У фэадальным грамадзтве гэтыя сацыяльныя межы не падрываюць, а наадварот, узмацняюць самасьвядомасьць этнічных групаў, нягледзячы на кантакты іх чальцоў з прадстаўнікамі іншых этнічных супольнасьцяў[8].

Ідэя мадэрнай нацыі ўключае ў сябе па сутнасьці этнічнае паняцьце супольнага паходжаньня і неад'емнай, хаця і часта дакладна ня вызначанай, аднароднасьці. Гэтую дыхатамію пераемнасьці і адрознасьці этнічнай ідэнтычнасьці і нацыянальнай сьвядомасьці сацыёляг Макс Вэбэр выпукліў з прыцягненьнем беларускага матэрыялу пачатку XX ст.:

> *«Нацыя» падзяляе гэтыя паняцьці (супольнага паходжаньня і аднароднасьці. —* Аўт.*) разам з пачуцьцём салідарнасьці этнічных супольнасьцяў... Аднак пачуцьцё этнічнай салідарнасьці само па сабе яшчэ не стварае «нацыі». Няма сумненьня, беларусы заўсёды захоўвалі пачуцьцё этнічнай салідарнасьці перад вялікарусамі, але нават напярэдадні сучаснай эпохі іх цяжка вызначыць як асобную «нацыю». Палякі зь Верхняй Сылезіі да нядаўняга часу наўрад ці валодалі пачуцьцём салідарнасьці з «польскай нацыяй». Яны адчувалі*

[8] Гл. Barth F. Introduction. Ethnic Groups and Boundaries. Oslo — Bergen — Tromsø, 1981.

*сябе асобнай этнічнай групай, адрознай ад немцаў, але ва ўсім іншым былі прускімі падданымі і нікім іншым*[9].

Каб быць нацыяй, супольнасьць людзей мусіць мець сваю айчыну, дамагацца атрыманьня ёй дзяржаўнага статусу і афіцыйнага міжнароднага прызнаньня, а таксама разьвіваць нацыянальную культуру. Для нацыі, як паказалі палякі ў XIX ст., неабавязкова мець сваю незалежную дзяржаву, дастаткова дамагацца статусу аўтаноміі і мець сваю айчыну. Нават калі нацыя ствараецца дзяржавай, яна становіцца нацыяй не раней чым усьведамляе сваё вяршэнства перад дзяржавай (Эдрыян Гастынгс).

Акурат імкненьне да дзяржаўнасьці адрозьнівае нацыі ад іншых формаў супольнасьцяў, заснаваных на салідарнасьці (М. Вэбэр). Сучасная дзяржава — гэта рацыянальны тып аб'яднаньня, апагей заходняга рацыяналізму і адна з галоўных рухальных сілаў рацыяналізацыі гістарычнага працэсу, тады як нацыя — гэта канкрэтны тып аб'яднаньня на аснове аўтарытэту.

І этнасы, і нацыі створаны супольнымі вераваньнямі і забавязаньнямі, супольнай памяцьцю і яе непарыўнасьцю. Паміж этнасам і нацыяй існуе глыбокая сувязь, паколькі элемэнты этнічнасьці «выбудоўваюцца», «перабудоўваюцца» і «выдумляюцца» стагодзьдзямі і нават тысячагодзьдзямі, і пры гэтым этнасы, зьмяняючы свой культурны склад, заставаліся доўгі час ідэнтыфікаванымі супольнасьцямі. Важнае адрозьненьне паміж імі палягае ў тым, што ў этнічных супольнасьцяў адсутнічае нацыянальная культура, а мадэрныя нацыі — «ідэалягічна кіраваныя». Нацыя да таго ж характарызуецца здольнасьцю арганізоўвацца незалежна ад дзяржавы і не паддавацца дзяржаве падчас крызісу. Этнас ня мае ўяўленьня пра сваю гісторыю, задавальняецца смутнай агульнай памяцьцю. Яшчэ глыбей адрозьненьне паміж этнасам і нацыяй сягае на ўзроўні ідэнтычнасьці: чальцам этнічнай суполь-

[9] Цытуецца паводле: Грицак Ярослав. Нарис історії України. Формування модерної української нації XIX—XX століття. К.: Генеза, 2000. С. 12.

насьці ўласьцівая выключна неінстытуцыяналізаваная этнічная ідэнтычнасьць, прадстаўнікам нацый — юрыдычная, палітычная і эканамічная ідэнтычнасьці, у якіх і ўвасабляецца ідэнтычнасьць нацыянальная. Нацыі таксама адрозьніваюцца ад этнасаў калектыўнымі правамі і абавязкамі іх чальцоў і наяўнасьцю адзінай нацыянальнай эканомікі. Этнасы маюць не нацыянальную культуру, а толькі асобныя супольныя культурныя элемэнты, у прыватнасьці, мову, рэлігію ці традыцыі. Таму нацыі, як правіла, фармуюцца на грунце дамінантнага этнасу, але яны могуць разрастацца шляхам асыміляцыі іншых этнасаў, якія ня здолелі стаць асобнай нацыяй.

Дэбаты наконт унівэрсальнага і ўсёабдымнага вызначэньня мадэрнай нацыі выбухнулі адразу пасьля таго, як катэгорыя нацыі стала натуральным разумовым элемэнтам рацыянальнай карціны сьвету: альфай і амэгай ідэальнага грамадзтва, цаглінамі, зь якіх будуецца чалавецтва (Эрнэст Гелнэр). Падчас іх стала відавочна, што выключна аб'ектыўныя крытэры нацыі (мова, рэлігія, тэрыторыя і г.д.), як правіла, не ахопліваюць усіх нацыяў. І наадварот, суб'ектыўныя вызначэньні, як правіла, ахопліваюць занадта шматлікія характарыстыкі нацыі. У выніку наданьне асаблівай значнасьці пачуцьцю, волі, уяўленьню і ўспрыняцьцю як крытэрам нацыі ўскладняе вылучэньне нацыі зь іншых відаў супольнасьцяў: ад этнасу, племені, імпэрыі і г.д.[10].

У 1882 г. Э. Рэнан у сваёй знакамітай лекцыі «Qu'est-ce qu'une nation?» вызначыў паняцьце нацыі як «штодзённы плебісцыт». Вызначэньне ўказвае на супрацьпастаўленьне англасаксонкаму тыпу нацыі, утворанай «дамовамі», вольным волевыяўленьнем: у Францыі нацыя ўзьнікла падчас плебісцыту, у выніку якога прыналежнасьць да нацыянальнасьці стала вызначацца не аб'ектыўнымі характарыстыкамі, а суб'ектыўнай дэкларацыяй.

Паводле Рэнана, нацыі — гэта духоўныя сутнасьці, супольнасьці, якія існуюць да тае пары, пакуль знаходзяць водгук у сэр-

[10] Сміт Ентоні Д. Націоналізм. Теорія, ідеологія, історія. Київ: видавництво К.І.С., 2004. С. 19—20.

цах людзей. Яны згасаюць, калі людзі пра іх перастаюць думаць і жадаць удзельнічаць у іх. Нацыі заснаваныя на нацыянальнай сьвядомасьці і пазнаюцца па супольнай гісторыі, супольнай славе і супольным ахвярам. Іх супольная гісторыя ва ўсіх разох — гэта абмежаваная рэальнасьць, абавязкова больш выдуманая і сканструяваная, чым рэальная.

Нацыя ня тоесная з расай, бо ўсе мадэрныя эўрапейскія нацыі маюць мяшанае этнічнае паходжаньне — французы паходзяць ад зьмяшаньня кельцкіх, ілірыйскіх і германскіх плямёнаў, немцы — германскіх, кельцкіх і славянскіх, у жылах італьянцаў цячэ кроў мноства народнасьцяў. Палітыка, якая апраўдвае дасягненьне нацыянальнай еднасьці расісцкімі аргумэнтамі, хімэрная і можа прывесьці эўрапейскую цывілізацыю да гібелі. Нацыя ня тоесная з мовай — інача як патлумачыць, з аднаго боку, адасабленьне ЗША ад Ангельшчыны, а Лацінскай Амэрыкі ад Гішпаніі, а з другога, адзінства Швайцарыі? І рэлігія ня можа быць падставай мадэрнай нацыі, бо межы нацыяў і канфэсіяў разыходзяцца. Адзінства інтарэсаў? Мытны саюз — не радзіма! А геаграфія? Не існуе тэорыі, як пабудаваць нацыю ў «натуральных межах»; мінуўшчына паказвае, што жыцьцёвыя прасторы нацыяў зьменлівыя.

Нацыю, робіць выснову Рэнан, нельга апісаць і патлумачыць з дапамогай матэрыяльных фактараў. Нацыя — гэта душа, духоўны прынцып. Дзьве рэчы, якія насамрэч ёсьць адзіныя, складаюць гэтую душу, гэты духоўны прынцып. Адна зь іх датычыць мінуўшчыны, другая — будучыні. Першая — гэта супольнае валоданьне багатай спадчынай памяці, другая — цяперашняя ўзаемная згода, жаданьне жыць разам. Нацыя, такім чынам, — гэта вялікая салідарная супольнасьць, заснаваная на пачуцьці ахвярнасьці і абумоўленая перажываньнем супольнай мінуўшчыны. Нягледзячы на гэта, яна ўвасабляецца ў сучаснасьці ў адным асязальным факце, згодзе, відавочным жаданьні працягваць жыць разам[11].

[11] Ренан Ернест. Що таке нація? // Націоналізм. Антологія. Київ: Смолоскип, 2000. С. 107—121.

Для Гелнэра існаваньне нацыяў не выпадковае і маральна значнае — яны ёсьць складовай часткай рэалізацыі чалавека. Л. Грынфэлд, вызначаючы нацыю як «канстытуцыйны элемэнт мадэрнасьці»[12], разумее яе ў цеснай сувязі зь пераходам ад традыцыйных супольнасьцяў да прамысловых з дапамогай нацыяналізму як носьбіта мадэрнасьці. Нацыя трактуецца як істотны элемэнт працэсаў мадэрнізацыі грамадзтва і адначасова як іхні прадукт на працягу двух апошніх стагодзьдзяў гісторыі Эўропы. Нацыя была вынікам распаду аграрных супольнасьцяў, але яна сама паскарала гэты распад: яна зьнішчала ранейшыя сацыяльныя структуры і канструявала новыя. Як новая дынамічная супольнасьць яна адчувала сталую патрэбу ва ўзаемадачыненьнях зь іншымі. Таму мадэрная нацыя — у адрозьненьне ад этнічных супольнасьцяў — фармуецца і часткова існуе ў працэсе ідэалягічнай канфрантацыі зь іншымі нацыямі, а сучасная палітычная мапа сьвету набыла характар мазаікі грамадзянскіх супольнасьцяў, якія існуюць у стане ўзаемнага адштурхоўваньня.

На зломе XVIII і XIX ст. у заходняй Эўропе ў розных гістарычных умовах узьніклі дзьве розныя канцэпцыі нацыі. Прыклад грамадзянскай, альбо палітычнай нацыі як палітычна актыўнай супольнасьці грамадзян пэўнай дзяржавы, незалежна ад уласнай мовы і этнічнага паходжаньня, дала рэвалюцыйная Францыя. Культурная нацыя (супольнасьць носьбітаў адзінай мовы, культуры і нацыянальнай сьвядомасьці, незалежна ад дзяржаўных межаў) разьвілася першапачаткова ў раздробленай на 38 княстваў Нямеччыне[13].

---

[12] Гл. Greenfeld L. Nationalism. Five Roads to Modernity. Cambridge, Mass. — London: Harvard Univ. Press, 1992. P. 308.

[13] Шэраг прысьвечаных ёй тэарэтычных заўвагаў пакінуў, напрыклад, Освальд Шпэнглер, паводле якога народ зьвязаны з культурай як зь «нечым цалкам зыходным, што ўзьнікла з глыбокіх крыніцаў духоўнасьці («aus den tiefsten Gründen des Seelentums Aufsteigendes»), а самі народы, «паводле сваёй унутранай формы, па ўсёй сваёй сутнасьці не ствaральнікі, але творы гэтай культуры».

Гл. Spengler O. Untergang des Abendlands. München, 1922. Першынство ў распра-

Такая нацыя не абавязкова мае ўласную дзяржаву, як у выпадку Нямеччыны альбо Італіі першай паловы XIX ст., раздробленых на малыя княствы, альбо славянскага Захаду (Чэхіі, Славакіі, Славеніі і г.д.) мяжы XIX і XX ст., якія знаходзіўся ў складзе тагачаснай Аўстра-Вугоршчыны. У той час у Эўропе ўзьніклі першыя масавыя нацыяналізмы, накіраваныя на дасягненьне палітычнага адзінства шляхам стварэньня адзінай нацыянальнай дзяржавы ў выніку аб'яднаньня разьяднаных (Нямеччына) альбо акупаваных (Італія, Польшча) тэрыторыяў. Ідэя «нацыянальнай дзяржавы» неўзабаве зьмястоўна трансфармавала эўрапейскі палітычны парадак: калі ў канцы XIX ст. у Эўропе было менш за два дзясяткі дзяржаваў, то ў пачатку XXI ст. іх колькасьць перасягнула 40.

У XIX ст. важкі досьвед пабудовы «культурнай» нацыі дасьць падзеленая паміж Расеяй, Аўстра-Вугоршчынай і Прусіяй Польшча. Нацыяналістычна настроеныя польскія эліты (на іх вялікі ўплыў меў прыклад Нямеччыны, дзе нацыяналізм давёў сваю здольнасьць эфэктыўна вырашаць палітычныя задачы, у прыватнасьці, аб'яднаць разьяднаную на асобныя тэрыторыі нацыю ў адзіную дзяржаву) сфармулююць такую нацыянальную ідэалёгію, якая стане вельмі прывабнай для ўкраінскіх эліт. Элітамі гэтых дзьвюх безьдзяржаўных нацыяў, пазбаўленых свайго палітычнага прадстаўніцтва і органаў ажыцьцяўленьня сваёй палітычнай волі, тагачасныя палітычныя юрысдыкцыі ўспрымаліся як чужыя, непрымальныя для забесьпячэньня нацыянальнай і палітычнай еднасьці.

Узьнікненьне ж беларускага нацыяналізму пайшло больш пакручастай траекторыяй. Зыходзячы з канструяваньня нацыянальнай традыцыі, то бок гістарычнага досьведу, эвалюцыі статусу

---

цоўцы паняцьця «культурнай нацыі», чыё адзінства базуецца на «сьвятой і вечнай» культуры альбо мове, належыць Гэрдэру і Фіхтэ. Фіхтэ не рабіў асаблівага адрозьненьня паміж народам і нацыяй; для яго народ («Volk») — носьбіт і зарука зямной вечнасьці («Träger und Unterpfand der irdischen Ewigkeit», а нацыя — «абалонка вечнасьці» («die Nation als Hülle des Ewigen»).

нацыянальнай мовы і засваеньня агульнанацыянальнай назвы, я паспрабую паказаць, чаму беларускі нацыяналізм адхіліўся ад стандартнага агульнаэўрапейскага сцэнару і храналягічна наблізіўся, напрыклад, да віетнамскага. Само распазнаваньне беларусаў як этнакультурнай супольнасьці было зьдзейсьнена ў рамках расейскай нацыяналістычнай рэакцыі на польскае паўстаньне 1863 г., і сьпярша ідэя беларускай нацыянальнасьці была рэакцыйнай і зь цяжкасьцю ўспрымалася грамадзтвам. Беларус у сучасным разуменьні — гэта культурная інавацыя другой паловы XIX ст.

У цэлым, у XIX ст. разьвіцьцё нацыянальнай сьвядомасьці «нерасейскіх» супольнасьцяў эўрапейскай часткі Расейскай імпэрыі наўпрост залежала ад якасьці культурных рэсурсаў, якімі канкрэтная этнічная супольнасьць валодала на той момант. Росквіт нацыяналізму на зломе XIX і XX ст. на гэтай тэрыторыі тлумачыўся тым, што ён бачыўся рамантычным праектам вызваленьня, гуманістычнай ідэалёгіяй разьвіцьця і памнажэньня культурнага і матэрыяльнага багацьця. Ягоным ключавым сацыяльным прынцыпам была роўнасьць, а сам ён уяўляў сэкулярны тып сьвядомасьці, заснаваны на прынцыпе народаўладзьдзя.

У трактоўцы Грыцанава этнас як субстытут нацыі разумеецца «па-пэрэніялісцку», г.зн. па сутнасьці як супольнасьць, што існуе з пракаветных часоў. З гэтай прычыны Грыцанава нельга назваць клясычным марксістам, таму што апошні падзяляў тэзіс пра буржуазнае (мадэрнае) паходжаньне нацыяў. У ягонай пазыцыі варта ўгледжваць водгукі марксісцка-ленінскай філязофіі нацыі, паводле якой нацыі ёсьць прадуктам эканамічных дачыненьняў, у якіх вызначальную ролю грае існаваньне нацыянальнага рынку і буржуазіі. (Паводле Гроха, нацыянальная сьвядомасьць ёсьць сацыяльным дачыненьнем.). У яе трактоўцы зараджэньне нацыяў пачалося яшчэ ў раньнім сярэднявеччы і было абумоўлена такімі сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, як канцэнтрацыя вытворчасьці, паглыбленьне тавараабмену, разьвіцьцё эканамічных сувязяў, узьнікненьне прамысловых цэнтраў. За фазай «зараджэньня» нацыі ў выніку палітычнай і эканамічнай цэнтралізацыі на

грунце буржуазных грамадзкіх стасункаў наступала фаза яе «станаўленьня»[14].

У рамках гэтай схемы сьцьвярджалася, што фармаваньне беларускай сацыялістычнай нацыі скончылася на пачатку XX ст. Акурат такой тэлеалёгіі падпарадкаваныя выказваньні, што характарызуюць сучасных прыхільнікаў нацыянальнай культуры ў Беларусі як «адмарозкаў» (маўляў, якія могуць быць сумневы ў нацыянальным пытаньні, калі нацыя склалася сто гадоў таму).

Падыход, што заснаваны на заходнім тэарэтычным і мэтадалягічным апараце, выявіць поўную неабгрунтаванасьць падобных высноваў. Як я пастараюся паказаць, фармаваньне беларускай нацыі пачалося толькі на зломе XIX і XX ст. і цяпер далёкае ад завяршэньня. Сама ж беларуская нацыя ў яе цяперашняй форме фактычна складаецца з тых, для каго нешта значаць нацыянальныя каштоўнасьці. І колькасна, і якасна яна ніяк не супадае з насельніцтвам Рэспублікі Беларусі.

А. Грыцанаў папросту адтварае жывучы каляніяльны міт, калі кажа, што малым культурам уласьцівы нацыяналізм, а вялікім — нейкая высокая ўнівэрсальнасьць. Нацыяналізм тыповы для ўсіх рэгіёнаў, культур і цывілізацыяў сьвету: і малых, і вялікіх. Канцэпцыі нацыі і нацыяналізму ёсьць культурнымі праектамі, узьніклымі ў эўрапейскай гісторыі і пастаянна зьменлівымі ў выніку бягучых гістарычных працэсаў.

Лічыцца, што наймацнейшы нацыяналізм цяпер існуе ў ЗША. Упершыню ж ён узьнікае яшчэ ў XVI ст. у Ангельшчыне[15]. За пер-

[14] Пар. Ленинизм и национальный вопрос в современных условиях. Москва: Политиздат, 1974. С. 598.

[15] Лія Грынфэлд, палемізуючы з тэзісам Ганса Кона, паводле якога нацыяналізм у сучасным разуменьні гэтага тэрміну ўзьнік не раней за др. п. XVIII ст., адзначае, што раньнія формы нацыяналізму ўзьніклі сьпярша ў Ангельшчыне, у Галяндыі, у Францыі ды ў Амэрыцы, і толькі потым у Нямеччыне, якая стала адной зь першых пэрыфэрыяў пашырэньня нацыяналізму. Ангельскі нацыяналізм зьлёгку апярэдзіў Рэфармацыю: ужо ў 1520—1530 гг. у асяродзьдзі ангельскае эліты распаўсюдзілася разуменьне тоеснасьці нацыі і ўсяго насельніцтва, якое і ёсьць, на думку Грынфэлд, вызначальным крытэрам наяўнасьці нацыяналізму. Ангельская пратэстанц-

шую ж нацыянальную рэвалюцыю ўважаюць вайну ЗША за незалежнасьць, калі ўзьнікла паняцьце нацыянальнай дзяржавы і стала агульнапрынятай думка, што асноўным прынцыпам кіраваньня мусіць стаць аб'яднаньне ўсіх прадстаўнікоў нацыі ў адной дзяржаве. Лёзунг амэрыканскай рэвалюцыі «No taxation without representation» прайшоў праз Эўропу, эліты якой запатрабавалі новых формаў палітычнай рэпрэзэнтацыі, якая б улічвала ператварэньне станавага аграрнага грамадзтва ў індустрыяльную масавую цывілізацыю і ідэалёгіі мадэрнай эпохі.

Яшчэ пад канец XVIII ст. нацыя была справай адносна нешматлікіх: як палітычнае паняцьце яна служыла для апісаньня пануючых палітычных пластоў, як культурная катэгорыя яна ахоплівала адукаваных людзей усіх станаў. На пачатку ж XX ст. ідэя нацыі, гаворачы словамі Карла Маркса, авалодала масамі і стала матэрыяльнай сілай, наймагутнейшай палітычнай легітымацыйнай ідэяй Эўропы і крыху пазьней — усяго сьвету. Гэтай ідэяй

---

кая Біблія і іншыя сакральныя тэксты надавалі гэтаму пачуцьцю магутную падтрымку і пераканаўчую матывацыю для барацьбы супраць Каталіцкай Царквы і ейнай хаўрусьніцы Гішпаніі. Нідэрляндзкая рэвалюцыя і ангельская грамадзянская вайна спарадзілі больш масавы буржуазны нацыяналізм, які даў пачатак новаму, больш суцэльнаму і мэтанакіраванаму разнавіду нацыі і сьпярша сілкаваўся ваяўнічым, пурытанскім варыянтам хрысьціянства. Яшчэ да паразы Непераможнай армады пачуцьцё прыналежнасьці да ангельскай нацыі распаўсюдзілася на сярэдні стан і стала ўзорам для будучых нацыяналістычных рухаў у Эўропе і Амэрыцы. Бёрк, Мантэск'ё, Русо, Сіес і Джэфэрсан распрацавалі першыя формы сьвецкіх нацыяналізмаў у XVIII ст., і некаторыя зь іх апярэдзілі Гэрдэра, ня кажучы ўжо пра Фіхтэ альбо Шлегеля.

Гл. Greenfeld L. Nationalism. Five Roads to Modernity. Cambridge, Mass. — London: Harvard University Press, 1992. P. 308.

Э. Сьміт знаходзіць элемэнты нацыяналізму яшчэ ў дамадэрных рэлігійных і антычных крыніцах. Аднак толькі ў мадэрнай Эўропе нацыяналізм быў дапоўнены зваротам да ідэалізаванай мінуўшчыны (каб адрадзіць нацыю і надаць ёй асаблівую гістарычную долю), а таксама верай у сувэрэнную ўладу народу. Акурат у такім дапрацаваным выглядзе ён пашырыўся ва ўсім сьвеце.

Гл. Smith Anthony D. History and national destiny: responses and clarifications // Nations and Nationalism. 2004. № 1/2. P. 195—204.

ужо кіраваліся заходнія палітычныя эліты пакаленьня 1775—1815 гадоў[16].

На пачатку XIX ст. нацыяналізм у заходніх грамадзтвах быў лібэральны паводле свайго вызначэньня. Пэўная супярэчнасьць паміж кантрактным элемэнтам лібэралізму (паняцьце кампрамісу) і арганічнай канцэпцыяй нацыяналізму (паводле якой прадстаўнікамі нацыі нараджаюцца) сьпярша ня мела вялікага значэньня. Права індывіда на свабоду і шчасьце — «pursuit of happiness», абвешчанае амэрыканскай рэвалюцыяй, — стала сьвецкім дэвізам эўрапейскага лібэралізму.

Эўрапейскія грамадзтвы, у якіх становіцца ўсё менш падданых і ўсё больш грамадзянаў, прасякнуліся ідэяй, што палітычнае і нацыянальнае адзінства, заснаванае на супольным этнічным паходжаньні, мове, культуры і г.д., мусяць супадаць, г.зн. этнічныя нацыі мусяць стварыць свае дзяржавы. Як пісаў лорд Эктан, нацыя стварае сябе актам нацыянальнага самавызначэньня. Адзінства ёсьць неабходнай умовай фармаваньня калектыўнай волі, тады як для яе сьцьвярджэньня патрэбная нацыянальная незалежнасьць.

Такім чынам, нацыяналізм узьнікае ня як спантанная «рэакцыя этнасу на дэструкцыйныя ўзьдзеяньні вонкавага асяродзьдзя», ён уяўляе сабой ідэалягічную дактрыну, якая сягае сваімі каранямі ў антычнасьць. Аднак толькі з XIX ст. нацыяналізм пачаў свой пераможны шлях па ўсім сьвеце. Ягонае пасьпяховае пашырэньне залежала ад наяўнасьці шэрагу матэрыяльных передумоваў, найперш прамысловай рэвалюцыі, якая прынесла ўдасканаленыя тэхналёгіі для распаўсюду ідэяў, выпрацаваных інтэлектуальна абдоранымі асобамі. Мадэрнізацыя вытворчых сродкаў рабіла магчымым шпаркі распаўсюд нацыяналістычных ідэяў у індустрыйна-капіталістычным станавым грамадзтве. Індустрыялізацыя таксама кідала выклік «першапачаткова не-

[16] Пар. Szporluk Roman. The Making of Modern Ukraine: The Western Dimension. Harvard Ukrainian Studies. Volume XXV (1/2). 2001. P. 57—90.

нацыянальнай» дзяржаве — ажыцьцявіць мадэрнізацыю свайго ўладкаваньня і застацца на палітычнай мапе сьвету, а этнічным супольнасьцям, якія насялялі гэтую «першапачаткова ненацыянальную» дзяржаву, — перажыць гэтую індустрыялізацыю і не згубіць пры гэтым сваёй своеасаблівасьці і дамагчыся палітычнай незалежнасьці.

Вылучаюць яшчэ дзьве матэрыяльныя перадумовы пашырэньня нацыяналізму ў Эўропе — «разьвіцьцё друкарскай справы» і «пратэстанцкую рэфармацыю»[17], спэцыяльна адзначаючы пры гэтым, што нацыяналізм ня быў створаны прамысловай рэвалюцыяй, а паявіўся задоўга да яе. Дзякуючы пратэстанцкай рэфармацыі, стаў магчымы пераклад Сьвятога Пісьма на нацыянальныя мовы і, як вынік, іх сакралізацыя. Тым самым нацыянальная мова прызнавалася здольнай перадаваць асновы хрысьціянскага веравучэньня і сакральны сэнс адкрыцьцяў Госпада. Раней такая здольнасьць прызнавалася толькі за лічанымі сакральнымі мовамі. Выкліканая Лютэрам сэкулярызацыя мовы дала магчымасьць кожнаму «званіць» Богу беспасярэдне, не карыстаючыся паслугамі «апэратара» — сьвятара. «Ерась» Лютэра разам з вынаходніцтвам Гутэнбэрга ўзаконіла іншыя, «нацыянальныя» шляхі да вечнага выратаваньня[18].

«Друкарская рэвалюцыя» спрыяла масаваму распаўсюду друкаваных тэкстаў на нацыянальных мовах, іх цыркуляцыі ў грамадзтве. Асабліва вялікае ўзьдзеяньне «друкарскай рэвалюцыі» назіралася там, дзе яна суправаджалася масавай ліквідацыяй непісьменнасьці, бо гэта здымала апошнія перашкоды для цыркуляцыі мадэрных ідэяў у целе ўсяго грамадзтва. Дзякуючы «друкарскай рэвалюцыі», нацыянальныя мовы канчаткова адваёўваюць сабе афіцыйны статус у сфэры народнай адукацыі, літаратуры і мастацтва, у рэлігійнай практыцы й вайсковай службе.

[17] Шпорлюк Р. Комунізм і націоналізм. Карл Маркс проти Фрідріха Ліста: пер. з анг. Київ: Основи, 1998. С. 33.

[18] Тамсама. С. 160.

У асяродзьдзі адукаваных людзей вялікі рэзананс знаходзілі нацыянальныя лёзунгі, і на іх грунце лягчэй ішла палітычная мабілізацыя, а павелічэньне гэтага стану ў XVII ст. дзякуючы дзяржаўнай экспансіі і камэрцыйнаму капіталізму прабуджала ў ім пэўнае «грамадзянскае» пачуцьце. Перадумовамі разьвіцьця нацыяналізму таксама называюць разьвіцьцё нацыянальнай літаратуры, імклівы рост карэннага насельніцтва ў Заходняй Эўропе, што давала магчымасьць папаўняць лік гарадзкога пралетарыяту на кошт сельскай люднасьці, увядзеньне ўсеагульнай вайсковай павіннасьці, што судзейнічала новаму пачуцьцю салідарнасьці, і г.д.

Узьдзеяньне рэфармацыі на мадэрны нацыяналізм не вычэрпваецца толькі камунікацыйным аспэктам. Пратэстанцкая рэфармацыя дала моцны штуршок пратэстанцкай тэалёгіі. Л. Грынфэлд зьвязвае ўзьнікненьне самой мадэлі ангельскага нацыяналізму зь пераасэнсаваньнем старазапаветнага міту аб этнічнай абранасьці жыдоў. Мэсіянскія ноткі ў нямецкім культурным нацыяналізьме ўзыходзяць да тэалягічных першавытокаў. Тэрміналёгія ідэолягаў нямецкага культурнага нацыяналізму накшталт Фіхтэ, мадэлі іх мысьленьня пазычаны з хрысьціянскага веравучэньня — хрысьціянскай алегорыкай прасякнутыя тэрміны «ўваскрасеньне», «адраджэньне». «Валадарства розуму чалавецтва» («Vernunftreich der Menschheit») Фіхтэ было навеяна новазапаветным «валадарствам нябесным», а ў «зямной вечнасьці» («irdischen Ewigkeit») прачытваецца апостальскае «жыцьцё вечнае».

Можна пагадзіцца з Э. Сьмітам, які называе мэтафарай нацыяналізму «адраджэньне і абнаўленьне, вяртаньне з духоўнага выгнаньня да зямлі абяцанай»[19]. Толькі насуперак цьверджаньням нацыяналістычна настроеных ідэолягаў нацыянальнае адраджэньне — гэта не вяртаньне да народных вытокаў, а мадэрная

[19] Сміт Э. Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі. Менск: Беларускі фонд Сораса, 1995. С. 52.

стратэгія стварэньня нацыі на матэрыяле разнароднага ў шырокім сэнсе насельніцтва, часта з чыстага аркуша.

Узаемадачыненьні паміж нацыяналізмам і рэлігіяй таксама больш складаныя, чым падаецца Грыцанаву. Калі сусьветныя рэлігіі сталі адказам старавечных аграрных супольнасьцяў на плягі й сацыяльныя катаклізмы, нацыяналізм стаў людзкой рэакцыяй на сьветаглядны крызіс, зьвязаны зь пераходам традыцыйных супольнасьцяў да мадэрнага грамадзтва. Падобна рэлігійнай суполцы, уяўленая нацыя стала замяняць традыцыйную сям'ю і звыклае асяродзьдзе, разбураныя капіталізмам і калянізацыяй. Ідэя нацыі, якая прапанавала тры ў адным — арыентацыю, адзінства і трансцэндэнтнасьць, — была падобная да рэлігійнай. Нацыя ня ёсьць беспасярэдне бачнай рэальнасьцю, у яе трэба верыць. Адсюль разуменьне нацыяналізму як палітычнай вэрсіі традыцыйнай рэлігіі альбо сьвецкай рэлігіі індустрыяльнай эпохі са сваімі сьвятымі кнігамі, літургіямі, сьвятымі і рытуаламі, якая паставіла нацыю як духоўную супольнасьць грамадзян на месца Бога, грамадзянскую супольнасьць на месца царквы і палітычную юрысдыкцыю на месца Царства Божага[20].

Нацыяналізм — трыадзінае паняцьце, якое можна вызначыць як сыстэму вераваньняў, форму культуры і пэўны кшталт рэлігіі[21], а нацыянальнае пачуцьцё падобнае містычнаму — яно дасягаецца шляхам унутранага прасьвятленьня. На блізкасьць нацыяналізму з рэлігіяй паказвае і частае называньне нацыяналістаў фанатыкамі (іх перакананьні грунтуюцца на катэгорыях, якія нельга называць рацыянальнымі), і тая акалічнасьць, што нацыяналізм у сьвеце больш уласьцівы грамадзтвам з высокім узроўнем рэлігійнасьці. Нацыянальная царква часьцяком служыла стымулам

[20] Смит Энтони. Национализм и модернизм. Критический обзор современных теорий наций и национализма. Москва: Праксис, 2004. С. 186—187; Schulze Hagen. Staat und Nation in der europaeischen Geschichte. Muenchen: Verlag C.H. Beck, 1994. S. 172.

[21] Сміт Ентоні Д. Націоналізм. Теорія, ідеологія, історія. Київ: видавництво К.І.С., 2004. С. 30.

для ўзьнікненьня нацыяналізму; а калі канфліктуючыя нацыянальнасьці вызнавалі розныя веры, рэлігія адыгрывала значную ролю як мэханізм абароны слабейшай нацыянальнасьці (каталіцызм у брытанскай Ірляндыі і ў прускай Польшчы).

Чыньнік рэлігіі можа спрыяць (як у выпадку з харватамі-каталікамі і сэрбамі-праваслаўнымі) альбо перашкаджаць нараджэньню нацыянальнасьцяў (як у выпадку беларусаў-каталікоў, якія масава прынялі польскую нацыянальнасьць).

У XIX ст. нацыяналізм не прэтэндаваў на ўнівэрсальнасьць і ўсёабдымнасьць і ня стаў сур'ёзным канкурэнтам рэлігіі. Замест канфрантацыі ён імкнуўся да своеасаблівага сымбіёзу зь ёй. Нацыянальны ідэоляг нават у паставе нацыянальнага прарока не замяняў сьвятара, а для большай эфэктыўнасьці нацыяналістычнай агітацыі пераймаў выяўленчыя сродкі, што ўласьцівыя рэлігіі. Ён больш нагадваў прапаведніка-місіянэра, а не духоўніка. Толькі ў XX ст. нацыяналізм пачынае канкураваць з рэлігійным веравучэньнем, прыгадаем хаця б нацысцкую дактрыну «нацыянальнага паганства» альбо той факт, што пасьля другой сусьветнай вайны расейскі нацыяналізм стаў адыгрываць ролю духоўнага (рэлігійнага) элемэнта камуністычнага сьветагляду.

Нарэшце, нацыяналізм як палітычны прынцып «не ўвасобіўся ў працэсах распаду імпэрыяў». Разбурэньне Францускай, Гішпанскай і Брытанскай імпэрыяў пачалося ўжо зь сярэдзіны XVIII ст. Паралельна ў працах мысьляроў пары Асьветніцтва за імпэрыямі замацавалася мэтафара заняпаду, заходу і распаду.

Такім чынам, нацыяналізм як актыўная, з унутраным патэнцыялам праграма дзеяньняў для прыгнечаных (Э. Сьміт) высоўваў пэўныя палітычныя задачы перад нацыяй, якая ўзьнікала з волі да незалежнага існаваньня грамадзянаў, аб'яднаных нацыянальнай сьвядомасьцю. Нацыю стваралі эліты, таму ідэя нацыі распаўсюджвалася зьверху ўніз, а праграмы культурнага пераўтварэньня грамадзтва ў палітычна розных абставінах Эўропы XIX ст. мелі вялікае падабенства.

Каб заручыцца падтрымкай і ўзмацніць свой мабілізацыйны патэнцыял, нацыяналізм ствараў штучную ўніфікаваную культу-

ру, зьнішчаючы традыцыйную патрыярхальную. Народ («сацыяльны першаэлемэнт») прызнаваўся сыравінай, прызначанай для перапрацоўкі ў нацыю — ключавы элемэнт мадэрнасьці.

З гэтай прычыны гавораць пра маніпуляцыйны характар нацыяналізму. Становячыся масавай ідэалёгіяй, нацыяналізм спэкуляваў на атаясамленьні ранейшых [данацыянальных] катэгорыяў з пазьнейшымі. «Забыцьцё альбо нават няправільнае разуменьне гісторыі ёсьць істотным момантам у стварэньні нацыі» (Эрнэст Рэнан): «сярэдні француз» — гэта той, хто п'е віно, мае ордэн і ня ведае геаграфіі. Ён не ўяўляе, якое ягонае этнічнае паходжаньне і кім былі ягоныя продкі: галамі, брэтонцамі, франкамі, бургундцамі альбо нарманамі. Акурат гэтая амнэзія стварае Францыю. Чальцы нацыі павінны забыцца пра разнастайнасьць сваіх культурных каранёў, паколькі адзінства нацыі забясьпечваецца ня памяцьцю, але яе стратай. На Ўсходзе прыгадваюць тое, чаго не было, на Захадзе — забываюцца тое, што было (Эрнэст Гелнэр).

У той час як нацыяналістычная ідэалёгія ўдае, нібыта выступае ў абарону народнай культуры, яна насамрэч навязвае высокую культуру. Адзіная нацыянальная мова — гэта штучны, «вынайдзены» прадукт:

> *Нацыянальныя мовы амаль заўсёды маюць рысы мастацкага твору і часам, як, напрыклад, сучасная габрэйская мова, у большай ступені штучныя. Яны ёсьць поўнай супрацьлегласьцю таго, за што іх выдае нацыяналістычная міталёгія, а менавіта — архаічнага падмурку нацыянальнай культуры, нарожнага каменя нацыянальнай сьвядомасьці. Звычайна адзіную мову спрабуюць стварыць з мноства гаворак (якія пазьней ператворацца ў дыялекты), пры гэтым праблема ў прынцыпе ў тым, які дыялект ляжа ў аснову ўнармаванай і адзінай мовы*[22].

[22] Гл. Hobsbawm E.J. Nation und Nationalismus. Mythos und Realität seit 1780. Frankfurt a.M., 1994. S. 288.

Нацыяналізм маніпулюе грамадзкай памяцьцю, выкарыстоўваючы сымбалі вечнасьці, памінаньня і замагільнага жыцьця: калектыўныя пахаваньні й магілы Невядомага Жаўнера. Падобна рэлігіі, ён спэкулюе на сьмерці і нягодах, ствараючы тым самым уяўную пераемнасьць пакаленьняў і зьвязваючы ў адзіную нацыю мёртвых і жывых (Бэнэдыкт Андэрсан).

Зробленыя вышэй заўвагі збольшага датычаць фэномэну нацыяналізму і нацыі як нейкага «ідэальнага тыпу» і фактычна нічога не гавораць пра мэтады дасьледаваньня беларускага нацыяналізму. Каб адказаць на пытаньне, як арганізаваць вырашэньне гэтай вялікай дасьледчай задачы, зьвернемся да агульных мэтадалягічных рамак, прапанаваных Э. Сьмітам[23].

Вось жа, пры дасьледаваньні нацыяналізму варта (1) апэраваць матэрыялам, узятым на вялікім часавым кавалку (la longue durée), аналізаваць (2) сымбалічныя элемэнты, (3) разьмежаваць этнас і нацыю, зьвярнуцца да (4) вывучэньня дамінантных этнасаў, раскрыць (5) шляхі нацыятварэньня, (6) узьдзеяньне, тыпы (7) і (8) трансфармацыю нацыяналізму. Пераемнасьць і зьменлівасьць нацыяналізму належыць раскрываць пры дапамозе аналізу культурных і сымбалічных элемэнтаў, асабліва з дапамогай такога спосабу рэпрэзэнтацыі, як літаратура.

Гэтыя мэтадалягічныя прынцыпы відавочныя для эмпірычна рэфэрэнцыйнага дасьледаваньня, прысьвечанага нарацыйнай гісторыі нацыяналізму. Аднак у меру напісаньня гэтай кнігі ўздымаліся пытаньні, на якія немагчыма было даць адказу, абапіраючыся выключна на гэтыя прынцыпы:

— Чаму ў беларускім выпадку каляніяльныя нарацыі аказаліся больш моцныя і інтэрналізаваныя, чым нацыяналістычныя? Чаму аўтарытэт каляніяльнай культуры аказаўся непахісны? Чаму пасьля дасягненьня нацыянальнай незалежнасьці колькасьць носьбітаў нацыянальнай мовы, здаецца, зьменшылася? Чаму ў масавай сьвядомасьці беларускамоўныя беларусы выступаюць як

[23] Гл. Smith Anthony D. History and national destiny: responses and clarifications // Nations and Nationalism. 2004. № 10 (1/2). P. 195—204.

«адмарозкі», публічнае ўжываньне беларускай мовы разглядаецца як сымптом ненармальнасьці альбо непавагі да людзей?

— Чаму каляніяльныя нарацыі пранізваюць усе віды моўных практык насельніцтва Беларусі, увесь час прысутнічаюць у палітычных прамовах, паведамленьнях дзяржаўных і незалежных СМІ? Чаму нашыя суайчыньнікі, самі таго не прыкмячаючы, штодзённа выдаюць безьліч выказваньняў, спароджаных каляніяльным дыскурсам, які прадукуе пэўны сьветагляд і ставарае сілавое поле, што ўтрымліваецца пэўнай сымболікай?

— Як канструявалася культура беларускага каляніялізму, якая стала наймацнейшым генэратарам цяперашняй культуры беларусаў, здольным спараджаць ня толькі моўныя практыкі, але і палітычныя пазыцыі, культурныя прыхільнасьці, музычныя густы і нават уяўленьні аб прыўкрасным і агідным? Чым патлумачыць жывучасьць і стабільнасьць гэтай ўсюдыпранікальнай гегеманічнай структуры? Чаму навукоўцы да гэтага часу схільныя будаваць свае канцэпцыі, а палітыкі — палітычныя праграмы на падмурках, закладзеных каляніялізмам?

— Чаму беларусы апынуліся адзінай групай сярод чатырох асноўных этнічных супольнасьцяў Рэчы Паспалітай, няздольнай пабудаваць мадэрнай нацыі?

— Калі ўзьнік беларускі нацыяналізм, якая была каньюнктура яго ўзьнікненьня? У гэтым пытаньні навуковая супольнасьць дапушчае сур'ёзныя разыходжаньні. Канадзкі гісторык Іван-Паўло Хімка сьцьвярджае, што Ўкраіна разам зь іншымі славянскімі нацыямі (трэба меркаваць, і беларускай) «абудзілася» ў сярэдзіне XIX ст.[24] Ягоную думку аспрэчвае Алег Латышонак, які сьцьвярджае, што беларускі нацыяналізм налічвае больш за 200 гадоў[25].

— Чаму Беларусь апынулася па-за агульнай эўрапейскай прасторай, і які будзе шлях ўваходжаньня ў гэту прастору? На якіх

---

[24] Химка Дж.-П. Зародження польської соціал-демократії та українського радикалізму в Галичині (1860—1890). Київ: Основні цінності, 2002. С. 328.

[25] Латышонак А. Гантынгтан, правераны часам // ARCHE. 2003. № 6 (29). С. 15.

нарацыях і міталёгіях грунтуецца аўтарытэт дэспатычнай улады? Як ствараецца ўніфікаванае сілавое поле міту ўлады, дзяржавы, афіцыйнага іканастасу і г.д.? Ці ёсьць дэманізацыя беларускага нацыяналізму сьвядомым прыёмам улады, і якую пагрозу ён уяўляе для яе сыстэмы, а таксама разьмеркаваньня і ўзнаўленьня сфармаваных культурных і палітычных стасункаў?

Каб адказаць на гэтыя пытаньні, давядзецца дапоўніць акрэсьленыя рамкі прынцыпам рэвізіі існуючых у гуманітарных навуках трактовак і падыходаў, якія зацямняюць адказы на іх. Гэтыя «зацямняючыя» трактоўкі, аднак, самі па сабе выклікаюць цікавасьць дзеля свайго пастаяннага ўзнаўленьня ў гуманітарным дыскурсе, а таксама дзеля свае ідэалягічнае падкладкі.

Гісторыя Беларусі — гэта гісторыя ўяўленьня. Мы ўяўляем беларускую гісторыю тады і там, калі і дзе ніякай Беларусі не існавала. Сама гісторыя паняцьця налічвае менш за дзевяць стагодзьдзяў, а гісторыя ягоных блуканьняў па землях Усходняй Эўропы, як і (адносна позьняга) замацаваньня за часткай, а потым і ўсёй беларускай тэрыторыяй, складае захапляльны інтэлектуальны сюжэт[26].

Дасьледаваць гісторыю беларускага нацыяналізму — значыць адсочваць на матэрыяле тэкстаў, як канструявалася ўяўленьне пра Беларусь, беларускую мову і літаратуру, геаграфію, традыцыі, мэнтальнасьць і тэлеалёгію. А значыць, у фокус нашага дасьледаваньня трапяць найперш тэксты і ідэі, а не гістарычныя постаці і падзеі.

---

[26] Развагі пра штучнасьць Беларусі не павінны схіляць да думкі, што беларуская мова таксама штучная. Штучнай у беларускай мове ёсьць хіба што ейная позна ўзьніклая назва. Характар каляніяльнай палітыкі цягам XIX і XX ст., накіраваны на яе зьнішчэньне, як нішто іншае паказвае на рэальнасьць і прадметнасьць.

Хаця назоў Беларусь у якасьці этнакультурнай катэгорыі позьні і вынайдзены, шмат гадоў існавала руская літаратура, існавалі русіны, існавала асобная руская ідэнтычнасьць, носьбітам якой быў Ф. Скарына.

Такія нацыянальныя традыцыі, як Польшча, Расея альбо Нямеччына, у роўнай ступені штучныя. Розьніца палягае ў тым, што працэс іх канструяваньня адбываўся ў даўнейшыя часы і таму быў асьвечаны назовам вечных.

*Да новых мэтадалягічных і пазнавальных парадыгмаў.* Самы распаўсюджаны мэтадалягічны прыём, які стварае ілжывае ўяўленьне пра беларускі матэрыял, — ягоная падгонка пад агульнапрынятыя ўнівэрсальныя схемы, эўрыстычна каштоўныя і эфэктыўныя стасоўна іншых усходнеэўрапейскіх нацыянальных культураў. Прачытаўшы шматтомныя гісторыі беларускай літаратуры XIX ст., немагчыма зразумець, калі і як адбыўся нацыянальны паварот, пасьля якога беларускі нацыянальны рух стаў адносна масавы. Для стваральнікаў гэтых гісторыяў, што карысталіся пэрэніялісцкімі канцэпцыямі нацыі, усё XIX ст. доўжыўся літаратурны працэс прыблізна аднаго кшталту. У беларускую літаратуру XIX ст. імі залічалася практычна ўсё, што было напісана па-беларуску альбо дзе ўжывалася слова «Беларусь», за выняткам хіба што самых адыёзных макаранічных пісаньняў аўтарства Аляксандра Пшчолкі. Дзеля гэтага хрэстаматыі беларускай літаратуры XIX ст. ператвараліся ў звалку тэкстаў, напісаных першапачаткова на розных мовах, у розных стылях і эстэтыках пад уплывам антаганістычных палітычных ідэалёгіяў. (Гэты запачаткаваны Рамуальдам Зямкевічам мэтад у цэлым вытрымліваецца і стасоўна гісторыі беларускае літаратуры XX ст., а ягоным стрыжнем застаецца падмена ацэнкі тэкстаў з эстэтычных крытэраў ідэалягічна матываванай карпарацыйнай герархіяй.)

На такіх інтэрпрэтацыях беларускай літаратуры грунтаваўся амэрыканскі палітоляг Раман Шпарлюк, высоўваючы тэзіс, што на беларускі нацыяналізм, як і на ўкраінскі, вырашальным чынам паўплывалі беспасярэдне ўспрынятыя польскія мадэлі. Намякаючы, відавочна, на творчасьць гуртка філяматаў і філярэтаў пры Віленскім унівэрсытэце, Шпарлюк сьцьвярджаў, што ў 1820-х гадох запазычаная ў нямецкіх і славянскіх землях імпэрыі Габсбургаў новая ідэя нацыі пачынае распаўсюджвацца і ў Вільні. Абуджаецца цікавасьць да беларускае мовы, фальклёру і гісторыі, узьнікае думка, што беларусы ёсьць асобнай нацыянальнасьцяй, а не адгалінаваньнем польскай нацыі, як уважалі палякі[27].

[27] Пар. Szporluk Roman. The Making of Modern Ukraine: The Western Dimension. Harvard Ukrainian Studies. № XXV (1/2). 2001. P. 57—90.

Уплыў польскага нацыяналізму, які адчуваўся на вялікай тэрыторыі «на захад ад Дняпра і на поўдзень ад Дзьвіны», таксама абумовіў фармаваньне сучасных культур і нацыяў ва ўкраінцаў, літоўцаў і беларусаў. Для гэтых «сялянскіх» нацыяў былых ускраін Рэчы Паспалітай польскі нацыянальны рух стаў адначасова выклікам і ўзорам, які задаў альтэрнатыўную мадэль нацыянальнага разьвіцьця[28].

Мэтадалягічны эсэнцыялізм такога падыходу ў тым, што за прынцыпам аналёгіі за беларускім нацыяналізмам *a priori* прызнаюцца простыя заходнія інсьпірацыі, а ў ягоныя стваральнікі залічаюцца толькі беларускамоўныя альбо, прынамсі, польскамоўныя праэўрапейска настроеныя інтэлектуалы. Напрыклад, сьцьвярджаецца, што аснову нацыянальных рухаў у Расейскай імпэрыі складала інтэлігенцыя, якая была пад уплывам нацыяналістаў з краінаў Заходняй Эўропы[29].

Зыходным момантам для такіх развагаў ёсьць, відаць, цалкам нэўтральная ідэя Ганса Кона, якая губляе сваю імавернасьць у выніку некарэктнага абагульненьня:

> *Кожны новы нацыяналізм, атрымліваючы першапачатковы імпульс ад культурнага кантакту зь іншым, старэйшым нацыяналізмам, шукаў абгрунтаваньня і пацьверджаньня сваёй унікальнасьці ва ўласным мінулым, у прастаце і старадаўнасьці ўласных традыцыяў, супрацьпастаўляючы іх заходняму рацыяналізму*[30].

---

[28] Шпорлюк Р. Націоналізм після комунізму: Росія, Україна, Білорусь та Польща // Імперія та нації з історичного досвиду України, Росії, Польщи та Білорусі. Київ: Дух і літера, 2000. С. 197.

[29] Смит Джереми. Оценка советской национальной политики: к построению количественной модели // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань: Центр исследований национализма и империи, 2004. С. 367.

[30] Гл. Kohn Hans. The Idea of Nationalism. New York: Collier-Macmillan, 1967.

Умовай магчымасьці такога падыходу становіцца атаесамленьне беларускай нацыянальнай літаратуры з польскацэнтрычнай правінцыйнай літаратурай на беларускай мове і абсалютызацыя польскіх інсьпірацыяў беларускага нацыяналізму, трэцярадных паводле свае значнасьці.

Гэты эсэнцыялісцкі падыход прадукуе сваю фантастычную лёгіку, якая называе асноўнай цяжкасьцю для разьвіцьця беларускага нацыянальнага руху ў XIX ст. «парадаксальную ідэйную сытуацыю: ягонымі праваднікамі ў краіне, дзе дамінавала праваслаўнае насельніцтва, сталі галоўным чынам прадстаўнікі каталіцкай шляхты». Апошнія, усьведамляючы сваю этнічную своеасаблівасьць, не маглі падняцца над рэлігійным бар'ерам і «сфармуляваць агульнанацыянальную праграму культурнай і палітычнай дзейнасьці, прымальную і для адной, і для другой часткі грамадзтва, асабліва — для праваслаўнай большасьці»[31].

У рамках гэтага падыходу адбываецца падмена паняцьцяў: сацыяльныя праслойкі, якія сталі (на пачатку XX ст.!) адчувальнымі да ідэяў беларускага нацыяналізму, абвяшчаюцца ягонымі «праваднікамі ў краіне праваслаўнай большасьці».

Я ж хачу паказаць, што першым беларускім нацыяналістам, г.зн. чалавекам, які карыстаўся мадэрным паняцьцем Беларусі як этна-

---

[31] См. Turonek Jerzy. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi. Warszawa: Oficyna Wydawnicza «Gryf», Instytut Historii PAN, 1992.

Генэалягічна такая пазыцыя ўзыходзіць да пэрэніялісцкіх дактрынаў нацыяналізму, якіх, у прыватнасьці, прытрымліваўся Антон Адамовіч:

> *У бальшыні такая «незацьверджаная» шляхта [г.зн. якая ня здолела пацьвердзіць свайго шляхецкага паходжаньня. — Аўт.] прыпісвалася да сялянства, радзей да мяшчанства... (як, найпраўдападабней, было ў выпадку Купалавага бацькі) і эканамічна найчасьцей ад іх і ня розьнілася, адылі пачуцьцё нацыянальнасьці й традыцыі захоўвала куды лепш, на што ў свой час указваў Язэп Лёсік...*

Адамовіч Антон. Да гісторыі беларускае літаратуры. Менск: Выдавец З. Колас, 2005. С. 1076.

Гэтае цьверджаньне беспадстаўнае, бо такая шляхта лепш захоўвала не абстрактнае пачуцьцё нацыянальнасьці, але гатовую формулу польскай нацыянальнасьці.

культурнай катэгорыі, быў, калі карыстацца ідэалягічнымі ярлыкамі, манархіст, імпэрскі гістарыёграф і праваслаўны рэакцыянэр Міхаіл Каяловіч, чый унёсак у «беларускую ідэю» супастаўны, калі ня большы, за ўнёсак Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. (Само вызначэньне «першы», ведама, тут нястрогае і часткова мэтафарычнае.)

Я таксама паспрабую давесьці, што расейскі каляніяльны праект пабудовы новага імпэрскага рэгіёну «Беларусь» меў прагрэсіўнае значэньне. Ён паслужыў пажыўным асяродзьдзем для беларускага нацыяналізму, стварыўшы касьцяк паняцьцяў і прэзэнтацыяў, неабходных для нацыяналістычнай дзейнасьці. З гэтай прычыны вывучэньне стратэгіяў расейскага каляніялізму[32] ў Беларусі як гістарычнага папярэдніка, а таксама і ідэалягічнага канкурэнта беларускага нацыяналізму гэтаксама складае частку агульнай дасьледчай задачы.

Беларускі нацыяналізм узьнікае толькі пасьля фармаваньня новага імпэрскага рэгіёну «Беларусь». У апошнія дзесяцігодзьдзі XIX ст. адбываецца тое, што можна назваць нацыянальным паваротам. Пакаленьне, народжанае ў 1880—1890 гг., дало ўжо не адзінкі, а тысячы беларускіх нацыяналістаў і кінула дадатковы выклік навукоўцам, бо адразу ж пасьля сваёй папулярызацыі беларускі нацыяналізм абвесьціў сябе і зьвязаныя зь ім катэгорыі чымсьці спрадвечным і цалкам натуральным.

---

[32] Тэрмін «каляніялізм» як правіла выкарыстоўваецца для характарыстыкі ўварваньня ў краіну і пасяленьня ў ёй прадстаўнікоў іншай краіны — мэтраполіі, якія ўводзяць сваю сыстэму адміністрацыйнага кіраваньня, юрыдычную сыстэму і іншыя сацыяльныя інстытуты. Тэрмін «імпэрыялізм» выкарыстоўваецца для характарыстыкі больш шырокага спэктру адносінаў эксплёатацыі — палітычнай, эканамічнай і культурнай (у выпадку Беларусі — умяшальніцтва ў юрыдычную сыстэму і рэлігійнае жыцьцё) — і тады, калі ў краіне не адбываецца масавага перасяленьня цывільных асобаў. У Беларусі расейскі каляніялізм прыйшоў на зьмену расейскаму імпэрыялізму (калі юрыдычныя, адукацыйныя і рэлігійныя правы Беларусі былі абмежаваныя аж да поўнага скасаваньня) зь сярэдзіны XIX ст. Акурат у гэты час пачынаюцца масавыя перасяленьні расейскіх каляністаў у краіну. Болей пра гэтыя тэрміны гл. Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 17.

Што ж адбылося паміж 60-мі і 90-мі гадамі XIX ст.? Момант нацыянальнага павароту затушоўваўся ў традыцыйнай гісторыі беларускай літаратуры і сумежных дысцыплінаў. Характар падзеяў тых часоў немагчыма прасачыць толькі зь беларускіх крыніц, якіх практычна не існавала: паміж 1864 і 1900 гг. было выдадзена, паводле розных падлікаў, 16 альбо 17 кніг на беларускай мове агульным аб'ёмам у 480 старонак невялікага фармату[33].

Каб разгледзець гэты паварот, я быў вымушаны зьвярнуцца таксама да польскіх, украінскіх і расейскіх тэкстаў. Гэты зварот дапамог мне зразумець, што парамэтры і магчымасьці пазнаньня трывала залежаць ад існуючай грамадзка-палітычнай, інтэлектуальнай і навуковай традыцыі. Дзеля гэтага я вырашыў разьвітацца з гатовымі пазнавальнымі парадыгмамі (пры аналізе літаратурных крыніц: матэрыялізму, рэвалюцыйнага дэмакратызму, рэалізму і г.д.) і прапанаваць эпістэмалягічную рэканструкцыю і пераасэнсаваньне паняцьцёвага апарату, які, на першы погляд, выглядае ўстойлівым.

Я паспрабаваў выбудаваць сваю аргумэнтацыю такім чынам, каб яна рэагавала на матэрыял, а не навязвала раней выпрацаваныя аўтарытарныя ідэі. Мой гістарычны і антрапалягічны аналіз быў прысьвечаны ня толькі канструктыўным асаблівасьцям беларускага нацыяналізму, ягоным першапраходцам і аўтарытэтам, першым кананічным тэкстам і выпрацаванаму імі сьветагляду, але і ягоным ідэалягічным папярэднікам, іх стылям, тэкстам і каштоўнасьцям. Дзеля гэтага я імкнуўся дасьледаваць ня толькі літаратурныя крыніцы, але і працы навукоўцаў, палітычную публіцыстыку, нататкі чыноўнікаў і статыстычныя матэрыялы.

Гэта запатрабавала асаблівай чуйнасьці да аўтарытарнага і расісцкага мысьленьня, да падыходаў, якія прэтэндуюць на ўсёабдымнасьць, але насамрэч звужаюць і зьбядняюць матэрыял. Банкруцтва ідэалягічнай сыстэмы, у рамках якой яны былі вы-

[33] Гл. Turonek Jerzy. Z dziejów białoruskiego ruchu wydawniczego w latach 1902—1905 // Studia polono-slavica-orientalia, Acta litteraria IX, 1985. S. 65.

працаваныя, дагэтуль не адбылося, таму наўрад ці магчыма абысьціся бяз крытыкі яе догматаў і інструмэнтара, іншымі словамі, гермэтычна ізаляваных канонаў. Пазьбягаць яе аналізу — значыць ігнараваць больш шырокую і інтэлектуальна больш сур'ёзную пэрспэктыву.

Наколькі згубнай можа быць няздольнасьць пераадолець ранейшыя, савецкія і вульгарна-нацыяналістычныя мэтадалягічныя падыходы, паказвае цяперашні крызіс беларускага літаратуразнаўства[34] і часткова альтэрнатыўнай афіцыйнай гістарыяграфіі. Ім дагэтуль уласьцівы сьляпы фактаграфізм, каньюнктурнасьць, папулізм, схематызм, няўлічваньне найноўшай тэарэтычнай думкі, засільле спэкуляцыі, гіпэрбалы і рыторыкі і г.д. Улічваючы гэта, я наважыўся адмовіцца ад пазытывісцкай практыкі намнажэньня фактаў і мэтаду іх простай, беспраблемнай канстатацыі. Такі падыход гранічна адкрыты, то бок бязьмежны, і тым самым рэальна хаатычны (Р. Грабовіч): хоць набор «фактаў» можна працягваць да бясконцасьці, яны не заўсёды тлумачаць тэму, а само імкненьне да ўсёабдымнай поўнасьці можна прывесьці да непапраўнай шкоды якасьці дасьледаваньня.

*Эмпірычная рэфэрэнтнасьць.* Асноўным рэфэрэнтным аб'ектам дасьледаваньня ёсьць мадэрная беларуская літаратура, якая доўгі час была па сутнасьці адзінай прасторай палітычнай актыўнасьці беларусаў і праявай мадэрнай беларускай ідэнтычнасьці. Яе ўзьнікненьне адбывалася ва ўмовах жорсткай ідэалягічнай канфрантацыі і было сьведчаньнем узьнікненьня нацыі, разрыву з засвоеным у працэсе калянізацыі комплексам непаўнавартасьці, з пануючымі культурнымі, гістарычнымі стэрэатыпамі і наратывамі. Пачынальнік мадэрнай літаратурнай традыцыі Францішак Багушэвіч, бадай, першы кінуў выклік гегеманісцкім плянам Расейскай імпэрыі ад імя беларусаў як нацыі. Багушэвіч адмаўляў асаблівую цывілізацыйную місію Расеі і навязваныя ёй гегеманісцкія ўяўленьні пра беларускі народ і ягоную гісторыю.

---

[34] Гл. Булгакаў В. Вузкія месцы дыяспары // ARCHE. 2004. № 1. С. 6—25.

Ён уяўляе сабой найзырчэйшы прыклад пратэстанта ў мадэрнай беларускай культуры, апалягета, гаворачы сучаснай мовай, грамадзянскай супольнасьці, які не скарыўся ідэалягічнаму дыктату дэспатычнай дзяржавы. Створаныя ім тэксты набылі вялізарную рэфэрэнцыйную сілу ў маштабах усёй новай беларускай культуры і адыгралі ролю інтэлектуальнага стымулу для цэлых пакаленьняў беларускіх пісьменьнікаў.

Каб разгледзець фэномэн Багушэвіча з дапамогай ня толькі новых тэарэтычных і мэтадалягічных падыходаў, але і на фоне больш шырокіх працэсаў, я аналізую розныя парадыгмы дасьледаваньня ягонай творчасьці, у тым ліку відавочна фальсыфікатарскія (парадыгмы аб рэвалюцыйным дэмакратызьме Багушэвіча, ягонай еднасьці зь перадавой расейскай літаратурай і таму падобнае). Не паддаўшы крытыцы перадгісторыю дасьледаваньня тэмы, не задумаўшыся аб адэкватнасьці падыходу да яе і абранага інструмэнтару, немагчыма ўнесьці дух рэвізіянізму ў кананічнае бачаньне Багушэвіча, падарваць эмпірычна неабгрунтаваныя, але трывала ўкаранёныя інтэлектуальныя догмы на ягоны конт.

У выпадку з Багушэвічам гэты дагматызм найчасьцей праяўляўся ў сацыялягізатарскай інтэрпрэтацыі ягонай творчасьці. Для сацыялягізатараў літаратура выступала як спараджэньне і функцыя палітыкі: яны адмаўляліся прызнаць анталягічны статус літаратурнага і, у прыватнасьці, паэтычнага мысленьня. Асаблівая лёгіка ўзьнікненьня мадэрнай беларускай літаратуры *a priori* адкідалася, а яе гісторыя перапісвалася для наданьня ёй статусу правінцыйнасьці і непаўнавартасьці, то бок для ўзмацненьня легітымнасьці цэнтру аўтарытарнай улады. У імя гэтага веліч расейскіх пісьменьнікаў абсалютызавалася, а адзіна магчымым каналам культурнага ўзаемадзеяньня паміж «расейскімі» тэрыторыямі прызнаваўся кірунак імпэрскі цэнтар — імпэрская правінцыя. Тэрыторыям, сканструяваным як імпэрская правінцыя, адмаўлялі ў праве на самастойныя культурныя кантакты, найперш з заходнімі культурнымі мэтраполіямі.

Калі вобраз Багушэвіча як рэвалюцыйнага дэмакрата яшчэ неяк можна было сканструяваць з дапамогай ягонага звышвыбарнага

прачытаньня, то ягоная іпастась як правінцыйнага пераймальніка Някрасава патрабавала сьвядомай фальсыфікацыі. Яна ўлучала ў сябе падмену напрамку культурных уплываў, рэальных адносінаў паміж тэкстамі, іх відамі і жанрамі, а таксама абставінаў, пры якіх яны набывалі культурную і палітычную значнасьць.

*Каляніяльныя і антыкаляніяльныя дыскурсы.* Я не імкнуўся даць комплекснага аналізу каляніялізму як ідэалёгіі, палітыкі і лёгікі ўлады, акрэсьліць ягоную інтэлектуальную генэалёгію альбо праілюстраваць жудасную структуру культурнага дамінаваньня. У мае пляны таксама не ўваходзіла раскрыцьцё прычынаў таго, чаму на вывучэньне каляніяльнай праблематыкі ў беларускім кантэксьце было накладзенае табу. Мяне найперш цікавіў канструктыўны патэнцыял каляніялізму (як ажыцьцяўляецца інтэлектуальнае канструяваньне калёніі?), а таксама пытаньне, як каляніялізм уплываў на пэўныя аспэкты мастацкай творчасьці. Акурат літаратурны дыскурс дазволіў мне разгледзець культурныя, эстэтычныя і ідэалягічныя стратэгіі каляніялізму, у якіх прагаворвалася Беларусь, шырэй: ня толькі з расейскага, але і з польскага боку.

Я хацеў паказаць, што каляніялізм ня толькі канструяваў новыя паняцьці і прэзэнтацыі, жыцьцёва важныя для нацыяналістаў (у прыватнасьці, ён стварыў канкрэтную эпістэмалягічную мадэль, празь якую бачылася Беларусь), а таксама кідаў выклік існаму сацыяльнаму і культурнаму парадку, спараджаючы рознага кшталту рэактыўныя рухі. Навязваючы свой слоўнік і эпістэмалягічныя інструмэнты, ён ламаў ранейшыя ідэалягічныя стэрэатыпы і сілавыя дыскурсы, пазбаўляў старыя эліты рэсурсаў для культурнай гегемоніі і напачатку валодаў пэўным патэнцыялам вызваленьня. І, што найважнейшае, каляніялізм выклікаў да жыцьця антыкаляніяльны ідэалягічны дыскурс супраціву, зараджэньне і разьвіцьцё якога ёсьць найзырчэйшай падзеяй у беларускай літаратуры XIX ст.

Гэтая падзея ў цэлым ігнаравалася навуковай супольнасьцю. Пад уплывам аўтарытарнай ідэалёгіі нарацыйным, сымбалічным і мэтафарычным структурам гэтага альтэрнатыўнага дыскурсу ад-

маўлялі ў разглядзе, а сам ён перакручваўся з мэтайператварыць ягоную аўдыторыю ў прыхільнікаў аўтарытарнага парадку. З гэтай прычыны асобны сюжэт у кнізе прысьвечаны таму, як Багушэвіча пасьля стараннай прэпарацыі інкарпаравалі ў савецкі канон. У сваю чаргу, гэтаму спрыяла пэўная пазацэнзурнасьць і падпольнасьць контрадыскурсу — яго не заўсёды заўважалі ідэалягічныя праціўнікі, што стварала ў іх няправільнае ўяўленьне аб сьвеце.

Я спрабую паказаць, што гэты контрадыскурс існаваў у цеснай сувязі з афіцыйнай палітыкай і ідэалёгіяй царызму і сьведчыў пра глыбокую занепакоенасьць імі з боку ягоных стваральнікаў. Ягоныя глыбінныя структуры выяўлялі моцныя палітычныя пачуцьці, найперш нежаданьне падпарадкоўвацца вонкавай гегеноніі, адмову прыняць імпэрскую ідэнтычнасьць, адрокшыся ад сваёй нацыянальнай.

Мы жывём у грамадзтве, дзе навука падмяняецца ідэалёгіяй, акадэмічныя інстытуты, асабліва ў гуманітарным сэктары, пры калясальным ціску кантролю, цэнзуры і самацэнзуры губляюць рэшткі навуковага аўтарытэту. Таму ўся дасьледчая задача ня зводзіцца да дасьледаваньня беларускага нацыяналізму і шляхоў беларускага нацытварэньня. Яна значна больш шырокая і ўлучае этычнае вымярэньне: спрыяць аднаўленьню і разьняволеньню гуманітарных дысцыплін, падрываць аўтарытэт палітычнай дэспатыі.

# І. НАЦЫЯ І НАЦЫЯНАЛІЗМ: ДАМАДЭРНАЯ І МАДЭРНАЯ ПАРАДЫГМЫ

## АНТЫЧНЫЯ, СЯРЭДНЯВЕЧНЫЯ І РАНЬНЕМАДЭРНЫЯ НАЦЫІ

Ужываньне паняцьцяў «natio» і «gens» для пазначэньня этнічных катэгорыяў замацавалася ў эпоху Сярэднявечча, што дало падставы амэрыканскаму гісторыку П. Вандычу не зусім дакладна сьцьвярджаць: калі Антычнасьць была эпохай гарадоў і імпэрыяў, то Сярэднявечча спарадзіла нацыі[1].

У пару Антычнасьці паняцьце «нацыя» («natio») азначала паходжаньне як адрозную прыкмету людзей. Цыцэрон ужываў яго для азначэньня арыстакратаў, для Плінія філязофская школа была *natio*. Паняцьці «natione liber» і «natione servus» выкарыстоўваліся для азначэньня вольных грамадзян і рабоў. Гэтым жа выразам карысталіся для азначэньня барбарскіх народнасьцяў (з адценьнем грэблівасьці). Паняцьце «народ» у сацыяльных вымерах рас-

---

[1] Вандич Пьотр. Ціна свободи. Історія Центрально-Східної Европи від Середньовіччя до сьогодення. Київ: Критика, 2004. С. 35.

падалася на дзьве складовыя часткі — уласна «народ», чэрнь і арыстакратыю, якая супрацьпастаўляла сябе «чэрні». У клясычным рымскім лексыконе *natio*, як і *gens*, супрацьпастаўлялася *civitas*. У гэтым сэнсе нацыі здаўна абазначалі супольнасьці людзей аднаго паходжаньня, не аб'яднаных у палітычную форму дзяржавы, не зьвязаных супольным асяродзьдзем пражываньня, супольнай мовай, звычаямі і традыцыямі.

У пару Сярэднявечча паняцьце этнічнасьці («gens») атрымала значэньне сваяцтва па бацькоўскай лініі (лат. «gentes» літаральна азначае «род»). Паняцьце *natio* ня значыла таго, што мы разумеем цяпер пад гэтым словам. Як паняцьце, якое абазначала супольнае паходжаньне і тэрыторыю, яно ахоплівала колькі нацыянальнасьцяў і ўжывалася стасоўна гільдыяў, карпарацыяў, унівэрсытэцкіх зьвязаў (студэнты падзяляліся на нацыі паводле рэгіёну свайго паходжаньня), фэадальных станаў. Крытэрам прыналежнасьці да сярэднявечнай нацыі былі таксама мова і дынастычная ляяльнасьць. Іх значнасьць зь цягам часу мянялася.

Наколькі няпэўнай была сувязь паміж мовай і нацыяй у той час, паказвае прыклад студэнтаў, якія пачынаючы з XIII ст. зьяжджаліся з усіх частак Эўропы ў заходнія ўнівэрсытэты і там дзяліліся на нацыі. Крытэрамі падзелу былі не рэгіёны паходжаньня, а мовы альбо моўныя групы, вылучэньне якіх часам ня мела аніякага навуковага абгрунтаваньня. У найстарэйшым у Эўропе Парыскім унівэрсытэце з 1249 г. вылучалася гальская нацыя — у якую ўваходзілі італьянцы, гішпанцы і грэкі, — нармандзкая, ангельская — у яе ўваходзілі немцы, палякі і скандынавы, — і, нарэшце, пікардыйская нацыя, названая паводле мовы, якая ў Парыжы тае пары ўважалася за зусім адрозную ад францускае і іншых падобных дыялектаў, кшталту бургундзкай, нармандзкай і валёнскай. Студэнты ўнівэрсытэту Арлеану сто год пазьней падзяляліся на дзесяць нацый: францускую, нармандзкую, пікардыйскую, аквітанскую, шампанскую, лятарынгскую, турэнскую, бургундзкую, шатляндзкую і «nation germanique», у якую залічалі студэнтаў са Сьвятой Рымскай імпэрыі, а таксама з Польшчы, Ангельшчыны, Даніі, Італіі і Далмацыі. Прынцып, згодна зь якім

быў зроблены падзел, выглядае на першы погляд незразумелым, аднак насамрэч ён быў даволі прагматычны: студэнтаў, якія прыбылі з бліжэйшых рэгіёнаў, цудоўна адрозьнівалі, таму што іх было шмат і іх трэба было падзяляць больш строга. Тых, хто прыбыў здалёк, было меней, таму дастаткова было адной ўсёахопнай катэгорыі[2].

У наваствораным Венскім унівэрсытэце вугорская «natio» распаўсюджвалася таксама на палякаў і чэхаў, а ў час Францішка Скарыны студэнты зь Вялікага Княства Літоўскага ў Балёньні ўтварылі цэлае селішча і належалі да «нямецкай нацыі»[3].

У пару Скарыны яшчэ не існавала нацыянальнае сьвядомасьці як масавага фэномэну (сам Скарына залежна ад абставінаў ідэнтыфікаваў сябе як літвін («Litphanus»), «русін» альбо «палачанін»). У той час было б ненатуральна, калі б людзі з розных геаграфічных тэрыторыяў, ня маючы рэальных супольных інтарэсаў, раптам пачалі б гуртавацца ў імя супольнае мовы — такая ідэя цалкам адсутнічала ў аграрным сьвеце і ўзьнікае толькі ў мадэрны час[4].

---

[2] Hagen Schulze. Staat und Nation in der europaeischen Geschichte. Muenchen: Verlag C.H. Beck, 1994. S. 118—119.

[3] Дварчанін І.С. Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве. Мінск: Навука і тэхніка, 1991. С. 26.

[4] Першыя фіксацыі сувязі паміж мовай і нацыянальнай сьвядомасьцю датуюцца канцом XII ст. Напрыклад, нацыянальная сьвядомасьць ангельцаў праявілася ўжо ў сярэдзіне XIV ст. У 1363 г. упершыню паседжаньне ангельскага парлямэнту было акрытае канцлерам на ангельскай мове, у 1366 г. па-ангельску ўпершыню быў выдадзены каралеўскі маніфэст, а ў 1399 г. кароль Генрых VI Лянкастэр прачытаў сваю тронную прамову перад парлямэнцкім сходам па-ангельску. У гэтым пераможным шэсьці ангельскае мовы першую ролю адыгрывалі практычныя рэзоны: падчас стогадовай вайны выявілася перавага ангельскіх лучнікаў над францускім рыцарствам. Лучнікі сталі асноўным элемэнтам ангельскага войска, і афіцэры змушаныя былі авалодваць народнай мовай. У той жа самы час гарады, найперш Лёндан, дасягнулі буйнога эканамічнага ўплыву; купцы гаварылі па-ангельску, а гарады былі прэзэнтаваныя ў парлямэнце. Гэтыя прычыны ўзмацняліся ўсьведамленьнем таго, што ангельскую ідэнтычнасьць варта ўмацоўваць насуперак францускай у тым ліку і з дапамогай мовы. Дзякуючы гэтаму ўзьнікла адносна

У фэадальных грамадзтвах «нацыю» складала толькі іх верхавіна: арганізаваныя ў гарызантальныя страты нешматлікія ўплывовыя эліты, што ўлучалі касты вайскоўцаў, бюракратаў, сьвятароў і арыстакратаў, якія «выкарыстоўваюць культуру — сваю культуру, каб адасобіць сябе ад астатняга грамадзтва» (Э. Сьміт). Калі ў 1520 г. Лютэр зьвярнуўся да «Хрысьціянскага дваранства нямецкай нацыі», дык пад нямецкай нацыяй ён разумеў няйначай як нямецкую шляхту. Дамадэрная француская нацыя ўлучала толькі тых індывідаў, якія знаходзіліся ў *status politicus*, г.зн. займаліся палітычнай дзейнасьцю, складаючы атачэньне караля альбо баронячы свае станавыя інтарэсы. Нямецкая нацыя складалася з імпэрскай шляхты (Reichsadel), імпэрскай царквы (Reichskirche) і імпэрскіх гарадоў (Reichsstaedten), якія былі разам прэзэнтаваныя ў Райхстагу. Ангельская нацыя была прэзэнтаваная ва Ўэстмінстэрскім парлямэнце, француская — у Генэральных штатах. У заходнім сьвеце з канца Высокага Сярэднявечча па канец XVIII ст. дзейнічала правіла: нацыю складаў ня ўвесь народ, а ягоная пануючая, палітычна рэпрэзэнтацыйная праслойка.

У такім грамадзтве культура альбо гарызантальная, як сацыяльная каста, альбо вэртыкальная, то бок разьмяжоўвае мясцовыя грамады, а групавыя формы ідэнтычнасьці грунтуюцца на генэалягічных мітах і рэлігійных сымбалях. У самой сацыяльнай сыстэме існуюць герархічна падначаленыя падсыстэмы, а таксама асаблівыя, сакралізаваныя і выведзеныя за межы будзённага розуму зьявы. Сучаснасьць наўрад ці адрозьніваецца ад мінулага і будучыні. Людзі, улучаныя ў сямейнае, сельскае і мястэчковае асяродзьдзе і бесьперапынныя пэрыяды сельскагаспадарчае вытворчасьці, на-

---

замкнёная ангельская моўная прастора, якая ахоплівала ня толькі простых людзей, але і шляхту, парлямэнт, каралеўскі двор.

Hagen Schulze. Staat und Nation in der europaeischen Geschichte. Muenchen: Verlag C.H. Beck, 1994. S. 129.

У сярэдзіне XVI ст. ангельская мова стала абавязковай у набажэнствах. У адрозьненьне ад Шылера, Шэксьпір ужо два стагодзьдзі да яго цьвёрда ведаў, дзе знаходзіцца ягоная краіна.

ўрад ці пераживалі працэсы чаргаваньня гістарычных эпох. Чаканая будучыня была паўтарэньнем мінуўшчыны, таму будучы парадак абавязкова быў «добрым старым парадкам».

Сацыяльная ідэнтыфікацыя ў такім грамадзтве мае большую вагу за нацыянальную. Большае ў параўнаньні з усьведамленьнем нацыянальнае прыналежнасьці значэньне мелі і іншыя тыпы «прыналежнасьці» — сямейнае, прафэсійнае і г.д.[5]. На працягу апошніх стагодзьдзяў зьмянілася не намэнклятура паказьнікаў, на падставе якіх адбываецца самаідэнтыфікацыя індывіда (мова, пол, канфэсія, сям'я, прафэсія і г.д.), а адносная важнасьць гэтых паказьнікаў: «этнічнасьць стала для пераважнай большасьці грамадзян з інфармацыйна насычаных грамадзтваў гэткай бягучай ідэнтычнасьцю...»[6].

Крытэрам прыналежнасьці да нацыі Рэчы Паспалітай былі не этнічнасьць (*gens*), мова альбо веравызнаньне, але дынастычная лаяльнасьць. Нацыю (*natio*) Рэчы Паспалітай складала польская і літоўская (апошняя часта мела славянскае этнічнае паходжаньне) шляхта[7], якая складала прыблізна ад 6 да 8 адсоткаў усяго насельніцтва і якая саступала колькасьцю ў Эўропе толькі гішпанскім ідальга.

---

[5] Кінан Е. Російські історичні міфи. К.: Критика, 2001. С. 69.

[6] Тамсама.

[7] У прадмове да трэцяга выданьня «Літоўскага статуту» (1588) літоўскі падканцлер Л. Сапега беспасярэдне зьвязваў паняцьце «польскага і літоўскага народу» з «слаўнымі і шляхетнымі панамі»: «Мы, гаспадар, знаючы быці павіннасьць нашу, іж есмо тым паньствам, на каторых нас Пан Бог з ласкі і волі сваяе сьвятое за дабравольным абудвух народаў Кароны польскае і Вялікага Князьства Літоўскага абраньнем пасадзіці рачыў павіньні права вольнасьці і свабоды іх ня толька цэла і непарушна дзяржаці, але што бы наболей прымнажаці, справядлівасьць і абарону чыніці, помнечы тэж і на то, яко тые абадва слаўныя народы, польскі і літоўскі, апусьціўшы многа ***іншых слаўных і зацных паноў***, каторыя се а тыя паньства зь вялікімі абятніцамі не адно прымнажэньня праў, свабод і вольнасьцей шляхецкіх, але расшырэньня тых паньств і прыбаўленьня ім многіх пажыткаў старалі...» (вылучана намі. — Аўт.).

Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск: Беларуская савецкая энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1989. С. 42—43.

Рэч Паспалітая была рэспублікай, на чале якой стаяў кароль, але рэальны сувэрэнітэт належаў парлямэнту. Рускі народ афіцыйна ня быў прызнаны нацыяй, што выклікала палітычныя крызісы і стала адной з прычынаў краху гэтай станавай дзяржавы з парлямэнцкімі інстытуцыямі. Мяшчане і сяляне да такой «дамадэрнай» нацыі не належалі, у іх адсутнічала нацыянальная ідэнтычнасьць і пачуцьцё прыналежнасьці да пэўнай нацыянальнасьці[8].

У адрозьненьне ад Чэхіі, Швэцыі і Нарвэгіі і шэрагу нямецкіх княстваў, дзе палітычная нацыя, якая ахоплівала станы шляхты, сьвятарства, мяшчан і рыцараў[9], была пашырана шляхам залічэньня ў яе самых сьвядомых сялян[10], у ніжняйгасподзе Сойму Рэчы Паспалітае не было прэзэнтавана духавенства, а мяшчанства — толькі сымбалічна (адзіны пасол ад Кракава паддаваўся абструкцыі з боку шляхты).

«Палітычная нацыя» Рэчы Паспалітай была яе сувэрэнам і валодала такімі правамі, як асабістая свабода, манаполія на зямельную ўласнасьць і ўлада над сялянамі, свабода выражаць і адстойваць свае інтарэсы з дапамогай дзяржаўных інстытутаў.

У адрозьненьне ад другіх краінаў Эўропы, дзяржаўная служба не спрыяла атрыманьню шляхецтва («noblesse de robe»). Доступ у гэтую групу быў абмежаваны (у першай палове XVII ст. нават кароль згубіў права надаваць шляхецтва), і яна станавілася ўсё больш замкнёнай кастай, якой да таго ж фармальна было заба-

[8] Тое, што, прыкладам, у канцы XVI ст. першы рэктар віленскай акадэміі П. Скарга падкрэсьліваў, што польскія сяляне належалі да нацыі, не азначала наяўнасьці ў апошніх нацыянальнай сьвядомасьці.

[9] Фэномэн рыцарства ў Рэчы Паспалітай адрозьніваўся ад заходнеэўрапейскага. Акурат практыка наданьня шляхецтва за вайсковыя заслугі прывяла да сытуацыі, калі ў Рэчы Паспалітай быў адзін з самых шматлікіх у Эўропе станаў рыцараў: цэлыя селішчы атрымлівалі шляхецтва, выставіўшы добра прыстасаваную для вайны ў мясцовых умовах лёгкую кавалерыю.

[10] А значыць, сяляне мелі ў тых краінах больш асабістых і эканамічных правоў, чым прыгонныя ў Рэчы Паспалітай.

ронена займацца гандлем і рамёствамі. Аднак у краіне не было геральдычнай гасподы, і самавольнае наданьне сабе шляхецкага статусу было, праўдападобна, досыць пашыранай зьявай[11].

Ці азначае гэта, што палітычную нацыю Рэчы Паспалітай складалі выключна згаданыя катэгорыі? У літаратуры паняцьце «obywatel» часам датыкала і мяшчанаў. Тэрмін «naród szlachecki» ужываўся ня толькі для характарыстыкі шляхецкай нацыі, але таксама для азначэньня таго, што чалавек нарадзіўся шляхціцам, а не атрымаў гэты статус. Аналіз створаных у XVI—XVIII ст. у Рэчы Паспалітай крыніц ня сьведчыць пра выразнае разуменьне «natio» як палітычнай альбо грамадзянскай нацыі і «gens» як этнакультурнай групы і яшчэ менш — пра герархічныя суадносіны паміж імі.

Асноўнай крыніцай дамадэрнага нацыяналізму пануючай нацыі Рэчы Паспалітай была Каталіцкая Царква і рэлігія, дарма што дамадэрныя інтэлектуалы — паэты, кніжнікі і духоўнікі — браліся за разьвіцьцё літаратурных моваў і літаратур, якія пачыналі праводзіць культурныя межы ў супольнай палітычнай прасторы. Гэты інстытут займаў цэнтральнае становішча ў сярэднявечным грамадзтве і адрозьніваўся ад іншых інстытутаў сваёй трансцэндэнтальнай і ўнівэрсальнай прыродай. Быўшы часткай фэадальнай структуры палітычнага і эканамічнага панаваньня, царква была духоўным настаўнікам і правадыром, кантралявала адукацыю, фармавала сьветагляд масаў і часам нават прэтэндавала на вярхоўную палітычную ўладу. (Дарэчы, праграма рэлігійнай гамагенізацыі пазьней аслабіць і без таго слабую дзяржаву.)

Людзі нешляхетнага паходжаньня падпарадкоўваліся фэадалу, дзяржаве альбо царкве і працавалі на іхных уладаньнях. Яны ня мелі права на самакіраваньне, але ў той жа час былі адзіныя ў краіне падаткаплатнікі. Тым ня менш, ідэя перадвызначанай з нараджэньня няроўнасьці людзей уважалася ўсімі пластамі непрывілеяванага насельніцтва натуральнай.

[11] Вандич Пьотр. Ціна свободи. Історія Центрально-Східної Европи від Середньовіччя до сьогодення. Київ: Критика, 2004. С. 81 і далей.

(Каталіцкая Царква асьвячала паняцьце нацыянальнасьці, культывуючы ідэал абранага народу. Яна дазволіла на выкарыстаньне шэрагу народных моваў, і царкоўнае вучэньне ў некаторых выпадках стала нацыянальным. У выніку зьявілася простая думка: кожная нацыя праўдзівых хрысьціян можа быць абрана Богам як старадаўнія жыды.)

Сьведчаньнем прывабнасьці пануючай нацыянальнай ідэнтычнасьці было прыняцьце ўсімі магнацкім радамі ВКЛ ужо ў XVII ст. польскай ідэнтычнасьці. Палянізацыя таксама часткова закранула сярэднюю шляхту і найвышэйшае духавенства. Гэтыя пласты рэалізаваліся як сацыяльныя групы, якія ігнаравалі этнічныя інтарэсы на карысьць палітычных альбо канфэсійных, і станавіліся часткай палітычнай нацыі Рэчы Паспалітай, якая, нягледзячы на свой шматэтнічны характар, станавілася польскай паводле поглядаў. Тэрмін «польскі» атрымаў падвойнае значэньне. Ён азначаў этнічных палякаў, а таксама ўсіх жыхароў Рэчы Паспалітай, незалежна ад іх паходжаньня або мовы — падобна таму, як паняцьце «брытанскі» ўлучала ангельскае, шатляндзкае і валійскае. (Памфлет «Ці могуць палякі вярнуць сабе незалежнасьць?», напісаны ў 1800 г. пад уплывам Касьцюшкі, гаварыў пра 16 мільёнаў палякаў, безумоўна, разумеючы пад гэтым тэрмінам усіх жыхароў тады ўжо падзеленай Рэчы Паспалітай.)

Палянізацыя арыстакратыі ў XVI—XVII ст. прывяла да сацыяльнага разьмежаваньня «рускага народу», зь якога пазьней узьнікнуць украінская і беларуская нацыі. Гэта істотна ўскладніла разьвіцьцё ўкраінскага і беларускага нацыяналізмаў, бо нацыянальнае адчужэньне ахапіла акурат тыя сацыяльныя групы, якія паводле свайго статусу мусілі былі стаць рухальнай сілай мадэрнага нацыяналізму.

У расейскай гістарыяграфіі XIX ст. гэты працэс апісваўся як аслабленьне імкненьня «заходнерускай арыстакратыі» падтрымліваць «рускую веру і народнасьць». Як што цэнтар дзейнасьці гэтай арыстакратыі быў не на Русі, а пры двары Кароны Польскай, яна імкнулася зраўняцца з польскай арыстакратыяй; і тым самым

«рускія» інтарэсы станавілася для яе правінцыйнымі і ніжэйшымі інтарэсамі[12].

Аднак у пытаньнях веры і мовы рэчаіснасьць была нашмат больш амбівалентная. Дыфэрэнцыяцыя моўных герархіяў датычыла хутчэй функцыянальных абсягаў выкарыстаньня рускай мовы, а ня ейнага сацыяльнага прэстыжу. Таму выцясьненьне рускай мовы з пэўных сфэраў ня мела *a priori* разбуральнага значэньня для «рускага народу».

Мадэрная ўкраінская ідэя ўзьнікае там, дзе ўкраінская мова захавала поліфункцыянальны статус, г.зн. у рэгіёнах, якія адпалі ад Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVI ст. і сфармавалі новую палітычна-сацыяльную мадэль у выглядзе казацкай Гетманшчыны. Акурат гэты і памежныя рэгіёны Рэчы Паспалітай уяўлялі сабой вынятак у раньнемадэрнай гісторыі гэтай дзяржавы: дзеля адсутнасьці рускай дзяржавы тут аб'ектам палітычнай ляяльнасьці была не айчына альбо дзяржава, але «народ»[13].

(Нядаўнія дасьледаваньні паказваюць, што формула *gente Ruthenus, natione Polonus*, якая выкарыстоўваецца для азначэньня шляхты беларускага альбо ўкраінскага паходжаньня і польскай паводле нацыянальнасьці альбо палітычнай ляяльнасьці, ёсьць пазьнейшым вынаходам. Яна ўзьнікла толькі на пачатку XIX ст., каб навязаць украінцам Галіччыны, у тым ліку й шляхце, польскую ідэалягічную айчыну.)

Дарма што ў момант свайго краху Рэч Паспалітая мела багатыя культурныя і духоўныя сувязі з захадам эўрапейскага кантынэнту, яна заставалася «аддаленай культурнай правінцыяй рамана-германскай Эўропы»[14].

---

[12] Соловьев С.М. История России с древнейших времен. Кн. 4. Т. IX. Москва: Госполитиздат, 1961. С. 378.

[13] Якавенка Н. Нічога ня мае быць дарожшага над вольнасьць // ARCHE. 2003. № 24. С. 85.

[14] Шпорлюк Р. Націоналізм після комунізму: Росія, Україна, Білорусь та Польща // Імперія та нації з історичного досвиду України, Росії, Польщи та Білорусі. Київ: Дух і літера, 2000. С. 189.

Гэтая правінцыйнасьць звычайна тлумачыцца геапалітычнымі, эканамічнымі і культурнымі прычынамі: занятая абаронай ад швэдзкіх набегаў, войнамі з Турэччынай, Масквой і казакамі, Рэч Паспалітая прапусьціла эўрапейскі інтэлектуальны пераварот XVII ст. Адцяпер яна стала пэрыфэрыйнай часткай кантынэнту, асуджанай на залежнасьць ад заходніх тэхналёгіяў, эканамічных і палітычных мадэляў, інтэлектуальных адкрыцьцяў, ведаў, ідэй і мастацкіх стыляў[15].

Палітычная культура Рэчы Паспалітай першай паловы XVIII ст. выглядала як «экзатычны анахранізм». Мала таго, што ў краіны адсутнічала нармальнае сталае войска, падаткі і бюракратыя (тры складнікі, неабходныя для мадэрнізацыі); сярод шляхты панавала думка, што яны зусім і не патрэбныя. Заходнія палітычныя ідэі практычна не закранулі мяшчанства, і з гэтага гледзішча патэнцыйным або рэальным трэцім станам у францускім разуменьні была шляхта.

У сельскай мясцовасьці захоўвалася жорсткая прыгонная сыстэма, у гарадох працягвалі існаваць гільдыі. Шляхецкія маёнткі складалі базавы ўзровень дзяржаўнага кіраваньня, падаткаабкладаньня і судаводзтва. З пыхлівых, вульгарных і ганарыстых польскіх магнатаў сьмяялася ўся Эўропа. Культурная і эканамічная адсталасьць, унутраныя палітычныя супярэчнасьці ў спалучэньні з вонкавай агрэсіяй урэшце прывялі да зьнікненьня Рэчы Паспалітай з палітычнай мапы тагачаснай Эўропы.

Напярэдадні падзелаў нацыяй сябе ўсьведамлялі эліты, што кіравалі краінай. Яны ўжо тады валодалі польскай ідэнтычнасьцю, усьведамлялі шэраг нацыянальных каштоўнасьцяў і мелі адміністрацыйныя, інстытуцыйныя і іншыя магчымасьці для таго, каб даць старт нацыянальнаму праекту. Рэч Паспалітая была шматмоўнай краінай, а люд, што не вызнаваў каталіцызму рымскага абраду, складаў блізу 5 з 12 мільёнаў жыхароў краіны. Таму крытэрам нацыянальнасьці быў абраны палітычны, заснаваны

[15] Єдлицкий Є. Національні периферії европейської цивілізації // Критика. 2004. № 9—10. С. 10—11.

на мясцовай традыцыі і сугучны з ідэямі Асьветніцтва, якія прыходзілі пераважна з Францыі.

Апублікаваныя ў 1772 г. «Заўвагі аб кіраваньні Польшчы» Русо пад пазычаным з прамовы польскага палітыка эпіграфам «Я аддаю перавагу небясьпечнай свабодзе перад пакорным рабствам» ужо ў 1789 г. былі перакладзеныя на польскую мову. Кніга мела ня толькі асьветнае, але і тэрапэўтычнае значэньне: зь яе польскі чытач мог даведацца, што нацыя, дзякуючы вялікай палітычнай значнасьці сваёй культуры (мовы, гісторыі і звычаяў), можа перажыць чужое панаваньне ва ўмовах безьдзяржаўнасьці. Нацыянальную сьвядомасьць можна ўмацаваць з дапамогай разгалінаванай сыстэмы народнай асьветы: «Вы ня здолееце перашкодзіць вашым ворагам праглынуць вас, але калі вы забясьпечыце тое, каб аніводзін паляк ня стаў расейцам, я гарантую: Расеі ніколі не заняволіць Польшчы»[16].

У канцы XVIII ст. нацыя Рэчы Паспалітай, як і маларасійская казацкая, пачынае губляць свой шляхецкі характар і набываць мадэрную форму. Аднак у грамадзкім абыходку тэрміналёгія заставалася невыразная.

Хоць польскі філёзаф часоў Асьветніцтва Ф. Язерскі адрозьніваў «нацыю» ад «дзяржавы» («нацыю» і «ўрад нацыі») на падставе «відавочнасьці досьведу» італьянскай нацыі, зьмешваліся нават такія тэрміны, як стан і дзяржава (у польскай мове Злучаныя Штаты атрымалі назву *Stany Zjednoczone*). Падзелы краіны прыпынілі працэс нацыятварэньня і, як сьцьвярджаў лорд Эктан, прывялі да зьяўленьня ў Эўропе тэорыі нацыянальнасьці.

Кульмінацыяй польскага нацыятварэньня ў XVIII ст. была Канстытуцыя 3 траўня 1791 г., якая сыгналізавала пра пераход ад станавага да клясавага грамадзтва. Старая шляхецкая палітычная нацыя ператваралася ў палітычную нацыю грамадзянаў, якія валодаюць пэўным маёмасным цэнзам. Адначасова быў зацьверджаны Статут гарадоў, які распаўсюджваў на жыхароў каралеўскіх

[16] Гл. Шпорлюк Р. Досліджуючи драму історії, або Національні шляхи до сучасности // Зустрічі. 1991. № 2. С. 76—82.

гарадоў права абароны ад самавольнага арышту (neminem captivabimus), права валодаць зямлёй, абмежаванае прадстаўніцтва ў сойме, уводзіў муніцыпальнае самакіраваньне і спрашчаў набыцьцё шляхецкага статусу.

Канстытуцыя 3 траўня была прынятая ад імя нацыі і абвяшчала, што ўся ўлада паходзіць ад нацыі. Сялянства было названае яе «самай шматлікай часткай». Безьзямельную шляхту, якая здаўна складала магнацкую кліентэлю, пазбавілі права голасу ўвядзеньнем маёмаснага альбо фінансавага цэнзу.

Канстытуцыя не адкінула канцэпцыі грамадзкіх станаў, але сьцьвярджэньнем, што ўсе яны ствараюць нацыю, надавала паняцьцю «нацыя» мадэрнае значэньне.

Аднак крах дзяржаўнасьці ў выніку падзелаў краіны перашкодзіў пераўтварэньню ўсяго ейнага насельніцтва ў мадэрную польскую нацыю.

## МАДЭРНЫЯ НАЦЫІ: ДЗЬВЕ ЭЎРАПЕЙСКІЯ ІДЭІ

*У той час як продкі не перажывалі нічога большага за вайну, тры апошнія пакаленьні перажылі бясконца больш разнастайны досьвед, а менавіта ўзьнікненьне новых прынцыпаў жыцьця, новую масавую дзяржаўную адукацыю, імклівыя зьмены ўсеагульных абычаёў, культуры і літаратуры. Узрушэньні жыцьця, адбытыя, напрыклад, у пару рэфармацыі і каляніялізму, — нішто ў параўнаньні з нашымі.*

Якаб Буркгарт. 1871.

Паняцьце нацыі як супольнасьці арыстакратаў, аб'яднаных ляяльнасьцю да пэўнай палітычнай улады, і якая не ўлучае сялянства і іншых «нізкіх» сацыяльных групаў, пачало перажываць у Заходняй Эўропе крызіс раней, чым у Рэчы Паспалітай напярэдадні яе краху. Ён суправаджаўся зьмяненьнем функцыянальнай ролі культуры грамадзтва. Яна перастала мацаваць існую дагэтуль станавую герархію зь яе жорсткімі, абсалютызаванымі і непераадольнымі сацыяльнымі адрозьненьнямі, г.зн., паводле Гелнэра, выкарыстоўвацца найперш дзеля таго, каб вылучаць прывілеяваныя групы, падкрэсьліваць іх выключнасьць і права на ўладу, узмацняючы іх харызму і мінімізуючы небясьпеку парушэньня статусу. Больш за тое, з канца XVIII ст. у тагачасным «цывілізаваным сьвеце» становішча, калі статус вызначаўся паводле нараджэньня, а розьніца ў статусе суправаджаецца розьніцай у культуры, пачынае лічыцца ненармальным.

Санкцыяваная грамадзтвам сыстэма адукацыі накіроўваецца на масавае выхаваньне сьвядомых і дзейных грамадзян, якія актыўна ўплываюць на разьвіцьцё грамадзтва, якое цяпер не дапускае адвольнага завышэньня статусу якой-небудзь падгрупы грамадзян на грунце яе культурнай перавагі.

Калі пры фэадалізьме грамадзтва кансалідавалася герархічнай структурай, а суб'ектам гісторыі выступала не асоба, але род, а сацыяльная мабільнасьць была па-за законам, то ў мадэрны час ролю злучальнага элемэнту пачынае выконваць культура, якая эмансыпуецца ад сваёй ранейшай вузкай функцыі захавальніцы этнічнай гамагеннасьці. Пры фэадалізьме сацыяльная структура разумелася як герархічная сыстэма грамадзкіх роляў і вызначала жыцьцё асобы ў такой высокай ступені, што тая асоба не ўважала культурныя адрозьненьні за істотныя. У мадэрных грамадзтвах клясавыя бар'еры значна больш пранікальныя, сацыяльныя ролі не перадаюцца ў спадчыну, і дзеля гэтага сацыяльная мабільнасьць рэзка ўзрастае.

Зусім іншы характар пры фэадалізьме мае і ступень пранікненьня дзяржавы ў жыцьцё грамадзтва. Яшчэ на пачатку XVIII ст. дзяржава была вымушана дзяліць свае палітычныя функцыі з

царквой, арыстакратыяй і іншымі карпарацыямі. Цэлыя сфэры грамадзкага жыцьця ня ведалі прысутнасьці дзяржавы альбо іншых цэнтральных палітычных сіл. У сфэру дзяржавы ўваходзіла дыпляматыя і вайна, а ўнутры краіны толькі бязладнае адміністраваньне вышэйшых узроўняў правасудзьдзя і падаўленьня (М. Ман). Толькі ў саюзе з царквой манархі маглі пранікнуць у розныя сфэры грамадзкага жыцьця, што віравала за іх дзьвярамі. Мадэрная ж дзяржава становіцца ўсёпранікальнай структурай, якая легітымізуе сябе спасылкай на нацыю.

Апрача таго, эканамічнае ўмацаваньне трэцяга стану ламала *status quo* ў эканамічным жыцьці, і ягоная культура пастулова выцясьняла культуру арыстакратыі. У краінах накшталт Брытаніі, Францыі і Злучаных Штатаў, дзе трэці стан набраў сілу ўжо ў XVIII ст., нацыяналізм паказаў сябе збольшага ў палітычных і эканамічных вымерах (хаця ягоныя праявы гэтым не абмяжоўваліся). Там жа, дзе трэці стан быў слабы і на пачатку XIX ст. знаходзіўся ў зародкавым стане, як у Нямеччыне, Італіі і заходніх славян, нацыяналізм паказаў сябе пераважна ў культуры.

Хоць прынята ўважаць, што француская нацыя інстытуцыянальна, культурна і палітычна існавала ў сьвядомасьці і паводзінах адукаваных клясаў прынамсі з XVII ст., напярэдадні Францускае рэвалюцыі паняцьце «нацыі» мела дамадэрнае сэнсавае напаўненьне. Гэта вынікае, напрыклад, з «Энцыкляпэдыі» Дыдро і Далямбэра, напісанай і выдадзенай у пэрыяд паміж 1751 і 1766 гадамі. У ёй народ выступае, па сутнасьці, вузкай сацыяльнай праслойкай («сама кляса людзей, якія складаюць народ, усё больш і больш звужаецца... Цяпер гэтая частка нацыі абмяжоўваецца работнікамі і земляробамі»)[1].

Яшчэ Мантэск'ё катэгарычна заяўляў, што нацыя складаецца з шляхты і духавенства. У антрапалёгіі ягонага сучасьніка І. Канта таксама ўжываўся дамадэрны панятак «нацыі» як «спосабу паз-

[1] Философия в «Энциклопедии Дидро и Даламбера». Москва: Наука, 1994. С. 344.

наньня ўнутранай сутнасьці людзей на грунце іх вонкавай сутнасьці» («Art, das Innere des Menschen aus dem Äusseren zu erkennen»)[2], а таксама як «характарыстыка народу». «Народ» (populus) — «гэта разьмешчаная ў адной мясцовасьці маса людзей, якая ў пэўным сэнсе складае адзінае цэлае» («die in einem Landstrich vereinigte Menge Menschen, in so fern sie ein Ganzes ausmacht»). Паняцьце народу (populus) у разуменьні Канта — зборнае, яно складаецца з «нацыі» (gens) і «чэрні» (vulgus), прычым чальцы апошняй з прычыны сваіх «процізаконных» («gesetzeswidriges») паводзінаў ня могуць быць грамадзянамі. Нацыя па сутнасьці ў Канта азначае толькі тую частку народу, якая дзякуючы свайму «грамадзкаму становішчу ўваходзіць у грамадзкае цэлае» («gemeinschaftliche Abstammung zu einem bürgerlichen Ganzen erkennt»)[3].

Нацыя як маральная катэгорыя стала асноўнай ідэяй, якую францускія асьветнікі супрацьпаставілі ранейшай ідэі дзяржавы, легітымнасьць якой мела трансцэндэнтнае паходжаньне. У выдадзенай у студзені 1789 г. брашуры пад назвай «Што такое трэці стан» абат Сіес выставіў новую, рэвалюцыйную ідэю нацыі: з трох станаў, якія ўтвараюць грамадзтва, г.зн. духавенства, шляхты і «трэцяга стану» — так званых простых людзей, — дабрабыт усяго грамадзтва забясьпечваецца толькі працай трэцяга стану. З гэтага вынікае: першы і другі станы ня ёсьць часткамі нацыі, таму што не спрыяюць яе дабрабыту; нацыю складае толькі трэці стан, народ: «Што такое трэці стан? Усё! Нацыя — гэта супольнасьць аднадумцаў, якія падпарадкоўваюцца аднаму праву і рэпрэзэнтуюцца адным заканадаўствам»[4].

---

[2] Гл. Kant I. Schriften zur Anthropologie, Geschichtsphilosophie, Politik und Pädagogik. Hg. von Wilhelm Weischedel. Frankfurt am Main: Suhrkamp, 1993.

[3] Аднак Кант такі паўплываў на мадэрны нацыяналізм, вылучыўшы паняцьце аўтаноміі добрай волі асобы, якое пасьля пераасэнсаваньня было выкарыстана да культурных, найперш моўных супольнасьцяў, якія сталі разглядацца як асяродак культурнай своеасаблівасьці.

[4] Гл. Sieyés E. Qu'est-ce que le Tiers État? Préface de J. Tulard. Paris: PUF, 1982.

Толькі народ утварае нацыю і толькі гэты народ-нацыя можа ў далейшым легітымізаваць дзяржаву і ўладу. Гэтая новая нацыя кладзе пачатак усяму. Яе воля заўсёды законная, бо яна сама закон. Нацыя дае дзяржаве яе канстытуцыю, зь яе вырастаюць усе дзяржаўныя ўлады, нацыя ў выглядзе вольнага народу ёсьць сувэрэнам, што й зацьвердзіла дэклярацыя правоў чалавека і грамадзяніна 26 жніўня 1789 г.: «Нацыя ёсьць фундамэнтальнай падставай якога-любя сувэрэнітэту. Органы і індывіды ня маюць права ажыцьцяўляць уладу, калі яна не паходзіць ад народу».

Вось жа, легітымнасьць гэтай заснаванай на новай і больш абстрактнай форме сацыяльнай інтэграцыі «нацыі-супольнасьці» пераўзыходзіла легітымнасьць дзяржавы і выступала большым маральным аўтарытэтам у параўнаньні зь ёй. Пасьля францускай рэвалюцыі «нацыя-народ» як палітычная супольнасьць рашуча выцесьніла на другі плян дагэтулешнія маральныя аўтарытэты грамадзтва: манархію і царкву. Зьвязаныя зь імі міты і лаяльнасьці згасьлі. Улада, паступова вызваляючыся ад ранейшых рэлігійных забавязаньняў, стала інструмэнтам абароны калектыўных сьвецкіх і ўсё часьцей нацыянальных інтарэсаў (іх паняцьце акурат і зараджаецца ў гэтую пару), а адданасьць нацыі становіцца больш высокім абавязкам, чым лаяльнасьць фактычнай уладзе.

Іншымі словам, да францускай рэвалюцыі францускі нацыяналізм быў апазыцыйным рухам, накіраваным супраць дзяржаўнай улады, а паняцьце нацыі як сукупнасьці ўсіх палітычна актыўных грамадзян, у аснове якога ляжыць прызнаньне яе чальцамі прынцыпаў роўнасьці, свабоды і братэрства, раней ня мела якіх-колечы значных артыкуляцыяў у інтэлектуальным дыскурсе. Не існавала і «рэспубліканскага» міту дзяржавы, чыя легітымнасьць грунтуецца на дэлегаванай усім грамадзтвам уладзе. Паняцьце нацыі і нацыянальных інтарэсаў не выкарыстоўвалася і як інструмэнт легітымацыі бягучага палітычнага курсу альбо як падстава для дасягненьня адзінства і цэльнасьці дзяржавы. Калі да рэвалюцыі абсалютызм успрымаўся нават у інтэлектуальным асяродзьдзі як інструмэнт рацыянальнага ўпарадкаваньня сьвету, то пасьля яе нарожным элемэнтам уяўленьня

аб ідэальным сацыяльна-палітычным ладзе становіцца нацыянальная дзяржава, якая спалучыла рацыяналізм і ўнівэрсалізм Асьветніцтва і пазьнейшую веру рамантыкаў у народны дух.

Прынцыпы роўнасьці, свабоды і братэрства на аснове супольнага палітычнага волевыяўленьня ў Францыі сталі ўспрымацца як базіс адзінства ўсяго грамадзтва, чым не маглі быць нават такія сацыяльна рэлевантныя элемэнты, як культура, мова, этнічнае паходжаньне альбо нават супольная мінуўшчына. Многія пэрыфэрыйныя рэгіёны былі далучаныя да Францыі параўнаўча позна і таму мелі вялікія культурныя адрозьненьні. Дарэвалюцыйная Францыя, апрача ўсяго, не была і адзінай праўнай прасторай. На поўдні і на поўначы краіны існавалі розныя сыстэмы права і функцыянавалі розныя заканадаўствы.

Інтэлектуальныя наступствы Францускай рэвалюцыі для эўрапейскага мысьленьня можна фармуляваць наступным чынам: а) яна замацавала аўтарытэт асобы ў грамадзтве; б) выставіла на парадак дня пытаньне ўкараненьня сьветагляду новага тыпу — нацыянальнага сьветагляду; в) дала штуршок для стварэньня нацыяў у астатніх частках Эўропы[5].

Француская рэвалюцыя «вынайшла новы тып палітычнага дыскурсу і практыкі, якімі мы карыстаемся і цяпер», яна вывела «на гістарычную сцэну... практычны і ідэалягічны спосаб грамадзкай дзейнасьці, падобнага якому раней не існавала»[6]. Яна была ня столькі буржуазная, колькі нацыяналістычная, а яе самым важным наступствам было «зьяўленьне новай канцэпцыі і выхад на гістарычную сцэну нацыяналізму»[7].

Нованароджаны нацыяналізм быў «творам бяз аўтара» і ўзьнік хутчэй з вымогаў моманту і магчымасьцяў яшчэ не народжанай

---

[5] Забужко О. Філософія української ідеї та європейський контекст: Франківський період. Київ: Наукова думка, 1992. С. 23.

[6] Шпорлюк Р. Комунізм і націоналізм. Карл Маркс проти Фрідріха Ліста: пер. з анг. Київ: Основи, 1998. С. 27.

[7] Тамсама. С. 148.

ідэалёгіі (якая, гаворачы словамі лорда Эктана, супрацьстаяла тэорыі, што ў нацыі як супольнасьці людзей няма супольных правоў), чым як вынік сыстэматычных інтэлектуальных высілкаў нейкага тэарэтыка.

Француская рэвалюцыя запачаткавала ня толькі новую ідэалёгію, але і новы разнавід калектыўнай ідэнтычнасьці і нацыі. Яе новае паняцьце не было зьвязана толькі з такімі прыкметамі, як супольная культура, мова, паходжаньне альбо нават гісторыя. Гэта не нямецкі *Volk*, аб'яднаны адзінствам расы альбо культуры і да якога індывіды належаць незалежна ад уласнай волі. Наадварот, гэта цела, створанае сьвядомымі грамадзянамі, якое існуе толькі дзякуючы іх добраахвотнаму ўдзелу ў своеасаблівай грамадзкай дамове. Іх лучыць ня раса альбо гісторыя, але правы і абавязкі[8].

Так зразуметы народ (а не шляхецкая нацыя, як яшчэ стагодзьдзе таму) ёсьць сувэрэнам, і яго асобныя чальцы не падданыя, але «грамадзяне». Праўная і рацыянальная ідэя грамадзянства была самай глыбокай ідэяй Француская рэвалюцыі[9].

Каб лепш зразумець інтэлектуальны кантэкст фармаваньня новага паняцьця нацыі ў Францыі, варта зьвярнуць увагу на дзьве канкурэнтныя палітычныя плыні таго часу і іх ідэалёгіі. У адрозьненьне ад сваіх палітычна памяркоўных праціўнікаў, жырандыстаў, якія выступалі за пашырэньне правоў і паўнамоцтваў рэгіёнаў і за фэдэрацыйны лад дзяржавы, радыкальна настроеныя якабінцы ігнаравалі любыя лякальныя адрозьненьні і адмаўлялі яшчэ жывым рэгіянальным культурам у праве на існа-

[8] Водгульле гэтых дзьвюх канцэпцыяў нацыі можна бачыць у сучаснай палітыцы натуралізацыі імігрантаў у Францыі і Нямеччыне: калі ў першым выпадку падставай для атрыманьня грамадзянства ёсьць працяглае пражываньне ў краіне, то ў другім — этнічнае паходжаньне, дзеля якога турэцкім гастарбайтэрам адмаўлялі ў грамадзянстве, а этнічныя немцы з былога СССР атрымлівалі яго без асаблівых турботаў.

[9] Гл. Palmer R.R. Man and Citizen. Applications of Individualism in the French Revolution // Essays in Political Theory, presented to G.H.Sabine. New York, 1948.

ваньне. Для якабінцаў прынцып палітычна сьвядомага грамадзтва роўных з гледзішча закону грамадзян — незалежна ад сацыяльнага і матэрыяльнага стану, паходжаньня, рэлігійных перакананьняў і культурных адрозьненьняў — не дапускаў стварэньня з боку меншасьцяў любых, ня кажучы ўжо пра фэдэрацыйныя, структур. Француская мова абвяшчалася «мовай свабоды і вызваленьня», у той час як мовы правансальцаў, баскаў, карсыканцаў, флямандцаў, эльзасцаў і іншых народаў Францыі заставаліся сродкам увекавечваньня «панаваньня фанатызму... папоў і арыстакратаў»[10].

Нацыя была вызваліцелькай ад фэадальнага рабства і носьбіткай культуры: толькі нацыянальная мова разглядалася як сапраўдная «культурная мова». Брэтонскую мову рэвалюцыянэры абвясьцілі мовай забабонаў, нямецкую — эміграцыі і антырэспубліканізму, а басконскую — мовай фанатызму. І на ўсіх іх разам начапілі бірку «барбарскіх жаргонаў» і «вульгарных дыялектаў».

Як вядома з гісторыі, якабінцы страцілі ўладу, але іх канцэпцыя пабудовы нацыі і дзяржавы перамагла. Ідэя цэнтралізаванай нацыянальнай дзяржавы адпавядала ідэі грамадзтва, заснаванага выключна на мэтафізычных вартасьцях роўнасьці і братэрства. Зь іншага боку, яна працягнула цэнтралізатарскія памкненьні манархаў і з гэтага гледзішча выражала імкненьне да палітычнага панаваньня: жыхары рэгіёнаў з ускраінаў не разумелі цэнтральнае мовы, і яе навязваньне дазваляла дасягнуць больш эфэктыўнай палітычнай мабілізацыі.

Такім чынам, з канца XVIII ст. «нацыя» пачынае ставіць супольныя палітычныя задачы і дае жыцьцё ідэі нацыянальнай місіі і пакліканьня (зрынаньне эўрапейскіх тыранаў і вызваленьне народаў Эўропы для француcкіх рэвалюцыянэраў-якабінцаў); нацыянальная дзяржава адцяпер ёсьць гарантам пра-

[10] Шпорлюк Р. Комунізм і націоналізм. Карл Маркс проти Фрідріха Ліста: пер. з анг. Київ: Основи, 1998. С. 148.

воў усіх, хто належыць да яе. Нацыя становіцца адзінай легітымнай крыніцай улады, і толькі той, хто належыць да яе, можа карыстацца свабодамі і правамі грамадзяніна. Свабода цяпер адносіцца да кампэтэнцыі грамадзтва, незалежнасьць якога адстойваецца не рукамі наймітаў, але крывёй «сыноў нацыі». Вайсковыя посьпехі францускай рэвалюцыйнай арміі паказваюць, што апэляцыя да рэвалюцыйнай салідарнасьці нацыі была ня толькі абстрактнай канструкцыяй, але і зброяй у палітычнай барацьбе, інструмэнтам пасьпяховай мабілізацыі масаў.

Рэзка ўзрастае роля нацыянальнай мовы як агульнапрынятага, агульнаўжывальнага і неабходнага сродку камунікацыі. Яе важныя якасьці — стандартызаванасьць, дакладнасьць і зразумеласьць, у адрозьненьне ад мовы мясцовых аграрных этнічных групаў, дзе працэс камунікацыі вызначаўся кантэкстам, тонам, мігамі, асобай, сытуацыяй. У дамадэрны час камунікацыя як такая не патрабавала дакладных формулаў. Зразумеласьць мовы была прывілеем царкоўнікаў, часткай іх карпарацыйнай таямніцы. У цесным сьвеце замкнёнай грамады моўная дакладнасьць была б прыкметай пэдантычнасьці, праявай непавагі, незразумелай і непрымальнай перашкодай[11].

Паводле іроніі лёсу, акурат рэфармацыя Марціна Лютэра, што выклікала міжкафэсійныя войны і тэрытарыяльны падзел і, як вынік, стварыла мноства культурных і палітычных цэнтраў, істотна замарудзіла выпрацоўку адзінай нямецкай культуры і нямецкае нацыятварэньне. Хоць у Нямеччыне ўжо ў XVII ст. былі заснаваныя таварыствы нямецкай мовы, якія ставілі на мэце яе разьвіцьцё і кшталтаваньне, а Ляйбніц і ягоныя аднадумцы пачыналі выкарыстоўваць нямецкую мову ў навуцы, адміністрацыі і выкладаньні, ва ўнівэрсытэтах панавала лаціна, а княскія

[11] Ґелнер Е. Нації та націоналізм; Націоналізм: Пер. з англ. К.: Таксон, 2003. С. 65.

двары і ўся адукаваная публіка да канца XVIII ст. гаварылі па-французску[12].

Двор нямецкага караля Фрыдрыха II гаварыў па-французску, а сам кароль гукаў па-нямецку з памылкамі. Толькі ў XVIII ст. нямецкія ўнівэрсытэты пачалі рыхтаваць столькі інтэлігенцыі, колькі спатрэбілася для зьмены культурнага становішча. У тую пару, г.зн. калі немцы не валодалі ні культурным, ні палітычным, ні рэлігійным адзінствам, прыкметай прыналежнасьці да нацыі пачынае разглядацца адзінства культурнай традыцыі, якое разумецца як адзінства сэкулярызаванай культуры, у прыватнасьці мовы[13].

Адначасова з абуджэньнем цікавасьці да ўласнай гісторыі, культуры і фальклёру немцы засвойваюць назоў Германія. Усе найлепшыя якасьці германскіх плямёнаў зьвязваюцца з сучаснымі немцамі, хаця на германскую спадчыну маглі прэтэндаваць ангельцы, нідэрляндцы і скандынавы (пазьней такі мэтад нацыятварэньня давядзе сваю жывучасьць на ўсходзе Эўропы). Акурат у сярэдзіне XVIII ст. былі выдадзеныя першыя зборнікі нямецкіх народных песень. Назіраўся надзвычайны рост кніжнай прадукцыі, асабліва публіцыстыкі. Паводле падлікаў бэрлінскага кнігагандляра Фрыдрыха Нікалая, у 1779 г. каля 20 тыс. чалавек ва ўсёй Нямеччыне ўдзельнічалі ў нацыянальным руху, г.зн. рэгулярна набывалі кнігі на нямецкай мове.

Гэты буйнамаштабны паварот да нямецкай гісторыі і культуры будзе паглыблены нямецкімі рамантыкамі, якія разам зь іншымі

[12] У эўрапейскіх унівэрсытэтах доўга захоўвалася лацінская мова выкладаньня: да пачатку XVIII ст. нацыянальныя мовы не выкарыстоўваліся ні ў водным зь іх, і ўлучна да канца XVIII ст. лаціна «захоўвала манаполію» на вялікую колькасьць унівэрсытэцкіх дысцыплін.

[13] Клопат аб нямецкай мове спалучаўся з імкненьнем разьвіваць нямецкую літаратуру і знайсьці свой асаблівы шлях (Sonderwege), незалежны ад клясыцысцкіх французскіх узораў. Дзякуючы крытыцы французскага клясыцызму і высокай ацэнцы твораў Шэкспіра адбывалася нацыянальная ідэнтыфікацыя нямецкіх эліт. Французскі клясыцызм абвяшчаўся «вычварным і штучным», а творы

прадстаўнікамі літаратурнай інтэлігенцыі ў гэты час становяцца фактычна на чале нямецкага нацыянальнага руху.

І ўсё ж напярэдадні Францускай рэвалюцыі на палітычна, рэлігійна і сацыяльна разьяднаных нямецкіх землях, што фармальна ўваходзілі ў «Сьвятую Рымскую імпэрыю германскай нацыі», не існавала дастатковых перадумоваў для росквіту мадэрнага нацыяналізму. У 1773 г. нямецкая нацыя па сутнасьці была не адзінай нацыяй, а «агрэгатам многіх нацыяў» (Х.-М. Віланд). Нямецкі нацыянальны рух абапіраўся толькі на вельмі вузкія пласты насельніцтва — на эліты грамадзтва.

«Сьвятая Рымская імпэрыя», якая, паводле трапнага выразу Вальтэра, не была ні «сьвятой», ні «рымскай», ні «імпэрыяй», была пакліканая сымбалізаваць адзінства германскай нацыі. Аднак ужо ў яе назьве існавала супярэчнасьць паміж хрысьціянскай традыцыяй трансцэндэнтнага разуменьня хрысьціянскага валадарства божага і зацяжным крызісам рэлігійнага адзінства ў нямецкіх княствах. Яшчэ адной прычынай нясьпеласьці нямецкага нацыяналізму ў канцы XVIII ст. была адсутнасьць моцнага цэнтру, вакол якога магла б зьяднацца нацыя:

> *Імпэрыя працягвала быць фокусам патрыятызму і народных пачуцьцяў, але была няздольная аб'яднаць краіну. У імпэрыі была традыцыя, але большасьць пазытыўных ас-*

---

Шэксьпіра — «натуральнымі і арыгінальнымі». Той, хто пісаў у другой палове XVIII ст. па-нямецку, рабіў гэта ня толькі таму, што гэтага вымагаў літаратурны рынак, а ў імя нацыі, дух якой лунаў над дзяржаўнымі межамі і адмяжоўваў немцаў ад францускай культуры. У 1785 г. адзін зь нямецкіх нацыянальных актывістаў выставіў патрабаваньне, што немцы не павінны больш «малпаваць чужыя моды».

Гл. Данн Отто. Нации и национализм в Германии. 1770—1990. Санкт-Петербург: Наука, 2003.

Нямецкая гістарычная драма палягала ў тым, што сьпярша мова і этнічная прыналежнасьць была спосабам «шляхетнай» барацьбы з вонкавым ворагам — францускім засільлем, але неўзабаве была скарыстаная супраць унутранага ворага — жыдоў (Э. Сьміт).

*пэктаў сацыяльнага жыцьця — адміністрацыйнае кіраваньне, гандаль, абарона і адукацыя — цалкам перайшлі пад кантроль княстваў. Нямецкай дынастыі, якая магла б факусаваць нацыянальныя пачуцьці, не існавала*[14].

Нямецкі нацыянальны рух ня мог прапанаваць узьнікаючай нацыі рэалістычнай схемы рэарганізацыі, а «фокусам грамадзкай думкі заставаўся мясцовы князь, а ня ўся нямецкая нацыя» (М. Г'юз). Таму ў канцы XVIII ст. у асяродзьдзі нямецкіх эліт пануе пачуцьцё разгубленасьці, выкліканае гамаваньнем нацыянальнай праграмы. Гётэ і Шылер пісалі ў сваіх датаваных 1796 г. «Ксэніях»:

*Deutschland? Aber wo liegt es? Ich weiss das Land nicht zu finden. Wo das gelehrte beginnt, hört das politische auf. Zur Nation euch zu bilden, ihr hioffet es, Deutsche, vergebens: Bildet, ihr könnt es, dafür freier zu Menschen euch aus».*

*(Нямеччына? Але дзе яна знаходзіцца? Я ведаю, што гэтую краіну не знайсьці. Там, дзе пачынаецца духоўнае, сканчаецца палітычнае. Стаць нацыяй дарма вы, немцы, спадзяецеся: станьце замест гэтага вольнымі людзьмі.)*

Ф. Шылер у паэтычным фрагмэнце «Нямецкая веліч» («Deutsche Groeße») (1797 альбо 1801 г.) таксама тонка ўлавіў гэтыя настроі. Адначасова ў яго гучыць пропаведзь нямецкага мэсіянскага паклІканьня («Наша мова авалодае сьветам»), якая будзе пазьней падхопленая і разьвітая І.-Г. Фіхтэ:

*Нямецкая імпэрыя і нямецкая нацыя — гэта дзьве розныя рэчы. Веліч немцаў ніколі не грунтавалася на асобе іх імпэ-*

[14] Hughes M. Nationalism and Society: Germany 1800—1945. London and Baltimore: Edward Arnold, 1988.

*ратара. Незалежна ад палітычнай вартасьці, немцы набылі ўласную вартасьць, і нават калі імпэрыя зьнікне, нямецкая годнасьць застанецца непахісная. Яны валодаюць маральнай веліччу, дзякуючы нацыянальнаму характару яны жывуць у культурнай прасторы, якая не залежыць ад яе палітычнага лёсу, і калі палітычная імпэрыя распадзецца, наша духоўнасьць стане яшчэ больш узвышаная і дасканалая. Наша мова авалодае сьветам. Мова — гэта люстэрка нацыі, і калі мы ўгледзімся ў гэтае люстэрка, то ўбачым, што нам адкрываецца вялікая цудоўная карціна саміх сябе.*

Француская рэвалюцыя 1789 г., а таксама ідэалягічны і вайсковы «экспарт» гэтай рэвалюцыі ў Эўропу пахаваў Сьвятую Рымскую імпэрыю і ўзмацніў першапачаткова культурны і апалітычны, «акадэмічны» (М. Ман) нацыяналізм у Нямеччыне і Аўстрыі. Пад іх уплывам узмацніліся нацыянальныя стэрэатыпы, цэлыя народы пачалі супрацьстаяць адзін аднаму. Мова стала асноўным сродкам адрозьненьня «нас», этналінгвістычнай супольнасьці, ад «іх», іншароднай палітычнай адміністрацыі, і тым самым падставай для вынаходу будучых нацыяў.

Палітычны крызіс і наступны за ім канчатковы распад імпэрыі зрабіў для нямецкай грамадзкай думкі і эліт актуальнай мадэрную канцэпцыю сувэрэнітэту. Нямецкая нацыянальная думка таго часу пераарыентуецца на нямецкія інтарэсы і мадэлі разьвіцьця. Гегель ставіць перад нямецкай палітыкай канкрэтныя патрабаваньні:

*Найважнейшае, з чаго складаецца дзяржава, а менавіта дзяржаўная ўлада, ажыцьцяўляецца імпэратарам і прадугледжвае ўзаемадзеяньне ўсіх частак (mit Mitwirkung der Teile errichten) грамадзтва... Існаваньне Германскай імпэрыі будзе магчыма толькі тады, калі будзе добра арганізаваная дзяржаўная ўлада і нямецкі народ ізноў будзе судакранацца зь імпэратарам і імпэрыяй.*

Гегель у гэтым фрагмэнце карыстаецца, па сутнасьці, мадэрным паняцьцем нацыі, зьвязаным зь дзяржавай (вызначанай як «увасабленьне маральнай ідэі») і з народам, прэзэнтаваным грамадзянамі, што ўзаемадзейнічаюць міжсобку. Ідэю пра нацыю як найвышэйшы маральны аўтарытэт (Nation als Verkörperung höchster Moralität) ён запазычвае ў францускіх асьветнікаў. Паводле яе, у дзяржаве разгортваецца «сусьветны дух» («Weltgeist»), і ўвасобленая ў дзяржаве ідэя дазваляе ажыцьцявіцца «нацыянальнаму духу» («Volksgeist»)[15]. Сусьветны дух не праяўляецца раўнамерна і адначасова ва ўсіх нацыянальных духах. Паводле Гегеля, існуюць народы, у якіх няма дзяржаваў, і таму як «род, арда, племя, статак і г.д.» яны стаяць на ніжэйшай ступені ў сусьветнай гісторыі. Цывілізаваныя нацыі ўважаюць іх за барбараў.

У «Лекцыях аб гісторыі філязофіі гісторыі» Гегель скептычна ацэньваў культурныя пэрспэктывы славянскіх нацыяў, намякаючы, што ўсе яны яшчэ недалёка сышлі ад барбарскага стану:

---

[15] Адным зь першых у нямецкай філязофіі апэраваць катэгорыяй «National-Geist» стаў філёзаф Ф.-К. фон Мозэр. Ягоная кніга «Пра нямецкі нацыянальны дух» («Von dem Deutschen National-Geist»), якая ўбачыла сьвет у 1765 г., пачыналася так:

> *Мы — народ з адной назвай і мовай, кіраваны адным Гаспадаром, вядзёны адзінствам, што абумоўлівае наш дзяржаўны лад, правы і абавязкі, зьвязаны зь Ім грамадзка значным інтарэсам да волі, неад'емны ад Яго больш чым тысячагадовым нацыянальным быцьцём для дасягненьня гэтай важнай мэты (auf Einer mehr als hundertjährigen Nationalversammlung zu diesem wichtigen Zweck vereinigt), сваёй сілай і магутнасьцю першая дзяржава ў Эўропе, чые каралеўскія кароны зіхцяць на нямецкіх галовах, і тое, як мы ёсьць, што стагодзьдзямі мы зьяўляемся загадкай палітычнага ўладкаваньня, здабычай суседзяў, прадметаў іх кпінаў, вылучае нас у гісторыі сьвету, нас, пазбаўленых адзінства, бясьсільных, дзеля нашай разьяднанасьці, дастаткова моцных, каб сябе шкадаваць, і слабых, каб сябе выратаваць, глухіх да гордасьці нашага імя, абыякавых да годнасьці законаў, раўнівых да нашага Гаспадара, што сее недавер паміж намі, непасьлядоўнымі ў прынцыпах, схільнымі ўжываць сілу ў іх ажыцьцяўленьні, намі, велічнымі і ўсё-ткі пагарджанымі, патэнцыйна шчасьлівым, але ў рэальнасьці вартым жалю народам.*

Гл. Eckstein K.F.C. v. Moser, Rechts- und Staatstheoretisches Denken zwischen Naturrecht und Positivismus. Gießen, 1973.

> *Славянскія нацыі займаліся земляробствам. Аднак такі стан рэчаў выклікае падзел [нацыі] на паноў і халопаў. Пры земляробстве пераважае пакарэньне прыроды; пры такой працы чалавечай дзейнасьці і суб'ектыўнай актыўнасьці знаходзіцца ўсё менш месца. Таму славяне марудней і цяжэй прыйшлі да фундамэнтальнага пачуцьця (Grundgefuehl) суб'ектыўнай самасьці, усьведамленьня агульначалавечых вартасьцяў, да таго, што мы раней называлі дзяржаўнай уладай, і яны ня могуць удзельнічаць ва ўзыходзячым сонцы (Рэфармацыі)*[16].

Народы, у якіх сусьветны дух не праяўляецца раўнамерна, Гегель адносіў да «негістарычных». Народы альбо нацыі (Гегель атаясамліваў *Volk* і *Nation*) бываюць «гістарычныя» і «негістарычныя» залежна ад свайго прагрэсу ва ўсьведамленьні свабоды. Падчас гэтага ўсьведамленьня чалавецтва праходзіць праз тры тыпы цывілізацыі: дэспатычную ўсходнюю (свабода ў ёй ёсьць толькі прывілеем дэспата), рымскую (у якой свабодай карысталася ня ўсё грамадзтва, а толькі яго асобны пласт) і — германскую, якая дае чалавеку поўную свабоду. У меру разгортваньня ідэі свабоды рэалізуецца сусьветны дух, які найбольш цэльна ўвасабляецца ў дзяржаве. Сама дзяржава выконвае асаблівую ролю «брамы Бога ў сьвет». У гістарычна безьдзяржаўных народаў дзеля адсутнасьці ўласнай дзяржавы, асноўнага суб'екта сусьветнай гісторыі, няма і гісторыі. Усе негістарычныя народы раней ці пазьней зьнікнуць[17].

Хоць такія развагі мелі больш супольнага з палітычнай публіцыстыкай, чымся з навукай у строгім сэнсе, сам падзел нацыяў на гістарычныя і негістарычныя прыжыўся ў навуцы і дагэтуль

---

[16] Гл. Hegel G.W.F. Vorlesungen ueber die Geschichte der Philosophie der Geschichte. Berlin, 1949.

[17] Параўн. Rudnytsky I. Observations on the Problem of «Historical» and «Non-Historical» Nations // Journal of Harvard Ukrainian Studies. 1981. № 5. S. 358—368.

выкарыстоўваецца ў дасьледаваньнях усходнеэўрапейскіх нацыяналізмаў[18].

У XIX ст. «гістарычныя нацыі» захавалі, а «негістарычныя нацыі» канчаткова страцілі шляхту сваёй жа нацыянальнасьці. «Гістарычныя нацыі» панавалі ў гарадох, нават на такіх тэрыторыях, дзе пераважала насельніцтва зь «негістарычных нацыяў», і таму рамесьнікі і гандляры станавіліся чальцамі «гістарычных нацыяў» з самага нараджэньня альбо ў працэсе асыміляцыі[19].

Дзеля таго, што Гегель дыстанцыяваўся ад праблемаў этнічнага і моўнага адзінства, ягоная канцэпцыя нацыі лічыцца палітычнай і, адпаведна, больш блізкай да ідэяў Мантэск'ё і Русо, чымся да нямецкага рамантызму. Прадстаўнікі апошняга разумелі нацыю як культурную супольнасьць людзей, зьвязаных адной мовай, культурай, «духам». У іх панавала культурнае разуменьне паняцьця *Volk*, заснаванае на супольнай мове, супольных звычаях і супольнай гісторыі. (Француз Адэльбэрт фон Шаміса стаў нямецкім пісьменьнікам, паводле ўласнага прызнаньня, «дзякуючы нямецкай мове, мастацтву, навуцы і рэлігіі».) Яны таксама былі пераважна арганіцыстамі, перакананымі ў цэльнасьці, старадаўнасьці і біялягічнай прыродзе нацыяў. Для Гэрдэра нацыя — гэта «такая ж натуральная расьліна, як і сям'я, — у ёй толькі больш разгалінаваньняў».

[18] Сьледам за Гегелем Ф. Энгельс у працы «Рэвалюцыі і контрарэвалюцыі ў Нямеччыне» падзяліў нацыі на «гістарычныя» (немцы, палякі, вугорцы) і «негістарычныя» (чэхі, харваты і іншыя цэнтральнаэўрапейскія народы; украінцаў альбо беларусаў у гэтым кантэксьце Энгельс наагул не згадаў), прыхільна паставіўшыся да нацыянальных памкненьняў першых і, адпаведна, адмовіўшы ў праве на нацыянальнае існаваньне другім. К. Маркс у гэтым сэнсе пайшоў далей Энгельса і да ліку «негістарычных нацыяў» далучыў жыдоў, назваўшы іх «хімэрнай нацыяй» на той падставе, што ў іх у той час не было ні дзяржавы, ні разьвітага нацыянальнага руху. «Ідэя Карла Маркса аб безьдзяржаўных народах была невуцкай, але мела вялікія наступствы» (Гаген Шульцэ).

[19] Химка Дж.-П. Зародження польської соціал-демократії та українського радикалізму в Галичині (1860—1890). Київ: Основні цінності, 2002. С. 21.

Гэрдэр быў гістарыцыстам, для якога мова была мысьленьнем, што разьвівалася толькі ў сацыяльным асяродзьдзі, а ўвасобленае ў мове мысьленьне ўяўляла сабой унікальную культурную асаблівасьць канкрэтнай сацыяльнай групы, якая валодала і іншымі этнаграфічнымі і культурнымі кодамі. Паколькі кожная нацыя ўнікальная, трэба вярнуць яе ў натуральны стан, атаясаміўшы культурную нацыю з палітычнай і дамогшыся яе нацыянальнага самавызначэньня[20], прызнаючы, зрэшты, што «лексыкаграфічная рэвалюцыя ў Эўропе спарадзіла і паступова распаўсюдзіла перакананьне ў тым, што мовы (прынамсі, у Эўропе) ёсьць, так бы мовіць, асабістай уласнасьцю спэцыфічных групаў — і што гэтым групам, прэзэнтаваным як супольнасьці, належыць аўтаномнае месца ў супольнасьці роўных»[21].

Як і Гегель, Гэрдэр атаясамліваў нацыю з народам (Volk), але не на грунце палітыкі, а на грунце мовы і паэзіі, якія ёсьць сапраўднымі падмуркамі нацыі і народу. Мова — базавы элемэнт нацыянальнай сьвядомасьці. Акурат дзякуючы мове грамадзтва цэмэнтуецца, ператвараецца ў адзіны камунікацыйны калектыў. У казках і песьнях выяўляецца душа народу, мова і культура — гэта ўнутраны голас нацыяў, якія ёсьць нашмат большым, чым сумай сваіх сяброў: духоўнымі супольнасьцямі людзей, калектыўнымі індывідамі, Божай празорнасьцю. Сьвет уяўляўся Гэрдэру вялізным садам, у якім нацыі разьвіваюцца накшталт расьлінаў паводле асаблівых, таямнічых боскіх законаў. Ніводная нацыя не валодае перавагай перад іншай, але кожная адрозьніваецца ад астатніх. Нацыі па сутнасьці былі індывідамі, якія клапаціліся

---

[20] Зьвязаўшы мовы і нацыю ў адно сэнсавае цэлае («Denn jedes Volk ist Volk; es hat seine National Bildung wie seine Sprache» [Кожны народ ёсьць народам; таму што ён мае сваё нацыянальнае ўладкаваньне, а таксама сваю мову]), Гэрдэр улічваў толькі эўрапейскі культурны досьвед і ігнараваў пазаэўрапейскі. За гэта Б. Андэрсан называў ягоную канцэпцыю «пыхлівай вузкаэўрапейскай канцэпцыяй нацыі».

Андерсон Б. Уявлені спільноти. Міркування щодо походження й поширення націоналізму: пер. з анг. Київ: Критика, 2001. С. 91—92.

[21] Тамсама. С. 110.

пра ўсіх сваіх чальцоў і пра ўсё чалавецтва. Кожнаму чалавеку наканавана быць чальцом свайго народу, з нараджэньня належаць да нацыі, сувязь зь якой ён захоўвае дзякуючы матчынай мове («Muttersprache»).

Кожны народ (Volk) можа разьвіцца з барбарскага стану і стаць нацыяй, якая валодае «сваім спосабам бачаньня агульных паняцьцяў, спосабам, закладзеным у форме выражэньня, карацей кажучы, наагул у традыцыі»[22], толькі праз культуру роднай мовы. Нацыятварэньне ахоплівае тры элемэнты: усьведамленьне моўнага і этнічнага адзінства, гістарычную сьвядомасьць і ўсьведамленьне гістарычнай місіі. (Дзеля гэтага ў Эўропе XIX ст. назіраецца пераможнае шэсьце гістарычнай навукі, дакладней кажучы, нацыянальнай гістарыяграфіі, якая надзяляла нацыі гістарычнай «адзежай».)

Ідэя непадзельнай і нязьменнай нацыі, народжанай з старадаўняга духу народу, патрабавала абгрунтаваньня ў гамагеннай, узаемазьвязанай, ачышчанай ад сумневаў і няпэўнасьці візіі гісторыі, якая б абгрунтоўвала і прадвяшчала лёсавызначальную пасьлядоўнасьць падзеяў, якія апраўдваюць нацыю на ўсе часы. Кожная нацыя, як заяўляў нямецкі гісторык Леапольд фон Ранке, мае боскую прыроду. Хада ж гісторыі палягае ў тым, каб кожная асобная нацыя выпрацавала свой цалкам адмысловы характар.

Нацыя існуе, каб выканаць ускладзеную на яе гістарычную місію. У тэлеалёгіі нацыі Гэрдэра сьцьвярджалася, што кожны народ мае сваё прызначэньне ў сусьветнай гісторыі (грэкі — для філязофіі, рымляне — для права). Заняволеным, «прыгнечаным» славянам яшчэ далёка да дзяржаўна-палітычнай сьпеласьці. Гэты «галубіны народ» «займае на зямлі больш месца, чым у гісторыі»[23].

Славяне «далёка жылі ад рымлянаў» і ў меншай ступені, чым нацыі Заходняй Эўропы, засвоілі культурную спадчыну Рымскай

---

[22] Гердер И.-Г. Идеи к философии истории человечества: пер. с нем. Москва: Наука, 1977. С. 373.

[23] Тамсама. С. 470.

імпэрыі. Гэрдэр супрацьпастаўляў славян і немцаў, бачыў гісторыю іх узаемадачыненьняў як гісторыю ўзаемнага змаганьня і тлумачыў той факт, што славяне знаходзіліся на пэрыфэрыі культурнага і палітычнага жыцьця сучаснай яму Эўропы, геаграфічнымі прычынамі (іх тылы былі адкрытыя для набегаў усходніх татараў...»).

(Падобны дыскурс пра славянаў праіснаваў яшчэ сама менш стагодзьдзе: Макс Вэбэр, чытаючы ў 1895 г. лекцыю ва ўнівэрсытэце і запэўніваючы, што польскі селянін у пэўным сэнсе жарэ траву, проста гаварыў мовай сваёй эпохі.)

Гэрдэр успрымаў славян хутчэй як «этнічную нацыю», чым як сукупнасьць нацыяў (тэрмін «славянскія нацыі» ў яго сустракаецца даволі рэдка): праекты пабудовы мадэрных славянскіх нацыяў былі ў найлепшым стане ў пачатковай стадыі. Ён вызначаў геаграфічны арэал іх расьсяленьня, падкрэсьліваў, што славяне вядуць «вясёлае музычнае жыцьцё», і выказваў пры гэтым пажаданьне, каб «зьнікаючыя рэшткі славянскіх звычаяў, песень і сказаў былі сабраныя і каб, у рэшце рэшт, была створаная цэльная гісторыя гэтага племені, чаго настойліва вымагае агульная карціна чалавецтва»[24].

Сваім сьвядомым альбо несьвядомым утапізмам Гэрдэр прапанаваў ідэолягам узьнікаючых славянскіх нацыяў мэтад асваеньня мінуўшчыны і стварэньня гістарычных нарацыяў: утапічнае бачаньне славян канвэртавалася ў славянскія ўтапічныя візіі гісторыі. Канструктары славянскіх нацыяў часта выкарыстоўвалі міты мінуўшчыны для стварэньня ідэалу айчыны. Яны імкнуліся, каб калі-небудзь ён стаў палітычнай рэчаіснасьцю, але адмаўляліся несьці за ягоную рэалізацыю ўсялякую адказнасьць.

Гэтыя і іншыя ідэі Гэрдэра[25] мелі ня толькі акадэмічны, але і грамадзкі рэзананс. Адштурхоўваючыся ад іх, І.-Г. Фіхтэ пературыў дагэтуль успрыманы як «вонкавы», культурна ірэлевантны

[24] Тамсама. С. 472.

[25] а) вяршэнства культуры над палітычным ладам краіны; б) адмова ад ідэі самадастатковасьці і культурнай аўтаркіі нацыі; в) адмова прызнаць у якасьці натураль-

крытэр мовы ў асноўны крытэр нацыянальнай самасьвядомасьці. Мова была вынесеная ў цэнтар нацыянальнага быцьця.

Стратэгія сакралізацыі мовы мела сваю перадумову ў крызісе ўяўленьня аб боскім паходжаньні мовы, зьняпраўджаным адно ў канцы XVIII ст. Тое, што мову вынайшлі людзі, а ня Бог, стала зразумелым толькі пасьля таго, як філялёгія ўстанавіла, што сьвятыя мовы не былі ні самыя старадаўнія, ні боскага паходжаньня. Фуко назваў гэта адкрыцьцём мовы — мова стала ўспрымацца як самадастатковая структура, якая функцыянуе паводле сваіх унутраных законаў, што перадвызначыла так званую «лексыкаграфічную рэвалюцыю ў Эўропе». Свой унёсак у гэты паварот зрабіла «Дасьледаваньне аб паходжаньні мовы» (1770, выд. 1772) Гэрдэра, якое атрымала ў 1772 г. ганаровы мэдаль Бэрлінскай Акадэміі. Парадаксальна, што адной рукой разбураючы ўяўленьне аб боскай прыродзе мовы, Гэрдэр другой рукой увекавечыў яго ў сваіх тэарэтычных пошуках.

«Адзіная мова» («gemeinschaftliche Sprache») і «супольны нацыянальны характар» («gemeinsame Nationalcharakter») быў абвешчаны абавязковай перадумовай адзінства Нямеччыны, а сама нацыя вызначаная паводле лінгвістычнай прыкметы як «сукупнасьць людзей, якія, нягледзячы на вонкавыя ўплывы на сваю мову, захоўваюць яе, суіснуюць, удасканальваюць у бесьперапынным памаўленьні» («die unter denselbenäussern Einflüssen auf

---

нага такі стан, калі адна нацыя альбо культура пануе над другой нацыяй альбо культурай (асабліва тады, калі чужая нацыя альбо культура пануе над уласнай нацыяй альбо культурай); г) разьвіцьцё пэўнай культуры залежыць ад палітычнай улады, якая можа тармазіць альбо стымуляваць гэтае разьвіцьцё, таму і абарона гэтай культуры ад зьнішчэньня магчымая пры ўмове палітычнай незалежнасьці; д) разьвіцьцё адной нацыі альбо культуры залежыць ад яе ўзаемадачыненьняў зь іншымі нацыямі/культурамі; далейшы досьвед сужыцьця эўрапейскіх нацыяў паказа, што нярэдка гэтыя ўзаемадачыненьні адбываюцца ў рэжыме ідэалягічнай канфрантацыі; е) усьведамленьне таго, што кожны нацыянальны рух патрабуе выпрацоўкі нацыянальнай ідэалёгіі.

Гл.: Шпорлюк Р. Комунізм і націоналізм. Карл Маркс проти Фрідріха Ліста: пер. з анг. К.: Основи, 1998. С. 170—172.

das Sprachwerkzeug stehenden, zusammenlebenden, und in fortgesetzter Mitteilung ihre Sprache fortbildenden Menschen ein Volk»)[26].

У Фіхтэ нацыяналізм становіцца мэсіянскім. Свае «Прамовы да нямецкай нацыі» ён сканчвае заклікам да ўсіх немцаў: «...калі вы зьнікнеце, то зьнікне ўсё чалавецтва без надзеі на будучае ўваскрашэньне». Дзякуючы сваёй незвычайнай духоўнасьці і калектыўнай волі, немцы ня толькі пасьпяхова супрацьстаялі «раманскай цывілізацыі», але і стварылі «германскую» (паняцьце «германскай цывілізацыі» шырока ўжываў і Гегель). У восьмай прамове Фіхтэ апісвае супраціў германцаў «начэпнаму сусьветнаму панаваньню рымлянаў», які быў скіраваны ня толькі супраць варожых войскаў, але і супраць спакусаў рымскай цывілізацыі, супраць раскошы і збыткаў. Мова раманскіх народаў узьнікла на аснове лаціны, немцы ж валодаюць арыгінальнай мовай, дзякуючы якой яны захавалі свой аўтэнтычны нацыянальны сьветагляд.

Як сьведчаньне «высокага пакліканьня» нямецкай нацыі Фіхтэ зьвяртаў увагу на яе гераічную мінуўшчыну, якая стварыла перадумовы для «валадарства чалавечага розуму» («Vernunftreich der Menschheit»). Адмысловую гістарычную місію немцаў, на думку Фіхтэ, падкрэсьлівае іх унікальны «нацыянальны характар» (цяпер бы яго назвалі «мэнтальнасьцю»):

> *Паколькі наш дух скарыць нельга, мы мусім мацаваць дух, суворы і ўпэўнены; нашае жыцьцё і мысьленьне мусіць быць усёпранікальным і ўстойлівым цэлым («ein sichdurchdringendes und gediegenes Ganzes»); толькі тады мы станем тым, кім і без таго мы мусім быць, немцамі*[27].

---

[26] Fichte J.G. Reden an die deutsche Nation. 5., durchges. Auflage nach dem Erstdruck von 1808, mit neuer Einleitung von Reinhard Lauth, mit Literaturhinweisen und Register. Hamburg: Rowolht, 1978.

[27] Тамсама.

Нарэшце, апрача Боскай празорнасьці і культурных катэгорыяў, нацыю яднае праўная культура:

> *Народ: супольнасьць людзей, якія разам жывуць у грамадзтве, узаемна ўзбагачаюць адно аднаго духоўна, якія няўхільна прытрымліваюцца пэўных своеасаблівых законаў, разьвіваюць боскае ў сабе. Сукупнасьць гэтых своеасаблівых законаў — гэта тое, што ў вечнасьці, і акурат таму і ў пераходжалым сьвеце лучыць гэтую масу людзей з натуральным і ўсюдыісным унівэрсумам («natürlichen, und von sich selbst durchdrungenen Ganzen»)*[28].

Гэрдэр і Фіхтэ, для якіх вызначальным крытэрам прыналежнасьці да нацыі становіцца культурнае адзінства, мова, супольнае паходжаньне (кроўнае сваяцтва), нацыянальны характар і нацыянальны дух («National-Geist» альбо «Volksgeist»), па сутнасьці знаходзіліся ў апазыцыі да тагачаснага францускага нацыяналізму, які, разглядаючы нацыю як «рукатворную» палітычную супольнасьць, тым самым закладваў аснову для стварэньня буржуазнай францускай «nation une et indivisible». У гэтым сэнсе нямецкі нацыяналізм не падзяляў усіх ідэяў Асьветніцтва і аддаляўся ад ідэйнага базісу францускага рацыяналізму, паводле якога дзяржава разумеецца як вынік калектыўнай дамовы, новага «contrat social», неабходнага для ўпарадкаваньня сацыяльных стасункаў. Зрэшты, зь сярэдзіны XIX ст. і сам францускі «грамадзянскі» нацыяналізм перарастае ў этнакультурны, г.зн. перастае асацыявацца зь дзяржаўным патрыятызмам і патрабуе ідэнтыфікацыі з этнакультурнай супольнасьцю. Так унівэрсалізм Асьветніцтва саступіў канцэпцыі нацыянальнай своеасаблівасьці.

Масавы базіс для нямецкага нацыяналізму зьявіўся толькі пасьля вызваленчых антынапалеонаўскіх войнаў. Узмацненьне трэ-

---

[28] Тамсама.

цяга стану, разам з палітычнай і культурнай эмансыпацыяй масаў, вяло да таго, што гэты культурны нацыяналізм паступова перарос у імкненьне да фармаваньня нацыянальнай дзяржавы. Аднак толькі ў 1840-я гг. у часе райнскага крызісу ён становіцца масавым рухам, а нацыянальная ідэя — легітымізацыйным прынцыпам. Нямецкія эліты спускаюць зьверху, а фактычна навязваюць народным масам нацыянальную мову, якая патроху выціскае амальгаму мясцовых гаворак і дыялектаў і становіцца мовай усеагульнага школьнага навучаньня.

Павелічэньне насельніцтва на эўрапейскім кантынэнце[29], індустрыяльная рэвалюцыя, перамога над часам і прасторай (чыгунка, тэлефон і тэлеграф), новае, нечуванае раней выкарыстаньне ведаў і інфармацыі паўплывалі на палітычную сыстэму Эўропы. Абсалютысцкая дзяржава больш не магла выконваць сваіх задачаў на трох вызначальных узроўнях: на ўзроўні ўдзелу грамадзтва ва ўладзе, эфэктыўнасьці палітычнай сыстэмы і на ўзроўні легітымацыі.

Найбольш відавочным у палітычным сэнсе стала параза абсалютызму перад заклікам усё больш шырокіх пластоў насельніцтва ўдзельнічаць у кіраваньні дзяржавай. Зьявіліся новыя эліты — прадстаўнікі буржуазнага слою. Індустрыялізацыя патрабавала новага апарату кіраваньня, сьпярша буржуазных прамыслоўцаў, потым мэнэджэраў са значнай палітычнай сілай і з прэтэнзіяй на ажыцьцяўленьне палітычнай улады. Рост пісьменнасьці і адукацыі прывёў да ўзьнікненьня інфармаванага слою аўтараў і

[29] Пасьля стагодзьдзяў адноснай раўнавагі, якая стрымлівалася эпідэміямі, войнамі і голадам, зь сярэдзіны XVIII ст. эўрапейскае насельніцтва пачало імкліва расьці. У 1750 г. кантынэнт налічваў прыблізна 130 млн жыхароў; у 1800 г. іх ужо было каля 180 млн, празь пяцьдзясят гадоў — 266 млн, напярэдадні першай сусьветнай вайны — 468 млн. Калі ў 1801 г. у Эўропе было ня больш за 21 горад з насельніцтвам, большым за сто тысяч чалавек, то ў 1901 г. такіх гарадоў было ўжо 147 і ў іх жыло прынамсі 10 адсоткаў насельніцтва Эўропы.

Hagen Schulze. Staat und Nation in der europaeischen Geschichte. Muenchen: Verlag C.H. Beck, 1994. S. 154.

чытачоў, якія не маглі зразумець, чаму іх палітычныя дыскусіі павінны заставацца безвыніковымі.

# ЧАМУ ПОЛЬСКАЯ ШЛЯХТА БЫЛА РЭАКЦЫЙНАЯ? НАЦЫЯНАЛІЗМЫ ВА ЎСХОДНЯЙ ЭЎРОПЕ І РАСЕІ: XIX СТАГОДЗЬДЗЕ

*Чыгунка зьнішчыла прастору, нам застаўся толькі час.*
Гайнрых Гайнэ.

Каля 1830 г. нямецкая вучонасьць валодала вядучымі пазыцыямі ў Эўропе (Э. Саід). Няма дзіва, што ідэі нямецкага нацыяналізму мелі вялізарны ўплыў на эліты эўрапейскага ўсходу, настолькі вялікі, што эўрапейскі ўсход стаў, паводле Гелнэра, унікальным у сусьветным маштабе геапалітычным рэгіёнам. Тут у дамадэрны час існавала амаль ідэальна чыстая ненацыянальная палітычная сыстэма, якая грунтавалася на дынастыях, рэлігіі і тэрытарыяльных інстытутах. Яна ўлучала ўсходнеэўрапейскія імпэрыі — Расею, Асманскую імпэрыю, Аўстра-Вугоршчыну і часткова Прусію. Паколькі яны былі перажыткамі фэадалізму, гэтыя манархічныя рэжымы абапіраліся на шляхту і баранілі яе сацыяльныя пазыцыі, але не заўсёды дапускалі яе да кіраваньня.

Па нейкім часе Ўсходняя Эўропа ператварылася ў сваю поўную супрацьлегласьць — амаль ідэальна чыстую нацыянальную па-

літычную сыстэму, угрунтаваную на моўных ідэнтычнасьцях і зьвязаных зь імі культурах.

У краінах Эўропы на захад ад Нямеччыны (Ангельшчына, Гішпанія, Швэцыя) культурная гамагеннасьць была высокая і нацыятварэньне пайшло паводле зьмяшанага, культурна-дзяржаўнага варыянту. Мадэрная нацыя тут была сканструявана зьверху дзякуючы палітыцы арыстакратычных эліт, якія, кіруючы дзяржаўным апаратам і выкарыстоўваючы свой эканамічны і культурны патранат над ніжэйшымі слаямі, паступова прывучылі іх да «арыстакратычнай» культурнай спадчыны, надаўшы ёй агульнанацыянальны вымер.

За межамі заходняга сьвету, у Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе і ў Азіі нацыяналізм узьнік ня толькі пазьней, але і на больш адсталай стадыі сацыяльнага і палітычнага разьвіцьця. Межы існуючай дзяржавы і нацыі, што ўзьнікала, рэдка супадалі; нацыяналізмы тут разьвіваліся «зьнізу» ў вострай канфрантацыі зь існуючымі дзяржавамі. Гэтыя нацыяналізмы імкнуліся ня толькі стварыць свае нацыянальныя дзяржавы, але і аформіць палітычныя межы паводле этнаграфічнай прыкметы.

У існуючых нацыянальных дзяржавах Заходняй Эўропы былі школы і войска, праз якія нацыянальная ідэя магла трапляць у масы; ва Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропе патрабавалася спалучэньне літаратуры і газэт, партыяў і аб'яднаньняў, клюбаў і гурткоў, згуртаваньняў і суполак, з дапамогай якіх адбывалася транспартаваньне зьнізу ўверх нацыянальнай ідэі. Калі зьвязаныя зь ёй лёзунгі і праграмы авалодвалі масамі, узьнікала нацыя.

Важнай інсьпірацыяй для нацыяналізмаў усходу Эўропы стаў узьніклы ў пару Асьветніцтва прынцып роўнасьці людзей, дапоўнены проталібэральнай дактрынай роўных магчымасьцяў для кожнага чалавека. Іх было немагчыма рэалізаваць ва ўмовах рознага прэстыжу і няроўных магчымасьцяў розных моваў, а значыць, барацьба за нацыяналістычныя ідэалы асьвятлялася гуманістычнай і прагрэсісцкай рыторыкай. Праз пэўны час гэтая дактрына дапоўніцца тэорыяй нацыянальнай незалежнасьці як

найважнейшай перадумовы дэмакратычнай рэалізацыі сувэрэннай волі народу.

Асаблівая роля ў пашырэньні нацыяналістычных ідэяў належала сыстэме суполак. Свабодныя асацыяцыі грамадзян, якія самастойна ставілі сабе мэты, сябры якіх добраахвотна ўваходзілі і выходзілі зь іх, былі накіраваным супраць станавага грамадзтва інстытутам, з дапамогай якога будавалася грамадзянская супольнасьць[1].

XIX ст. у Эўропе было стагодзьдзем суполак і грамадзкіх аб'яднаньняў. На захадзе кантынэнту фактычна не было людзей, якія б не былі сябрамі хаця б адной суполкі. У Нямеччыне з пачатку XIX ст. існавалі сьпеўныя (музыка і лірыка мелі вялізнае значэньне для масавага пашырэньня нацыяналістычных лёзунгаў і паняцьцяў), гімнастычныя, студэнцкія суполкі. У краінах Усходняй Эўропы іх ролю часьцяком выконвалі таемныя таварыствы — масоны і ілюмінаты.

Выкарыстоўваючы нацыяналізм як «гатовы шаблён для пераводу сьветагляду ў палітычную праграму дасягненьня аўтаноміі, адзінства і ідэнтычнасьці» (Э. Сьміт), эліты «іншай», «негістарычнай» Эўропы пачалі інтэнсіўнае вывучэньне мовы, гісторыі і традыцыяў уласных народаў. Праекты пабудовы ўласных нацыяў рэалізоўваліся з выкарыстаньнем ужо апрабаваных сцэнароў (з выпрацоўкай міту нацыянальнага адраджэньня і г.д.)[2].

---

[1] Тэрмін грамадзянская супольнасьць зьявіўся ў XVIII ст. для азначэньня інстытутаў-пасярэднікаў паміж дзяржавай і мясцовымі супольнасьцямі. Мантэск'ё і Таквіль уважалі іх за найбольш надзейныя апоры супраць дэспатызму. У Расейскай імпэрыі XIX ст. інстытутамі грамадзянскай супольнасьці былі суды, выбарныя земствы і г.д.

[2] Адзін з раньніх украінскіх нацыяналістаў П. Куліш быў знаёмы з ідэямі Гэрдэра. У адным з сваіх лістоў адзначаў, што пры перакладзе Песьні Песьняў карыстаўся камэнтарам Гэрдэра, якога чытаў «зь пільнасьцю». І. Франко меркаваў, што «славянскі сэпаратызм» мае відавочна нямецкае паходжаньне.

Вынік не прымусіў сябе доўга чакаць. На працягу XIX ст. фактычна ва ўсіх эўрапейскіх этнічных супольнасьцях на парадку дня зьяўляецца пытаньне фармаваньня нацыянальнай сьвядомасьці іх чальцоў, а ў пэрспэктыве — дасягненьня палітычнага сувэрэнітэту. Іншая рэч, што зусім ня кожная зь іх здужае на практыцы ажыцьцявіць гэтыя амбітныя пляны — на захадзе кантынэнту іх большасьць будзе асымiляваная культурна і палітычна больш разьвітымі суседзьмі.

У літаратуры дэталёва апісаныя працэсы нямецка-чэскай інтэлектуальнай сынэргіі[3]. У чэскім кантэксьце «айчына», зразумелая як палітычная катэгорыя, рэзка супрацьпастаўлялася нацыі, якая вызначалася моўнай унікальнасьцю. Гістарычна-палітычны кантэкст фармаваньня мадэрнага польскага нацыяналізму часткова супадаў зь нямецкім і чэскім. Праўда, адрозна ад тагачаснай Чэхіі тут існаваў не адзін, а цэлыя тры імпэрскія цэнтры, а адрозна ж ад тагачаснае Нямеччыны назіралася не «разьяднанасьць» краіны, а «падзел», «rozbiór», які польскімі інтэлектуаламі будзе асэнсаваны пры дапамозе мэтафары ўкрыжаваньня Рэчы Паспалітай суседнімі дзяржавамі-zabiorcami.

Ва ўмовах нацыянальнай безьдзяржаўнасьці станавая ідэя нацыі-сувэрэну перажыла сур'ёзную трансфармацыю. Нацыя перастала атаесамляцца са шляхтай і быць выключна палітычна-геаграфічнай катэгорыяй (якая злучае толькі тых, хто ўспрымае Рэч Паспалітую як бацькаўшчыну, г.зн. абмяжоўваецца толькі тымі, хто мае разьвітае ўсьведамленьне палітычнае своеасаблівасьці сваёй радзімы). Яна становіцца культурнай імплікацыяй (нацыя — супольнасьць, заснаваная на супольнай культурнай і гістарычнай спадчыне).

Існаваньне безьдзяржаўнай нацыі сфармавала польскую палітычную культуру: пазбаўленыя нармальнага ўдзелу ў палітыцы, многія палякі сталі эмігрантамі, паўстанцамі, падпольшчыкамі альбо ссыль-

[3] Hroch Miroslav. From ethnic group toward the modern nation: the Czech case // Nations and nationalism. 2004. № 10 (1/2). P. 95—107.

ньмі (П. Вандыч). За адсутнасьцю нацыянальных палітычных і адміністрацыйных інстытутаў функцыі асноўнага захавальніка нацыянальнай сьвядомасьці і стваральніка новага нацыянальнага сьветагляду бярэ на сябе польская культура (і польскі нацыяналізм таго часу збольшага ёсьць культурным нацыяналізмам).

Безьдзяржаўная польская нацыя не магла разьлічваць на нацыяналізуючае ўзьдзеяньне дзяржаўнага апарату, і таму асноўныя «нацыятворчыя» імпульсы выходзяць з асяродзьдзя польскіх літаратараў (у польскай літаратуры першай паловы XIX ст. панаваў рамантызм). Іх сьветагляд быў у значнай ступені інсьпіраваны апалёгіяй роднага краю, паэтыкай барацьбы дабра са злом, ідэалам вызвольнай барацьбы супраць захопнікаў. Рамантычная эстэтыка прымусіла іх іначай паглядзець на ранейшыя стасункі паміж панскім дваром і сялянскай хатай. На месца ранейшага адчужэньня, пачуцьця дыстанцыі паміж прадстаўнікамі розных сацыяльных пластоў прыходзіць замілаваньне працоўным чалавекам і ягоным непаўторным культурным асяродзьдзем — фальклёрам, індывідуальнай мовай, патрыярхальным ладам жыцьця. Сёньняшні прыгонны заўтра будзе вольны, калі зробіць сьвядомы выбар на карысьць сабоды. У адным з двух вершаў, напісаных па-беларуску, Уладзіслаў Сыракомля пісаў:

*Там на Заходзе праліваюць кроў,*
*Б'юцца для славы, свабоды і чэсьці*
*І робяць вольных людзей з мужыкоў...*
*І панская дзецка, і хамская юха*
*З аднэй кватэркі папіяюць мёд:*
*І прысягнулі навек, жа абуха,*
*Быць сабе вольны і роўны народ.*
*Мужык і шляхціц засядзе на лаве,*
*Каб весьці раду а сваей зямлі*[4].

[4] Сыракомля Уладзіслаў. Добрыя весці. Паэзія, проза, крытыка. Мінск: Мастацкая літаратура, 1993. С. 15.

Нягледзячы на маргіналізацыю селяніна ў грамадстве, нягледзячы на ягоную скрайнюю галечу, яму адводзілі ролю Пяста Калодзія, прыпісвалі славянскае першародзтва, дынастычную герархічнасьць, ускладалі надзею на ягоную ўяўную біялягічную сілу і маральнае здароўе ў адраджэньні ўсяго народу[5]. У сялянах убачылі невычэрпную крыніцу народнага духу, матэрыял для выпрацоўкі нацыянальнай ідэнтычнасьці і аб'ект звароту па шырокую палітычную падтрымку. У польскіх рамантыкаў вобраз прадстаўніка патрыярхальнай культуры перастае асэнсоўвацца з дапамогай «нізавога» сьмехавога дыскурсу і перажывае ідэалізацыю як носьбіт сацыяльна значэнных маральных вартасьцяў і этычных ідэалаў.

Гэта рыхтавала «змычку» паміж сацыяльнымі вярхамі і нізамі, спрыяла ўцягваньню ў працэс фармаваньня нацыі шырокія сацыяльныя масы. (У гэтым сэнсе лішняга разу пацьвярджаецца слушнасьць разуменьня нацыяналізму як навязваньня высокай культуры грамадзтву, у якім раней нізкія культуры вызначалі жыцьцё большасьці, а ў пэўных разох і ўсяго насельніцтва.) Характэрна, што пры гэтым нікога асабліва не цікавіла этнічнае паходжаньне гэтых масаў — у аснову была пакладзена супольная культурная ідэнтычнасьць і адчуваньне/перажываньне былога палітычнага адзінства жыхароў Рэчы Паспалітай. Для ўзмацненьня прыцягальнасьці новай польскай нацыянальнай самасьвядомасьці польскія рамантыкі прапагандавалі ідэю асаблівай цывілізацыйнай місіі Польшчы, яе мэсіянскае пакліканьне.

Тое, што ва ўмовах безьдзяржаўнасьці стварэньнем нацыі заняліся культурныя сілы грамадзтва, а ня толькі ягоныя традыцыйныя эліты, было заканамернай зьявай. Традыцыйная эліта польскага грамадзтва, польская шляхта, была, паводле Б. Андэрсана, адсталая і рэакцыйная. Толькі дзякуючы дэмакратызацыі паняцьця нацыі, у чым галоўную ролю адыгралі тагачасныя

[5] Мисливський В. Кінець селянської культури // Критика. 2004. № 4. С. 38.

польскія інтэлектуалы, натхнёныя заходнеэўрапейскімі інсьпірацыямі, шляхта была змушаная для выгляду, гаворачы словамі Андэрсана, «выдаваць запрашэньне (няхай толькі не далей за кухню) сваім заняволеным суайчыньнікам»[6].

Адштурхоўваючыся ад ідэі «вымушанага дэмакратызму», Андэрсан робіць выснову аб «папулісцкім» характары польскага нацыяналізму: толькі дзякуючы адносна новаму паняцьцю нацыянальных інтарэсаў, самая рэакцыйная група польскага грамадзтва, шляхта і магнаты, адмовілася ад ідэі прыгону (учорашні прыгонны, зьведзены да становішча раба, мусіў быў заўтра стаць сьвядомым барацьбітом за незалежнасьць краіны)[7].

Ужо ў XIX ст. палякі здалелі пабудаваць трывалую грамадзянскую супольнасьць. Абапіраючыся на нацыянальную культуру, яна стала ядром нацыянальнай ідэнтычнасьці перад пагрозай з боку іншаземнага панаваньня. Мэтады расейскай улады ў Польшчы былі стандартныя: забарона выкладаньня ў школах на нацыянальнай мове (яшчэ на пачатку XX ст. палякі дамагаліся дазволу навучаць сваіх дзяцей у сярэдніх школах па-польску), абмежаваньне друку на нацыянальнай мове, выкараненьне рэгіянальных асаблівасьцяў, зьнішчэньне памяці пра мінуўшчыну і г.д. Дзеля гэтага грамадзянская супольнасьць, якая супрацьстаяла ўмяшаньню

---

[6] Андерсон Б. Уявлені спільноти. Міркування щодо походження й поширення націоналізму: пер. з анг. Київ: Критика, 2001. С. 107.

Зрэшты, нельга сказаць, што ў першай палове XIX ст. польская шляхта на беларускіх землях была цалкам абыякавая да мадэрнага польскага нацыяналізму. Сьледам за Т. Касьцюшкам некаторыя папулісцка настроеныя земляўласьнікі вызвалялі сялян ад прыгоннай залежнасьці. Яны цудоўна разумелі, што вэртыкальная інтэграцыя, пакліканая зрабіць этнічных беларусаў часткай польскай нацыі, патрабавала пэўнай ступені эканамічнай эмансыпацыі і асьветы. Аднак спатрэбілася яшчэ багата часу, каб яны здолелі атаясаміць сябе са шляхтай і знайсьці повязі нацыянальнай салідарнасьці.

[7] Адрозна ад Андэрсана, А. Забужка акцэнтуе не адсталасьць польскай шляхты, і шырэй, усяе польскае нацыі, а яе сьпеласьць. Хоць у Польшчы лібэралізм не вытрымліваў канкурэнцыі з нацыяналізмам (лібэралізм быў ідэалёгіяй буржуазіі, а

дзяржавы і адстойвала правы асобы, у Польшчы стала асноўным абаронцам нацыі. Яе існаваньне падтрымлівала рэспубліканская традыцыя спачылай Рэчы Паспалітай.

У літаратуры часьцяком сустракаецца тэза аб новай нацыянальнай маралі, выпрацаванай польскімі элітамі пасьля падзелу Рэчы Паспалітай. Няцяжка прасачыць яе генэзу. Ужо ў рэвалюцыйнай Францыі паняцьце нацыі становіцца найвышэйшым маральным аўтарытэтам, які значнасьцю пераўзыходзіць Царкву і нават дзяржаўную ўладу. Польскія мысьляры зрабілі наступны лягічны крок. Дзякуючы насычэньню паняцьця «нацыя» містычным і мэсіянскім духам, у польскіх эліт яно становіцца абсалютнай маральнай каштоўнасьцю, у імя якой дазволеныя нават амаральныя ўчынкі з гледзішча «будзённай» маралі. Пэрспэктыва зьмены нацыянальнасьці значыць ня проста маральнае падзеньне, але духоўную сьмерць.

А. Міцкевіч дасьць ключавому для хрысьціянства фэномэну здрады новае тлумачэньне: ня толькі прыняцьце асобай новай нацыянальнасьці, якая ў ранейшыя часы наступала аўтаматычна са зьменай сацыяльных роляў альбо месца ў сацыяльнай герархіі, але і калябарацыя з пануючым «антыпольскім» рэжымам разглядаецца як акт найглыбейшага падзеньня, які заслугоўвае на самую суровую маральную ацэнку. І наадварот, усё, што садзейні-

---

працэс абуржуазьніваньня ішоў складана дзеля засільля шляхты), палякі былі прыкладам «сьпелага» (з поўнай сацыяльна-клясавай структурай) і самасьвядомага народу, «які, аднак, пазбаўлены дзяржаўнасьці і падзелены паміж імпэрыямі, лунаў над усходнеэўрапейскімі прасторамі як адмысловы «народ-прывід», «душа бязь цела, увачавідкі дэманструючы, што «нацыя» і «дзяржава» — гэта фэномэны рознага парадку».

Забужко О. Філософія української ідеї та європейський контекст: Франківський період. Київ: Наукова думка, 1992. С. 23.

Гэтая трактоўка, відаць, узыходзіць да працы лорда Эктана «Прынцып нацыянальнага самавызначэньня» (1862). У ёй польская нацыя паўстае як «прагная цялеснага ўвасабленьня душа, якая марыць у наноў здабытым целе пачаць новае жыцьцё».

чае адраджэньню бацькаўшчыны, мае высокую маральную вартасьць.

У трактоўцы А. Міцкевіча польская нацыянальная ідэя была ідэяй мэсіянскай: Польшча абвяшчалася галоўным «геніем славянства», а носьбіт новай нацыянальнай сьвядомасьці — прарокам новай гістарычнай рэальнасьці. У сваіх лекцыях, прачытаных на пачатку 40-х гадоў XIX ст., Міцкевіч адводзіць нацыі цэнтральную ролю ў надыходзячай эпосе і называе Польшчу «Капэрнікам новай маралі», якая закладае такім «нацыяцэнтрычным» маральным кодэксам асновы новай цывілізацыі. Расея ж складае «адмоўны полюс славянскай ідэі». Яна ня мае права называцца славянскай краінай, бо яна «ататарылася» і «афінілася». Назва «Расея» нічога ня значыць і ёсьць чыста дыпляматычным тэрмінам.

Яшчэ раней, у адным зь першых твораў эміграцыйнага пэрыяду — «Кнігах польскага народу і польскага паломніцтва» Міцкевіч выбудоўвае мадэль нацыянальнай тэлеалёгіі, дзе бярэ за аснову хрысьціянскія крыніцы. Уваскрашэньне нацыі непазьбежнае («A trzeciego dnia dusza wróci do ciała, i naród zmartwychstanie, i uwolni wszystkie ludy Europy z niewoli»[8]), нягледзячы на жудасны ціск дэспатычнай дзяржавы («I ziemia cała stała sił niewolnica, a nie bylo takiej niewoli nigdy na świecie, ani przedtem; oprócz w Rosji za dni naszych»[9]):

> *Кожны народ пачынае сваё нацыянальнае існаваньне з адкрыцьця. Кожная нацыя мае ў сваёй аснове асаблівае адкрыцьцё. У аснове кожнай зь вялікіх нацыяў — пэўная адзіная ідэя, і нацыя жыве толькі для таго, каб гэтую ідэю рэалізаваць*[10].

---

[8] Mickiewicz Adam. Księgi narodu polskiego i pielgrzymstwa polskiego // Dzieła Poetyckie. T. 2. Warszawa: Spółdzielnia wydawnicza «Czytelnik», 1992. S. 238.

[9] Тамсама. С. 224.

[10] Szpotański St. Adam Mickiewicz i jego epoka. Warszawa — Kraków, 1922. T. 2. S. 29.

Міцкевіч у гэтым фрагмэнце фармулюе сэнсавую адрознасьць паміж «народам» — незалежна ад таго, як ён разумеецца, як сацыяльная, культурная альбо этнічная супольнасьць, — і «нацыянальным праектам», «нацыянальным існаваньнем народу», у аўтарскай тэрміналёгіі.

Фэномэн «адкрыцьця» ў гэтым кантэксьце выклікае да жыцьця выпрацаваны на аснове нацыянальнай культурнай традыцыі «сымбаль веры» — тэксты, якія даюць штуршок распаўсюду новай нацыянальнай сьвядомасьці ў межах супольнасьці, якая раней успрымалася як цэлае, найперш дзякуючы сацыяльнай герархіі альбо дынастычнай ляяльнасьці.

На думку А. Забужкі, мэсіянізм Міцкевіча сьведчыў пра надыход фазы «дасэкулярнага нацыяналізму, на якой нацыянальнае самапазнаньне мае яшчэ ня столькі філязофска-рэфлексійны, колькі пераважна рэлігійна-эмацыйны характар»[11].

Цяжка пагадзіцца з такой ацэнкай. Нацыянальнае мысьленьне Міцкевіча мела ня столькі рэлігійна-тэалягічныя, колькі акурат філязофскія інсьпірацыі ў асобе тэарэтыкаў нямецкага нацыяналізму (Фіхтэ ды іншых). Ужываньне апошнімі хрысьціянскай сымболікі і алегорыкі толькі падкрэсьлівае той факт, што царква, сфэра рэлігійнай сакральнасьці наагул, на зломе XVIII і XIX ст. перажывае дэсакралізацыю, губляе свой дагэтулешні непахісны маральны аўтарытэт. Таму пасьля пэўнага пераасэнсаваньня мэтамова хрысьціянскай сакральнасьці будзе без асаблівых цяжкасьцяў запазычана і разьвіта канструктарамі новага грамадзкага рэлевантнага сакруму — ідэі нацыі і яе адраджэньня. Нацыя як уяўленая палітычная супольнасьць запаўняла пустэчу, утвораную ў выніку згасаньня сусьветных рэлігіяў, сьвятых манархічных цэнтраў і вялікіх імпэрыяў тады, калі новыя паняцьці «друкаванага» капіталізму далі магчымасьць уяўленым нацыям рухацца ў лінійным часе (Б. Андэрсан).

[11] Забужко О. Філософія української ідеї та європейський контекст: Франківський період. Київ: Наукова думка, 1992. С. 45.

Сучасны Міцкевічу польскі нацыяналізм зь ягоным ідэалам нацыі, увасобленым у пакутах і ўваскрашэньні Хрыста (Э. Сьміт), не «дасэкулярны», а цалкам «сэкулярны», г. зн. заснаваны на своеасаблівай інтэлектуальнай гульні з хрысьціянскай духоўнай спадчынай. Лёзунг нацыянальнага польскага касьцёлу, адзін з найважнейшых фактараў аб'яднаньня польскага грамадзтва (каталіцтва падкрэсьлівала адрознасьць палякаў ад немцаў-лютэран і расейцаў-праваслаўных), зьявіўся ўжо пасьля рэвізіі польскай нацыянальнай ідэі[12].

Такім чынам, польскія эліты ў першай палове XIX ст. пазычаюць упершыню ўзьніклае ў Нямеччыне паняцьце «Kulturnation», заснаванае на адзінстве культуры, а не этнічнага паходжаньня альбо мовы. Паняцьце прадугледжвала таксама момант супольнай рэлігійнай ідэнтычнасьці ствара́най нацыі пры затушоўваньні яе герархічна-станавай і этнічнай прыроды[13].

Мадэрная польская нацыя была пераважна сумесьсю шляхты і плебеяў, у той час як на Захадзе нацыі ўзьнікалі на аснове сярэдняй клясы і пралетарыяту. Стаўка на новую канцэпцыю нацыянальнасьці (у савецкай гуманістыцы яна, здаецца, называлася «польскім рэвалюцыйным дэмакратызмам») была абумоўлена «прабуксоўваньнем» у першыя дзесяцігодзьдзі XIX ст. ранейшай «элітарнай» канцэпцыі, якая атаесамляла нацыю са шляхтай і выключала зь яе складу ня толькі ўкраінскае, літоўскае альбо бела-

---

[12] «Мэсіянская фаза» нацыянальнай ідэалёгіі ва ўсіх культурна разьвітых народаў Эўропы скончылася адначасова з пабудовай адпаведных мадэрных нацыяў, калі натуральным чынам адпала неабходнасьць у мабілізацыі яшчэ нацыянальна несьвядомых масаў для пабудовы нацыі. Храналягічна яна працягвалася да пачатку першай сусьветнай вайны, ператварыўшыся ў найноўшую, сэкулярную нацыянальную ідэалёгію. Прыкры вынятак тут — Расея, якая так і не прайшла гэтай «ювэнільнай» (А. Забужка) фазы аж да канца XX ст.

[13] Пар. «Litwin i Mazur to bracia są: czyż kłocą sią bracia o to, iż jednemu na imię Władysław, drugiemu Witowt»? Mickiewicz Adam. Księgi narodu polskiego i pielgrzymstwa polskiego // Dzieła Poetyckie. T. 2. Warszawa: Spółdzielnia wydawnicza «Czytelnik», 1992. S. 262.

рускае сялянства, але і сялян «карэннай» Польшчы. Пераход на новыя прынцыпы быў збольшага завершаны паміж 1815 і 1891 гадамі. Аднак адно ў канцы XIX — пачатку XX ст. асноўная маса польскага сялянства сьвядома пачала сябе атаесамляць з польскай нацыяй (падобны стан рэчаў быў ня толькі на эўрапейскім Усходзе, якім была Польшча, але і на эўрапейскім Захадзе: «пераварэньне» «селяніна ў француза» было актуальнай задачай яшчэ ў канцы XIX ст.).

Пры адсталай сацыяльнай структуры польскага грамадзтва (становішча сялян у Рэчы Паспалітай параўноўвалі зь месцам рабоў у сацыяльнай герархіі Паўночнай Амэрыкі) паміж элітамі і народнымі масамі заставалася непераадольная дыстанцыя. Пераадоленьне гэтага адчужэньня разумелася тэарэтыкамі польскага культурнага нацыяналізму (у якіх «народ» становіцца прадметам узьвелічэньня і «служэньня», а шляхта, ранейшая крыніца палітычнай улады Рэчы Паспалітай, успрымаецца як кляса паразытаў, прыгнятальнікаў і гвалтаўнікоў) як затушоўваньне культурных разьмежаваньняў.

Для польскага сялянства, якое ўцягвалася ў працэс пабудовы нацыі, гэтая новая рэдакцыя польскага нацыяналізму мела найперш культурны і толькі пасьля — палітычны зьмест[14]. Польская культурная спадчына ад тае пары «належала ўсім, хто далучыўся да нацыянальнай супольнасьці. У выніку польскі селянін, палянізаваны жыд, русін альбо немец станавіўся спадкаемцам польскай шляхты і ўсёй гісторыі Рэчы Паспалітай» (Е. Ядліцкі).

Шлях «з тутэйшых у палякі» (Ф. Багушэвіч) быў актуальны ў той час ня толькі для беларускага (насельніка Расейскай імпэрыі) мужыка, але і для ўкраінскага (жыхара імпэрыі Габсбургаў) інтэлігента. Польскаму праекту пабудовы нацыі спрыяла тое, што цягам доўгага часу русіны-ўкраінцы захоўвалі рэлігійны сьветагляд і ляяльнасьць да манархіі Габсбургаў. Калі хтосьці

[14] Шпорлюк Р. Комунізм і націоналізм. Карл Маркс проти Фрідріха Ліста: пер. з анл. Київ: Основи, 1998. С. 154—155.

з адукаваных русінаў пакідаў веру і імпэрскую дзяржаву і прымаў мадэрныя ідэі, ён станавіўся палякам. Для русінаў гэта быў адзіны шлях стаць эўрапейцамі ў мадэрнай Эўропе[15].

Польскі культурны нацыяналізм выходзіў з таго, што дасягненьне нацыянальнага адзінства магчымае адно пры ўмове кансалідацыі ўсяго грамадзтва на падставе супольнага культурнага досьведу. Пры гэтым ён захаваў мэсіянскі кампанэнт і набыў рэзкую антыімпэрскую скіраванасьць (царызм асуджаўся за ягоны мілітарызм і прыгон). Польская культура была непарыўным злучвом паміж падзеленымі між Расеяй, Аўстрыяй і Прусіяй землямі, а польская мова заставалася больш аднародная, чым тагачасная нямецкая альбо італьянская. У шматлікіх разох польская культура ня толькі захавала свае пазыцыі пры такіх умовах, але і была настолькі прывабная, што пад яе ўплывам палянізавалася і асымілявалася шмат немцаў, жыдоў, чэхаў, славакаў і нават расейцаў і французаў. (У 1860-х гадах жыдоў называлі «палякамі Майсеевай веры». Чартарыйскі і Лелявель выступалі за поўную роўнасьць жыдоў, уважаючы іх за таварышаў-суграмадзянаў, а не за чужнікоў.)

У пачатку XIX ст. нацыяналізм дасягнуў і расейскіх элітаў. Яго пашырэньне моцна замаруджвалі традыцыі расейскай жа палітычнай культуры, а таксама эканамічная адсталасьць краіны, у якой капіталістычныя стасункі пачалі актыўна разьвівацца толькі ў другой палове XIX ст. і дзе да аграрнай рэформы 1861 г. існаваў прыгон — форма рабства, уласьцівая фэадальным грамадзтвам.

Агульнае спазьненьне Расеі ў XIX ст. закранала ня толькі дзяржаўны лад, але і ўсё грамадзтва на ўсіх узроўнях ягонага функцыянаваньня. Стасоўна Расеі XIX ст. «грамадзтва» — праблематычнае паняцьце. Яно існуе хутчэй як жорсткая герархія сацыяльных роляў, а ня як грамадзянская супольнасьць.

---

[15] Шпорлюк Роман. Творення модерної України: західний вимір // Критика. 2004. № 7—8. С. 16, 18.

Гаспадарчы лад дзяржавы з XVI да пачатку XIX ст. амаль не зьмяніўся. Адрозна ад краінаў Захаду, Расея не прайшла стадыі гарадзкой гаспадаркі і ня ведала цэхавай арганізацыі. Ня зьведаўшы паўнавартаснай гарадзкой прамысловасьці, Расея ня мела і той своеасаблівай прамысловай культуры, якая на Захадзе выклікала да жыцьця фэномэн прамысловай рэвалюцыі і індустрыялізацыі[16].

Расейская імпэрыя ў XIX ст. заставалася аграмаднай голай тэрыторыяй: без буйных гарадоў (прамысловых цэнтраў) і сучасных тэхналёгіяў, з адсталай сельскай гаспадаркай, у якой зьведзеныя да становішча рабоў сяляне ўраблялі зямлю прымітыўнымі прыладамі працы. Расея была важным элемэнтам міжнароднай сыстэмы дзякуючы сваёй тэрыторыі і колькасьці насельніцтва, г.зн. дзеля здольнасьці фармаваць вялікае войска.

Прамысловае разьвіцьцё імпэрыі замаруджваў курс ураду на замарожваньне існуючых культурных стасункаў і недапушчэньне палітычных зьменаў. У Расеі не існавала ні ўсеагульнага навучаньня, ні сыстэмы грамадзянскіх правоў, што было неабходнай умовай для стварэньня дэмакратычнай дзяржавы. У міжнароднай эканоміцы Расея ўдзельнічала найперш як экспартэр сыравіны, хаця магчымасьці яе здабычы былі абмежаваныя дзеля тэхнічнае адсталасьці краіны.

Усплёск індустрыялізацыі адбыўся ў 1880-х гг., г.зн. больш чым праз трыццаць гадоў пасьля пачатку індустрыялізацыі ў Нямеччыне дзякуючы заканадаўчым і адміністрацыйным рэформам шасьцідзясятых гадоў XIX ст., якія стварылі неабходную для прамысловага разьвіцьця базу[17].

---

[16] Кантор В.К. Западничество как проблема русского пути // Вопросы философии. 1993. № 4. С. 30.

[17] Само па сабе скасаваньне прыгону 1861 г. не дало імгненнага эканамічнага эфэкту. Сур'ёзны прамысловы ўзрост адбыўся толькі тады, калі зь сярэдзіны васьмідзясятых гадоў дзяржава стала ўзрастаючымі тэмпамі будаваць чыгункі і зьмяніла сыстэму падаткаабкладаньня. Але нават пасьля гэтага расейская эканоміка працягвала пакутаваць ад нястачы капіталу для фінансаваньня буйнамаштабнай індустры-

Асноўнай прычынай эканамічнага адставаньня Расеі ад Эўропы было захаваньне прыгону да 1861 г. (І акурат незадаволенасьць сялянства стала рухальнай сілай і зарукай посьпеху расейскай рэвалюцыі 1917 г.) Эканамічная адсталасьць, у сваю чаргу, замаруджвала цыркуляцыю мадэрных, найперш нацыяналістычных ідэяў у целе расейскага грамадзтва, абмяжоўваючы яе адносна нешматлікай сацыяльнай групай інтэлігенцыі. Да таго ж магчымасьці для атрыманьня вышэйшай адукацыі меў толькі шляхецкі стан, і ў пару ўзьнікненьня нацыянальнага руху высокі ўзровень непісьменнасьці быў наўпрост зьвязаны зь нязначным маштабам літаратурнай дзейнасьці. Калі ўзьнікаў нацыянальны рух, часопісы і газэты існавалі толькі для эліты[18].

Расейская імпэрыя валодала адносна ўстойлівымі тэрытарыяльнымі межамі, манапольным сувэрэнітэтам на сваю тэрыторыю і бюракратычным ды вайсковым апаратам. Ажыцьцяўляючы стандартызацыю дзяржаўнага кіраваньня і гамагенізацыю тэрыторыі, нішчачы канкуруючых сувэрэнаў, у эпоху нацыяналізму яна апынулася перад выклікам стварэньня цесных сацыяльных сувязяў на аснове лінгвістычнай, этнакультурнай альбо рэлігійнай супольнасьці. Не дасягнуўшы дастатковай ступені гамагеннасьці і захоўваючы статус тэрытарыяльна-працяглай імпэрыі (за выняткам Аўстра-Вугоршчыны, пэрыфэрыі іншых імпэ-

---

ялізацыі. Мізэрныя стандарты сумленнасьці ў бізнэсе рабілі немагчымым прыцягненьне значных заходніх альбо ўнутраных пазыкаў. (Эканамічная і, у першую чаргу, камэрцыйная дзейнасьць лічыліся непарыўна зьвязанымі з падманам.) Каб забясьпечваць індустрыялізацыю капіталам, патрабаваўся прымусовы апарат ураду, які шляхам падатковай палітыкі накіроўваў прыбыткі ад спажываньня на інвэстыцыі.

Гл. Gershenkron Alexander. Economic Backwardness in Historical Perspective, a Book of Essays. Cambridge: Belknap Press of Harvard University Press, 1962.

[18] Нацыяналістычныя ідэі знаходзілі больш спрыяльную глебу там, дзе ішло актыўнае эканамічнае разьвіцьцё, напрыклад, у Царстве Польскім альбо ў Прыбалтыцы: нацыя творыцца пры дапамозе камунікацыі, урбанізацыі, масавай адукацыі і патрабуе ўдзелу ў палітычным жыцьці.

рыяў пераважна складаліся зь земляў, аддаленых ад мэтраполіяў на тысячы міль), яна не магла разьлічваць на ўстойлівае разьвіцьцё.

Палітыка тэрытарыяльнага пашырэньня імпэрыі стварала дадатковыя выдаткі для пабудовы мадэрнай расейскай нацыі. Манархія найперш апекавалася падтрымкай функцыянальнай дзеяздольнасьці расейскай дзяржавы, таму інтарэсы імпэрыі дамінавалі над інтарэсамі расейскай нацыі.

Пазьней гэтую практыку ігнараваньня расейскіх нацыянальных інтарэсаў на карысьць інтарэсаў савецкай імпэрыі без асаблівых зьменаў успадкуе камуністычны рэжым. Савецкі Саюз ня быў этнічна «расейскай імпэрыяй», у якой мэтраполія цалкам атаесамлялася б з пануючай нацыянальнасьцяй. Камуністычная намэнклятура таксама была шматнацыянальная. У абодвух выпадках месца пануючай нацыянальнасьці займаў акурат інстытут улады і панаваньня — дваранства/камуністычная эліта.

Кідаючы вялізныя рэсурсы на падтрыманьне імпэрскай інфраструктуры, савецкая сыстэма таксама аказалася ня ў стане вырашыць нацыянальнае пытаньне для расейцаў і таму празь семдзесят гадоў паўтарыла «самаразбуральную дынаміку» (Р. Шпарлюк) імпэрыі Раманавых: чым болей расейскія кіраўнікі спрабавалі мадэрнізаваць сваю імпэрыю, тым больш адсталай яна станавілася. У параўнаньні з Раманавымі, у імпэрыі Габсбургаў працэс мадэрнізацыі зайшоў значна далей, але гэтая дынастыя таксама апынулася ня ў стане прышчапіць падданым агульнаімпэрскую нацыянальнасьць, што зрабіла крах іх імпэрыі непазьбежным[19].

Тое, што *explicite* расейскія эліты атаесамлялі дзяржаву з нацыяй і дзяржаўныя інтарэсы з нацыянальнымі, але *implicite* ігнаравалі апошнія на карысьць першых, мела для Расеі цяжкія інтэлектуальныя наступствы. У расейскім мысьленьні ні ў XIX ст., ні стагодзьдзем пазьней не адбылося поўнай дээтаты-

[19] Гл. Szporluk Roman. The Making of Modern Ukraine: The Western Dimension. Harvard Ukrainian Studies. Volume XXV (1/2). 2001. P. 57—90.

зацыі расейскай нацыянальнай ідэі, калі дзяржава пачынае ўспрымацца ня як абсалют, што гняце грамадзтва, а ўсяго толькі як інстытут эфэктыўнага ажыцьцяўленьня нацыянальных інтарэсаў. Бяз гэтага адасабленьня ад дзяржавы, якая мысьліцца асноўнай праваднiцай нацыянальных інтарэсаў і гарантам забесьпячэньня правоў нацыі, расейскі нацыяналізм схіляўся да вульгарнай сакралізацыі дзяржавы і тым самым дэ факта пагаджаўся на яе рэдукцыю да ідэі тэакратыі, «валадарства Божага на зямлі»[20].

Будучы часткова вэстэрнізаванай краінай, Расейская імпэрыя выступала адначасова і як «дзеючая і супрацьдзеючая асоба» (Сэймур Бэйкер) імпэрыялістычнай экспансіі. Элемэнты мадэрнізацыі (так званыя Вялікія рэформы) былі няпоўныя: царызм да свайго краху блякаваў сур'ёзныя сацыяльныя і палітычныя трансфармацыі. Тым ня менш, што да сваіх «калянізаваных» суседзяў, царызм паводзіў сябе такім жа чынам, як Захад, — адносна сваіх заморскіх тэрыторыяў, г.зн. як цэнтар улады, чыя тэхналягічная і арганізацыйная перавага не пакідала гэтым тэрыторыям шанцаў перад яго экспансіяй[21].

Расейская імпэрыя адрозьнівалася ад астатніх эўрапейскіх імпэрыяў і іншымі парамэтрамі. Эўрапейскія імпэрыі разглядалі свае калёніі як залежныя тэрыторыі і не імкнуліся да іх асыміляцыі, Расея ж успрымала свае валоданьні як складовую частку сваёй палітычнай супольнасьці, адкрытую для сталага пасяленьня расей-

[20] Польскі гісторык М. Махнацкі ў кнізе «Powstanie narodu polskiego w roku 1830 i 1831» яшчэ ў першай палове XIX ст. адзначаў, што Расея застаецца дзяржавай, а не «грамадзкім целам», яна не стварыла ўласнай нацыі, і, нарэшце, яе падманлівая веліч грунтуецца на сіле ўраду. У сваёй ранейшай форме яна перастане існаваць разам са зьменай формы яе палітычнага ўладкаваньня. У ягонай трактоўцы Расея ўяўляецца палітычнай юрысдыкцыяй падданых розных нацыянальнасьцяў, нyздольная эфэктыўна навязваць ім усім супольную, «уніфікаваную» форму нацыянальнай сьвядомасьці.

[21] Becker Seymour. Russia's Protectorates in Central Asia: Bukhara and Khiva, 1865—1924. 2nd edition. London, New York: Routledge Curzon, 2003. P. XII.

цаў. І нарэшце, калі калёніі падпарадкоўваліся эўрапейскім нацыянальным дзяржавам, то расейская імпэрыя ўяўляла сабой больш архаічнае ўтварэньне — дынастычную дзяржаву, заснаваную на падпарадкаваньні ўсіх падданых аднаму вярхоўнаму кіраўніку.

Разьвіцца ў нацыянальную дзяржаву Расейская імпэрыя не магла не таму, што яе кіраўнікі хацелі будаваць імпэрыю замест нацыі, а таму, што гэты шлях у пару нацыяналізму быў ужо закрыты. У дынастычных імпэрыяў ужо не заставалася часу для асыміляцыі этнічных меншасьцяў — працэсу, які заняў бы час, роўны жыцьцю колькіх пакаленьняў[22].

Тое, што было магчыма ў дамадэрны час, г.зн. асымяляваць этнічныя меншасьці ў адносна гамагеннае ядро протанацыі на падставе супольнай рэлігійнай ідэнтычнасьці і палітычнай лаяльнасьці, стала амаль немагчымым у пару нацыяналізму, таму што ідэя нацыі са спадарожнымі прыцягальнымі канцэпцыямі прагрэсу і мадэрнасьці, прадстаўніцтва і дзяржаўнасьці аказаліся агульным здабыткам. Зьвязаны з канцэпцыяй нацыі заклік да народнага сувэрэнітэту, роўнасьці і дэмакратыі нанёс удар па няроўнасьці, герархіі і дыскрымінацыі як падставе імпэрыі, падарваўшы сэнс яе існаваньня. Захаваць самаўладзьдзе і правесьці канстытуцыйныя і лібэральна-дэмакратычныя рэформы толькі ў асобных імпэрскіх рэгіёнах, забясьпечыць эфэктыўнае эканамічнае разьвіцьцё і пабудаваць мадэрную нацыю было немагчыма. Імпэрыя не патрапіла цалкам выкарыстаць прадукцыйны патэнцыял свайго насельніцтва. З гэтай прычыны Расея не змагла (у адрозьненьне ад Японіі ці Нямеччыны, якія пабудавалі мадэрныя нацыі) пераадолець свайго эканамічнага адставаньня. Эканоміка заўсёды служыла падтрымкай дарагой імпэрскай структуры[23].

---

[22] Бэйкер Сеймур. Россия и концепт империи // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань: Центр исследований национализма и империи, 2004. С. 70—71, 79.

[23] Суни Рональд. Диалектика империи: Россия и Советский Союз // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань: Центр исследований национализма и империи, 2004. С. 170.

У адрозьненьне ад нацыі, у імпэрыі дыстанцыяванасьць і адрозьненьне кіраўнікоў ад кіраваных ёсьць часткай ідэалягічнай легітымізацыі кіруючай функцыі пануючага інстытуту. Права на ўладу ў імпэрыі выходзіць ад пануючага інстытуту, а не ад згоды кіраваных (Р. Суні). Тыя ж самыя спосабы асыміляцыі, з дапамогай якіх жыхароў Францыі ператварылі ў французаў, — школа, адміністрацыя, войска, — дзейнічалі ў Расеі ня так эфэктыўна. Узаемная варожасьць улады і грамадзтва паралізавала рэформы 1860-х гадоў, якія яшчэ маглі мадэрнізаваць Расею і выратаваць «трыадзіную» нацыю. Пазьней, калі сфармаваўся і ўзмацніўся ўкраінскі нацыяналізм, было ўжо позна. Адказ царызму на гэты рух — узмацненьне інтэграцыйных і асыміляцыйных тэндэнцыяў у апошнюю чвэрць XIX ст. — стаў для імпэрыі фатальным[24].

Расейскае нацыятварэньне ў XIX ст. выявілася праблематычным як за францускай мадэльлю, бо для гэтага патрабавалася маштабная мадэрнізацыя сацыяльнага і эканамічнага ўладкаваньня імпэрыі, ператварэньне падданых у грамадзян, так і згодна з культываванай у Нямеччыне дактрынай культурнай нацыі, бо сфэра пашырэньня высокай расейскай культуры была вузкая і абмяжоўвалася пераважна імпэрскімі адміністрацыйнымі цэнтрамі.

Кантраляваны дзяржавай «выхад» у Эўропу быў абмежаваны. У першую чаргу пазычаліся прамысловыя тэхналёгіі, у апошнюю — палітычныя ідэі і інстытуты накшталт прадстаўнічага парлямэнту, незалежнага судаводзтва альбо свабоды друку. Нежаданьне разьвівацца ў заходнім кірунку выразна выявілася ў канцы кіраваньня Кацярыны II і яе двух наступнікаў — імпэратараў Паўла

[24] Пар. Nowak Andrzej. Ab Imperio. Nowe spojrzenie na historię Rosji. Przegląd Wschodni. T. VIII. Zeszyt 3 (31). S. 605—630.

Дарэчна будзе адзначыць, што канцэпцыя «адзінай і непадзельнай Расеі» была культурным імпартам. Крыніцай пазычаньня была, бадай, француская «nation une et indivisible» (адзіная і непадзельная нацыя). Як вядома з гісторыі, у Францыі гэты першапачаткова палітычны прынцып быў пасьпяхова рэалізаваны, што нельга сказаць пра Расею.

(1796—1801) і Аляксандра (1801—1825). Канчаткова ўсё паставіла на сваё месца цараваньне Мікалая І (1825—1855), пры якім асноўнымі прынцыпамі расейскай дзяржаўнасьці сталі вядомыя праваслаўе, самаўладзьдзе і народнасьць. Гэтая дактрына сыгналізавала, што расейскі абсалютызм варожа ўспрымае пануючы на Захадзе дыскурс нацыяў. Яна была спробай стварыць яму альтэрнатыву, злучыўшы нацыю зь дзяржавай, манархам і дзяржаўнай рэлігіяй, тады як у самой Эўропе палітычная супольнасьць у форме нацыі ўжо адасаблялася ад дзяржавы і станавілася незалежнай крыніцай легітымнасьці ўлады[25].

Бэнэдыкт Андэрсан угледзеў у гэтай дактрыне адказ кіруючых групаў, пераважна дынастычных і арыстакратычных, на пагрозу выключэньня альбо маргіналізацыі ва ўяўленай супольнасьці. Гэты адказ быў глыбока кансэрватыўны і заснаваны на проціпастаўленьні ідэалізаванай сьвятой Русі бязбожнай і рэвалюцыйнай Эўропе.

Мікалаеўская афіцыйная народнасьць ўяўляла сабой трансфармаваны міт эўрапейскага абсалютызму XVIII ст. Складнікі народнасьці ў гэтым кантэксьце разумеліся па-ўнівэрсалісцку як абавязковыя для ўсіх падданых ляяльнасьць манарху, любоў да ўлады і рэлігійнасьць. (Кансэрватыўны момант палягаў у тым, што нідзе ў Эўропе ў той час ўзаемадачыненьні манархаў і падданых ужо не грунтаваліся на гэтых прынцыпах.) Нацыяналістычная мадэль рэпрэзэнтацыі самадзяржаўя замацоўваецца толькі ў 1880-х гадах: сучаснасьць тлумачылася як вяртаньне пэўнай ідэалізаванай мінуўшчыны, як матэрыялізацыя іманэнтнай нацыянальнай памяці, тым часам як гістарычная дыстанцыя паміж мінулым і цяперашнім паддавалася сымбалічнаму забыцьцю (Р. Ўортман). Сваёй сакральнай функцыяй улада лічыла распазнаньне суцэльнага і гамагеннага цела нацыі

[25] Суни Рональд. Диалектика империи: Россия и Советский Союз // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань: Центр исследований национализма и империи, 2004. С. 185.

і ачышчэньне яго ад чужародных напластаваньняў і скажэньняў[26].

Гэтая дылема Расеі як аб'екта і суб'екта вэстэрнізацыі, адсталай імпэрыі з «мадэрнізацыйнымі канвульсіямі» агаляе праблематычнасьць палітычных, эканамічных, сацыяльных і культурных перадумоваў для пабудовы мадэрнай расейскай нацыі. «Нават у 1914 г. расейцы не былі праўдзівай нацыяй» (Дамінік Ліўен). Расейскай імпэрыя ажно да моманту свайго распаду ня стала нацыянальнай дзяржавай, а нацыянальная самасьвядомасьць расейцаў не набыла скончанай, «эўрапейскай» формы: адзінства краіны забясьпечвалася ня зьнізу, нацыянальнай і палітычнай самасьвядомасьцю яе грамадзян, але зьверху, дэспатычнай і неабмежаванай уладай кіруючай алігархіі.

Гэта ня значыць, што ні ў XIX, ні ў XX ст. не існавала самой магчымасьці пабудовы «мадэрнай» расейскай нацыі. У XIX ст. ў Расеі існавалі элемэнты «супольнай сацыяльнай прасторы» альбо «звышнацыянальнай сыстэмы» (Л. Грынфэлд), якія рабілі магчымым пашырэньне заходніх нацыяналістычных ідэяў. Зьдзейсьнены імпарт заходняй ідэі «нацыянальнай дзяржавы» меў перадумовай існаваньне супольнай сацыяльнай мадэлі, уласьцівай толькі для такіх грамадзтваў, якія штосьці значаць адно для другога. Праўдападобна, гэтая супольная сацыяльная (калі ўлічваць ролю ідэяў у гісторыі нацыяў, лепш сказаць, культурная альбо мэнтальная) прастора была створана хрысьціянствам і, магчыма, Рэнэсансам[27].

На думку Э. Сьміта, маральны і інтэлектуальны падмурак ранняга расейскага нацыяналізму заклаў М. Карамзін. Сьпярша ён быў збольшага абарончы і кампэнсаторны. У цэнтры гісторыяў

---

[26] Гл. Уортман Р. Сценарии власти. Мифы и церемонии русской монархии от Петра Великого до смерти Николая I. Т. 1.: пер. с англ. С.В. Житомирской, И.А. Пильщикова. Москва: ОГИ, 2002.

[27] Выходзячы з таго, што яшчэ з XVIII ст. расейскія валадары спрабавалі ўпісаць сваю дзяржаву ў эўрапейскі кантэкст, Л. Грынфэлд з дапамогай канцэпцыі «супольнай сацыяльнай прасторы» абгрунтоўвае правільнасьць залічэньня Расеі да Эўропы.

Карамзіна — вобраз Расеі як пастаяннай ахвяры нядобразычлівых суседзяў, гатовых заўсёды скарыстаць зь яе слабасьці. Паводле Карамзіна, патрэбамі імпэрыі былі неабходнасьць захаваць бясьпеку дзяржавы ад вонкавых ворагаў, аднавіць радавыя валоданьні Рурыкавічаў, дамагчыся павагі іншаземцаў, абараніць суседнія народы і прынесьці ім усьлед за заваёвай прагрэс і цывілізацыю (пад цывілізацыяй альбо асьветай разумелася кіраваньне канкрэтна ўзятым народам звонку).

Імкнучыся апраўдаць сваё права кіраваць народамі, якія сталі ператварацца ў нацыі, імпэрская эліта выкарыстоўвала ідэю мадэрнізацыі «малодшых» і нецывілізаваных народаў у якасьці галоўнага сродку легітымацыі імпэрскага ладу аж да XX ст.[28].

Тым самым яшчэ ў першай палове XIX ст. імпэрыялістычная традыцыя аб'ядналася з расейскім нацыяналізмам. Экспансіяністкія амбіцыі і імпэрскае бачаньне суіснавалі і сталі неад'емнай часткай пазьнейшых праяваў расейскага нацыяналізму.

Дарма што імпэрская адміністрацыя блякавала спробы атаясаміць расейскасьць з «простым народам, нацыянальным строем і барадой» (Рональд Суні)[29], расейскія нацыяналісты заклікалі забясьпечыць дзяржаву абгрунтаваньнем у выглядзе этнічнай нацыі, а таксама шляхам культурнай русіфікацыі зьнішчыць праявы нерасейскага нацыяналізму, прымусіць чальцоў этнічных меншасьцяў ідэнтыфікаваць сябе з расейскай нацыяй, дынастыяй і манархіяй.

---

[28] Гл. Суни Рональд. Диалектика империи: Россия и Советский Союз // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань: Центр исследований национализма и империи, 2004. С. 172.

[29] Ляяльнасьць прасталюдзінаў мусіла быць зьвернутая да асобы манарха, а не да абстрактнай нацыі, і гэтыя спробы нівэляваліся магутнай супрацьвагай у выглядзе наднацыянальных ідэнтыфікацыяў падданых Расеі з імпэрыяй, праваслаўем і славянствам. Царскае самаўладзьдзе, нягледзячы на ўсе ягоныя саступкі розным нацыяналістычным плыням, заставалася верным прынцыпам данацыянальнай дынастычнай станавай палітыкі, якая толькі і магла забясьпечыць сацыяльна-палітычную стабільнасьць імпэрыі. Гл. Каппелер Андреас. Россия — многонациональная империя: возникновение, история, распад. Москва, 1997. С. 183.

Як раней нямецкі і польскі, расейскі нацыяналізм сцьвярджаў уласную «missions civilisatrices». Філёляг і журналіст Мікалай Грэч адмаўляў самабытнасьць беларускай мовы і гаварыў пра вышэйшасьць расейскай над іншымі мовамі: «Наша мова — і пра гэта можна ўпэўнена казаць — вышэйшая за ўсе сучасныя мовы». Ягоны калега, ураджэнец Меншчыны Фадзей (Тадэвуш) Булгарын прадвяшчаў, што ў будучыні кожны будзе ведаць расейскую мову: «Расейская мова, якая, несумненна, мае першае месца мэлядычнасьцю, багацьцю і лёгкасьцю пабудовы словаў, — гэта мова паэзіі і літаратуры ва ўсіх краінах зямной кулі»[30].

Як адзначыў яшчэ А. Цьвікевіч, ідэю Гегеля пра гісторыю як праяву сусьветнага духу, ягоную пропаведзь «абранасьці» нямецкай нацыі як адзінага праўдзівага носьбіта гэтай ідэі, Хамякоў і Кірэеўскі перанесьлі на расейскую глебу і стварылі тэорыю аб асаблівай «абранасьці» Расеі як носьбіткі ідэі славянства[31].

Расейскі нацыяналістычны мэсіянізм увасобіўся таксама ў ідэі, што «асаблівы» характар разьвіцьця расейскага народу, агульная адсталасьць і спазьненьне Расеі — гэта, насамрэч, яе перавага, паколькі структурна яна лепш падрыхтаваная для прагрэсіўнага шляху разьвіцьця. Была вылучана канцэпцыя «расейскага асаблівага шляху»[32].

У трактоўцы раньняга расейскага нацыяналіста М. Каткова паняцьце «расейскасьці» становіцца поліэтнічным і поліканфэсійным, а ў герархіі ідэнтычнасьці галоўная роля адводзіцца расейскай мове («найтрывальшай з усіх заваёваў ёсьць заваёва, зробленая мовай якога-небудзь народу»). У сваёй публіцыстыцы Кат-

---

[30] Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 37.

[31] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XXст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 203.

[32] Само паняцьце, як сцьвярджае А. Бэзансон, было пазычана з рамантычнай Нямеччыны, «гэтай вялікай лябараторыі думкі». Прывязка паняцьця «Sonderwege» да эпохі нямецкага рамантызму даволі спрэчная, паколькі яно было выпрацавана прынамсі яшчэ ў 50-я гг. XVIII ст.

коў атаесамляў імпэрыю і нацыю. У красавіку 1863 г. ён пісаў: «Ёсьць у Расеі адна пануючая нацыянальнасьць, адна пануючая мова, выпрацаваная стагодзьдзямі гістарычнага жыцьця». Шматлікія плямёны з разнастайнымі мовамі і звычаямі павінны адчуваць яднаньне зь «вялікім расейскім сьветам». У імя ляяльнасьці да царскай дынастыі ім належыць шукаць сябе ў «адзінстве дзяржавы, у адзінстве вярхоўнай улады», у «Цару, у жывым абсалютным увасабленьні гэтага адзінства»[33].

Рылееў і іншыя дзекабрысты заклікалі да «вызваленьня» Мэксыкі ад гішпанскага панаваньня і анэксіі Каліфорніі. Цютчаў адстойваў ідэю панславянскага адзінства на чале з усеславянскім, а ня проста расейскім царом і заклікаў да заваёвы Канстантынопалю. Вільня для яго была адвечна расейскім горадам.

На сярэдзіну XIX ст. прыпадае палеміка наконт расейскай нацыянальнай сьвядомасьці паміж лягерам славянафілаў (І. Кірэеўскі, А. Хамякоў і К. Аксакаў) і лягерам «заходнікаў», які сфармаваўся на грунце гуртка М. Станкевіча і ў які ў розны час уваходзілі В. Бялінскі, А. Герцэн і іншыя. Найважнейшым вынікам гэтай палемікі была выпрацоўка дыхатаміі «Захад—Усход» як культурнарэлігійнага крытэру для асэнсаваньня эўрапейскай мінуўшчыны[34].

Расейскія нацыяналісты накшталт Дастаеўскага прапагандавалі новы калектывізм, заклікалі вызваліць нацыянальную сьвядомасьць ад згубных заходніх уплываў. У сваёй ідэалёгіі яны сьвя-

---

[33] Катков М.Е. 1863 год. Собрание статей по польскому вопросу. Москва, 1887. С. 100—101.

[34] Нягледзячы на ўтапізм і нацыяналізм і першых, і другіх, паміж імі існавалі дзьве найважнейшыя сьветаглядныя супярэчнасьці: 1. індывідуалізм супраць калектывізму (у славянафілаў незалежнасьць асобы павялічвае ізаляцыю паміж людзьмі, ставіць пад сумнеў вастрыню рэлігійных перажываньняў чалавека; асоба дасягае свабоды адно тады, калі яна здолее зьліцца з калектывам); 2. рацыяналізм супраць арганіцызму (у заходнікаў перадумовай свабоды была рацыяналізацыя і індывідуалізацыя сьвядомасьці, тым часам славянафілы сьцьвярджалі, што сапраўдная свабода дасягаецца праз безрэфлексіўную веру; ідэалам славянафілаў была «арганічная» сувязь індывіда з калектывам, заснаваная на веры, традыцыях

дома атаесамлялі маральнае (ідэю, што Расея адновіць на зямлі хрысьціянскае царства дабра і справядлівасьці) і эгаістычна-імпэрыялістычнае (заклікаючы нарошчваць расейскую палітычную магутнасьць)[35].

Асабліва незамірэнчым нованароджаны расейскі нацыяналізм быў да больш раньняга польскага нацыяналізму. Калі ўперад польска-расейская варажнеча была праявай канкурэнцыі імпэрскіх амбіцыяў дзьвюх дзяржаваў, то ў XIX ст. яна ўвайшла ў стадыю жорсткага ідэалягічнага супрацьстаяньня двух агрэсіўных нацыяналізмаў.

Акупацыя Расейскай імпэрыяй часткі тэрыторыі Рэчы Паспалітай паставіла першую перад праблемай, невядомай для заходнеэўрапейскіх імпэрыяў: інтэграцыі стратэгічна важных тэрыторыяў з вышэйшым, чымся ў цэнтры, узроўнем культурнага разьвіцьця. У яе аснове была немагчымасьць асыміляваць палякаў і прымусіць ужо нацыянальна сьвядомую польскую эліту да калябарацыі з імпэрыяй. Паўстаньні 1830—1831 і 1863 гг. далі моцны штуршок да разьвіцьця расейскага нацыяналізму, які пачаў выступаць супраць ідэі наднацыянальнай імпэрыі пад лёзунгам барацьбы з «польскай пагрозай». Пасьля 1863 г. адукаваную расейскую публіку накрыла хваля нацыяналістычнай гістэрыі.

---

і маральных уяўленьнях; заходнікі пастулявалі неабходнасьць ператварыць просты люд у «народ», славянафілы настойвалі ж на вяртаньні «інтэлігенцыі» ва ўлоньне народу; заходнікі спагадна ставіліся да капіталізму і новага буржуазнага ладу як праваднікa лібэральна-дэмакратычных вартасьцяў у расейскім грамадзтве; славянафілы адмаўлялі капіталістычны шлях разьвіцьця Расеі).

Валіцький А. В полоні консервативної утопії. Структура і видозміни російського слов'янофільства: пер. з польськ. К.: Основи. 1998. С. 508—514.

Акрамя таго, славянафілы меркавалі, што першапачатковай рэлігіяй усіх славян, улучна з заходнімі, было праваслаўе, а іх альфабэтам — кірыліца. Падзелы і звады паміж славянамі сталі вынікам экспансіі заходняй цывілізацыі. Таму насельніцтва ўсіх славянскіх земляў неабходна ўзьяднаць з Расеяй — носьбіткай чыстай славянскай традыцыі.

[35] Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 351.

# II. ПЕРШЫЯ НАЦЫЯНАЛІСТЫ

## ДАМАДЭРНАЕ ПАНЯЦЬЦЕ БЕЛАРУСІ. БЕЛАРУСЬ ЯК ЗОНА ПОЛЬСКАГА НАЦЫЯТВАРЭНЬНЯ

*Na Bożym sudzie — usim u sraku budzie!*

Адзінае вядомае выслоўе Адама Міцкевіча
на беларускай мове.

*Жывучы ня ў Польшчы, мы пачуваемся як бы ў Польшчы і нават лепей, чымся ў праўдзівай Польшчы.*

З адрасу польскай шляхты расейскаму ўраду пасьля
падзелаў Рэчы Паспалітай.

*Беларуская або руськая мова: пад гэтай назвай сталі апошнімі часамі разумець тую барбарскую мову, якой пісалі Скарына, Сымон Полацкі, Лазар Барановіч і інш. духоўныя пісьменьнікі, якія сфармаваліся пад уплывам Польшчы: гэта сумесь больш ці менш шчыльная польскіх выразаў і слоў з расейскімі.*

Языкоў Дз.І. Энцыкляпэдычны лексыкон
Плюшара. 1837.

*Пасьля каранацыі ў 1802 г. Джыа-лонг пажадаў назваць сваё каралеўства «Nam Việt» і выслаў пасланцоў, каб атрымаць згоду Пэкіна. Маньчжурскі Сын Нябёсаў, аднак, настаяў на назьве «Việt Nam». Падстава для такой інвэрсіі была наступная: «Việt Nam» (альбо па-кітайску Yüeh-nan) значыць прыблізна «на поўдзень ад Việt (Yüeh)», г.зн. ад заваяванай сямнаццаць стагодзьдзяў назад дынастыяй Хань вобласьці, разьмешчанай, як мяркуюць, на тэрыторыі цяперашніх правінцый Квантун і Квансі, а таксама ў даліне Чырвонай ракі. «Nam Việt» Джыа-лонга значыла, аднак, «Паўднёвы Việt/Yüeh», што мела прэтэнзіі на кітайскую тэрыторыю. Паводле словаў Аляксандра Вудсайда, назву «Віетнам», навязаную Пэкінам, сто гадоў таму віетнамскія кіраўнікі наўрад ці цанілі так высока, як у цяперашнім стагодзьдзі. Гэтая штучная назва не выкарыстоўвалася шырока ні кітайцамі, ні віетнамцамі...*

Бэнэдыкт Андэрсан. Уяўленыя супольнасьці.

Белая Русь, больш вядомая як Беларусь, — гэта літаратурны твор, які ўпершыню фіксуецца ў летапісах XIII ст. («Incipiunt descriptiones terrarum»), праўдападобна, адносна цяперашняга расейска-карэльскага памежжа. Пазьней гэтую паразытарную блукаючую назву ўжывалі ў дачыненьні розных украінскіх рэгіёнаў, усёй Маскоўскай дзяржавы, Паўночнага Прычарнамор'я і Прыазоўя, Пскоўскай вобласьці і іншых усходнеэўрапейскіх тэрыторыяў.

У часы Вялікага Княства Літоўскага ягоныя рускія землі ніколі ў дзяржаўных дакумэнтах не называліся «беларускімі». Толькі ў 1555 г. тэрмін «Белая Русь» быў выкарыстаны з «вонкавай пазыцыі» для апісаньня часткі Вялікага Княства Літоўскага. У канцы 1570-х гг. ён распаўсюджваўся на акупаваную з 1563 г. Іванам Жахлівым частку ВКЛ. У 1627 г. Белая Русь як частка ВКЛ упершыню згадваецца ў афіцыйных дакумэнтах Рэчы Паспалітай. У 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч уводзіць назву ў свой царскі тытул. З канца 1650–х гг. тэрмін «Белая Русь» на эўрапейскіх картах

канчаткова замацоўваецца за Полацкім ваяводзтвам і пачынаючы з 1720-х гг. зьнікае зь іх у значэньні «Маскоўская дзяржава»[1].

Палітычныя, культурныя і адміністрацыйныя эліты Літвы, г.зн. паўночна-ўсходніх ускраін Рэчы Паспалітай, інкарпараваных у канцы XVIII ст. у Расейскую імпэрыю, на мяжы XVIII і XIX ст. не валодалі цяперашнім уяўленьнем аб Беларусі, а навуку і літаратуру таго часу не цікавіла моўная і культурная своеасаблівасьць беларусаў.

У першыя дзесяцігодзьдзі расейскага кіраваньня традыцыйныя правы і прывілеі мясцовай шляхты былі захаваныя. На гэты рэгіён са «старымі, замацаванымі сацыяльнымі і палітычнымі структурамі заходнеэўрапейскага тыпу» (С. Бэкер) адразу пасьля інкарпарацыі не распаўсюджвалі расейскіх адміністрацыйных і праўных нормаў — коштам іх увядзеньня была палітычная дэстабілізацыя. Самі шляхціцы ўспрымаліся новай уладай як прадстаўнікі заходняй культуры, а іх шлюбы з расейскай арыстакратыяй заахвочваліся. Расейская прысутнасьць у Беларусі абмяжоўвалася вайсковым і адміністрацыйным апаратам і нешматлікімі земляўласьнікамі, якія атрымалі ў краі маёнткі.

У першай трэціне XIX ст. Беларусь заставалася замежнай тэрыторыяй, а яе гісторыя і геаграфія былі вылучаныя з інтэграцыйных наратываў імпэрыі. У ёй фактычна быў закансэрваваны зьніклы з палітычнай мапы польскі сьвет: захоўваліся традыцыйныя структуры польскай адукацыйнай сыстэмы, судаводзтва, сацыяльнага ўзаемадзеяньня і г.д. Эканоміка і адміністрацыя таксама знаходзіліся ў польскіх руках. Запачаткаваная яшчэ да падзелаў папулярызацыя польскай мовы была працягнутая. Лад жыцьця польскай шляхты сур'ёзна не зьмяніўся і трымаўся на трывалай традыцыі шляхецкай салідарнасьці («komitywy szlacheckiej»). Розьніца паміж Беларусяй і «карэннай» Польшчай заставалася нязначная — хіба што тут народныя масы былі этнічна беларускія, а там — польскія[2].

[1] Гл. Белы Алесь. Хроніка Белай Русі. Chronicon Russiae Albae. Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы. Мінск: Энцыклапедыкс, 2000.

[2] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XXст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 44.

Польская эліта першай у Расейскай імпэрыі ўбачыла шанец на існаваньне ўласнай нацыі ва ўмовах безьдзяржаўнасьці ў нацыятварэньні. Дзякуючы яму маладая польская нацыя спадзявалася заняць годнае месца сярод іншых нацыяў, змагацца зь імі і давесьці сваю самакаштоўнасьць і незалежнасьць. Насьледуючы запаветам Жан-Жака Русо, польская эліта рабіла стаўку на разьвіцьцё адукацыі і навукі, найперш айчыннай гісторыі, літаратуры і этнаграфіі. Польскамоўныя школы вызначалі межы польскай ідэнтычнасьці, дый самой Польшчы, якая пасьля падзелаў стала віртуальнай дзяржавай. Польшча была там, куды даходзіла сетка польскіх школ і куды сягала ўяўленьне іх вучняў. Таму ішла зацятая барацьба за мову выкладаньня і навучальную праграму гэтых школаў, а пасьля іх дэлегалізацыі ў другой палове XIX ст. — за самое іх існаваньне[3]. Толькі ў 1825 г. у сярэдніх школах Беларусі абавязковым прадметам стала гісторыя Расеі, якая выкладалася па-расейску[4].

Вучням школ Віленскай навучальнай акругі прышчаплялася польская ідэнтычнасьць, найперш з дапамогай курсаў літаратуры і гісторыі. Напрыклад, сярод экзамэнацыйных пытаньняў зь літаратуры за 1822 г. былі наступныя: У якім стагодзьдзі пачалася гісторыя Польшчы? Як хрысьціянства паўплывала на разь-

---

[3] Пільны М. Каяловіч у часопісе «Новое время» (1882 г.) пісаў:

> *Навокал Вільні ідзе ўзмоцненая агітацыя на карысьць палянізму... Патайныя польскія школы вырастаюць, як грыбы, па гарадох і асабліва па вёсках; масы польскіх кніжак распаўсюджваюцца ў народзе.*

У 1881 г. толькі ў гэтым рэгіёне было выкрыта 144 тайныя польскія школы. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм»... С. 265.

Простым эфэктам здушэньня польскамоўнай адукацыі стала страта кантролю імпэрскай улады над польскім нацыятварэньнем. Польскія эліты пры неафіцыйнай падтрымцы каталіцкай герархіі і шляхты перавялі працэс навучаньня ў цень, памнажаючы сеткі падпольных школак.

[4] Beauvois D. Szkolnictwo na ziemiach litewsko-ruskich. 1803—1832. T. II. Szkoły podstawowe i średnie, Rzym: Fundacja Jana Pawła II; Lublin: Redakcja Wydawnictw KUL. S. 348.

віцьцё адукацыі ў Польшчы? У якім стагодзьдзі пачалося разьвіцьцё адукацыі ў Польшчы? Калі прыйшлі ў Польшчу езуіты, піяры? На якія пэрыяды можна падзяліць гісторыю Польшчы[5]?

Найважнейшым сродкам польскага нацыятварэньня ў Беларусі становіцца імпэратарскі Віленскі ўнівэрсытэт[6], створаны 4 красавіка 1803 г. згодна з указам цара Аляксандра I. Ён хутка ператварыўся ў навучальную ўстанову зь міжнародным аўтарытэтам, а таксама ў апірышча «польскасьці», якое рэалізоўвала стратэгію абароны польскай ідэнтычнасьці і разьвіцьця польскай нацыі[7].

У першае дзесяцігодзьдзе XIX ст. у Віленскім унівэрсытэце навучалася 525 студэнтаў, у Дэрпцкім — 193, у Маскоўскім — 135, у Харкаўскім — 82, у Казанскім — каля 50[8].

Вільня таксама стала сталіцай найбольшай у імпэрыі навучальнай акругі, якая ахоплівала сьпярша восем губэрняў (разам зь Беластоцкім краем). У 1813 г. павятовыя школы і гімназіі Віленскай акругі наведвалі амаль 13 тыс. вучняў, у той час як у Харкаўскай акрузе іх налічвалася каля 8,15 тыс., у Маскоўскай — амаль 6,5 тыс., у Дэрпцкай — менш за 6 тыс., у Пецярбурскай — каля

[5] Тамсама. S. 345.

[6] Ідэя падпарадкаваць унівэрсытэт задачам нацыятварэньня стала здабыткам эліт Цэнтральнай Эўропы: адным зь першых актаў новага ўраду Вугоршчыны падчас сакавіцкай рэвалюцыі 1848 г. стала падрыхтоўка «Асноўных правілаў вугорскага ўнівэрсытэту» — законапраекту для правядзеньня глыбокай унівэрсытэцкай рэформы, накіраванай на мадэрнізацыю структуры і спосабаў выкладаньня ў заснаваным у пару сярэднявечча Пэшцкім унівэрсытэце, на павышэньне ягонага грамадзкага статусу як нацыянальнага цэнтру асьветы і навукі.

Гл. Андрєєв Андрєй. «Національна модель» університетської освіти: проблеми виникнення та розвитку в Західній Європі та Російській імперії // Схід/Захід. Історіко-культурологічний збірник. Випуск 7. Харків — Київ: Критика, 2005. С. 76.

[7] Буковєц Павел. Імператорський Віленський університет і литуаністичний рух // Схід/Захід. Історіко-культурологічний збірник. Випуск 7. Харків — Київ: Критика, 2005. С 110.

[8] Вішлєнкова Єлєна. Корпоративність і етнічна ідентичність Казанського імператорського університету // Схід/Захід. Історіко-культурологічний збірник. Випуск 7. Харків — Київ: Критика, 2005. С. 172.

4,65 тыс., а ў найменшай, Казанскай, — блізка 4,2 тыс. З часам гэтая дыспрапорцыя стала яшчэ большая: у 1820 г. у Віленскай акрузе колькасьць пачатковых школ з польскай мовай выкладаньня павялічылася да 430 насупраць 70 у 1803 г.[9].

Статус-кво быў парушаны польскім паўстаньнем 1830—1831 гг. У адрозьненьне ад элітаў былой Рэчы Паспалітай, у той час сярод пецярбурскай бюракратыі ідэі мадэрнага нацыяналізму не атрымалі значнага пашырэньня, і імпэрыя зрэагавала згодна зь лёгікай дынастычнай манархіі. Афіцыйны Пецярбург стаў узмацняць адміністрацыйную і нарацыйную інтэграцыю Літвы (зразуметай у дамадэрным значэньні) з імпэрскім цэнтрам, пашыраць зямельныя ўладаньні расейскага дваранства, абмяжоўваць зямельныя надзелы карэнных земляўласьнікаў, спрыяць прытоку расейскай бюракратыі. У 1840 г. на ўсіх беларускіх землях перастаў дзейнічаць Літоўскі статут[10], годам раней ліквідавана ўніяцкая царква, у 1832 г. закрыты Віленскі ўнівэрсытэт. Пачалася русіфікацыя сыстэмы асьветы і ціск на каталікоў. У 1836 г у Віцебскай

---

[9] Западные окраины Российской империи. Москва: НЛО, 2006. С. 95—96.

[10] Увядзеньне ў Беларусі расейскіх праўных стандартаў узмацніла культурную траўму ў мясцовага грамадзтва. «Культурны бар'ер, які адмяжоўваў палякаў ад расейцаў, быў значна большы, чым паміж палякам і аўстрыйцам і нават паміж палякам і немцам».

Radzik R. Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Białorusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-Wschodniej XIX stulecia. Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2000. S. 100.

Вэстэрнізаваная польская эліта асабліва пільна адчувала беспадстаўнасьць расейскіх прэтэнзіяў на асаблівую цывілізацыйную місію:

«Палякі часта мелі рацыю, калі гаварылі аб прыкладах «маскальскага барбарства», якое прыносілі з сабой гэтыя [расейскія] культуртрэгеры», бо «індывідуальна-парлямэнтарны лад Беларусі эпохі Літоўскага статуту... рэзка адрозьніваў Беларусь ад Расеі на працягу многіх стагодзьдзяў». Цьвікевіч таксама бачыў «большую гістарычную сувязь Беларусі з Заходняй Эўропай, чым з Маскоўскім княствам».

Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XXст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 228.

У такой жа сытуацыі знаходзіліся жыхары іншых земляў Рэчы Паспалітай, далу-

і Магілёўскай губэрнях было забароненае выкладаньне на польскай мове.

На працягу ўсяго гэтага часу польская эліта прытрымлівалася імпэрскай структуры арыенціраў і прэтэндавала на гісторыю і культуру Беларусі як на сваю ўласнасьць. На яе думку, польская мова павінна стаць адзінай мовай беларусаў, а ўваходжаньне беларускіх земляў у склад Польшчы — неабходнай умовай пасьпяховага разьвіцьця будучай польскай дзяржавы. Дамадэрная канцэпцыя шляхецкай нацыі была адкінутая на карысьць мадэрнай канцэпцыі нацыі як супольнасьці носьбітаў польскай мовы і культуры. З тае прычыны, што гэтая канцэпцыя разглядалася ў якасьці неабходнай перадумовы польскай дэмакратыі, павелічэньне колькасьці носьбітаў польскай сьвядомасьці стала найважнейшым напрамкам нацыянальнай актыўнасьці. Любы рэгіяналізм, напрыклад, культывацыя асобнай рускай альбо літоўскай культуры і мовы, жорстка караўся. Усходняя частка былой Рэчы Паспалітай павінна была засвоіць польскую мову і стаць арганічнай часткай

---

чаных да Расейскай імпэрыі. Маларосія да сярэдзіны XIX ст. таксама захоўвала сыстэму, заснаваную на ўладзе закону (шмат мясцовых пасадаў, былі, прынамсі, фармальна, выбарныя).

Пар. Szporluk Roman. The Making of Modern Ukraine: The Western Dimension. Harvard Ukrainian Studies. Volume XXV (1/2). 2001. P. 57—90.

Ва ўкраінскім дыскурсе гэтае сацыяльна-праўнае і, у шырокім сэнсе, культурнае адрозьненьне паміж украінцамі і расейцамі атрымала распрацоўку параўнальна рана. Ужо сучасьнік Багушэвіча М. Драгаманаў (1841—1895) выказваў меркаваньне, што «галоўнае адрозьненьне паміж украінцамі і расейцамі абумоўлена хутчэй сацыяльна-палітычнымі фактарамі, чым этнічнасьцю, мовай альбо рэлігіяй». Пазьней гэту тэзу паглыбіў украінскі палітоляг Вячаслаў Ліпінскі:

> *Галоўным адрозьненьнем паміж Украінай і Масковіяй ёсьць ня мова, ня племя, ня вера ... а розная палітычная сыстэма, якая складалася стагодзьдзямі, розны спосаб арганізацыі кіруючай эліты, розныя ўзаемадачыненьні паміж вышэйшымі і ніжэйшымі клясамі, паміж дзяржавай і грамадзтвам — паміж тымі, хто кіраваў, і тымі, кім кіравалі.*

Цыт. пав.: Химка Дж.-П. Зародження польської соціал-демократії та українського радикалізму в Галичині (1860—1890). Київ: Основні цінності, 2002. С. 22.

Польшчы. Рамантычны ідэал польскай геапалітыкі прадугледжваў, што Польшча, адноўленая ў межах 1772 г., павінна стаць свайго роду антырасейскім стратэгічным фарпостам у Цэнтральна-Ўсходняй Эўропе. Каб забясьпечыць стабільнасьць Польшчы ў будучыні, належала разбурыць існуючую Расейскую імпэрыю і дывэрсыфікаваць яе геапалітычную тэрыторыю на як мага больш складнікаў-дзяржаваў. (Гэта ідэя была падобнай да ідэяў кардынала Рышэльё, які два стагодзьдзі да гэтага выношваў плян падзелу нямецкіх княстваў для ўзмацненьня стратэгічных пазыцыяў Францыі на ўсходзе). Уваскрэслая Рэч Паспалітая мелася стаць апірышчам свабоды ў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропе і споўніць нейкую вызвольную місію[11].

У першыя дзесяцігодзьдзі XIX ст. адбываецца фармаваньне вызначальных мэтафарычных і нарацыйных структураў, з дапамогай якіх канструявалася Беларусь (многія зь іх акажуцца надзіва жывучымі, працягнуўшы сваё існаваньне і ў XX ст.). Каб заахвоціць набыцьцё этнічнымі беларусамі польскай нацыянальнай сьвядомасьці, прыналежнасьць да гэтай этнічнай групы належала пазбавіць рэштак сацыяльнага і культурнага прэстыжу. І сфармаваны наратыў апісваў беларусаў як плебейскі этнас. Ён уключаў перакананьне, што няма такога народу, а ёсьць толькі этнаграфічная маса, якая неўзабаве пад уплывам польскай культуры набудзе польскую ідэнтычнасьць.

У рамках наратыву Беларусь паўстае малазаселенай, «незанятай» зямлёй, культурна аморфным, мяшаным, а то й засьмечаным замежнымі ўплывамі асяродзьдзем, прагрэс і мадэрнізацыя якога немагчымыя без асыміляцыі з боку пануючай і нашмат вышэйшай польскай культуры. У разьвіцьці мадэрнай польскай ідэнтычнасьці, як пазьней і расейскай, Беларусь адыгрывала ролю калянізаванага іншага. Польская літаратура арыенталізавала Беларусь, каб уз-

---

[11] Гл. Nowak Andrzej. Between imperial temptation and anti-imperial function in eastern European politics: Poland from the eighteenth to twenty-first century. Slavic Euroasian Studies, Hokkaido University. Slavic Eurasian Studies No.7. Emerging Meso-Areas in the Former Socialist Countries Histories Revived or Improvised?

мацніць свае ўласныя прэтэнзіі на прыналежнасьць да «цывілізаванай» часткі зямной кулі і клюбу народаў — будаўнікоў імпэрыяў[12].

Польскі каляніяльны інструмэнтар пазьней будзе перагледжаны, але не адкінуты наагул расейскім бокам. У якасьці прыкладу можна назваць тэндэнцыйную тэзу аб братэрстве аж да кроўнага сваяцтва паміж палякамі і беларусамі і надзвычайнай блізіні польскай і беларускай моваў, якая прадказальным сэнсавым зрухам увайшла ў лексыкон расейскага нацыяналізму, адкуль была запазычаная беларускімі русафіламі і папулістамі.

Як у 1800 г. для Фрыдрыха Шлегеля Усход быў найчысьцейшай формай рамантызму, так праз колькі дзесяцігодзьдзяў такой формай для польскіх рамантыкаў стаў польскі «ўсход» — цяперашнія Беларусь і Ўкраіна. Згодна з агульнаэўрапейскай літаратурнай модай, ягоныя «старадаўнія», «чыстыя», вартыя выкарыстаньня адно ў якасьці літаратурнай сыравіны паданьні і традыцыі, у якіх угледжваюць неверагодную архаічную глыбіню (бо народ, які іх стварыў, знаходзіцца на вельмі нізкім, першабытным узроўні разьвіцьця), выклікаюць цікавасьць польскіх рамантыкаў. «Несапсаваны» заходняй цывілізацыяй беларускі фальклёр стаў адным з нарожных камянёў польскага рамантызму[13].

Мадэрны нацыяналізм, эўрапейская інтэлектуальная мода, Віленскі ўнівэрсытэт і Беларусь як Усход і як Іншае сталі настолькі моцнымі інсьпірацыямі для польскіх рамантыкаў, што «акурат на беларуска-літоўскіх землях польскі рамантызм раней за ўсё атрымаў перамогу над клясыцызмам»[14].

Такім чынам, для польскай літаратуры першай паловы XIX ст. Беларусь — гэта зусім не краіна, дзе беларускую мову захоўва-

---

[12] Гл. развагі пра падобную сытуацыю ў кнізе: Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 28—29, 64.

[13] Jakóbiec M. Białorusko-polskie związki literackie // Literatura polska. Przewodnik encyklopedyczny. T. 1. Warszawa, 1984. S. 69.

[14] Мальдис А.И. Белорусско-польские литературные взаимосвязи во второй половине XIX ст. Автореферат диссертации... канд. филол. наук. Минск: АН БССР, 1963. С. 13.

юць палітычна бяспраўныя і зьведзеныя да стану рабоў сяляне, а таксама дробная і сярэдняя шляхта, але найперш хімэрная, туманная, расплывістая, аднамерная прастора безь якіх-любя глыбокіх традыцыяў, гісторыі і дакладных геаграфічных абрысаў. Беларусь цэняць за яе пантэізм, яе стабільнасьць і прымітыўнасьць. Адваротны бок такой ацэнкі — уяўленьні пра яе як пра недагуманізаваны, антыдэмакратычны край.

У рамках наратыву Польшча нясе асьвету і прагрэс зародкавай Беларусі, якая ня мае шанцаў на незалежнае існаваньне. Яе тэлеалёгія палягае ў тым, каб уліцца ў польскую нацыю, больш за тое, унутранае палкае жаданьне беларусаў якраз і палягае ў тым, каб як мага хутчэй стаць палякамі.

Сьвядомай практыкай польскіх інтэлектуалаў былі разьбежнасьці і няпэўнасьць у ацэнках Беларусі і беларусаў (амбівалентнасьць ёсьць адной з галоўных стратэгіяў усялякай дыскрымінацыі). Не існавала кансэнсусу нават у пытаньні адзінай назвы беларускай мовы і беларусаў, ня кажучы ўжо пра іх этнічныя межы. Для Яна Чачота беларуская мова была «славяна-крывіцкай», для Адама Міцкевіча — «рускім альбо літоўска-рускім» дыялектам, для Сыракомлі — рускай, рутэнскай і русінскай мовай («językiem ruskim», «ruteńskim», «rusińskim»). Існавалі таксама тэрміны «польска-руская», «крывіцкая», «славяна-літоўская» мова. Беларусам адмаўлялі ў праве надаць сваёй мове паўнавартасны літаратурны статус і лічылі яе вартай толькі сацыяльных нізоў, ізаляваных у сельскай глушэчы. Ян Баршчэўскі адзначаў у прадмове да кнігі «Шляхціц Завальня, альбо Беларусь у фантастычных апавяданьнях»:

*Ня кожны чытач зразумее беларускую мову, дык гэтыя народныя апавяданьні, якія пачуў я з вуснаў простага люду, вырашыў (наколькі магу), у даслоўным перакладзе напісаць па-польску*[15].

[15] Баршчэўскі Ян. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Мінск, 1990. С. 26.

Важнай каляніяльнай стратэгіяй стала стратэгія прэзэнтацыйнага абмежаваньня. Як і сама Беларусь, яе жыхары беларусы падаваліся прымітыўнымі, ананімнымі, пазбаўленымі высакародных якасьцяў істотамі, якім доля варажыла бедаваць і гараваць, а іх культура і мова надзялялася сумнеўнай вартасьцю і маргінальным статусам. Русін-беларус уяўляўся наіўным і прастадушным прасталюдзінам, якім лёгка маніпуляваць. Беларусам прыпісвалася мэнтальнасьць прыдушанага бездапаможнага племені, арганічна няздольнага распараджацца сваім лёсам. Дзеля гэтага яны патрабуюць пастаяннага клопату з боку нацыі, якая знаходзіцца на больш высокім узроўні разьвіцьця.

Датаваную 8 верасьнем 1844 г. прадмову да «Шляхціца Завальні...» Ян Баршчэўскі пачынае так:

> *Сярод беларускага народу захоўваюцца яшчэ і цяпер некаторыя паданьні даўніх часоў, якія, пераходзячы ад чалавека да чалавека, зрабіліся такія жа цьмяныя, як і міталёгія старажытных народаў. Жыхары гэтага краю, а менавіта Полацкага, Невельскага і Себескага паветаў, спрадвеку пакутуючы, зусім зьмяніліся характарам; на іх тварах заўсёды адбіты нейкі смутак і змрочная задумлівасьць. У іх фантазіях увесь час блукаюць нядобрыя духі, якія, аднак, служаць злым панам, чараўнікам і ўсім непрыяцелям простага люду*[16].

Калі для Баршчэўскага Беларусь зводзілася да Полацкага, Невельскага і Себескага паветаў, а літаратурны крытык Рамуальд Падбярэскі заўважыў у 1844 г., што праўдзівая Беларусь складаецца зь Віцебскай і Магілёўскай губэрняў[17], то ў выдадзенай

---

[16] Тамсама. С. 8.

[17] Кісялёў Г.В. Пачынальнікі: З гістарычна-літаратурных матэрыялаў XIX ст. 2-е выд. Мінск: Беларуская навука, 2003. С. 60.

ураджэнцам Віцебшчыны Аляксандрам Рыпінскім у Парыжы (1840 г.) кнізе «Беларусь. Некалькі словаў аб паэзіі простага народу гэтай нашай польскай правінцыі, аб ягонай музыцы, песьнях, танцах»[18] яе геаграфія была больш хімэрнай і двухсэнсоўнай: «налева Прыпяць і пінскія балоты, на поўнач па Пскоў, Апочку і Лукі». У гэтым разуменьні Беларусь — інтэгральная частка Польшчы («неад'емная («niewyłaczną») частка дарагой нашай айчыны»). Сэнсам існаваньня саміх мужыкоў-беларусаў абвяшчаецца набыцьцё польскай ідэнтычнасьці: Рыпінскі прысьвяціў кнігу «першаму зь беларускіх мужыкоў (kmiotków białoruskich), які сьпярша чытаць, а потым гаварыць і думаць па-польску навучыцца». Каб дзіцё навучылася «прамаўляць сьвятое імя Польшчы», Рыпінскі раіць не карміць яго датуль, пакуль не папросіць есьці па-польску.

Беларусы Рыпінскага — убогія, закаханыя ў Польшчу мужыкі («просты народ славянскага роду, які здаўна шчыльна зь сям'ёй ляхаў парадніўся (spokrewniony), сумленны, але бедны і маловядомы нават у Польшчы — сваёй айчыне, хаця ён яе любіць найбольш)[19].

Мінуўшчына беларусаў вычэрпваецца адной падзеяй — уваходжаньнем у крэўны саюз з Польшчай: (беларускі народ) «абраў сабе ў выніку Польшчу за маці, кінуўся разам зь Літвой у ейныя апякунскія абдымкі і да яе з усёй сыноўняй любоўю прыхінуўся»[20]. Нарэшце, для Рыпінскага палякі — гэта «мы», беларусы — гэта «іншае», «яны» («гэты народ шчыльней з намі, чым з Масквой зьвязаны»)[21].

---

[18] Rypiński A. Białoruś. Kilka słów o poezji prostego ludu tej naszej polskiej prowincji, o jego muzyce, śpiewie, tańcach. Paryż, 1840. Цыт. пав. Токць Сяргей. Беларуская ідэнтычнасць у XIX ст. // Беларускі гістарычны зборнік — Białoruskie Zeszyty Historyczne. №24. С. 70—71. У гэтым разьдзеле я цытую паводле артыкулу Токця і шэраг іншых крыніцаў, што не заўсёды адмыслова агаворваю.

[19] Rypiński A. Białoruś... S. 18.

[20] Тамсама. С. 19.

[21] Тамсама. С. 21.

Яну Чачоту (1846 г.) беларусы ўяўляліся напаўдзікім племенем, якое выпала з культурнага прагрэсу. Яго дыялект можа быць карысны для засваеньня больш высокай культуры, але літаратура на ім наўрад ці мае будучыню:

*Крывіцкае племя, якое налічвае некалькі мільёнаў насельніцтва, ня мае нічога болей, апрача катэхізісу, выдадзенага нядаўна ў Віленскай эпархіяльнай друкарні, якога бачыць мне, аднак, ня здарылася. Менавіта цяпер пара адплаціць за гэта занядбаньне мінулых вякоў і ўзяцца за ўкладаньне граматыкі і слоўніка крывіцкага дыялекту (...) бо хоць бы хацелі калі вучыць сялян іншаму дыялекту, яны не зразумеюць яго дастаткова, ня маючы тэрмінаў гэтага іншага, выкладзеных на сваім уласным дыялекце.*

*Калі мы рады бачыць рэшткі кельцкай або герульскай мовы, што засталіся ў дакумэнтах, можа, калі-небудзь будзе абуджаць такую ж і непустую цікавасьць помнік крывіцкага дыялекту, які, трэба сумнявацца, каб сам стаў пісьмовым і разьвіваўся самастойна*[22].

Адам Міцкевіч успрымаў беларусаў за нешта непаўнавартаснае, існуючае не ў рэальным часе, а ў міталягічным, спыненым альбо зачараваным. Ён уяўляў рускія землі сынкрэтычна, як адно пазбаўленае традыцыяў дзяржаўнасьці цэлае, а яго мінуўшчыну, дзеля адсутнасьці сапраўднай суб'ектнасьці, як шэраг уваходжаньняў то ў азіяцкую Расею, то ў эўрапейскую Польшчу. Ён часам ня рупіўся аб тым, каб разьмяжоўваць Беларусь і Ўкраіну. Гэтая зямля — ўсяго толькі ананімная арэна сутыкненьня сапраўдных сіл гісторыі, зямля, якая адвеку была адно вайсковым трафэем магутных заваёўнікаў:

[22] Кісялёў Г. Пачынальнікі: З гістарычна-літаратурных матэрыялаў XIX ст., 2-е выд. Мінск: Беларуская навука, 2003. С. 99.

*Гэты спрадвечна славянскі край ня мае сваёй назвы, бо ня ёсьць (асобнай дзяржавай), але хінуўся то да ляскай сыстэмы (systemu lechickiego), то пад уладу кіеўскіх князёў (pod berło ruskie). Гэтыя землі былі заваяваныя Рурыкавічамі і пасьля гэтай заваёвы атрымалі назву рускіх земляў. Ліцьвіны захавалі за імі назву, якая нагадвае пра гэтую даўнюю заваёву, а палякі, наклаўшы на іх свой адбітак, адрозьніваюць у сваёй мове рускія землі ад расейскай дзяржавы...*

*Гэтая вялізная краіна была арэнай бітваў паміж Польшчай і Русьсю. На гэтай прасторы сутыкаліся дзьве рэлігіі, каталіцкая і праваслаўная. Шляхецкая Рэч Паспалітая палякаў і сыстэма самаўладзьдзя Расеі сыходзіліся тут у зацятых баёх*[23].

Для яго (студзень 1842 г.) беларуская мова была гаворкай польскай, гісторыя публічнага выкарыстаньня якой скончылася да ўкладаньня Люблінскай уніі. Колькасьць яе носьбітаў ня мае значэньня і таму можа свабодна вар'явацца[24]:

*...Гаворкай Белай Русі, якую называюць рускай альбо літоўска-рускай, гаворыць каля дзесяці мільёнаў; гэта самая багатая і самая чыстая гаворка, калісьці яна мела афіцыйны статус (było ono niegdyś uprawne): у часы самастойнасьці Літвы вялікія князі выкарыстоўвалі яе ў дыпляматычнай карэспандэнцыі (? — Аўт.).*

Верагодна, будучы пад уплывам аўтара «Гісторыі польскага народу» Адама Нарушэвіча, для якога Піншчына была радзімай

---

[23] Цыт. пав.: Białokozowicz Bazyli. Między Wschodem a Zachodem. Z dziejów formowania się białoruskiej świadomości narodowej. Беласток: Бібліятэчка Беларускага літаратурнага таварыства «Белавежа», 1998. Выпуск 21. С. 29.

[24] Філаматы і філарэты. Зборнік. Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. С. 122.

Гл. таксама Białokozowicz Bazyli. Między Wschodem a Zachodem... С. 30.

Крывічоў, ён заводзіў абсяг расьсяленьня беларускага народу ў асноўным да межаў Піншчыны:

> *З усіх славянскіх народаў русіны, то бок сяляне Пінскай, часткова Менскай і Гарадзенскай губэрняў, захавалі найбольшую колькасьць агульнаславянскіх рысаў. У іх казках і песьнях ёсьць усё. Пісьмовых помнікаў у іх мала, толькі «Літоўскі статут» напісаны на іх мове, самай гарманічнай і з усіх славянскіх моваў найменш зьмененай. Усю сваю гісторыю на зямлі яны прайшлі ў страшэннай галечы і прыгнёце*[25].

Нарэшце, «зямля, дзе яны жывуць, убогая, сухая, бясплодная, пяскі альбо багна» (1847 г.)[26].

У адрозьненьне ад Міцкевіча, Рыпінскі, Чачот і Дунін-Марцінкевіч пісалі на беларускай мове, чым стварылі падставу для залічэньня сябе ў беларускія пісьменьнікі (Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч абвешчаны клясыкам беларускай літаратуры XIX ст.).

Іх творы, аднак, ня мелі простага эфэкту для беларускага нацыятварэньня. Вытокі гэтай літаратуры варта шукаць у палітычным неспакоі, зьвязаным з усьведамленьнем аграмаднай і небясьпечнай прорвы паміж шляхтай і сялянскім морам вакол яе. У пэўнай меры яе стварэньне было прадыктаванае эўрапейскай літаратурнай модай — выкліканым рамантызмам захапленьнем этнаграфіяй і мясцовымі мовамі. Як і ў Брытанскай Індыі, у аснове гэтай субліттаратуры «ляжала негалосная практыка засваеньня мясцовай культуры, што мела наўвеце і зраднiць [пануючую клясу] з культурай калянізаваных і далучыць іх да жыцьцёвага ўкладу карэнных жыхароў»[27].

---

[25] Філаматы і філарэты. С. 122.

[26] Цыт. пав.: Białokozowicz Bazyli. Między Wschodem a... С. 30.

[27] Viswanathan Gauri. Currying Favor: The Politics of British Educational Policy in India, 1813—54 // McClintock, Mufti, Aamir and Shohat, Ella (eds). Dangerous Liaisons:

Да такога манэўру зьвярнулася і польская шляхта, калі паспрабавала пад уплывам рамантызму сфармаваць прамежкавую польска-беларускую ідэалёгію. Яе мэтай была, аднак, не нацыянальная эмансыпацыя беларусаў, а заахвочваньне іх руху ў бок польскай ідэнтычнасьці і культуры[28].

«Клясык беларускай літаратуры» Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч заставаўся палкім польскім нацыяналістам. Пра гэта лішні раз сьведчыць факт, што пасьля паўстаньня 1863 г. і надыходу рэакцыі ён наагул адмовіўся ад творчасьці на беларускай мове, а ў канцы 1870-х утрымліваў падпольную польскую школку для дзяцей беларускіх сялян. Паводле ягонага ўласнага прызнаньня, польская была ягонай роднай мовай. Беларуская ж — мовай-пасярэдніцай далучэньня да высокай польскай культуры, а прызначэньне творчасьці на гэтай мове — вучыць мужыка-беларуса «адначасова і польскай, матчынай літаратуры»[29].

У рамках гэтай парадыгмы беларусы былі «Іншае», «яны», «братні атожылак» з сваёй гаворкай, які гібее ва ўмовах беспрасьветнай цемры. Паміж імі і «намі» (палякамі) існавала створаная стагодзьдзямі культурная і станавая мяжа. Больш за тое, Дунін-Марцінкевіч сьцьвярджаў, што заніжаны эстэтычны стыль твораў на беларускай гаворцы — гэта адзіна магчымы стыль, таму што гэты «атожылак» няздольны самастойна вытварыць высокай культуры:

---

Gender, Nation and Postcolonial Perspectives. Minneapolis: University of Minnesota Press, 1997. P. 115. Цыт. пав.: Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 31.

[28] У пэўным сэнсе гэтая літаратура была праявай хлапаманства, калі разумець пад ім бачаньне селяніна толькі ў калектыўным, грамадзкім пляне (як ягоны тыповы элемэнт), а ня як чалавека ў індывідуальным, экзыстэнцыйным вымеры, які перабывае ў складаных сувязях з калектывам і з асяродзьдзем, у якім ён нараджаецца і памірае. Пар. Мисливський В. Кінець селянської культури // Критика. 2004. № 4. С. 38.

[29] Янушкевіч Я. Беларускі дудар. Праблема славянскіх традыцый і ўплываў у творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча. Мінск: Навука і тэхніка, 1991. С. 122.

*Жывучы пасярод народу, які гаворыць беларускай гаворкай, засвоіўшы ягоны спосаб мысьленьня, марачы пра лепшую долю для гэтага братняга атожылка (tego szczeru bratniego), застылага ў дзяцінстве (niemowlęctwie) і цемры, я вырашыў пісаць на ягонай уласнай гаворцы ў духу ягоных звычаяў, паданьняў і разумовых здольнасьцяў, каб заахвоціць яго да асьветы*[30].

Падобная літаратура знаходзілася пад уплывам палітычных ідэалёгіяў, што апраўдвалі сьцьвярджэньне польскай культурнай гегемоніі над Беларусяй, якая апісвалася як набор каляніяльных і аўтарытарных прэзэнтацыяў, якія апраўдвалі ўладу над яе тэрыторыяй і прышчаленьня яе насельніцтву польскай ідэнтычнасьці пад шырмай цывілізацыйнай, асьветнай і мадэрнізацыйнай місіі. Калі літаратура на беларускай мове і ствралася, то яна абавязкова была стылёва заніжаная, тэматычна абмежаваная, убогая на ідэі і мастацкія якасьці, нецікавая для адукаваных людзей. Сытуацыю пагаршала нізкая ступень навуковай веды аб беларускай гісторыі, мове і культуры. Беларусь не ўспрымалася як этнічная катэгорыя.

Бачаньне Беларусі ў расейскіх імпэрскіх наратывах было падобным. Іх структура і дынаміка паказваюць, што касьцяк уяўленьняў пра Беларусь у 1830—1850 гг. быў пазычаны з польскага дыскурсу зь мінімальнымі зьменамі, абумоўленымі палітычным і культурным курсам імпэрскага ўраду. Узьніклыя сьледам за разгромам польскага паўстаньня 1830—1831 гг. першыя прыкметы адыходу ад польскага канону ў бок ягонага паглыбленьня і аб'ектывацыі былі выкліканы ростам навуковай веды ў выніку імпэрскага пранікненьня[31].

[30] Цыт. пав.: Radzik R. Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Białorusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-Wschodniej XIX stulecia. Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2000. S. 216.

[31] Сыходзячы з расейскіх крыніцаў, Павал Ёзэф Шафарык ужо на пачатку 1840-х гг. вызначыў этнічную тэрыторыю беларусаў ад Пскоўскай губэрні да Беластоку, уключыўшы ў яе цалкам Магілёўскую і Менскую губэрні, большую частку Віцебскай

Тым ня менш канстанта ўспрыняцьця — Беларусь як набор каляніяльных прэзэнтацыяў і як геаграфічнае паняцьце, антытэза этнакультурнаму засталася ў сіле. Як і польскія ідэолягі, іх расейскія апанэнты адмаўлялі беларусам у праве на стварэньне высокай культуры і пабудову мадэрнай нацыі.

У 1843 г. у часопісе «Маяк» быў надрукаваны артыкул «Два словы пра мову і пісьменнасьць Белай Русі», у якім сьцьвярджалася, што беларусы — «значная частка народу расейскага», а спробы стварэньня асобнай беларускай культуры бессэнсоўныя: «Ведама, шмат можна напісаць на гэтай гаворцы. Але для каго? Але для чаго?[32]».

Для Фадзея Булгарына Беларусь у 1835 г. прасьціралася «паміж Курляндыяй, Ліфляндыяй, губэрнямі Пскоўскай, Смаленскай, Арлоўскай, Чарнігаўскай і Менскай»[33]. Расейскі нацыяналізм Булгарына меў дадатковыя ксэнафобскія абэртоны. Беларус-мужык у ягонай трактоўцы паўстае як хваравіты дэгенэрат, чый чысты ў мінуўшчыне тып заплямлены згубным польскім і жыдоўскім уплывам. Тут быў уведзены адносна новы акцэнт — бачаньне бела-

---

і Гарадзенскай губэрняў і Беластоцкай вобласьці, а таксама меншую частку Віленскай губэрні. Паводле Шафарыка, беларусаў налічвалася 2 726 000, зь іх 2 376 000 праваслаўных і 350 000 каталікоў. Пар. Slowansky národopis. Sestawil Pawel Josef Šafarik. S mappau. 2. wydani. W Praze: Nakladem wydawatele, 1842. S. 30, 32.

Пад уплывам росту навуковай веды Дунін-Марцінкевіч у прадмове да беларускага перакладу «Пана Тадэвуша» (1859) акрэсьліў межы расьсяленьня беларусаў значна шырэй, чым эмігрант Міцкевіч, чыё мысьленьне адлюстроўвала стан навуковай веды 1820-х гадоў, г.зн. басэйнамі рэк «Дняпра, Дзьвіны, Бярэзіны, Сьвіслачы, Вяльлі і часткова Нёману». Напісаны ім па-польску верш «Да пачцівых беларусаў!» (1857) паказвае, што этнонім «беларусы» ў той час пачаў замацоўвацца за жыхарамі захаду Менскай губэрні:

*Вас, браты, я помніць буду,*
*Я ня сьніў такога цуду,*
*Каб, вырасшы між літвінаў,*
*Палюбіў беларусінаў!*

Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1984. С. 428.

[32] Цыт. пав.: Кісялёў Г.В. Пачынальнікі... С. 8.

[33] Булгарын Фадзей. Выбранае. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. С. 193.

руса ў катэгорыях «малодшага брата». Калі тэза аб адсталасьці, дэгенэратыўнасьці і відавочнай анталягічнай няроўнасьці паміж беларусам і расейцам была зьвязаная зь біялягічнай дактрынай расізму пачатку XIX ст., то апошняя пазыцыя ўзьнікае ў рамках каляніяльнага дыскурсу ідэнтычнасьці калянізатара і калянізаванага, дзе калянізаваны — гэта бляды цень асілка-калянізатара:

> *Расейскі мужык дужы, моцны і кемлівы, а беларус малы, худы і санлівы. Дасьць Божа, і беларусы перародзяцца! Продкі іх, крывічы, севяране, радзімічы, дрыгавічы, палачане, былі слаўныя дзецюкі, добрыя і храбрыя славянскія плямёны, складзеныя з дужых, моцных людзей. Яны набылі знакамітасьць у гісторыі. Да цяперашняга хваравітага стану давялі беларусаў два зლаварожыя вятры: адзін, што дзьмуў зь берагоў Віслы, а другі, што веяў зь берагоў Ярдану. Але цяпер усё ідзе ў нас хуткімі крокамі да лепшага, дзякуючы Богу і цару, а можа ўмацуюцца і нашы беларусы*[34].

Новай стратэгіяй расейскага імпэрыялізму стала асьмяяньне і агрубленьне беларускай мовы і яе носьбітаў. У 1843 г. у часопісе «Москвитянин» выйшаў артыкул П. Куліша[35], у якім беларускія тыпы былі сканструяваныя так, каб «паказаць іх пачварнасьць і насьмяшыць чытача» (А. Цьвікевіч). Менавіта ў адказ на гэты артыкул Іван Насовіч пісаў:

> *Кожны расеец, ад асьвечанага да простага, знаходзіць беларускую мову сьмешнай. Шмат хто глядзіць на яе з пагардай, а некаторыя як на нейкае «исчадие» альбо як на ўроду... Шмат хто беларускі дыялект пакрывае зьедлівымі кпінамі markiзнага кшталту, нібы якую страшную карыкатуру... Гэткі ўжо лёс Беларусі. Але не адзін толькі дыялект яе*

[34] Тамсама. С. 200.

[35] Кулиш П. Гецыки // Москвитянин. 1843. Ч. IV. № 8. С. 383—412.

*служыць прадметам кпінаў: нават самыя жыхары яе з сваім кірункам жыцьця і думак ня ўніклі розных кпін... Замест таго, каб заняцца разглядам звычаяў, маралі і самога быту беларусаў, літаратары выводзяць на сцэну расейскага сьвету беларусаў зь іх звычаямі і гаворкай у самым гадкім і агідным выглядзе, апаганьваюць імі літаратурнае поле*[36].

Для аўтара «Падарожжа па Палесьсі і Беларускім краі» (першая публікацыя ў «Современнике», 1853) Паўла Шпілеўскага беларускі край складаўся зь Менскай, Магілёўскай і Віцебскай губэрняў[37], а ў 1855 г. Міхаіл Без-Карніловіч[38] і сьледам за ім Восіп Турчыновіч (1857)[39] атаесамлялі Беларусь зь Віцебскай і Магілёўскай губэрнямі.

Як і Міцкевіч, Турчыновіч успрымаў Беларусь як нейкую прамежкавую катэгорыю, напоўненую найперш геаграфічным зьместам, чыя гісторыя зьяўляецца адно падчас ваенных кампаніяў:

*Яе (Беларусі) старадаўняя, яе ўласная гісторыя мала вядомая: новая ж пачынаецца з XV ст., цесна зьвязана з палітычнай гісторыяй Літвы, Польшчы і Расеі. Дзеля свайго геаграфічнага становішча Беларусь зрабілася арэнай, на якой на працягу апошніх чатырох стагодзьдзяў вырашаліся з дапамогай зброі амаль усе пытаньні палітычнага жыцьця гэтых дзяржаваў, і наступствы гэтай векавой,*

[36] Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XXст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 324.

[37] Шпилевский Павел. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. Минск, 2003 С. 97—98.

[38] Гл. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся, составлены генерал-майором М.О. Без-Корниловичем. Санкт-Петербург, 1855.

[39] Гл. Турчинович О. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. Санкт-Петербург. 1857.

> *кровапралітнай барацьбы складаюць лёс і новую гісторыю Беларускага краю*[40].

Паколькі ў сярэдзіне XIX ст. асобнай беларускай ідэнтычнасьці не існавала, прадстаўнікі як расейскіх, так і польскіх адукаваных слаёў працягвалі рабіць выгляд, быццам яны ня ведаюць пра існаваньне беларускага народу, ягонай гісторыі і культуры. Бакі збліжала супольнае дамадэрнае ўспрыманьне Беларусі як прамежкавай катэгорыі без культурнага альбо моўнага зьместу, але антаганізавалі ўзаеманепрымальныя нацыяналістычныя і імпэрыялістычныя амбіцыі (пасьля «прысабечваньня» спадчыны шматэтнічнай Рэчы Паспалітай палякамі ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. у польскай сьвядомасьці гэтая дзяржава стала ўспрымацца як «польская імпэрыя»).

Ніхто з польскіх і расейскіх аўтараў ня ставіў пад сумнеў адметнасьці Беларусі, яе эксцэнтрычнасьці, яе адсталасьці, яе маўклівай абыякавасьці, дзіцячай абмежаванасьці і жаночай падатлівасьці. Іх ідэалёгія зводзілася да ўспрыняцьця адметнасьці як слабасьці, не вылучала каляніяльнага суб'екта і абвяшчала ідэнтычнасьць калянізатара і калянізаванага. Беларусь выяўлялася як барбарскі, недысцыплінаваны край, які дзякуючы імпэрскаму кіраваньню/перамозе польскай культуры становіцца цывілізаванай часткай вялікай расейскай/польскай нацыі[41].

У ход ішла дыскурсіўная інжынэрыя: ператварэньню Беларусі ў топас дрымучай першабытнасьці служыла таксама сэміятызацыя яе краявіду. Балотаў, пяскоў і непраходных нетраў наўрад ці было менш у пэрыфэрыйных і цэнтральных рэгіёнах імпэрыі, ды

[40] Цыт. пав.: Белорусская историография в конце XVIII — начале 60-х годов XIXст. // Очерки истории науки и культуры Беларуси XIX — начала XX ст. Ред. П.Т. Петриков, Д.В. Карев, А.А. Гусак и др. Минск, 1996. С. 31.

[41] Аналітычная катэгорыя «вялікая расейская нацыя» ўведзена А. Мілерам у кнізе: Украинский вопрос в политике властей и русском общественном мнении (вторая половина XIX в.). Санкт-Петербург: Алетейя, 2000. С. 31—45.

і ў польскіх правінцыях, аднак гэтая рыса беларускага краявіду сымбалізавала эканамічную, палітычную і культурную адсталасьць і пастаянна падкрэсьлівалася, каб легітымізаваць прэтэнзію на каляніяльнае панаваньне.

Польскі праект нацыятварэньня, які ўмоўна можна датаваць годам заснаваньня Віленскага імпэратарскага ўнівэрсытэту, быў храналягічна першы ў Беларусі. Польскі досьвед мадэляваньня Беларусі быў найстарэйшы (Польшча гістарычна выступала транзытнай пляцоўкай для ператоку мадэрных ідэяў аб імпэрыі, калёніі і нацыі з заходняга культурнага архіва ў Расею), і першы час расейскія інтэлектуалы адно толькі пераймалі яго. Імпэрская эліта напярэдадні паўстаньня 1863 г. мела расплывістае ўяўленьне аб Беларусі, хаця ў імпэрскім наратыве яна абвяшчалася «адвечным здабыткам» Расеі[42].

У культурным пляне польская шляхта ў Беларусі заставалася скрайне эгаістычная і рэакцыйная. Замінаючы зараджэньню беларускай грамадзкай эліты і палітычнай культуры, яна блякавала канструяваньне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці і беларускага нацыяналізму. Яна не дапускала канвэрсіяў «пана» ў беларуса.

---

[42] Калі верыць выдадзенаму ў 1861 г. гістарычна-статыстычнаму дасьледаваньню чыноўніка цэнтральнага статыстычнага камітэту МУС М. Лябёдкіна, сярод жыхароў Беларусі налічвалася 17 228 душ харватаў і 8 398 душ ціверцаў і углічаў.

Гл. Лебедкин М. О племенном составе народонаселения Западного края Российской империи // Записки Русского географического общества. 1861. Кн. III. Отд. II. С. 131—160.

Міністар унутраных справаў П.А. Валуеў у 1861 г. пасьля азнаямленьня зь вёрсткай артыкулу для афіцыёзу МУС «Северная почта» так выказаў яе аўтару свае перажываньні: «Я спалатнеў ад перапуду, калі прачытаў, што вы прызнаяцё большасьць сельскага насельніцтва ў чатырох Паўночна-Заходніх губэрнях [Віленскай, Гарадзенскай, Ковенскай і Менскай] польскім племем. Што было б з намі, калі б гэты ваш выраз, што саскочыў з вашага пяра, трапіў у друк!!! ... Польскім племем, акрамя паноў і часткі гараджан, мы нікога там прызнаваць ня можам».

Русская старина. 1899. № 8. С. 472—473. Цыт. пав.: Долбилов М.Д. Культурная идиома возрождения России как фактор имперской политики в Северо-Западном крае в 1863—1865 гг. // Ab Imperio. 2001. № 1—2. С. 227—268.

Да 1863 г. яе палітычная праграма вагалася паміж патрабаваньнем надаць Беларусі польскую культурную і моўную аўтаномію і ўвайсьці ў склад Царства Польскага. Пасьля 1863 г. яна абвесьціла «нацыянальным абавязкам» кожнага паляка захаваньне зямлі ў Беларусі ў польскіх руках. Дзеля гэтага ўзьніклі так званыя «зямельныя сындыкаты» (syndykaty rolne), «Таварыствы пазямельнага крэдыту» і г.д., якія пакрылі Беларусь густой сеткай і мелі свае філіі ў губэрнскіх, а часам і ў павятовых гарадох[43]. Як пакажуць падзеі наступнага стагодзьдзя сацыяльнага экстрэмізму, падзяліўшы ідэі мадэрнага польскага нацыяналізму, польская шляхта на беларускіх землях учыніла палітычнае самагубства.

Польскі нацыяналізм сярэдзіны XIX ст. заставаўся расісцкім і імпэрыялістычным, паколькі прадуктам усходнеэўрапейскай культуры таго часу — эксклюзытывісцкай, уладнай і антыгуманнай. Для беларусаў ён выяўляўся ў тым, каб, усьведамляючы сваё этнічнае паходжаньне, захоўваць вернасьць памерлай польскай дзяржаве і аддаваць пачуцьцю польскай нацыянальнасьці.

У рамках пануючых наратываў каляніяльнае бачаньне Беларусі абсалютызавалася. Яе вобраз быў прафільтраваны праз гегеманічныя мадэлі мысьленьня і разглядаўся ня як самастойны экзыстэнцыйны аб'ект, а як адна з экзатычных правінцыяў віртуальнай польскай дзяржавы. Для польскіх пісьменьнікаў Беларусь стала сапраўднай базай мітатворчасьці і хімэрных апісаньняў. Чым менш быў чутны голас самога суб'екта, тым больш неўтаймаваныя станавіліся фантазіі[44]. Беларусь Баршчэўскага, населеная дзікунамі і вядзьмаркамі, — гэта адчужаная і экзатычная Беларусь.

Калі літаратура на беларускай мове і дапускалася, то абмяжоўвалася жорсткімі ідэалягічнымі, тэматычнымі і эстэтычнымі рамкамі. У ідэалягічным пляне яна грунтавалася на агульнай дынаміцы імпэрска-каляніяльнага мадэляваньня Беларусі. Ёй забаранялася ствараць

[43] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 266.

[44] Гл. Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 414.

контравобразы і канкурэнтныя нарацыйныя стуктуры, абуджаць у беларусах пачуцьцё іх адрозьненьня ад палякаў/расейцаў і мець іншы сэпаратысцкі, палітызаваны зьмест. Эстэтычна — літаратуру на беларускай мове было дазволена ствараць толькі ў нізкіх літаратурных жанрах: сатырычным, эпіграмным альбо альбомным. Тэматычна: ёй дазвалялася, за рэдкімі выняткамі, паказваць стаўленьне двара да вёскі, інтэлігентнага і адукаванага пана да мужыка (А. Цьвікевіч). Нарэшце, існавалі колькасныя абмежаваньні — аўтары твораў на беларускай мове тым самым паказвалі, што пішуць на ёй толькі дзеля забавы. Уладзіслаў Сыракомля за ўсю сваю літаратурную кар'еру напісаў па-беларуску 2 вершы, Вінцэнт Каратынскі — 3, Ян Баршчэўскі — 3 альбо 4. Ніхто зь беларускіх пісьменьнікаў за ўсё XIX ст., за выняткам Ф. Багушэвіча, В.Дуніна-Марцінкевіча, А. Гурыновіча (15 адзінак), Янкі Лучыны (менш за 20 разам зь перакладамі) і Яна Чачота (31), не напісаў па-беларуску больш за 10 вершаў. Да 1880-х крыніцай гэтай сублітаратуры быў сэнтымэнтальны альбо ў найлепшым выпадку навукова-этнаграфічны інтарэс да Беларусі, а яе мова была напоўненая вульгарызмамі і правінцыялізмамі і далёкая ад выкшталцонасьці й зграбнасьці.

Ажно да апошняга дзесяцігодзьдзя XIX ст. пануючая ідэалягічная і эстэтычная традыцыя забараняла пісаць прозу на беларускай мове. Можна без асаблівага перабольшваньня сказаць, што першым апавяданьнем, напісаным на ёй у XIX ст., была «Тралялёначка» Ф. Багушэвіча (апублікаваная ў 1892 г.). Гэтая традыцыя дазваляла выяўляць мастацкімі сродкамі не абстрактную «народнасьць», а значна больш канкрэтнае — голас «прасталюдзіна». Яе характэрная мова ўзьнікла як стылізацыя пад «мужыцкі» маналёг з такімі стылістычна-моўнымі рысамі, як «дыялягізацыя», сынтаксіс спалучэньня і пералічэньня, пазьбяганьне пазычаных словаў з дапамогай апісаньня альбо недакладных уласных адпаведнікаў, апэраваньне мясцовымі фактамі як агульнавядомымі[45].

[45] Грабович Г. До історії української літератури. Дослідження, есеї, полеміка. Київ: Критика, 2003. С. 299—300.

У гэтай літаратурнай традыцыі непадзельна дамінуе вусная мадэль, якая фармуе і нарацыйную структуру, і тэматыку, і голаснарацыю, і стаўленьне аўтара да ягонай публікі. Калі ў суседніх літаратурах гэтая мадальнасьць была адной зь некалькіх жанраўмадальнасьцяў (*сказ* у расейскай літаратуры альбо *gawenda* ў польскай), то ў беларускай дабагушэвіцкай літаратуры гэта не адзін з варыянтаў, але самая яе сутнасьць[46].

Адмова надаць паўнавартасны статус беларускай мове была адмовай у нацыянальным статусе. Існаваньне пэўнага кшталту працаў — пераважна асьветных, этнаграфічных, фальклёрных і гістарычных — дапускалася датуль, пакуль яны не маглі спрычыніцца да фармаваньня беларускай ідэнтычнасьці. Тэма сьмерці беларускай літаратуры і мовы была супольнай для польскіх і расейскіх наратываў[47].

Нявінны верш Вінцэнта Каратая на беларускай мове «Ўставайма, братцы», напісаны ў 1858 г. з нагоды візыту цара Аляксандра II у Вільню, сутыкнуўся з жорсткім астракізмам за «нацыянальную здраду» і палітызаванасьць. Нават паўэтнаграфічны інтарэс Арцёма Вярыгі-Дарэўскага да беларускай культуры выходзіў паза межы традыцыйных уяўленьняў польскага грамадзтва пра дазволенае. Яго рэакцыю добра перадаў Ялегі Францішак Карафа-Корбут у альбомным чатырохрадкоўі (Віцебск, 1859).

*Крыкнуць на цябе паноўе,*
*Што ты здраднік і місьцюк, —*
*Страціш голас і здароўе*
*І дуду ўпусьціш з рук*[48].

[46] Пар. назіраньні аб украінскай літаратуры ў: Грабович Григорій. Шевченко, якого не знаємо (З проблематики символічної автобіографії та сучасної рецепції поета). Київ: Критика, 2000. С. 176.

[47] Гл. таксама: Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 63—64.

[48] Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Хрэстаматыя. Мінск: Вышэйшая школа, 1988. С. 97.

(Далейшая духоўная эвалюцыя Каратая ўлучала перараджэньне ў пасрэднага польскага пісьменьніка Каратынскага і пераезд у Варшаву, дзе ён пражыў рэшту свайго жыцьця.)

Гэтай сублітаратуры як правіла была ўласьцівая грубасьць і вульгарнасьць, а асноўнай марфалягічнай прыкметай было «зьядnаньне грамадзкай асобы — уласна аўтара — зь ягонай літаратурнай праекцыяй, ягоным голасам»[49]. У літаратурна-мастацкім пляне яе непасрэдным наступствам была гіпэртрафаваная літаратурная псэўдаміка.

Гэтая традыцыя хоць і адасабляе найноўшую беларускую літаратуру ад папярэдняга этапу, але можа інтэрпрэтавацца як прыклад мастацкага стылю, адпаведнага данацыянальнаму этапу беларускай нацыянальнай сьвядомасьці, якую канчаткова абуджае Ф. Багушэвіч.

Па-прымардыялісцку настроенае беларускае літаратуразнаўства пасьля Адама Бабарэкі спрабавала давесьці адваротнае. Ягоным мэтадам была дыягностыка нацыянальнай ідэнтычнасьці ў таго ці іншага аўтара на падставе надуманых крытэраў: ужываньня ім слова «беларус» для апісаньня свайго паходжаньня (М. Хаўстовіч)[50], выкарыстаньня тэрміну «Беларусь», няхай нават са значэньнем, якое і блізка не супадае з сучасным

[49] Грабович Г. До історії української літератури. Дослідження, есеї, полеміка. Київ: Критика, 2003. С. 299.

[50] Пар. «Аднак у 30-я гады XIX ст. сярод беларускіх дзеячоў не было значнае асобы (як Т. Шаўчэнкі ва ўкраінцаў). Цяжкую ношу беларускага работніка мусілі ўзяць на сябе тыя, хто сваёй творчасьцю ў польскай літаратуры не пакінуў і сьледу. Але для беларусаў іх дзейнасьць, іхняя творчасьць мае пэўную вартасьць. Напрыклад, у 1837 г. тры браты Грымалоўскія — Валяр'ян, Клеменс, Юльян — выдалі ў Пецярбургу трохтомнік вершаваных твораў, ужо ў тытуле зборніка акрэсьліваючы сваю нацыянальную прыналежнасьць як беларусаў. Дарэчы, варта заўважыць, што гэта першае выданьне, на тытульным лісьце якога аўтары гаварылі пра сваю нацыянальную самасвядомасьць».

Хаўстовіч М. Ігнат Даніловіч і «Катэхізіс» 1835 г. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1999. № 12. S. 151.

(І. Навуменка, М. Хаўстовіч)[51], нарэшце, выкарыстаньне беларускай мовы ў літаратурнай творчасьці з тэндэнцыйнымі мэтамі (І. Навуменка, Я. Янушкевіч)[52] альбо наагул нейкая адцягненая дзейнасьць, зьвязаная з назапашваньнем навуковай веды (Ігар Запрудзкі)[53].

---

[51] 40-я гг. XIX ст. — гэта надзвычай складаны час у гісторыі беларускай культуры і літаратуры. Асыміляцыйная палітыка царызму прыводзіла да таго, што значная частка насельніцтва былога Вялікага Княства Літоўскага не адчувала трывалай повязі з традыцыямі продкаў. І працэс пашырэньня бяспамяцтва набываў незваротны характар. Усё гэта надзвычай болесна ўспрымалася ў беларускім патрыятычным асяродзьдзі. А таму ладзіліся спробы актуалізаваць гістарычную памяць ліцьвінаў-беларусаў. На нашу думку, гэта найбольш удала зьдзейсьніў Я. Баршчэўскі.

Хаўстовіч Мікола. На парозе святыні. Творчасць Яна Баршчэўскага. Мінск: Права і эканоміка, 2001. С. 177.

Нараджэньне новай беларускай літаратуры пачалося зь першых гадоў і дзесяцігодзьдзяў новага, дзевятнаццага стагодзьдзя.

Навуменка І.Я. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Мінск: Навука і тэхніка, 1992. С. 23.

[52] Беларуская нацыянальная ідэя нарадзілася і чым далей, тым больш высьпявала менавіта ў XIX ст. В.І. Дунін-Марцінкевіч успрыняў яе наймацней.

Тамсама. С. 9.

Месца Дуніна-Марцінкевіча ў гісторыі роднай літаратуры вызначана даўно і трывала: ён па праву лічыцца пачынальнікам новай беларускай літаратуры.

Янушкевіч Я.Я. Беларускі дудар. Мінск: Навука і тэхніка, 1991. С. 116.

[53] На працягу 30—50-х гг. XIX ст. ідзе карпатлівая праца па вывучэньні гістарычнага мінулага, нараджаецца і інтэнсіўна разьвіваецца археалягічная навука, шырока вядзецца запіс фальклёрных матэрыялаў, асэнсоўваецца этнічная адметнасьць беларусаў, робіцца некалькі спробаў выданьня беларускага пэрыядычнага органа, мастацкая літаратура ўваходзіць у новы пэрыяд свайго разьвіцьця... Усё гэта дазваляе гаварыць аб далучанасьці беларусаў ня толькі да славянскага, але да агульнаэўрапейскага працэсу росту нацыяналізму, які ішоў, у першую чаргу, шляхам усьведамленьня народамі сваёй гістарычнай саматоеснасьці і неабходнасьці барацьбы за збудаваньне ўласнай дзяржавы.

Запрудскі Ігар. Роля гістарычнага самаўсведамлення ў працэсе фарміравання нацыянальнай свядомасці беларусаў (сярэдзіна XIX ст.) // Беларусіка/Albaruthenica. Выпуск 2. Мінск: Навука і тэхніка, 1992. С. 213—214.

Каб гэтая навукападобная канструкцыя, заснаваная на праекцыях сьвядомасьці сучаснага беларускага інтэлігента, для якога мінуўшчына ёсьць адно мэтафарай сучаснасьці, не абрынулася, даводзілася атаесамляць этнаграфічна-экзатычную Беларусь Рыпінскага і Баршчэўскага з сучаснай Беларусяй альбо ўводзіць крытэры накшталт «ліцьвінская ідэнтычнасьць шляхты Беларуска-Літоўскага краю» (С. Токць).

Адным з найзырчэйшых прыкладаў аблудаў, выкліканых да жыцьця гэтай парадыгмай, ёсьць надзяленьне мадэрнай беларускай ідэнтычнасьцю аднаго з герояў паўстаньня 1863 г. на землях былой Літвы Канстанціна Вінцэнта Каліноўскага. Каліноўскі быў аўтарам і публікатарам выданьня на беларускай мове «Мужыцкая Праўда», сем нумароў якога выйшлі паміж 1862 і 1863 гг. Пасьля задушэньня паўстаньня быў схоплены і пакараны сьмерцю ў Вільні 10 (22) сакавіка 1864 г.

Гэтыя факты натхнілі навукоўцаў на сьцьверджаньне, што ў Ф. Багушэвіча быў «такі папярэднік й можа навет правадыр, як наш векапомны Кастусь Каліноўскі» (А. Адамовіч). Амэрыканскі гісторык Джон Т. Стэнлі падкрэсьліваў блізіню К. Каліноўскага да «сучаснай беларускай ідэі»: «Апошнія тэксты Каліноўскага зьмяшчаюць пачаткі асобнага палітычнага нацыяналізму»[54].

Каліноўскі сапраўды быў нацыяналістам-эгалітарыстам, чый нацыяналізм быў скіраваны супраць нямецкіх і расейскіх гегеманістычных прэтэнзіяў. Пры гэтым антынямецкі патас Каліноўскага ня йдзе ні ў якае параўнаньне з русафобскай рыторыкай, на якой ляжаў моцны адбітак тагачасных польскіх інтэлектуальных дыскусіяў пра неславянскае паходжаньне расейскага народу.

Каліноўскі заклікаў да вызвольнай вайны проці Расеі, бо толькі вырваўшыся зь яе складу, можна прыдбаць свабоду. Апрача ўсеагульнага, у тым ліку палітычнага і эканамічнага прыгнёту, ра-

---

[54] Stanley J.T. The Birth of a Nation: The January Insurrection and the Belorussian National Movement // The Crucial Decade: East Central European Society and National Defense, 1859—1870. New York: Columbia University Press, 1984. P. 195.

сейская адміністрацыя прынесла ў Беларусь сваё спэцыфічнае разуменьне права, якое выкарыстоўваецца інструмэнтальна, для дасягненьня бягучых палітычных мэтаў, як рэсурс улады. Ён пісаў пра бяздушную паразытуючую расейскую бюракратыю, пра распад традыцыйнага сельскага грамадзтва, рэзка крытыкаваў культурную палітыку расейскіх уладаў, у прыватнасьці, русіфікацыю сыстэмы адукацыі, а таксама іх рэлігійную палітыку, асуджаў прымусовую ліквідацыю ўніяцкай канфэсіі, «той веры, якую апавядалі ягоныя (мужыка. — Аўт.) бацькі, дзяды, прадзеды».

Каліноўскі ўсьведамляў культурную своеасаблівасьць беларусаў і гаварыў пра іх культурныя правы. З другога боку, у ягоных тэкстах, акрамя мовы, ня знойдзеш іншых неабходных элемэнтаў нацыяналістычнага мысьленьня, улучна з прасторавай лякалізацыяй Беларусі. К. Каліноўскі карыстаўся звонкім псэўданімам «Яська-гаспадар з-пад Вільні», пісаў «мы, што жывемо на зямлі Польскай, што ямо хлеб Польскі, мы, Палякі зь векаў вечных»[55], а адрасатам сваіх пасланьняў называў «мужыкоў зямлі Польскай». У тэкстах «Мужыцкай праўды» ні разу ня згадваецца і сам тэрмін «беларусы»[56].

Вось жа, і для Каліноўскага палякі былі «мы». У ягонай публіцыстыцы ня знойдзеш ацэнкі альбо характарыстыкі палякаў, зробленай з пазыцыі вонкавага назіральніка. Каліноўскі таксама ня бачыў прынцыповай розьніцы паміж палякам і ліцьвінам. Як вынікае з матэрыялаў сьледзтва над Каліноўскім, пад тэрмінам «Літва» ён разумеў землі былога ВКЛ. Маніфэст Выканаўчага (Віленскага) аддзелу варшаўскага нацыянальнага ўраду ад 19 сакавіка 1863

[55] Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Мінск: Беларускі кнігазбор, 1999. С. 242.

[56] Падчас паўстаньня 1830—1831 гг. падобны манэўр быў зьдзейсьнены адносна «мужыкоў-літоўцаў», якія ў той час яшчэ не пачалі сьцьвярджаць свёй асаблівай нацыянальнай ідэнтычнасьці. Паўстанцы выпусьцілі шэраг праклямацыяў па-літоўску з абяцаньнем зямлі і скасаваньня прыгону. У іх гаварылася, што пасьля перамогі паўстаньня сяляне стануць «сапраўднымі свабоднымі палякамі» і ня будуць «мужыкамі, як называюць вас маскалі». Ochmański J. Historia Litwy. Wrocław — Warszawa — Kraków — Gdańsk — Łódź: Ossolineum 1967. S. 163.

г. заклікаў «братоў нашых літоўцаў і беларусаў, якія ўтвараюць з Польшчай адзінае цэлае», да яднаньня ўсіх нацыянальных сіл вакол штандару незалежнасьці. У маніфэсьце ад 3 траўня 1863 г. жыхары Беларусі называліся сынамі «адзінай польскай айчыны». У «Лістах з-пад шыбеніцы» Каліноўскі ізноў заклікаў беларусаў падтрымаць барацьбу палякаў супраць царызму. Тэрмін «беларусы» зьяўляецца разам з тэрмінамі «палякі» і «літоўцы» сьпярша ў паўстанчых маніфэстах, а затым у «Лістах з-пад шыбеніцы» адно ў выніку барацьбы за сымпатыі мясцовага насельніцтва[57].

Такая ідэалягічная пазыцыя падаецца ўнутрана супярэчлівай, толькі калі катэгарычна прызнаваць Каліноўскага беларускім нацыянальным дзеячом, стваральнікам беларускасьці ў яе палітычным вымярэньні, які трактуе нацыю як палітычную і культурную катэгорыю.

Гэтая супярэчнасьць здымаецца, калі дапусьціць, што К. Каліноўскі быў чуйным да беларускай рэгіянальнай культуры «палітычным палякам»[58], які намагаўся шляхам абуджэньня пачуцьця «краёвага» патрыятызму мабілізаваць усе пласты насельніцтва Беларусі на барацьбу з расейскай дэспатыяй, улучна з вызваленымі ад прыгону прасталюдзінамі. Палітычным ідэалам Каліноўскага, як і іншых кіраўнікоў паўстаньня, заставалася аднаўленьне адзінай Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. як нацыянальнай дзяржавы. Акурат палітычна пасіўная і чакальная пазыцыя сялян, у тым ліку на беларускіх землях, асудзіла паўстаньне на паразу.

Кіраўніцтва паўстанцаў было гатовае прызнаць своеасаблівасьць беларускай мовы, каб падчас паўстаньня мабілізаваць бе-

---

[57] Гл. Токць Сяргей. Беларуская ідэнтычнасць у XIX ст. // Беларускі Гістарычны Зборнік — Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 24. С. 84—85; Смалянчук Алесь. Нацыя ў пошуках гісторыі. Да праблемы гістарычнай свядомасці пачынальнікаў беларускага Адраджэння. (Другая палова XIX — пачатак XX ст.) // Беларускі Гістарычны Зборнік — Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 24. С. 189.

[58] Гл. Radzik R. Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Białorusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-Wschodniej XIX stulecia. Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2000. S. 232.

ларусаў на барацьбу за аднаўленьне польскай незалежнасьці і захапіць ідэяй прыналежнасьці да ўнітарнай польскай палітычнай нацыі. Прызнаючы сялян суграмадзянамі адроджанай Рэчы Паспалітай, паўстанцы хацелі, каб яны прасякнуліся польскім патрыятызмам. Трохскладовая пячатка паўстанцкага Нацыянальнага ўраду (Rządu Narodowego) вызначала польскую нацыю, выходзячы з формулы «gente Ruthenus natione Polonus» і «gente Lituanus natione Polonus».

На момант паўстаньня беларускага нацыяналізму яшчэ не існавала, і дзеля гэтага можна было не намагацца заручацца ляяльнасьцю нацыянальна сьведамых беларусаў, а адразу «праглынуць» іх, заплюшчыўшы вочы на іх этнічнае аблічча. Сама практыка адозваў на рэгіянальных мовах падчас баявых дзеяньняў была распаўсюджаная ў Эўропе XIX ст. Падчас вайны багата што дазвалялася.

Дыскусіі сярод лідэраў паўстанцкага руху ішлі не над тым, прызнаваць ці не нацыянальную асаблівасьць беларусаў, а на больш агульныя тэмы: калі «белыя» разглядалі сувэрэнітэт шляхецкай нацыі як прадвесьце народнага сувэрэнітэту і лічылі, што шляхта адыграе асноўную ролю ў пераходзе ад аднаго да другога, то «чырвоныя» ставілі на п'едэстал масы (lud) і акурат у іх бачылі сапраўдную нацыю, да якой шляхта павінна была альбо далучыцца, альбо яе належала ўстараніць як перашкоду[59].

З гэтай пэрспэктывы роля К. Каліноўскага ня значна адрозьніваецца ад ролі В. Дуніна-Марцінкевіча. Як гэта ні дзіўна гучыць сёньня, прызнаньне імі абодвума пэўнай асаблівасьці беларускай мовы/гаворкі ня мела вынікам зьяўленьне беларускага нацыяналізму. Самабытная мова сталася важнай, але далёка ня самай неабходнай передумовай ягонага ўзьнікненьня. Беларускі нацыяналізм узьнікае толькі пасьля таго, як нарадзілася новае разуменьне Беларусі як этнічнай і культурнай, а не этнаграфічнай альбо

[59] Вандич Пьотр. Ціна свободи. Історія Центрально-Східної Европи від Середньовіччя до сьогодення. Київ: Критика, 2004. С. 204—206.

геаграфічнай катэгорыі. Крытычнай умовай ягонага ўзьнікненьня было ператварэньне Беларусі з правінцыі ў калёнію, уяўленьне яе народу ў якасьці этнічнай супольнасьці і надзяленьне яе больш высокай культурнай і гістарычнай легітымнасьцю. Статус адсталай правінцыі стаўся несумяшчальным з разьвіцьцём беларускага нацыяналізму.

## АНТЫПОЛЬСКІ ПЕРАВАРОТ 1863 Г.: БЕЛАРУСЬ ЯК ПРЫГНЕЧАНАЯ ЭТНІЧНАЯ НАЦЫЯ

*Беларусь — гэта краіна, «дзе народ гаворыць па-беларуску».*

М. Каяловіч. 1863.

*Вайна — гэта не пачатак нацыі, а яе каталізатар. Пачатак ёй паклалі адасабленьне ад суседзяў, варожасьць і барацьба, дзякуючы чаму эўрапейскія нацыі знайшлі сябе, — працэс, які цягнуўся тысячагодзьдзямі і быў на працягу доўгага часу справай шляхты і купкі гарадзкіх патрыцыяў і інтэлектуалаў, які запавольваўся падчас адноснага палітычнага заціша і зноў набіраў сілу ў неспакойныя часы, і толькі на мяжы XVIII і XIX ст. пачаў шырока ахопліваць масы і ператварацца ў матэрыяльную сілу.*

Гаген Шульцэ. Дзяржава і нацыя ў эўрапейскай гісторыі.

*Палякі і жыды — хатнія, дробныя, штохвілінныя і неадступныя дэспаты.*

І.Карнілаў, апякун Віленскай
навучальнай акругі. 1864 г.

Сынэргетычны польска-расейскі дыскурс пра Беларусь пачаў падточвацца задоўга да паўстаньня 1863 г. Хоць мысьленьне імпэрскай эліты даволі марудна ўбірала ў сябе вартасьці мадэрнага нацыяналізму, гэты працэс стаў незваротны з 1840-х гг. Пасьля Крымскай вайны нацыяналізм стаў рухальнай сілай і славянафілаў, і расейскіх панславістаў, і пецярбурскай бюракратычнай эліты. Зьвязаўшы ў адно расісцкія ідэі аб этнічнай вышэйшасьці расейцаў з аргумэнтам аб прагрэсіўнай прыродзе дзяржаўнай экспансіі, расейскі нацыяналізм станавіўся этнакультурным і этатысцкім. Усе малыя і палітычна слабыя народы павінны быць падпарадкаваныя духоўна і культурна вышэйшай Расеі, якой наканавана, дзякуючы яе памерам і вайсковай магутнасьці, кіраваць, несьці асьвету і асымілёўваць.

Палітыка расейскай імпэрыі становіцца больш чуйнай да нацыянальных інтарэсаў, хаця бюракраты і нацыяналісты зусім не ва ўсіх пытаньнях знаходзілі паразуменьне. Дынастычная паводле сваёй прыроды ўлада не магла дазволіць «нацыяналізаваць» самаўладзьдзе і дазволіць рэалізацыю прынцыпу «souveraineté du peuple» — вяршэнства інтарэсаў нацыі над інтарэсамі манархіі, бо гэта прадугледжвала карэнную ломку палітычнага ладу дзяржавы. Узмацніць цэльнасьць імпэрыі імкнуліся з дапамогай фармаваньня вялікай расейскай нацыі і асыміляцыі беларусаў і ўкраінцаў, а па магчымасьці і іншых нерасейскіх народнасьцяў. Гэтай мэце быў падпарадкаваны амбітны праект пабудовы новай агульнарасейскай ідэнтычнасьці зь відавочна выражаным этнакультурным пачаткам.

Прызнаньне беларусаў складовай часткай вялікай расейскай нацыі з асаблівай гаворкай і культурнымі традыцыямі цягнула за сабой далёкасяжныя наступствы. Гэта прадугледжвала пэўную інстытуцыяналізацыю мовы і традыцыяў беларусаў, увядзеньне

нейкай прамежкавай беларуска-расейскай ідэнтычнасьці і, нарэшце, жорсткае адмежаваньне беларусаў ад палякаў і іншых этнічных групаў згодна са строгімі навуковымі дадзенымі, у тым ліку на падставе этнічных крытэраў. Уцягненьне беларусаў у расейскае нацыятварэньне патрабавала заблякаваць ператварэньне беларусаў у чальцоў польскай нацыі.

Заклік да зьвядзеньня польскай нацыянальнасьці да межаў Царства Польскага і «вызваленьня» прыгнечаных Польшчай славянскіх нацыянальнасьцяў славянафілы абгрунтоўвалі зьвязаным зь лёзунгам вызваленьня ўсіх славянскіх народаў правам нацыяў на ўласную культурную своеасаблівасьць (на «поўную свабоду жыцьця і разьвіцьця кожнай нацыянальнасьці»). Гэтую праграму Канстанцін Аксакаў выразіў заклікам «Няхай жыве кожная народнасьць!».

Іван Аксакаў у лісьце да М. Каяловіча ад 13 верасьня 1861 г. тонка ўлавіў бягучую ідэалягічную каньюнктуру, у прыватнасьці, захапленьне геаграфіяй і картаграфіяй для выпрацоўкі прызначанага для грамадзкай думкі ўяўленьня аб межах «спрадвечнай» Расеі, і завастрыў увагу на этнічных межах расейскай нацыі: «Для нас цяпер найважнейшае пытаньне польскае і *пытаньне аб граніцах* польскіх... Адносіны Літвы і Беларусі да Польшчы могуць быць патрэбным чынам акрэсьленыя толькі пры дапамозе гістарычных, статыстычных і этнаграфічных дадзеных»[1].

---

[1] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 153.

Напярэдадні і падчас паўстаньня выйшла колькі дасьледаваньняў, прысьвечаных этнаграфічным межам беларусаў.

Бобровский П.О. Гродненская губерния (Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального Штаба). Санкт-Петербург, 1863. Ч. 1—2. С. 886—1074; Зелинский И. Минская губерния (Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального Штаба) Санкт-Петербург, 1864. Ч. 1—2. С. 672—701; Корев А. Виленская губерния (Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального Штаба). Санкт-Петербург, 1861. С. 804.

Расейскіх нацыяналістаў відавочна раздражнялі несумненныя посьпехі польскага нацыятварэньня сярод этнічных літоўцаў і беларусаў, асабліва каталіцкага веравызнаньня. Акурат з глыбокай заклапочанасьці гэтымі посьпехамі ўзьнікла трактоўка «палянізму» як нейкай аблуднай нацыянальнасьці, а ў нацыяналістычнай публіцыстыцы замільгацелі мэтафары перараджэньня, адступніцтва, «спакушэньня» ў чужую народнасьць і веру і адрачэньня ад спрадвечных каранёў. Славянафіл Аляксандар Гільфердынг у 1862 г. меркаваў, што толькі зьяўленьне беларускага Шаўчэнкі зможа выратаваць Беларусь ад палянізму. Беларуская нацыянальнасьць мелася стаць шчытом, які агароджвае ад прыняцьця польскай ідэнтычнасьці. Яна была вынайдзена, каб служыць карысьлівай праграме русіфікацыі масаў, якія яшчэ не набылі выразнай нацыянальнай сьвядомасьці альбо засвоілі яе «аблудную», г.зн. польскую вэрсію. Каб асымляваць беларусаў, іх трэба было спачатку распазнаць як асобную нацыянальнасьць[2].

Легітымізацыя імпэрскага дыскурсу адбывалася шляхам а) пастуляваньня асаблівых гістарычных правоў Расеі на прыгнечаную лацінскай Польшчай Беларусь: толькі Расея як самы магутны цэнтар славянскай цывілізацыі можа забясьпечыць сапраўднае разьвіцьцё гэтай «спрадвечна расейскай» тэрыторыі; б) усхваленьня манархіі Раманавых і адмаўленьня права польскай нацыі на ўласную дзяржаўнасьць, бо яна «зьняславіла сябе падчас заняпаду Рэчы Паспалітай», успрыняцьця польскай шляхты як варожага да народу стану, якое адмовілася ад сваёй народнасьці; в) уяўленьня аб Расеі як аб «царстве бязь межаў», якое ахоплівае

[2] У чэрвені 1863 г. у газэце «День» Іван Аксакаў пісаў: «Неабходна, каб селянін разумеў і царскі ўказ, і намаўленьне расейскай улады... неабходна, каб ён адчуў сябе зусім расейцам, а для гэтага ён павінен адчуць сябе найперш беларусам...»

Аксаков И.С. Полн. собр. соч. Т. III. Польский вопрос и Западно-Русское дело. Еврейский вопрос. Москва, 1886. С. 114—115. Цыт. пав.: Долбилов М.Д. Культурная идиома возрождения России как фактор имперской политики в Северо-Западном крае в 1863—1865 гг. // Ab Imperio. 2001. № 1—2. С. 227—268.

ўсе часткі сьвету і лучыць усе славянскія народы. Крывавае замірэньне Польшчы ўслаўлялася як перамога сапраўднай праваслаўнай веры над загніваючым каталіцызмам. (Уяўленьні аб «агульнапрынятым у гэтым краі нястрымным польскім «дэспатычным тыранізьме» і «польскай распусьце», несумненна, праектавалі ў публічную прастору адпаведныя ўласьцівасьці расейскай улады.)

Імпэрскі ўрад пэўны час праяўляў нерашучасьць у нацыянальным пытаньні, якое пагражала ў будучыні палітычнымі ўзрушэньнямі. Мэтадам пабудовы вялікай расейскай нацыі сьпярша былі абраныя прадыктаваныя лёгікай нацыяналізму рэформы ў сацыяльна-эканамічнай сфэры — аграрная, адукацыйная, судовая і адміністрацыйная.

Аграрная рэформа 1861 г. суправаджалася прапагандысцкай шуміхай з выкарыстаньнем нацыяналістычнага слоўніка (глеба, вытокі, арганічная суцэльнасьць, адраджэньне, узьяднаньне народнай масы зь зямлёй). Прысьвечаныя ёй афіцыйныя дакумэнты стракацелі неад'емнай ад арганіцысцкага нацыяналізму сымболікай абуджэньня народу, зразумелага як сьвядомы арганізм, ад векавога сну, узнаўленьня ягонай цэльнасьці з дапамогай устараненьня станавых бар'ераў, уваскрашэньня забытых традыцыяў. Надзяленьне сялян зямлёй падавалася як аднаўленьне спрадвечнай сувязі селяніна з глебай. Сялянскае права ўласнасьці на зямлю набывала значэньне старадаўняй расейскай традыцыі, адроджанай дзякуючы чуйнасьці ўлады да гістарычнай памяці народу[3].

Праектуючы вышэйазначаныя рэформы, пецярбурская бюракратыя зьбіралася ўніфікаваць апарат кіраваньня ва ўсіх імпэрскіх рэгіёнах, паставіць яго на адзіную прававую аснову і зьнівэляваць мясцовую спэцыфіку на карысьць усталяваньня адзінай агульнадзяржаўнай (а ў пэрспэктыве і агульнанацыянальнай) ідэнтычнасьці. Межы паміж асобнымі рэгіёнамі мусілі быць

[3] Долбилов Михаил. Полонофобия и русификация Северо-Западного края (1860-е гг.): Метаморфозы этностереотипов // Образ врага. Москва: ОГИ, 2005. С. 334.

ліквідаваныя, традыцыйныя асаблівасьці кіраваньня і заканадаўства паступова сьцёртыя, у якасьці адзінай бюракратычнай мовы мусіла быць уведзеная расейская мова, а станавае самакіраваньне, радавыя прывілеі і асаблівыя правы зьведзеныя да мінімуму. Мэтам русіфікацыі павінны былі служыць сэкулярызацыя пачатковай адукацыі, выпуск разьлічанай на масавага чытача друкаванай прадукцыі і г.д.

Студзеньскае паўстаньне прымусіла перагледзець мэтады вырашэньня «нацыянальнага пытаньня». З аднаго боку, 18 ліпеня 1863 г. зьявіўся цыркуляр Валуева, які забараняў кнігадрукаваньне на ўкраінскай мове. Зь іншага боку, улада пачала навязваць этнічнае, але не палітычнае альбо культурнае разуменьне польскасьці. Сур’ёзным аргумэнтам для новай нацыянальнай палітыкі таксама быў факт, што частка беларусаў усё-ткі далучылася да паўстаньня. Каб надалей не дапусьціць гэтага, акрамя зьвядзеньня польскай нацыянальнасьці да яе этнаграфічных межаў на тэрыторыі Царства Польскага, гэтая нацыянальная палітыка ўключала ў сябе адмежаваньне ад уплыву «палянізму», г.зн. польскай культуры і ідэнтычнасьці, іншых этнічных групаў, у тым ліку беларусаў. Больш за тое, імпэрская эліта стала зацікаўленая ў нарошчваньні іх колькасьці.

Палякі былі адной з эўрапейскіх дамадэрных нацыяў, і да паўстаньня 1863 г. у Эўропе пад гэтым імем разумелі жыхароў былой Рэчы Паспалітай. Зразумела, што гэтая дамадэрная нацыя не была этнічнай супольнасьцю, і ў першай палове XIX ст. польская эліта намагалася прышчапіць пачуцьцё польскай нацыянальнасьці таксама літоўцам, украінцам і беларусам праз школьнае навучаньне на польскай мове і канструяваньне прамежкавых ідэнтычнасьцяў. На момант паўстаньня працэс фармаваньня мадэрнай польскай нацыі быў далёкі ад заканчэньня: грамадзтва на ўсходняй пэрыфэрыі былой Рэчы Паспалітай было раскалотае на эліты — адданыя нацыянальнай ідэнтычнасьці, заснаванай на шляхецкай культуры, рыцарскай этыцы, каталіцызьме і лацінскім культурным кодзе (П. Вандыч), — і беларускае, украінскае і літоўскае простанародзьдзе. На фоне ўкраінцаў і літоўцаў беларусы складалі вынятак, бо ў гэты

час яшчэ не існавала ні беларускага нацыяналізму, ні іх разуменьня ў якасьці самастойнай этнічнай групы.

Пасьля недвухсэнсоўнага сыгналу ўлады кардынальна вырашыць нацыянальнае пытаньне на заходніх ускраінах імпэрыі Беларусь адразу трапіла ў фокус расейскай грамадзкай думкі. Праграма гвалтоўнай асыміляцыі беларусаў у расейцаў прыкрывалася ў нацыяналістычнай публіцыстыцы ўзятымі зь лексыкону этнічнага і арганіцысцкага нацыяналізму ідэямі арганічнасьці і магнэтычнай сілы расейскай экспансіі, а таксама кроўнага сваяцтва[4] і мэтафары адзінага расейскага народу, абуджэньне ўсіх плямёнаў якога адбываецца насуперак прыніжэньням і прошукам «варожых элемэнтаў» (у гэтым палягала інавацыя, раней паляк маляваўся як апанэнт законнай улады, а не народу):

> *Наша грамадзтва наўрад ці і прыпамінала да цяперашніх падзеяў, што за Кіевам і Смаленскам жывуць яшчэ цэлыя мільёны расейцаў , але жывуць у галечы матэрыяльнай і духоўнай, прыгнечаныя і маральна прыніжаныя варожым элемэнтам, кінутыя без кіраўніцтва і падтрымкі роднымі братамі*[5].

Славянафільскі «День» тры нумары (№ 26, № 28 і № 30 за 1863 г.) прысьвяціў «аблудам» адносна польскай мовы ў Беларусі. У №

---

[4] «Сьвядомасьць адзінства, — пісаў М. Каяловіч, — заўважная ў нашых летапісцаў, прычым яна ідзе далей дзяржаўнасьці і абдымае больш унутраныя зьявы нашага гістарычнага жыцьця».

Коялович М.О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям. СПб., 1884. Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 225.

[5] Еленев Ф. Польская цивилизация и ее влияние на Западную Русь. СПб., 1863. С. 82. Цыт. пав.: Долбилов Михаил. Полонофобия и русификация Северо-западного края (1860-е гг.): Метаморфозы этностереотипов // Образ врага. Москва: ОГИ, 2005. С. 334.

26 быў надрукаваны «Ліст былога вучня Менскай гімназіі» з разважамі аб блізіні беларускай мовы да польскай. У адказ на яго ў № 28 выйшла зацемка «З нагоды ліста былога вучня Менскай гімназіі, памешчыцкага сына» за подпісам «Не з памешчыцкіх сыноў. N., настаўнік адной з заходніх гімназіяў» са спраставаньнем гэтага меркаваньня на падставе моўных фактаў, фальклёру і мясцовых звычаяў і спробай давесьці адваротнае — блізіню беларускай мовы да расейскай. Выніковы рэдакцыйны камэнтар на гэтую тэму быў зьмешчаны ў № 30 за подпісам «Рэдакцыя газэты «День», яе супрацоўнікі і ўсе, хто спачувае ёй» і пад назвай «З Масквы да праваслаўных беларусаў не зь сялян, пераважна да беларускага духоўнага стану».

Аднак значна больш доўгатэрміновы эфэкт меў беспрэцэдэнтны, выбухападобны інтарэс імпэрскай навукі, найперш філялёгіі, картаграфіі і этнаграфіі, да беларускай праблематыкі. У 1863—1864 гг. адна за адной выходзяць працы, якія па-новаму трактавалі этнаграфічныя межы беларускага народу і асаблівасьці ягонай мовы. У 1863 г. у газэце «Современная летопись» друкуецца нарыс Н. Вінаградава, прысьвечаны моўным асаблівасьцям крайняга захаду беларускай этнічнай тэрыторыі — Аўгустоўскай і Гарадзенскай губэрняў. На самым пачатку 1864 г. «Русский инвалид» (№ 1 і 13) за подпісам «П. Ос-кий» друкуе «Лісты зь Беларусі», у якіх закранаецца пытаньне ўплыву беларускай мовы на латыскую ў гарадох Рэжыца і Люцын. У жніўні таго ж году часопіс «Русский вестник» друкуе шасьцістаронкавы артыкул Дз. Ілавайскага «Вялікі Ноўгарад і Беларусь», у якім выкладалася меркаваньне аб блізіні ноўгарадзкай гаворкі да беларускай мовы і шэраг заўвагаў аб польскім уплыве на яе. «Вестник Западной России» (1864/65, т. III, отд. IV, июнь, с. 351—363) друкуе за подпісам «Ал. Толс.» артыкул «...Сеё-тое аб народнасьцях расейскай (русской) і польскай», дзе таксама закраналася тэма паходжаньня і слоўнікавага складу беларускай мовы.

Акурат у разгар нацыяналістычнай рэакцыі на студзеньскае паўстаньне нараджаецца вобраз Беларусі як прыгнечанай этнічнай нацыі. Ягоны аўтар — Міхаіл Каяловіч, імпэрска-легітымісцкі

маралізатар, рэалістычны расіст і рамантычны нацыяналіст-арганіцыст, у якім дзякуючы пільнай увазе да нацыянальнага пытаньня лёгка распазнаць заходніка[6].

Каяловіч ня быў прадстаўніком чыстай навукі — да яе ён прымешваў элемэнты ідэалёгіі, прапаганды, журналістыкі і публіцыстыкі. Валодаючы ўнікальнымі ведамі аб гісторыі і этнаграфіі Беларусі і жвава цікавячыся этнічным паходжаньнем беларусаў, сваёй ідэалягічнай дзейнасьцю ён імкнуўся наблізіць перамогу канцэпцыі вялікай расейскай нацыі. Адсюль ягонае бачаньне беларусаў як адной з расейскіх народнасьцяў, якая арганічна ўваходзіць у склад «адзінага расейскага народу», выражанае ўжо ў 1863 г.:

> *У нас, у Беларусі, (...) на гістарычную сцэну выходзіць народ, які на працягу доўгага часу здольны быў проціпа-*

---

[6] Прафэсар Пецярбурскай духоўнай акадэміі Міхаіл Каяловіч нарадзіўся 20 верасьня (2 кастрычніка паводле новага стылю) 1828 г. у мястэчку Кузьніца Гарадзенскай губэрні (сёньня ў Польшчы) у сям'і ўніяцкага сьвятара. Пачатковую адукацыю атрымаў у школе мястэчка Супрасьля, потым скончыў Супрасьлеўскую духоўную вучэльню і паступіў у Літоўскую духоўную сэмінарыю, якая ў год ягонага паступленьня (1845 г.) была пераведзеная з Жыровічаў у Вільню. У 1851—1855 гг. навучаўся ў Санкт-Пецярбурскай Духоўнай Акадэміі. Гл. ягоную біяграфію ў кнізе: Черепица Валерий Н. Михаил Осипович Коялович. История жизни и творчества. Гродно: ГрГУ, 1998. С. 328.

Насуперак І. Бабкову* акурат Каяловіч, а не Ф. Багушэвіч быў аўтарам знаку «Беларусь» як этнічнай катэгорыі.

*Бабкоў Ігар. Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньні ру[і]наў. Менск: Логвінаў. С. 54.

Факт, што Каяловіч быў нараджэнцам Беласточчыны, разьмешчанай на захадзе беларускага этнічнага арэалу, мабыць, ня быў гістарычнай выпадковасьцю. Беларусы гэтага краю адчувалі сваю этнічную своеасаблівасьць вастрэй, чым жыхары іншых частак беларускага этнічнага арэалу, таму што непасрэдна сутыкаліся з палякамі і немцамі Ўсходняй Прусіі як этнічнымі супольнасьцямі, якія ўжо на мяжы XVIII і XIX ст. пачалі будаваць свае асобныя нацыі. Паводле перапісу 1897 г., 36,4% насельніцтва Аўгустоўскага павету Сувалкаўскай губэрні, што непасрэдна межавала з Усходняй Прусіяй, складалі беларусафоны. Адлегласьць жа паміж населенымі пунктамі, разьмешчанымі на крайнім захадзе беларускага этнічнага арэалу, напрыклад, ад вёскі Трыпуці (15 км на захад ад Беластоку), да Варшавы складае ўсяго каля 150 км.

*ставіць напору чужых яму стыхій толькі пасіўную сілу, — народ бедны, прыгнечаны, загнаны, здрабнелы фізычна і маральна. Паглядзеце на змучаны твар тутэйшага селяніна, на яго нізкі рост і худое цела, на лахманы, у якія ён апрануты, на пасьпешнасьць, зь якой ён кідаецца вам пад ногі, а пасьля цалуе руку, — паглядзеце, і вам будзе зразумелая тая цемра зьнявагі, у якой ён апынуўся*[7].

У рыторыцы Каяловіча суседнічалі ўстойлівыя традыцыйныя каляніяльныя ўяўленьні аб беларусах як пасіўнай і несьвядомай масе і адносна новае ўспрыманьне іх як апірышча ўлады ў барацьбе з сэпаратызмам, носьбіта здаровага пачатку, антыпода «пана»-«паляка»-мяцежніка. Перад намі разгортваецца нацыяналістычная сымболіка народу, абуджанага ад векавога сну, што ледзьве ня стаўся для яго сном «сьмяротным», узмоцненая эфэктамі прасьвятленьня:

*Ітак, факт адбыўся. Народ беларускі, які доўга быў палучаны з Польшчай духам і крывёю, паўстаў процi гэтае самае Польшчы... Вось як бліскуча заяўляе тутэйшы народ свае правы на належнае яму месца ў сям'і эўрапейскіх нацыянальнасьцяў*[8].

Тэматызацыі Каяловічам Беларусі быў уласьцівы арганіцысцкі кантэкст, сфармаваны рамантычным «гэрдэрыянскім» нацыяналізмам. У ягонай аснове была канцэпцыя арганічнай нацыі, якая разумелася як жывая істота, дзе кожная частка залежыць ад іншых частак і дзе паміж членамі адзінага арганізму ня можа быць ані-

---

[7] Коялович М.О. Народное движение в Западной России // Русский Инвалид. 1863. № 91. Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 158.

[8] Тамсама. С. 166.

якага прынцыповага канфлікту інтарэсаў. Дзяржава трактуецца як «галава» арганічнага цела, якое выконвае яе волю, вызначае яе інтарэсы і абараняе іх ад шкодных унутраных мікробаў і вонкавых узрушэньняў. Беларусь жа трактуецца як адзін з членаў гэтага цела:

> *Беларусь зь сярэдзінай Расіі лучыць моцная ды жывая сувязь. Туды яе непераможна цягне і «руская вера» вялізнай большасьці насельніцтва, і расійская мова, і расійскі гандаль, больш важны для краіны, чым гандаль з заходнімі суседзямі. Гістарычна народная цяга Заходняе Расіі да Ўсходняй выяўлялася ў шмат якіх выпадках нават і тады, калі гэтая Заходняя Расія знаходзілася пад чужой уладай*[9].

Вытворнае гэтага арганіцысцкага нацыяналізму — міт аб непарыўнай сувязі Беларусі і Расеі — стаў нарожным для тэлеалёгіі русіфікацыі. Ён трывала ўвайшоў у беларускі культурны архіў, і ўваскрасаў кожны раз, калі ў Беларусі ўзмацнялася жорсткасьць палітычнага рэжыму.

Аргумэнтамі аб братэрстве, адзінакроўнасьці, супольнай веры і гісторыі Каяловіч ідэалягічна апраўдваў асыміляцыю беларусаў у расейцаў. Ва ўлоньні «вялікай» Расеі без усялякіх цырымоніяў павінна была знайсьці сваю сьмерць беларуская ідэнтычнасьць[10].

Прапанаваная ім схема мысьленьня, паводле якой беларусы маюць тую самую мову і тое ж самае кроўнае і культурнае паходжаньне, што і расейцы, здавалася, не пакідала прасторы для сэпаратызму:

---

[9] Коялович М., проф. Чтения по истории западной России. СПб., 1884. С. 4. Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 223.

[10] Пар. Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 55.

*Толькі ў адзінстве з Усходняй Расіяй любоў да Беларусі можа мець законнае і плённае выяўленьне. На ўсход Беларусь цягне народнае адзінства крыві, і вораг народу той, хто будзе паўставаць супраць гэтага адзінства*[11].

Каяловіч адным зь першых выкарыстоўваў мадэрнае паняцьце Беларусі як своеасаблівай лінгвакультурнай сутнасьці, у ягоным разуменьні арганічна зьвязанай з Расеяй. І як ні парадаксальна, акурат ён першы паставіў пытаньне аб палітычнай незалежнасьці Беларусі (у нэгатыўнай форме, сьцьвярджаючы, што яна немагчымая):

*Палітычная незалежнасьць Заходняй Расіі немагчымая... Беларусь нагэтулькі бедная, што ня можа дапускаць непатрэбных тэорый і летуценьняў. Ёй трэба вырашаць толькі самыя істотныя, канечна патрэбныя пытаньні, дый беларускае племя такое блізкае да вялікарускага, што ніякі сэпаратызм ня можа мець у ім сілы*[12].

Наступнае выказваньне ўводзіць яшчэ адзін важны элемэнт расейскага нацыяналістычнага дыскурсу — уяўленьне аб «расейскай душы, скарбніца якой ёсьць надзеяй усіх славянскіх народаў». Гэта быў аргумэнт на карысьць поўнага прысабечаньня голасу іншага, апраўданьне імпэрскага маналёгу: маецца на ўвазе, што іншая мова і іншы народ не патрэбныя; расейцы, нібыта найлепш разумеючы чужых, могуць браць на сябе паўнамоцтвы гаварыць

[11] Коялович М. Польское приглашение белорусского юношества к сепаратизму // Литовские епархиальные ведомости. 1882. № 10. С. 78—80. Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 222.

[12] Коялович М. Лекции по истории Западной России. Москва, 1864. С. 25—27. Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 217—218.

за іх і пра іх. Усхваленьне нібыта ўсёабдымнай расейскай «душы» ў творчасьці пісьменьнікаў некалькіх пакаленьняў было літаратурным дадаткам да каляніялізму, ягоным эквівалентам і ішло поруч з рэальнасьцю агрэсіяў і гвалтоўнай асыміляцыі[13].

Супрацьпастаўленьне «мы» (беларусы) — «яны» (расейцы) у дадзеным кантэксьце падкрэсьлівае, што Каяловіч успрымаў яшчэ ня выкараненую беларускую адметнасьць як прыкры факт:

> *Паміж расійцамі і намі няма поўнага адзінства. Як стварыць гэтую паўнату? Мне шмат прыходзілася думаць аб гэтым і мне здаецца, што замацуе яе не матэрыяльная расійская сіла, ні нават расійскі розум, а расійская душа, скарбніца якой зьяўляецца надзеяй усіх славянскіх народаў*[14].

Зь лёгкай рукі А. Цьвікевіча Каяловіча прынята ўважаць за аднаго з заснавальнікаў «заходнерусізму». Нягледзячы на сваю праблематычнасьць, паняцьце «заходнерусізму» трывала ўкаранілася ў беларускім дыскурсе разам са спадарожнымі яму аблудамі:

> *У межах заходнерусізму адбываюцца наступныя падзеі:*
> *— апазнаваньне славянскасьці і рускасьці ў літоўскай гісторыі;*
> *— паўставаньне міту здраджанага народу;*
> *— крытыка мэханічнай калянізацыі*[15].

---

[13] Пар. Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 42.

[14] Речь М. Кояловича на общем собрании виленского братства // Вестник Западной России. Кн. 10. Гл. IV. 1865—1866. С. 74—75. Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западноруссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 170.

[15] Бабкоў Ігар. Генэалёгія беларускай ідэі. Зь лекцыяў для Беларускага калегіюму // ARCHE. 2005. № 3. С. 150.

Калі з вылучэньнем міту здраджанага народу можна пагадзіцца, дадаўшы, што адбываецца ў атмасфэры антыпольскай гістэрыі, а «крытыка мэханічнай калянізацыі» застаецца нераскрытым абстрактным канцэптам (хутчэй наадварот, заходнерусізм адстойваў нарошчваньне мэханічнай калянізацыі), то «апазнаваньне славянскасьці і рускасьці ў літоўскай гісторыі» — гэта відавочнае непаразуменьне. У рамках заходнерусізму адбываецца іншая, значна больш маштабная падзея: упершыню ў гісторыі беларусы былі апазнаныя як этнічная нацыя. Як ідэалёгія заходнерусізм абгрунтоўваў таксама блякаваньне польскага нацыятварэньня на беларускіх землях, найперш шляхам аслабленьня старой эліты. (Адным зь першых посьпехі ў пабудове вялікай расейскай нацыі адзначыў Ф. Энгельс — ужо ў 1866 г. ён пісаў, што новая канцэпцыя нацыянальнасьці была «расейскім вынаходам, прызначаным зьнішчыць Польшчу».)

Цаной прыналежнасьці да польскай нацыянальнасьці сталі жорсткія палітычныя рэпрэсіі і ўзмоцненая культурная, рэлігійная, эканамічная і сацыяльная дыскрымінацыя. Мясцовую польскую эліту адхілілі ад кіраваньня мясцовымі справамі, у якіх яна была кроўна зацікаўленая, на карысьць бюракратыі з «карэннай» Расеі. Падобна сучаснай беларускай намэнклятуры, яна вытрачвала ўсю сваю энэргію на самавыжываньне, а не на нарошчваньне пазыцыяў.

Польскі краёвы літаратурны працэс пасьля падзеяў 1863—1864 гг. на пэўны час перастае прадукаваць прыдатныя для публікацыі тэксты на беларускай мове. Гэта было выклікана як абмежаваньнямі імпэрскай улады, так і ўзмацненьнем рэакцыйнасьці польскіх элітаў, для якіх выкарыстаньне беларускай мовы пачынае маркіравацца як знак здрады нацыянальнай справе.

Гэтая рэакцыйная ўстаноўка пойдзе на спад толькі пад самы канец XIX ст. У 1885 г. А. Ельскі ў рамках ужо апрабаванага Дуніным-Марцінкевічам і ягонымі аднадумцамі сюжэту прызнаў за беларускай мовай пэўныя якасьці і правы:

*Адносна беларускай мовы, на якой зь невялікімі адрозьненьнямі гавораць больш чым пяць мільёнаў чалавек, трэ-*

*ба сказаць, што незалежна ад цалкам асабістай, уласьцівай ёй характарыстыкі (całkiem osobistej, sobie właściwej charakterystyki)... барацьба супраць яе зь любога боку ня будзе мець вынікаў*[16].

Ельскі паўтараў дзяжурныя фразы аб любові да мовы як цноце і пра самую мову як пра вартасьць, якія цяжка было назваць новымі:

*Калі народ любіць і шануе (czci pielnia) сваё гняздо, ужо гэта добра сьведчыць пра яго, у такім разе той, хто можа, няхай дапаможа яму палюбіць і захаваць для ўласнай хвалы і шчасьця родную мову, якая ёсьць ягонай сапраўднай вартасьцю, безь якой ён ня быў бы тым, кім ёсьць, і не сьпяваў бы так пранікнёна і пачціва, як ён сьпявае пра родны край*[17].

Як і Дунін-Марцінкевіч амаль пяцьдзясят гадоў таму, Ельскі ў 1892 г. карыстаўся заснаванай на каляніяльнай ідэалёгіі аргумэнтацыяй. Братэрства беларусаў і палякаў нібы пацьвярджае «старадаўні, пакрэўны польскаму беларускі язык»[18]. Яно не вычэрпваецца моўнай блізінёй і праяўляецца ў тэлеалягічным, духоўным і матэрыяльным аспэктах («брацтва двух языкоў і двух народаў, каторым Бог сам судзіў жыць сумесна і побач, разьвівацца разам духоўна і матэр'яльна...»)[19].

Нарэшце, як і для ранейшых польскіх культуртрэгераў, беларусы для Ельскага былі «яны»:

*Чытаючы «Пана Тадэвуша», дарагія Беларусы, палюбіце ж усім сэрцам сваю родную, занядбаную, сьвятую бела-*

---

[16] Jelski A. O gwarze białoruskiej // Kraj. 1885. № 6. S. 11.
[17] Тамсама.
[18] Ельскі Аляксандр. Выбранае. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. С. 388.
[19] Тамсама. С. 389.

*рускую мову, каторая спрадвеку ня толькі была вашаю ў сёлах, но яе ўжывалі самыя даўнейшыя манархі краю і іх вяльможы. Ваш старадаўні беларускі язык мусіць варт чагось, калі можна на яго склад ператлумачыць найцальнейшыя паэтычныя творы вялікіх пісацеляў*[20].

Вось жа, гэтая ўзыходзячая да Чачота і Баршчэўскага ідэалягічная лінія ў канцы XIX ст. апынулася ў стане стагнацыі і была пазбаўленая сур'ёзнай унутранай дынамікі.

Застой «польскай справы» і перамога Каяловіча і іншых заходнярусаў пакажуць дадзеныя перапісу 1897 г., калі з мадэрнай, нядаўна распрацаванай катэгорыяй «беларуская мова» атаясамілі сваю мову амаль 6 млн чалавек[21].

Тое, што пасьля 1863 г. беларускасьць набывае мадэрны, адрозны ад геаграфічнага, вымер, паказвае дэмаграфічная статыстыка. Напрыклад, у 1858 г. у Смаленскім, Дарагабускім, Духаўшчынскім, Ельнінскім, Красьнінскім, Парэцкім, Рослаўскім паве-

---

[20] Тамсама. С. 391.

[21] Стан нацыянальнай сьвядомасьці беларускага грамадзтва падчас студзеньскага паўстаньня адлюстроўвае буркатаньне Мураўёва: «Самі расейцы, што жылі ў тых губэрнях, не лічылі сябе расейцамі, а край той лічылі прыналежнасьцю Польшчы»*.

Ва ўсходняй і цэнтральнай частцы Беларусі, асабліва сярод праваслаўнага насельніцтва, якое па сутнасьці не закрануў працэс польскага нацыятварэньня, сярод сялянскіх мас не існавала нацыянальнай сьвядомасьці нават у канцы XIX ст. Беларусы Віцебскай губэрні звалі сябе «наськімі, тутэйшымі», праваслаўныя сяляне Гарадзеншчыны — «тутэйшымі», часам літвінамі**.

* [Муравьев М.Н.] Всеподданнейший отчет графа М.Н. Муравьева по управлению Северо-Западным краем (с 1 мая 1863 г. по 17 апреля 1865 г.) // Русская старина. 1902. № 6. С. 495. Цит. по Долбилов М.Д. Культурная идиома возрождения России как фактор имперской политики в Северо-Западном крае в 1863—1865 гг. // Ab Imperio. 2001. № 1—2. С. 227—268.

** Шейн П. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Санкт-Петербург, 1902. Т. 2. С. 21. Цыт пав.: Токць Сяргей. Беларуская ідэнтычнасць у XIX ст.// Беларускі гістарычны зборнік — Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 24. С. 93.

тах, а таксама ў Смаленскай губэрні наагул пераважала беларускае насельніцтва. Паводле перапісу 1897 г. ва ўсіх паветах, апроч Красьнінскага, пераважала ўжо вялікарасейскае насельніцтва, а наагул у губэрні доля расейцаў складала 91,7%, беларусаў — 6,6%. Мяркуючы па ўсім, гэтая дынаміка тлумачыцца канчатковым ператварэньнем тэрміна «беларус» у этнонім, а не выключна русіфікацыяй, якая наўрад ці магла ісьці такімі тэмпамі.

Для канструяваньня беларусаў як этнічнай нацыі Каяловіч выкарыстаў стандартны нацыяналістычны інструмэнтар: мапы, перапісы і дадзеныя этнаграфіі[22].

Ягоным зыходным пунктам была крытыка этнаграфічнага «атлясу правінцыяў, населеных спрэс альбо часткова палякамі» Эркерта[23]. Каяловіч пярэчыў проці самой назвы атлясу, падкрэсьліваў недакладнасьці і памылкі межаў і лічбаў расьсяленьня беларусаў, у тым ліку беларуска-польскага і беларуска-літоўскага памежжа (на захадзе тагачаснай Гарадзенскай губэрні, па Бугу і Нёману). Як і паўсюль у Эўропе, у Беларусі этнічная ідэнтыч-

---

[22] Гл. ягоныя артыкулы «О расселении племен Западного края России. По поводу изданного Эркертом (на французском языке) Этнографического атласа областей, населенных сплошь или отчасти поляками. Сказано в Общем собрании Географического общества 8 мая 1863 г.» // Русский инвалид. 1863. № 114; «Об этнографической границе между Западной Россией и Польшей. Публичная лекция, сказанная в имп. Русском географическом обществе 3 апреля» // Русский инвалид. 1863. № 78. Славянафільскі «День» у № 14—29 за 1864 г. друкаваў «Лекции по истории Западной России» М. Каяловіча, што выклікалі палеміку з боку Н. М. Кастамарава (Голос. 1864. № 118), які крытыкаваў тэорыю аб утварэньні беларускай і ўкраінскай мовы з адзінай «западнорусской» мовы і крытыкаваў ідэі Каяловіча аб блізіні беларускай і ўкраінскай мовы да расейскай. Кастамараў таксама назваў навукова неабгрунтаванай тэорыю Каяловіча аб існаваньні адзінай «западнорусской» мовы і што беларуская і ўкраінская мова ўяўляюць сабой адну мову. Рэпліка ў адказ была надрукаваная ў «Русском инвалиде» (1864. № 100). Сярод іншага, Каяловіч у ёй пярэчыў супраць атрыбуцыі Кастамаравым мовы шэрагу беларускіх помнікаў у якасьці польска-расейскай.

[23] Выйшлі два выданьні — у 1860 г. па-француску — «Atlas éthnographique des provinces, habitées en totalité partie par les Polonais» і ў 1864 г. па-расейску, ужо зь зьмененай назвай — «Взгляд на историю и этнографию Западной России», з атлясам.

насьць не супадала з моўнай і рэлігійнай, і каб зьняць гэтую супярэчнасьць, Каяловіч настойваў на ідэнтыфікацыі беларусаў на аснове крытэра веры. Паводле яго, Беларусь у мінуўшчыне была ня проста тэатрам ваенных дзеяньняў паміж Усходам і Захадам, як меркавалі Турчыновіч і Міцкевіч, але полем сутыкненьня «славянскага» і «лацінскага» хрысьціянства. Беларуская душа неадрыўная ад праваслаўя, і этнічная ідэнтыфікацыя беларусаў павінна супадаць з канфэсійнай:

> *Прынцып гэты — найлепшы цяпер для падзяленьня жыхароў Беларусі на палякаў і беларусаў; мяне заўсёды дзівяць спробы шмат каго ў нашай літаратуры вырашаць жыцьцёвыя пытаньні ў Заходняй Расіі не на аснове рэлігійнага пытаньня*[24].

Гэты падыход выклікаў вострую палеміку з боку яшчэ аднаго «заходняруса» Паўла Баброўскага, для якога крытэр веры ня быў вызначальным для этнічнай ідэнтыфікацыі беларусаў:

> *Чым, як ня мовай, кіраваўся Эркерт пры разьмежаваньні беларусаў ад украінцаў? А тым часам ён ня хоча прыняць гэткага ж прынцыпу для разьмежаваньня беларусаў ад палякаў... Нічога ня значыць, што беларусы, па словах Эркерта, не называюць сябе гэтым імем. Беларусы, ня ведаючы, што яны беларусы, захавалі і ў штодзённай гутарцы, і ў песьнях, і ў прыслоўях свае азначаныя нацыянальныя, лягічныя формы, свой азначаны характар, свае правы, звычаі і г.д. Беларус-селянін, ці будзе ён праваслаўны, ці каталік, мае свае пераконаньні, сваю мараль-*

[24] Коялович М. О расселении племен Западного края России. Доклад в Общем собрании Географического общества 8 мая 1863 г. Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 175.

*ную філязофію і перадае гэта разам з мовай сваім дзецям і ўнукам*[25].

Лягічна бездакорны, здавалася б, падыход Баброўскага так і не запанаваў у мысьленьні імпэрскай эліты. Усю другую палову XIX і ўсё XX ст. імпэрская ўлада нібыта несьвядома блыталася ў меркаваньнях, успрымаючы беларусаў-каталікоў як палякаў, паколькі заахвочвала этнічную самаідэнтыфікацыю беларусаў зусім не для таго, каб яны пабудавалі мадэрную нацыю, а для іх лягчэйшай асыміляцыі ў расейцаў. За гэтай знарочыстай забыўлівасьцю стаяў важны стратэгічны падыход: ідэнтыфікацыя беларусаў на аснове веры была самым зручным спосабам іх апазнаваньня ва ўмовах, калі ўлада ўсяляк прымяншала значнасьць беларускай мовы і культуры, адмаўляючы ім у праве на паўнавартаснае разьвіцьцё альбо заганяючы іх у каляніяльнае гета. Зьмяніць найважнейшы крытэр ідэнтыфікацыі значыла б пахіснуць цэнтар цяжару ўсёй канструкцыі, асудзіўшы асыміляцыйную праграму на няпэўнасьць.

Іншая пашыраная аблуда наконт заходнерусізму палягае ў тым, што ён адвеку быў канкурэнтам беларускага нацыяналізму ці наагул узьнік у адказ на беларускі нацыяналізм:

*Прагрэс руху, які да першай сусьветнай вайны разьвіваўся амаль выключна ў культурнай сфэры (кніжкі, часопісы, культурна-асьветніцкія і рэлігійныя каталіцкія арганізацыі), уплываў на пашырэньне нацыянальнай сьвядомасьці, а гэта штораз больш непакоіла ідэолягаў «адзінай і непадзельнай» Расеі, якія бачылі ў ім пагрозу сэпа-*

---

[25] Бобровский П. Можно ли одно вероисповедание принять в основание племенного разграничения славян Западной России? (По поводу этнографического атласа западнорусских губерний и соседних областей Р. и Ф. Эркерта) // Русск. инв. 1864. № 75 і 80. Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 177.

*ратызму. У прыватнасьці, актывізавалі свае высілкі прыхільнікі гэтак званага «западноруссизма», але яны ня здолелі стварыць цэльнай ідэалёгіі, якую можна было б супрацьпаставіць ідэям беларускага нацыянальнага адраджэньня*[26].

Гістарычна заходнерусізм ня быў супернікам беларускага нацыяналізму — апошні ўзьнікае значна пазьней на глебе, угноенай заходнярускімі ідэолягамі, якія зьдзейсьнілі беспрэцэдэнтную інавацыю — напоўнілі катэгорыю «Беларусь» этнакультурным зьместам. Аднак і разуменьня беларусаў як этнічнай групы было недастаткова для нараджэньня беларускага нацыяналізму. У адрозьненьне ад украінскага нацыяналізму, які толькі ўзмацніўся пасьля сутыкненьня з расейскім каляніялізмам, у беларускім выпадку пад ціскам ідэалёгіяў расейскага нацыяналізму і імпэрыялізму пачаўся працэс паглыбленага асваеньня беларускай гісторыі і культуры. Больш сур'ёзны зрух адбыўся адно пасьля канструяваньня сталых калектыўнымі ўяўленьняў пра новы імпэрскі рэгіён «Беларусь». Безь яго Багушэвіч быў бы немагчымы.

[26] Гл. Turonek Jerzy. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi. Warszawa: Oficyna Wydawnicza «Gryf», Instytut Historii PAN, 1992.

# НЕСПАДЗЯВАНЫ ВЫНІК КАНСТРУЯВАНЬНЯ НОВАГА ІМПЭРСКАГА РЭГІЁНУ: УЗЬНІКНЕНЬНЕ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

*Вось толькі блага, што [дзеці] сталі гаварыць па-беларуску, і часам такое слоўца рэкнуць, што хоць праз зямлю праваліся.*

Марыя Багдановіч. 9 траўня 1895 г.*

*Усходняя Эўропа была плодам філязофскага і геаграфічнага сынтэзу, яе вынайшлі людзі пары Асьветніцтва.*

Лары Вульф.
Вынаходзячы Ўсходнюю Эўропу.

*Філёзафы маюць звычай дыскутаваць пра Лока, Юма і эмпірызм, ніколі ня маючы на ўвазе, што існуе эксплiцытная сувязь паміж «філязофскімі» дактрынамі гэтых клясычных аўтараў і расавай тэорыяй, якая апраўдвае рабства, альбо аргумэнтамі на карысьць каляніяльнай эксплёатацыі.*

Эдвард Саід. Арыенталізм.

* Маці клясыка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча.

Пасьля 1863 г. расейскія інтэлектуалы знайшлі ў Беларусі месца, якое імпанавала іх мітам, апантанасьцям і патрэбам. Апазнаваньне беларусаў як расейскага племені, а ня як адной з этнічных супольнасьцяў Рэчы Паспалітай здавалася надзейным спосабам панаваць над гэтай яшчэ нядаўна ўспрыманай як польскай тэрыторыяй, рэструктурызаваць і калянізаваць яе. У меру ўсё больш шырокага пранікненьня ў Беларусь імпэрскай сьвядомасьці фабрыкаваліся ўсёабдымныя каляніяльныя прэзэнтацыі Беларусі.

Паколькі імпэрска-каляніяльнае мадэляваньне Беларусі адбывалася з прыцягненьнем пазытывісцкай навукі, яно ўтрымлівала ў сабе дзьве супярэчлівыя дынамікі: імпэрыя працягвала канструяваць і апісваць Беларусь з дапамогай ужо апрабаваных нарацыйных мадэляў, вобразаў і тропаў, фэмінізуючы яе і зьвязваючы з усім састарэлым, сельскім, нізкім і прымітыўным. Культуры ж мэтраполіі яна прыпісвала кантрастную пазыцыю інтэлектуальнай перавагі, зьвязанай зь сілай, аўтарытэтам, асьвечанасьцю і сучаснасьцю. Разам з тым пазытывісцкая навука пачала выпрацоўваць веды пра Беларусь, якія кардынальна пашыралі ўяўленьні пра краіну і ставілі імпэрыю перад выклікам, што яны будуць скарыстаныя для пабудовы альтэрнатыўных палітычных ідэалёгіяў. Зьяўленьне новых парадыгмаў веды, напрыклад, мовазнаўства і этнаграфіі, культурнай антрапалёгіі і геаграфіі, ня толькі змушала мясцовае грамадзтва ўсьвядоміць, што «тутэйшы край не Расея альбо Польшча, а Беларусь»[1] (А. Цьвікевіч), г.зн. дазволіла ўзяць Беларусь у дакладней акрэсьлены і большы сваімі памерамі ракурс, але і штурхала ўлады да выкарыстаньня ў сваёй рыторыцы пра Беларусь навуковай тэрміналёгіі, увядзеньня ў масавую сьвядомасьць усё новых уяўленьняў пра яе. Часам, як у выпадку П. Бяссонава, новыя прэзэнтацыі Беларусі выходзілі па-за межы каляніяльнага поля і мелі відавочныя нацыяналістычныя абэртоны.

[1] Цьвікевіч А. «Западно-руссізм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск. Навука і тэхніка, 1993. С. 239.

Паколькі каляніяльныя прэзэнтацыі Беларусі мелі квазінавуковую прыроду, адсылалі не да крыніцаў для карэкцыі і вэрыфікацыі, а да каляніяльных аўтарытэтаў і лёгка разбураліся лягічна абгрунтаванымі сродкамі, імпэрыя доўгі час імкнулася манапалізаваць веду аб Беларусі і не дапускаць альтэрнатыўных праектаў яе мадэляваньня. Яна імкнулася ствараць ня толькі веду, але і самую рэчаіснасьць, якую гэтая веда нібыта павінна была памагаць інтэрпрэтаваць. Прэзэнтацыі павінны былі ўспрымацца як рэчаіснасьць альбо, прасьцей кажучы, заступаць рэчаіснасьць, якая, у сваю чаргу, абумоўлівала масавую сьвядомасьць і ўплывала на грамадзкую думку.

Веда пра Беларусь, для выпрацоўкі якой пачала функцыянаваць спэцыяльная інфраструктура (унівэрсытэты, установы Акадэміі навук, навуковыя таварыствы, аналітычныя службы сілавых міністэрстваў), выкарыстоўвалася для апраўданьня дзейнасьці, накіраванай на абарону расейскай дзяржавы, экспансіі, цывілізацыі, вартасьцяў, інтарэсаў і мэтаў. І ўсё ж акурат яму, прадукаваньню веды, якую можна вэрыфікаваць пазытывісцкім чынам, мы абавязаныя аб'ектыўнымі адкрыцьцямі, зьвязанымі з публікацыямі мапаў і крыніц, кадыфікацыяй гістарычных помнікаў і напісаньнем слоўнікаў. Дзякуючы ёй узьнік сталы звычайным парадак тлумачыць аб'екты, якасьці і ўласьцівасьці, зьвязаныя зь Беларусяй.

Навукоўцы, якія займаліся Беларусяй, выступалі як *alter ego* імпэрскай бюракратыі: калектыўныя акадэмічныя намаганьні для вынаходу Беларусі як культурнага канструкта сталі бюракратычным інстытутам, падпарадкаваным дыктату імпэрскага ўраду і пазбаўленым у пэўнай меры самастойнасьці ў выбары аб'ектаў дасьледаваньня. Вывучэньне, разуменьне, веданьне, ацэнка залежалі ад ідэалягічнай каньюнктуры, служылі інструмэнтамі палітычнага панаваньня і выражалі эканамічны інтарэс у пошуку новых рынкаў і рэсурсаў. Як толькі ўзьнікла каньюнктура адмежаваць беларусаў ад палякаў, імпэрыя Раманавых санкцыявала выданьне «Словаря белорусского наречия», але да самага свайго краху блякавала стварэньне школьнага правапісу,

ня кажучы ўжо пра акадэмічную граматыку беларускай мовы[2].

Навуковая дзейнасьць, зьвязаная зь Беларусяй, мела цалкам рэальную культурную, геаграфічную і гістарычную значнасьць. Будучы стратэгічным рэсурсам улады, яна дазваляла распараджацца гісторыяй, культурай і геаграфіяй Беларусі ў поўным адчужэньні ад беларускага народу. Як іншыя крыніцы ўлады, яна была жорстка цэнтралізаваная. Назапашваньне навуковай веды на месцах, таксама як дзейнасьць унівэрсытэту ў «Паўночна-Заходнім» краі былі строга забароненая[3].

На месцах навуковая веда ня столькі назапашвалася, колькі сымулявалася. Беспасярэднім вынікам паўстаньня 1863 г. было згортваньне польскай навукі ў царскай імпэрыі і іміграцыя польскіх навукоўцаў, у тым ліку ў больш лібэральную Аўстра-Вугоршчыну. У першыя гады пасьля паўстаньня дасьледаваньні ў Беларусі ў археалёгіі, археаграфіі, этнаграфіі і іншых навуковых дысцыплінах былі прыпыненыя. Гістарычныя дасьледаваньні зьвяліся да трох бюракратычных частак: бібліятэкі, цэнтральна-

[2] Каньюнктурнасьць «Словаря белорусского наречия» лішні раз праявілася ў тым, што яго аўтар без пачуцьця меры напхаў яго палянізмамі, наяўнасьць якіх быццам пацьвярджала ведамы пастулят аб беларускай мове як больш ці менш шчыльнай сумесі расейскіх і польскіх словаў. Паводле ацэнак спэцыялістаў, доля пазычаньняў з польскай у рэестры «Словаря...» складае прынамсі 10—15 %.

[3] Пры адсутнасьці расейскага ўнівэрсытэту ў Паўночна-Заходнім краі ў канцы XIX ст. стабілізацыйную функцыю выконвалі народная школа і настаўніцкая сэмінарыя. Разам з царквой і арміяй яны былі найважнейшымі інстытутамі пашырэньня агульнарасейскай ідэнтычнасьці. Толькі ў Віленскай губэрні колькасьць царкоўна-прыходзкіх школаў за чатыры гады — з 1884 да 1888 гг. — вырасла з 4 да 352. У Гарадзенскай губэрні колькасьць народных (міністэрскіх) школаў у адносінах да царкоўна-прыходзкіх была наступная:

| Год | Народных школаў | Царкоўна-прыходзкіх |
|---|---|---|
| 1891 | 299 | 534 |
| 1892 | 300 | 556 |
| 1901 | 326 | 1295 |

Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 244.

га архіву і камісіі для разбору старадаўніх актаў. У канцы XIX ст. у Вільні налічвалася тры навуковыя таварыствы, аднак першае — Паўночна-заходні аддзел Расейскага імпэрскага геаграфічнага таварыства — існавала толькі на паперы, другое — «Віленскае аддзяленьне расейскага музычнага таварыства» — цяжка было ўважаць за акадэмічную ўстанову, а ад навуковай дзейнасьці трэцяга — Мэдычнага таварыства — у тыя гады не захавалася аніякай інфармацыі[4].

Улюбёнымі жанрамі каляніяльнай эпістэмалёгіі становяцца падарожныя нататкі, аповед, палеміка, навуковае дасьледаваньне, аналітычны даклад, слоўнік, нарыс і камэнтар, нататкі перасяленца, апісаньні экзатычных мясцовасьцяў і рэаліяў. У іх расейскія аўтары праектавалі на Беларусь свае ўласныя жаданьні, фантазіі і амбіцыі, за якімі часьцяком стаялі імпэрскія прэтэнзіі дзяржавы альбо нацыяналістаў. Апісаньні Беларусі яны прыстасоўвалі да сваіх патрэбаў, прасейваючы іх праз рэгуляцыйныя коды, клясыфікацыі, каталёгі антрапалягічных вобразаў XIX ст. Дзякуючы ім Беларусь з асабістага, часьцяком перакручанага досьведу бюракратаў, навукоўцаў, падарожнікаў і каляністаў ператваралася ў агульнапрынятае паняцьце, якое складаецца з мноства асобных уяўленьняў. Пад уплывам дзейнасьці навукоўцаў, бюракратыі, арміі і капіталістаў яна набывала лексыкаграфічны і бібліяграфічны вымер, шырэй кажучы, станавілася тэкстуальна асязальным.

Беларусь, якой яе выяўлялі, канчаткова становіцца сыстэмай рэпрэзэнтацыяў, прадуктам пэўных палітычных адносінаў і сымбалічнай дзейнасьці. У яе бачаньні дамінуюць імпэратывы, пэрспэктывы і ідэалягічныя забабоны, уласьцівыя імпэрскаму сьветагляду. Беларусь павучаюць, дасьледуюць, падганяюць пад сябе, кіруюць і выказваюцца пра яе з пэўнай зьмястоўнасьцю.

Беларусь як калёнія канструюецца найперш з дапамогай мэтаду прэзэнтацыйнага абмежаваньня. Тубыльцы-беларусы паўста-

---

[4] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 137—138.

юць настолькі адсталымі, што палітычна і культурна іх можа рэпрэзэнтаваць толькі імпэрская ўлада. Дзякуючы гэтаму труку яна надзяляла сябе правам гаварыць за Беларусь і ад імя Беларусі (бо пры існых культурных дачыненьнях тубыльцы ня ў стане мець уласнага голасу). Арганіцысцкая канцэпцыя вялікай расейскай нацыі прадугледжвала, што такім чынам беларусы ажыцьцяўляюць сымбалічны трансфэрт паўнамоцтваў «зьнізу» «ўгару», дэлегуючы ўладзе функцыю, ажыцьцявіць якія яны былі арганічна няздольныя: беларуская народнасьць складае «неаддзельную частку расейскага народу і безь яднаньня з Расіяй ня можа мець самастойнае і незалежнае будучыні»[5].

Улада і беларускі народ, Расея і Беларусь уяўляліся адзіным суб'ектам, рознымі членамі адзінага цела. Хада гісторыі палягае ў нарошчваньні гэтага адзінства, немагчымага без выцясьненьня «мясцовых» моваў і культур «супольнымі» і «ўнівэрсальнымі» імпэрскімі. Аднак зьліцьцё моваў і культур павінна адбывацца таксама арганічна, улада ня мае на мэце неадкладнай асыміляцыі беларусаў. Яна гатовая чакаць і нават прызнаць за Беларусяй пэўныя культурныя адрозьненьні, якія дапускаюцца ў той ступені, у якой яны не супярэчаць разуменьню Беларусі як часткі Расеі. Перакананьне ў іх нізкім статусе фармуецца як мэтадам палітычнай і культурнай дыскрэдытацыі, так і катэгарычнай адмовай імпэрскай дзяржавы падтрымліваць іх адтварэньне з прыцягненьнем дзяржаўных рэсурсаў. Любыя культурныя імпульсы, здольныя выклікаць узвышэньне беларусаў да нацыянальнага статусу, хай сабе нават увядзеньне беларускай мовы ў пачатковай адукацыі, успрымаюцца як выклік палітычнаму звышсуб'екту імпэрыі — вялікай расейскай нацыі, і нястомна адхіляюцца.

Самаідэнтыфікацыя Беларусі як калёніі адбываецца праз маркіраваньне ворагаў, найперш яе супрацьпастаўленьне Польшчы.

[5] Платформа «Белорусского общества» // Белорусский учитель. Вып. 1. 1909. Цыт. пав.: Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 331.

Акурат з чужароднымі ўплывамі зьвязваюцца імаверныя палітычныя пагрозы статусу і цэльнасьці агульнарасейскага адзінства.

Гісторыя Беларусі як калёніі разглядаецца як інструмэнт з палітычнай мэтай і пішацца для прадухіленьня мясцовага сэпаратызму і нарошчваньня палітычнай ляяльнасьці. Яна зводзіцца да сьцьвярджэньня тэлеалёгіі поўнай асыміляцыі і навязваньня ўяўленьня аб бессуб'ектавасьці Беларусі ў мінуўшчыне і будучыні. У рамках каляніяльнай гістарыяграфіі адстойваецца тэза аб «абсалютнай канвэртаванасьці Беларусі як сацыяльнай прасторы» (А. Казакевіч). Сама Беларусь апісваецца як прадукт абмену паміж канфліктуючымі мэтраполіямі, а яе гісторыя збольшага вычэрпваецца падзеямі, зьвязанымі зь ліквідацыяй уплыву мэтраполііі-суперніцы[6].

Акурат пасьля 1863 г. былі давызначаныя наратыўныя структуры, мэтафары і выяўленчыя мадэлі, якія вось ужо паўтара стагодзьдзя вызначаюць канцэптуальны вобраз Беларусі. Створаны слоўнік і ідэі так ці іначай выкарыстоўваліся кожным, хто выказваўся пра Беларусь.

*Геаграфія*. Беларусь апісваецца як спрадвечная частка расейскага сьвету, якая даказвае жывучасьць агульнарасейскай народнасьці. Дапускаюцца наратывы, якія апісваюць яе як транзытную пляцоўку паміж Захадам і Расеяй, менш аддаленую ад галоўных плыняў эўрапейскага прагрэсу ў навуцы, мастацтве і камэрцыі, чым яе цяперашняя мэтраполія, і таму патрабуючую расейскай увагі і каляніяльнай рэканструкцыі. Тое, што ў геаграфічных апісаньнях Беларусі спалучаецца рэальнае і ўяўнае, ня варта тлумачыць нейкімі надзвычайнымі высілкамі, зьвязанымі зь ейным уяўленьнем. Патрэба ў геаграфічным апісаньні Беларусі ўзьнікла першапачаткова зь імпульсу панаваць над ёй. Расея глядзела на Беларусь праз сетку імпэрскіх катэгорыяў і настойвала,

[6] Казакевич А. Про колонию // Перекрестки. Журнал исследований восточноевропейского пограничья. 2005. № 3—4. С. 24.

што спасьціганьне яе праўдзівага аблічча магчымае толькі зь іх дапамогай:

> *Беларусь, зь яе велічнымі Дняпром і Дзьвіною, зь яе непралазнымі лясамі, зь непраходнымі тундрамі і балотамі, — царства ваўкоў і казаў, лесавікоў і русалак, царства ведзьмаў і чараўніцаў, дзе іх яшчэ ў канцы мінулага стагодзьдзя плавілі на азёрах*[7].

«Непраходныя тундры Беларусі» не агаворка А. Кіркора, а атрыбут рэпрэзэнтацыйнага дыскурсу, які прадукуе сваю лёгіку выказваньняў. Вынаходзтва Беларусі яшчэ ня скончылася, і ў яе апісаньнях эмпірычнае спалучалася з хімэрным. Паколькі ў каляніяльных прээзэнтацыях Беларусь разглядаецца як твор расейскага геаграфічнага, гістарычнага і маральнага генія, яе геаграфія ўяўляла сабой набор назіраньняў, якія абагульнялі і злучалі ў адно яе тэрыторыю з прасторай імпэрыі.

Мэта каляніяльнай геаграфіі далёкая ад чыста навуковай і легітымізуе каляніяльны слоўнік. Яна канструюе Беларусь як стандартную калёнію выходзячы з ужо звычайнай лёгікі імпэрскага рэпрэзэнтацыйнага дыскурсу. Тундра — гэта сымбалічная абалонка першабытнасьці як неад'емнай уласьцівасьці ўсялякай новай тэрыторыі, далучанай да імпэрыі. Яе наяўнасьць маркіруе пэрыфэрыйнае палажэньне і каляніяльны статус Беларусі як дадатку і як супрацьлегласьці імпэрскаму цэнтру.

Іншымі словамі, імпэрыя надзяляе жыцьцём, уяўляе, канструе прастору, якая ўвайшла ў яе знакавыя межы, выходзячы з асаблівай лёгікі рэпрэзэнтацыі. Панаваць — значыць кантраляваць прэ-

[7] Киркор А.К. Белорусское Полесье. Памятники времен первобытных // Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3. Литовское и Белорусское Полесье. Репринтное воспроизведение издания 1882 года. Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993. С. 236.

зэнтацыі імпэрскіх тэрыторыяў. Эмпірычны матэрыял сам па сабе ня мае выращальнага значэньня:

> *Дзікая і велічная, разнастайная і зьменлівая прырода Беларусі. Шмат у ёй такіх асаблівасьцяў, якіх вы не сустрэнеце нідзе, хіба на скрайняй Поўначы*[8].

Лінія каляніяльнай прэзэнтацыі (Беларусь — экзотыка) балянсуецца ідэалягічнай лініяй Беларусь — непрыглядная радзіма беларусаў (Я. Карскі), Беларусь — векавая пустыня (Сяргей Южакоў), «краіна вельмі мала культываваная, населеная масай цёмнага народу, жабруючага і амаль выміраючага»[9].

У яе рамках Беларусь надзялялася пачуцьцём звыродлівасьці, убоства, пустэчы, утраты і катастрофы. Пра сілу і непахіснасьць гэтай прэзэнтацыйнай лініі гаворыць мысьленьне Аляксандра Салжаніцына, які больш чым праз стагодзьдзе ў эсэ «Як нам уладкаваць Расею» (1990) пісаў:

> *А ў журботнай Беларусі я правёў большую частку сваіх франтавых гадоў і да пранізьлівасьці палюбіў яе маркотную мізэрнасьць і ейны рахманы народ.*

*Мова: выцясьненьне ў тагабочны сьвет.* Пад уплывам славянафільскіх ідэяў імпэрыя непрацяглы час вагалася што да функцыянальных сфэраў ужываньня беларускай мовы. У самым пачатку 1863 г. апякун Віленскай навучальнай акругі князь Шырынскі-Шыхматаў дапускаў яе выкарыстаньне для пачатковага навучаньня беларусаў-каталікоў. У тым жа годзе ў Вільні выходзяць «Рассказы на белорусском наречии». Аднак пасьля нацыя-

---

[8] Киркор А.К. Белорусское Полесье... С. 329.

[9] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 285.

налістычнага павароту сярэдзіны 1863 г. рыторыка ўлады рэзка мяняецца. У траўні 1864 г. віленскі генэрал-губэрнатар Мураўёў называе ідэю аб павышэньні публічнага статусу беларускай гаворкі «бядотнай», якая пацягне за сабой «разьяднаньне народнасьцяў у Расеі»[10].

Далейшая каляніяльная гісторыя Беларусі пацякла ў рэчышчы простай і маўклівай забароны на зьмену публічнага статусу беларускай «гаворкі», якая ўсё часьцей кваліфікуецца як вульгарны жаргон. Нават зьбіральнік беларускага фальклёру П. Шэйн «склаў сабе дрэннае ўражаньне аб беларусах і не чакаў знайсьці ў стыхіі беларускай мовы што-небудзь каштоўнае»[11]. Стандартная формула зь лексыкону расейскай бюракратыі 60-х гг. XIX ст. — «маларасійская мова і беларуская гаворка» дажыла да пачатку XX в., калі сьцьвярджалася, што «беларуская мова» існуе толькі тэарэтычна[12].

Гэтая забарона выражалася таксама ў замоўчваньні моўнай праблемы альбо ў заявах, што яна вырашаная.

Каляніяльная тэлеалёгія малявала толькі адну магчымую пэрспэктыву беларускай мовы — паступовае адміраньне. Дзяржава ня толькі пазбавіла яе ўсялякай падтрымкі, але зрабіла ўсё, каб навязаць яе эмацыйнае адпрэчваньне. Пасланьне ўлады агучылі лідэры грамадзкай думкі, якія прадстаўлялі сфэры, што карысталіся найбольшым грамадзкім даверам. Аўтарытэтныя экспэрты сышліся ў меркаваньнях, што беларуская мова:

— «граматычна і філялягічна неапрацаваная» (меркаваньне мітрапаліта кіеўскага Арсенія (1866)[13];

---

[10] Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX ст. Минск: Наука и техника, 1980. С. 144—147.

[11] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 287.

[12] Тамсама. С. 315.

[13] Сталюнас Дариус. Границы в пограничье: белорусы и этнолингвистическая политика Российской империи на западных окраинах в период Великих реформ //Ab Imperio. 2003. № 1. С. 289.

— прыдатная выключна для «хатняга сельскагаспадарчага ўжытку», «толькі для размоваў паміж сялянамі» (меркаваньне мітрапаліта кіеўскага Арсенія (1866)[14];

— мае «даволі непрыемную» эўфанію (менскі праваслаўны япіскап Міхаіл Галубовіч (люты 1866)[15];

— «здаўна рыхтавалася як зброя рымскай прапаганды, каб народ перавярнуць у каталіцтва і апалячыць» (магілёўскі архіяпіскап Яўсеві, 1866)[16];

— мае формы, у якія «ня можа быць укладзеная ніякая вышэйшая думка», «таму што яна ня мае літаратуры» (дырэктар сьвянцянскай гімназіі А. Кандзідаў (1862)[17].

Беларускую мову прызналі арганічна няздольнай да любых формаў інстытуцыяналізацыі ў школе, царкве і пэрыядычным друку: «вучыць на беларускім жаргоне — недарэчнасьць, якая, дзякаваць Богу, да гэтага часу не прыйшла да галавы аніводнаму зь беларусінаў»[18].

Дзякуючы высокаму грамадзкаму даверу да аўтараў гэткіх выказваньняў, узьнік існуючы дагэтуль дыскурс, які разглядае іх як бясспрэчныя факты. Больш за тое, гэтыя сьцьверджаньні зрабіліся здабыткам масавай сьвядомасьці, якія яна змушае сваіх носьбітаў паўтараць штораз, калі гаворка заходзіць пра беларускую мову. Шукаць адпаведнасьць паміж гэтымі сьцьверджаньнямі, што характарызуюць беларускую мову, і самой беларускай мовай бес-

---

[14] Тамсама.

[15] Миловидов А. Распоряжение и переписка графа М.Н. Муравьева относительно римско-католического духовенства в Северо-Западном крае. Вильно, 1910. С. 12. Цыт. пав.: Сяргей Токць. Беларуская ідэнтычнасць у XIX ст. // Беларускі гістарычны зборнік — Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 24. С. 90.

[16] Сталюнас Дариус. Границы в пограничье... С. 289—290.

[17] Тамсама. С. 272.

[18] Инструкция народным учителям // Вестник Юго-Западной и Западной России. Историко-литературный журнал. Том III. Февраль. Киев. Отд. IV. С. 239. Цыт. пав.: Сталюнас Дариус. Границы в пограничье... С. 278.

сэнсоўна нават не таму, што гэтыя выказваньні не адпавядаюць сапраўднасьці, а таму, што яны не імкнуцца ёй адпавядаць.

Наступны акт каляніяльнай драмы палягаў у засваеньні самімі беларусамі гэтых каляніяльных уяўленьняў пра сваю мову. Прадказаньні сьмерці беларускай мове канвэртаваліся ў абцяжаранасьць мовы сымболікай сьмерці і яе проста нэўратычнае непрыняцьцё, што стала прыкметнай зьявай апошніх дзесяцігодзьдзяў XIX ст. (Сіла нянавісьці да сваёй культуры, як паказваюць прыклады Марыі і Адама Багдановічаў, у жыхароў каленіі была значна вышэйшая, чым у сярэднім у мэтраполіі.) Адсутнасьць хоць якога значнага грамадзкага супраціву дазваляла проста выпраўляць мову ў нябыт — у адрозьненьне ад Украіны, дзе выцясьненьне ўкраінскай мовы патрабавала працяглай і, як пазьней выявіцца, малаэфэктыўнай кампаніі забаронаў і абмежаваньняў.

*Каляніяльная антрапалёгія. Беларус як тубылец.* Інкарпарацыя беларусаў у склад вялікай расейскай нацыі суправаджалася наданьнем ім мэнтальнасьці і генэалёгіі: мэтраполія была зацікаўленая глядзець на тубыльцаў як на асоб, якія маюць сталыя характарыстыкі (Э. Саід). Аблічча беларуса сэміятызавалася з дапамогай атрыбутаў тубыльца — хваравітасьці, адсталасьці і расавай нечысьціні. Каяловіч пісаў І. Аксакаву ў 1864 г.:

> *Мне часам здаецца, што вы і Вашыя сябры больш здольныя любіць Польшчу, чым Літву і Заходнюю Расею наагул, таму што народ польскі... усё-ткі больш чысты і моцны за народ заходне-расейскі, мяшаны і паўтару, жудасна змардаваны*[19].

---

[19] Цыт. пав.: Долбилов Михаил, Сталюнас Дариус. Слова, люди и имперские контексты: дискуссия продолжается // Ab Imperio. 2006. № 1. С. 363.

Мэтафара зьмяшэньня, якая спачатку сыгналізавала аб адхіленьні этнічнага паходжаньня беларусаў ад імпэрскага стандарту, цяпер у афіцыйным беларускім дыскурсе выкарыстоўваецца дзеля тлумачэньня імклівай русіфікацыі беларусаў у другой палове XX ст. Маўляў, Беларусь стала расейскамоўнай краінай празь зьмяшэньне больш чым ста нацыянальнасьцяў, якія жывуць у ёй.

Хвароба беларуса была невылечная: яна доўжылася, пакуль беларус захоўваў тоеснасьць з самім сабой, і спынялася, калі ён дасягаў ідэнтычнасьці з расейцам. У імпэрскім дыскурсе існавала нязначная сэміятычная дыстанцыя паміж беларусам і якутам альбо башкірам.

Клясычны вобраз беларуса ў расейскай літаратуры, які паўплываў на расейскую масавую сьвядомасьць, даў Мікалай Някрасаў у паэме «Чыгунка» (1864 г.). Гэты вобраз аказаўся маляўнічы і насычаны дзякуючы ўдаламу выражэньню імпэрскага ідэалу, як мае выглядаць беларус. Някрасаў тонка ўлавіў напрамак расейскай грамадзкай думкі, у якой асабліва замацаваўся вобраз каўтуна ў валасах і ямы ў грудзёх:

*Стыдно робеть, закрываться перчаткою.*
*Ты уж не маленький!.. Волосом рус,*
*Видишь, стоит, изможден лихорадкою,*
*Высокорослый, больной белорус:*

*Губы бескровные, веки упавшие,*
*Язвы на тощих руках,*
*Вечно в воде по колено стоявшие*
*Ноги опухли; колтун в волосах;*

*Ямою грудь, что на заступ старательно*
*Изо дня в день налегала весь век...*
*Ты приглядись к нему, Ваня, внимательно:*
*Трудно свой хлеб добывал человек!*

*Не разогнул свою спину горбатую*
*Он и теперь еще: тупо молчит*
*И механически ржавой лопатою*
*Мерзлую землю долбит!*

*Эту привычку к труду благородную*
*Нам бы не худо с тобой перенять...*
*Благослови же работу народную*
*И научись мужика уважать.*

*Да не робей за отчизну любезную...*
*Вынес достаточно русский народ,*
*Вынес и эту дорогу железную —*
*Вынесет всё, что господь ни пошлет!*[20]

Калі Някрасаў спыніўся на сэміятызацыі вонкавага аблічча беларусаў (хворы беларус і г.д. былі ня столькі антрапалягічнымі характарыстыкамі, колькі знакамі сэміятычнага поля), то А. Багдановіч сэміятызаваў усе асноўныя сфэры іх духоўнай дзейнасьці. Прапанаваныя ім трактоўкі паказваюць, што каляніяльны дыскурс пра беларусаў стаў рэгулярны, усёабдымны і пасьлядоўны, а веда пра Беларусь значна пашырылася і магла быць сыстэматызаваная.

А. Багдановіч ставіўся да беларусаў-тубыльцаў толькі як да матэрыялу для стварэньня тэксту, які павінен прынесьці карысьць каму заўгодна, толькі ня ім самім. Ягоная Беларусь — безжыцьцёвая, пазачасавая, бездапаможная. Беларуская культура ня мае шанцаў стаць стандартызаванай і ўніфікаванай і за гэтым непрыдатная да выкарыстаньня ў сучасным сьвеце:

*Беларускія сяляне, выясьняючы на свой лад выраз «западный край», — выраз, чужы для беларускай мовы, — перадаюць яго словамі «запáдлы край», г.зн. закінуты, занядбаны. Хаця зь філялягічнага гледзішча можна шмат пярэчыць супраць такога вольнага перакладу, але рэчаіснасьць*

[20] Некрасов Н.А. Полное собрание сочинений и писем в 15-ти томах. Том. 2. Ленинград: Наука, 1981.

*яго апраўдвае. І жыцьцё беларуса, і ягоная творчая дзейнасьць рэзка адзначаны пячаткай неразьвітасьці, адсталасьці, забітасьці. Акурат «запáдлы край», «запáдлы народ»*[21].

Кніга «Пережитки древнего миросозерцания...» была значным унёскам у каляніяльную антрапалёгію, бо ў ёй быў зьдзейсьнены сэмантычны перанос мізэрнасьці Беларусі на ўсе асноўныя сфэры духоўнай культуры беларусаў. Гэтыя сфэры таксама былі ўведзеныя ў поле гульні, ім быў нададзены пэўны сэмантычны статус і ўстаноўленыя нібыта іманэнтна ўласьцівыя ім характарыстыкі. Дыскурс пра Беларусь стаў унівэрсальны, а прэзэнтацыі, напрыклад, беларускага фальклёру альбо абраднасьці, — ягонай складовай часткай.

Паколькі Беларусь нібыта не магла зрабіць гэта сама за сябе, А. Багдановіч надзяліў сябе абавязкам перафармуляваць яе. Беларусь, узурпаваная ім і пераведзеная на ягоныя думкі, павінна ведаць, што яшчэ жывая беларуская культура — гэта блага. Ёй катэгарычна адмоўлена ў праве на разьвіцьцё, а любыя яе праявы абвешчаныя «перажыткамі старадаўняга сьветасузіраньня»:

*Узяць хоць бы беларускія песьні, гэтае агульнапрызнанае люстра народнай душы. Яны сьведчаць пра тую ж «западласьць». Песень у беларусаў даволі багата, але зьмест іх вельмі бедны, вельмі аднастайны...*

*Беларускія казкі зноў такі, хоць і шматлікія, але і, як песьні, бедныя зьместам: адна паўтарае другую. Фабуля іх, у большыні выпадкаў, крайне немудрагелістая, выяўленыя пачуцьці надзвычай простыя, пагляды на вонкавы сьвет вельмі наіўныя.*

---

[21] Богданович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк. Гродно: губернская типография, 1895. Рэпрынт. Минск: Беларусь, 1995. С. 1.

> *Абрады, што суправаджаюць жыцьцё беларуса ад калыскі да магілы, — гэтыя акамянеласьці мінулай рэчаіснасьці, — альбо гранічна дзікія з гледзішча цывілізаванага чалавека, альбо груба фэтышысцкія. І ў тым, і ў другім разе яны сьведчаць аб параўнальна невысокім узроўні разумовага разьвіцьця*[22].

А. Багдановіч апэруе сьцьверджаньнямі на найвышэйшым узроўні абстракцыі — ягоныя абагульненьні нічога ня кажуць пра адрозьненьні паміж асобнымі беларусамі, дыялектамі іх мовы, сучаснымі і згаслымі традыцыямі — і таму яны застаюцца адцягненымі, тэарэтычнымі і ў канцавым выніку аўтарытарнымі:

> ...*беларуская мова найперш небагатая на словы. Пэўная частка іх пазычаная з польскай мовы, а ў апошні час, сярод маладога пакаленьня, даволі шырока ўваходзяць у зварот расейскія словы... Яна значна бяднейшая словамі для азначэньня адцягненых паняцьцяў за вялікарускую народную мову і нават саступае ў гэтых адносінах маларускай. Яна таксама не валодае гнуткасьцю, сілай і выразнасьцю першай і мяккасьцю, мілагучнасьцю апошняй...*
>
> *Справядлівасьць вымагае паставіць беларуса паводле тыпу душэўнага разьвіцьця ніжэй за ягоных братоў зь вялікай расейскай сям'і*[23].

(У аснове гэтых абстракцыяў ляжалі сьцьверджаньні, якія адштурхоўваліся ад спэцыфічных прыватных выпадкаў: нетыповая сынтаксычная асаблівасьць беларускай мовы або параўнаньне гутарковай мовы беларускіх сялян з кніжнай мовай расейскіх вучоных станавіліся падставай для агульнай высновы аб яе нікчэмнасьці.)

[22] Тамсама. С. 1—3.

[23] Тамсама. С. 4.

Беларуская мова была галоўнай мішэньню для каляніяльнай улады ня толькі таму, што ўтварала перашкоду, калі казаць нацыяналістычным штампам таго часу, для «адраджэньня сьвядомасьці сваёй прыналежнасьці да вялікага расейскага племені». Забраўшы ў тубыльцаў мову, сымбалічна пазбавіўшы іх голасу, улада ўзмацняла сваю легітымнасьць, бо яна атрымлівала поўнае права гаварыць ад іхняга імя. Уклаўшы ў вусны тубыльцаў стандартызаваную мову, аўтарытарная ўлада на доўгі час атрымала магчымасьць кантраляваць іх мысьленьне і сьветагляд.

Ідэалягічна такая каляніяльная антрапалёгія была сукупнасьцю ідэяў прымусу, якія легітымізавалі дэгуманізатарскую, садысцкую палітыку мэтраполіі да беларускай культуры. Яна, здавалася б, пераканаўча тлумачыла адставаньне беларусаў у разьвіцьці ад суседніх нацыяў унівэрсальнымі, пазагістарычнымі прычынамі: нізкай якасьцю іх культуры і мовы. З гледзішча псыхалёгіі яна была формай параноі, ведай зусім іншага тыпу, чым, скажам, звычайная навуковая веда. (Тут знаходзяцца вытокі многіх цяперашніх грамадзкіх нэўрозаў.) Шляхам маніпуляцыі бясспрэчнымі навуковымі фактамі і хваравітымі фантазіямі яна пераконвала ў прыроджанай інтэлектуальнай нікчэмнасьці беларусаў і звышнатуральнай інтэлектуальнай магутнасьці імпэрыі. У яе разуменьні прыход прагрэсу наўпрост залежаў ад хуткасьці зьнішчэньня беларускай мовы і культуры.

Атрымаўшы публічны статус і абвясьціўшы спароджаныя ідэі праўдзівымі, гэтая антрапалёгія ўсталёўвала каноны густаў і вартасьцяў, фармавала, перадавала і адтварала традыцыі, ацэнкі і меркаваньні. Яна эфэктыўна апраўдвала асыміляцыю і навязвала ўяўленьне аб яе непазьбежнай і выратавальнай прыродзе. Імпэрыя надзялялася сілай выцягнуць Беларусь зь яе цяперашняга барбарскага стану і ўзьняць на вышыню клясычнае велічы, г.зн. сфармуляваць яе, надаць ёй форму і ідэнтычнасьць, выразную акрэсьленасьць з поўным прызнаньнем месца ў расейскай нацыянальнай сьвядомасьці як натуральнага прыдатку Расеі.

*Этнаграфічныя межы.* Пэўны час у вызначэньні беларускіх этнаграфічных межаў супрацьстаялі дзьве лініі, умоўна кажучы,

геаграфічна-хімэрычная і навукова-пазытывісцкая. Першая была прэзэнтаваная Адамам Кіркорам, які меркаваў, што беларусы жывуць у Херсонскай і Пензенскай губэрнях[24].

Пазытывісцкая лінія бярэ пачатак ад «Рассказов на белорусском наречии» (Вільня, 1863 г.). У прадмове да «Словаря белорусского наречия» І. Насовіча тэрыторыя расьсяленьня беларусаў была вызначана зь вялікай ступеньню дакладнасьці паводле лінгвістычнага крытэра[25]. У 1860—1880 гг. былі ўстаноўленыя беларуска-польская, беларуска-літоўская і беларуска-латыская этнічныя межы. Нязначныя разьбежкі засталіся толькі пры фармулёўцы этнаграфічнай мяжы з Украінай і Расеяй.

*Традыцыі: прывід Маларосіі.* У больш аддаленай пэрспэктыве за імпэрскім мадэляваньнем Беларусі віднелася маларасійская мадэль — імпэрыя імкнулася сканструяваць «Беларусію» як зьменшаную і паслухмяную копію «Маларосіі». Праекцыі імпэрскай сьвядомасьці, увасобленыя ў Беларусі, між іншага, паказваюць, якой улада хацела б бачыць Украіну.

У каляніяльных наратывах Беларусь надзялялася культурнымі і гістарычнымі традыцыямі. Асабліва значэньне для іх канструяваньня мела праца П. Бяссонава[26], у якой быў выпрацаваны міт аб росквіце Беларусі ў адносна нядаўняй мінуўшчыне і выбітнай беларускай нацыянальнасьці, чыя веліч таксама належыць гісторыі. Пра Беларусь Бяссонаў зрабіў і шэраг іншых сьцьверджань-

---

[24] Киркор А.К. Белорусское Полесье. Следы язычества в празднествах, обрядах и песнях // Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3. Литовское и Белорусское Полесье. Репринтное воспроизведение издания 1882 года. Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993. С. 249.

[25] Носович И.И. Словарь белорусского наречия. СПб: Типография Императорской Академии наук, 1870. Рэпрынт: Мінск: Беларуская савецкая энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1983.

[26] Белорусские песни, с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта, издал П. Бессонов, издержками Общества любителей российской словесности. Ч. 1. Москва: типография Бахметева, 1871.

няў, надзеленых шырокай унівэрсальнасьцю і культурнай каштоўнасьцю, але ў рэшце рэшт скіраваных на тое, каб адмовіць беларускай культуры ў праве на адраджэньне.

Хоць Беларусь у Бяссонава — нейкая прамежкавая катэгорыя, якая дазваляе бачыць беларускую культуру як рэгіянальны варыянт культуры вялікага расейскага народу, па сутнасьці, інструмэнт з палітычнай функцыяй, які дае магчымасьць замацоўваць уладу і прадухіляць палітычныя пагрозы, ён здолеў выйсьці за межы стандартных каляніяльных прэзэнтацыяў. Бяссонаву належыць аўтарства паранаідальнага ўяўленьня аб Беларусі як краіне, што стагодзьдзямі ўладарыла над культурна, палітычна і эканамічна менш разьвітымі народнасьцямі, якія жылі на яе тэрыторыі, у тым ліку над палякамі і жыдамі.

У Бяссонава Беларусь уяўлялася ў мінуўшчыне як дзяржава, якая панавала і падбівала, несла прагрэс і дасканала кантралявала, вяла сваю палітыку насуперак зычэньням падступных суседзяў.

Сканструяваная такім чынам краіна станавілася праекцыяй украінскага і расейскага культурнага досьведу: падобна Украіне, Беларусь у мінулым выконвала ролю пасярэдніцы для перадачы перадавога культурнага досьведу з Захаду на Ўсход, як і расейцы, беларусы ў мінуўшчыне былі ўсебакова абдоранай дамінуючай нацыянальнасьцяй, якая «расьцякалася» далёка па-за межы сваёй краіны. Як і ва Ўкраіне з Расеяй, у Беларусі, паводле Бяссонава, жыды і палякі былі чужым наносным элемэнтам.

У гістарычным жыцьці Беларусі былі дзьве бліскучыя пары. У першую, да канца XVI ст., беларуская нацыянальнасьць выявіла «надзвычайную моц і жывучасьць сваіх асноваў, рознабаковасьць развою, пераможную ўплывовасьць сваіх сілаў». Яна на роўных змагалася з суседнімі моцнымі нацыянальнасьцямі: літоўцамі, палякамі, жыдамі і немцамі[27].

---

[27] Тамсама. С. 1. Тут і далей цытаты зь Бяссонава даюцца ў перакладзе Яна Станкевіча.

Беларусь то ваявала зь імі, то ўкладала хаўрусы, у рэшце перамагаючы іх сваім духоўным, маральным, творчым, жыцьцёвым і асьветным патэнцыялам:

> *Яна ні здала ані пядзі зямлі, ані каменя свайго будынку; наадварот, стварыла зямлю й цэлы край, паставіла ад надрубаў свой вялікі будынак. Мову сваю налажыла яна на вялікую часьціну іншых выдатных нацыянальнасьцяў, з мовою — пісьменнасьць, з тым і другім — сьветапагляд, а з гэтым пасярэднім праводам — усе іншыя самабытна-цывілізацыйныя фундамэнты: на штодзённую гаворку, на грамадзкую мову, на пісьменнасьць усіх цывільных і нат часткава гаспадарсьцьвеных справаў, на першыя школы, на казань і песьні царкоўныя.*
>
> *Ейны народны абрад трывалка захоўваў сваю надзвычайную паўніну: народны абычай разьвіваўся безь перашкодаў і да падрабязнасьцяў творства кіпела багатымі сіламі: песьняю і вершам, не шырокімі й не даўгімі, але з тысяча выглядамі, зь мізэрным і часткава жартлівым характарам зьвінеў увесь гэты відомы й нявідомы абраз народнага жыцьця, даволі сказаць, што «Слова аб палку Ігаравым» безь яе [Беларусі] зьменшылася-б на траціну, што шмат для цэлага славянскага песеннага творства згінула-б няясным і няпоўным бязь ейнае спадчыны, нат у цяперашніх ейных астачах, што мае перад сабою чытач[28].*

Так Беларусь ахапіла і злучыла цэлы вялікі край ад польскіх межаў да пскоўскіх і смаленскіх пад самы Мажайск, а на поўдзень яшчэ далей па цечы рэк, асабліва Дняпра, праз Валынь і Чарнігаўшчыну:

> *Уступаючы ўнутро гэтых межаў Краю... як ні ацяжыла над ім рука апошніх стагодніх здарэньняў, бачым, чуем і*

[28] Тамсама. С. 1—2.

*адчуваем, што тут дакладна існуюць не надуманыя й не нарысаваныя толькі геаграфічныя або гаспадарсьцьвеныя межы, што ўнутры іх ёсьць запраўдная асаблівасьць, якая із сярэдзіны сябе абрысавала, што тут свой грунт, сваё плямя, свой народ, свая нацыянальнасьць, якая калісь панавала*[29].

Паводле Бяссонава, другі пэрыяд пачаўся з таго ж XVI ст. і цягнуўся да XVIII ст., яго трэба назваць пераважна адукацыйным, у значэньні разьвіцьця школ, навукі, літаратуры, бібліятэк, друкарань[30].

Чужая дзяржава (Польшча) расхістала балянс складовых частак створанага Беларусяй сьвету. Была страчаная ўсякая надзея на сваю дзяржаву, а пастулальны шлях разьвіцьця зрабіўся немагчымым. На гэта беларусы былі вымушаныя адказаць спосабам, апрабаваным іншымі эўрапейскімі нацыямі ў іх палітычным жыцьці: грамадзкім уздымам. Ён назіраўся ва ўсіх кірунках: беларускія школы апярэдзілі нават украінскія, шмат у чым паўплывалі на іх і перанесьліся ў Маскоўскую дзяржаву пад канец XVII ст. Беларуская навука з асновай сярэднявечнай схалястыкі, але з пэўнай часткай элемэнтаў рэфармацыйнага адраджэньня ахапіла ўсе галіны ведаў ад граматыкі да тэорыі музыкі і сьпеваў, да багаслоўскага катэхізісу і палемічнага багаслоўя, — і зноў-ткі апярэдзіла сваімі дасягненьнямі Расею і Украіну.

Беларусь «набыла сабе бліск і славу ад тых сілаў, што выліваліся за межы краю... шэрагі каланізатараў рушылі туды, дзе ўважалі ўзровень асьветы за ніжэйшы... Яны былі багатыя, дужыя і ўплывовыя, прыкладам, у Велікарусі й асабліва Маскве. Беларуская літаратурная мова з гэтым самым імем увайшла вельмі ўплывовым інгрэдыентам у літаратуру маскоўскую».

---

[29] Тамсама. С. 2—3.

[30] Тамсама. С. 4—5.

Беларуская іміграцыя, якая праславіла іншыя краіны, а таксама ўціск варожых сілаў, падарвала самастойнасьць Беларусі. Глыбіня заняпаду, у якім апынуліся беларусы, на думку Бяссонава, такая, што сучасная беларуская літаратура наўрад ці будзе створаная. Беларусь — гэта краіна, веліч якой цалкам у мінулым.

*Мэнтальнасьць/тэлеалёгія*. Хоць за Беларусяй прызнаюцца пэўныя гістарычныя, культурныя і моўныя асаблівасьці, яна ўспрымаецца як геаграфічная, культурная, палітычная, дэмаграфічная, сацыялягічная і гістарычная сутнасьць, чыім лёсам павінна распараджацца імпэрыя. Якія б добрыя ці благія якасьці ні прыпісваліся Беларусі, яны заставаліся функцыямі спэцыялізаванага расейскага інтарэсу да яе. Беларусь ператваралася ў катэгорыю, пакліканую ўзмацняць уплыў імпэрскага ўраду.

Як і нацыянальная гісторыя ў грубых нацыяналістычных наратывах, гісторыя калёніі ў імпэрскіх трактоўках падмяняецца тэлеалёгіяй. Вартасьць культуры беларусаў-тубыльцаў мізэрная. Паглыбленьне комплексу культурнай непаўнавартасьці адбывалася праз супрацьпастаўленьне бязьмежнай прасторы, моцы і славы імпэрыі вузіні, шэрасьці і забітасьці беларуса. Засвоіць расейскую ідэнтычнасьць значыла вырвацца па-за межы тубыльскай культуры, недаразьвітай плебейскай мовы, далучыцца да паўнавартаснай нацыянальнай і дзяржаўнай традыцыі, заручыцца апекай магутнай дзяржавы: толькі чалавек асыміляваны можа пакаштаваць пладоў прагрэсу і цывілізацыі.

Гісторыя Беларусі служыла ўзмацненьню легітымнасьці ўлады і апісвалася ў форме чарады вайсковых кампаніяў і заняволеньняў іншаземнымі фэадаламі, якім пасьля яе ўзьяднаньня з Расейскай дзяржавай прыйшлі на зьмену асьвета і ўсебаковы прагрэс. Унікальная місія Расейскай дзяржавы палягае ў тым, каб замест былой у гісторыі Беларусі палітычнай анархіі і цывілізацыйнай сумятні забясьпечыць палітычную стабільнасьць і культурную непахіснасьць. Улада ёсьць сынонімам стабільнасьці і непадатлівай зьменам вечнасьці.

Гістарычныя наратывы суседнічалі з заклікамі захоўваць вернасьць імпэрыі, праяўляць незамірэнчасьць да любых формаў

«палянізму» (адной зь іх называлася пануючая сацыяльная няроўнасьць), асуджалі здрадніцкія расколы, усхвалялі вайсковыя перамогі і эканамічны росквіт, праслаўлялі непазьбежнасьць самаўладнага праўленьня, але найперш увесь час нагадвалі пра місію цывілізаваньня і ўдасканаленьня беларуса-тубыльца. Яны прадугледжвалі ўжываньне расісцкай бінарнай тыпалёгіі перадавых і адсталых (альбо падпарадкаваных) расаў, культур і грамадзтваў, залічыўшы беларусаў у апошнюю катэгорыю на падставе іх пераканаўча даведзенай падчас хады гісторыі разумовай адсталасьці:

> *Беларусь вельмі часта была арэнай спусташальных войнаў. Яны даводзілі да галечы народ, і тым самым абумовілі ягоную адсталасьць і невуцтва, разьвівалі грубасьць нораваў. А што важней — Беларусь да такой ступені была заняволеная абшарнікамі, абавязкі да гэтых апошніх клаліся на народ гэткім цяжарам, што на іх выкананьне вытрачваліся ўсе яго сілы, і таму ў яго не заставалася ні часу на разважаньне і абдумваньне, ні сродкаў на навучаньне, а бяз гэтага немагчымае разумовае разьвіцьцё*[31].

Панаваньне імпэрыі на адной шостай частцы сушы змушала гісторыкаў легітымізаваць яго, шырэй акрэсьліваючы тэрыторыю расейскага сьвету ў мінулым. Культурныя і гістарычныя традыцыі Вялікага Княства Літоўскага ідэнтыфікаваліся як «русские». Кіркор гаварыў пра «Беларусь, якая замяніла нам Літву», і што «князі літоўскія былі, верагодна, рускага (русского) паходжаньня». Саюз літоўскіх і беларускіх (sic!) княстваў, які прывёў

---

[31] Богданович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк. Гродно: губернская типография, 1895. Репринт. Минск: Беларусь, 1995. С. 6.

да ўзьнікненьня ВКЛ, ён называў «самастойным дзяржаўным саюзам»[32].

Падобна імпэрскай сучаснасьці, калі расейскі народ дэманструе сваю пераканаўчую інтэлектуальную перавагу над недаразьвітымі ўскраіннымі народнасьцямі, у сярэднявеччы дзеля большай сьпеласьці расейскай культуры літоўцы перанялі заходнерасейскую мову і традыцыі для публічнага і індывідуальнага ўжываньня: «русськая мова нэ тулько панoвала въ звычайныхъ розмовахъ, а и въ кныжкахъ и всякихъ судовыхъ бумагахъ: короли Польськыи пысалы для Литвы и Билоруссіи законы по-билорусськy»[33].

Адбывалася ўвязваньне гісторыі Беларусі з полацкім княствам і ягонай княскай дынастыяй («наши диды-Крывычи Полоцькыи... милы... своихъ князювъ, и якъ вси Словянэ въ тую пору»[34]). У гістарычных апісаньнях узаконьваецца ўжываньне тэрмінаў «Беларусь», «беларусы», «беларускія гарады» і г.д. як стылёва нэўтральных.

І ўсё-ткі мэта дыскурсіўнай інжынэрыі заставалася нязьменная: давесьці, што ўся гісторыя Беларусі ад пачатку зьвязана з расейскім сьветам, правесьці непераадольную мяжу паміж ім і Захадам і, наапошку, інтэграваць беларусаў у сымбалічны сьвет Расейскай імпэрыі.

Вось жа, каляніяльная Беларусь двоістая: з аднаго боку, яна апісваецца праз стандартны набор каляніяльных прэзэнтацыяў (якія рэзка павышалі яе адчувальнасьць, надзялялі яе гістарычнай легі-

---

[32] Киркор А.К. Литовское Полесье. Природа древней Литвы // Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3. Литовское и Белорусское Полесье. Репринтное воспроизведение издания 1882 года. Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993. С. 44.

[33] Рассказы на белорусском наречии. Вильно, 1863 г. Цыт. пав.: Латышонак А. Гутарка «царкоўнага старасты Янкі» з «Яськам, гаспадаром з-пад Вільні» // Дзеяслоў. 2004. № 9.

[34] Тамсама.

тымнасьцю), з другога боку, навуковая веда пасьпяхова і скрупулёзна даводзіць яе этнаграфічныя асаблівасьці, дакладна акрэсьлівае моўныя межы, археалёгія і археаграфія рэканструююць яе гісторыю, іншымі словамі, робяць Беларусь уяўляльнай.

Першай рэакцыяй на пабудову новага імпэрскага рэгіёну і канструяваньне новай культурнай традыцыі была творчасьць нешматлікіх першым часам пісьменьнікаў і грамадзкіх дзеячоў. Два апошнія дзесяцігодзьдзі XIX ст. — гэта восевы для беларускай нацыі час, «скрыжаваньне гісторыі», калі «нацыя» альбо «эпоха» сутыкнуліся тварам да твару (М. Грох)[35].

У 1881—1884 гг. беларуская праблематыка апынулася ў цэнтры ўвагі расейскамоўнай публіцыстыкі беларускіх народнікаў. У ёй пад уплывам, як яны самі прызнаваліся, ідэяў М. Драгаманава, пераважалі інтэрнацыяналісцкія і фэдэралісцкія ідэалы. Беларуская мова разглядалася як недастаткова распрацаваная і імпліцытна няздольная да перадачы складаных абстрактных сэнсаў.

Адрасатам актыўнасьці народнікаў была найперш «інтэлігенцыя, якая і павінна быць рухавіком народу на шляху ягонага разьвіцьця...»[36], крытыкаваная са спэцыфічных пазыцыяў: за няведаньне народнага жыцьця, у формах якога крыюцца «творчыя сілы і жыцьцёвая энэргія народу». «Народ» (фактычна, сацыяльныя нізы) ідэалізаваўся як носьбіт вартасьцяў, годных пераймання ўсім грамадзтвам, што, аднак, не замінала глядзець на яго праз стандартную каляніяльную оптыку: «І цяпер наўрад ці ёсьць у

---

[35] Паказальна, што з 16 ці 17 кніг, якія выйшлі па-беларуску паміж 1864 і 1900 гг., толькі адна, брашура «Пра багацтво да беднасьць» (Жэнэва, 1881. 32 с.) была выдадзеная да 1891 г. Усе астатнія выданьні выйшлі пазьней, паміж 1864 і 1881 гг. не было выдадзена аніводнай кнігі па-беларуску, паміж 1864 і 1891 гг. па-беларуску выйшла толькі адна кніга. Гл. Turonek Jerzy. Z dziejów białoruskiego ruchu wydawniczego w latach 1902—1905 // Studia polono-slavica-orientalia, Acta litteraria IX. 1985. S. 65.

[36] Публицистика белорусских народников. Нелегальные издания белорусских народников (1881—1884). Минск: Издательство БГУ имени В. Ленина, 1983. С. 21.

Расеі народ больш бедны за беларусаў, змардаваны, прыніжаны, забіты і галодны...»[37].

Сьледам за мовай адмаўляўся дзеяльнасны патэнцыял і самастойнасьць беларускага народу, а сам ён уяўляўся пасіўнай масай без разьвітай самасьвядомасьці. Беларусы ня маюць гісторыі — іх традыцыі памерлі ў мінуўшчыне:

> *А між тым была некалі пара, калі і нашыя суродзічы жылі поўным гістарычных падзеяў жыцьцём і нават уплывалі на сваю суседку Літву, якая ўжывала беларускую мову ў якасьці афіцыйнай...*[38]

Сьцерліся і рэлігійныя асаблівасьці, дарма што «за два стагодзьдзі частка беларускага народу ўжо пасьпела зжыцца з уніяй, і гвалтоўнае вяртаньне ў праваслаўе было новай зьнявагай народнай душы»[39].

У 1901 г. выходзіць праца «Літвіны-беларусы Чарнігаўскай губэрні, іх побыт і сьпевы» Марыі Косіч (нарадзілася ў 1850 г. у сяле Расуха Ўнецкага раёну сучаснай Бранскай вобласьці), а яшчэ праз дзевяць гадоў клясычная нацыяналістычная «Кароткая гісторыя Беларусі» Вацлава Ластоўскага, пры напісаньні якой аўтар выкарыстаў 18 дасьледаваньняў і крыніц. Зь іх толькі пяць былі на польскай, а 13, у тым ліку «Чытаньні з гісторыі Заходняй Расеі» (СПб, 1884) М. Каяловіча, — па-расейску. Нарэшце, літаратурная творчасьць Ф. Багушэвіча стала асноўным маркерам пераходу Беларусі ад статусу калёніі да статусу нацыі.

Канструяваньне новага імпэрскага рэгіёну і тэматызацыя царызмам беларусаў як этнічнай нацыі сталася зброяй, вострай з абодвух бакоў. Беларускі нацыяналізм узьнік на наступны дзень

[37] Тамсама. С. 27.

[38] Тамсама. С. 25.

[39] Тамсама. С. 26.

пасьля стварэньня новага імпэрскага рэгіёну «Беларусь». Новая эліта рабіла на яго стаўку, спрабуючы падпарадкаваць будучыню ягонай лёгіцы.

Расейскі каляніялізм ня толькі стварыў канструктыўны касьцяк уяўленьняў і выпрацаваў дастатковую колькасьць навуковай веды пра Беларусь, але пастаяннай плыньню інфармацыі бударажыў уяўленьне, прымушаў думаць пра яе.

Такі лёс імпэрыі — усялякае канструяваньне нацыянальнай традыцыі, хай нават зь відавочна ўтылітарнымі, ня маючымі нічога супольнага з нацыятварэньнем мэтамі, можа быць скарыстаны нацыяналістамі для сваіх мэтаў. Абумоўленая відавочнай палітычнай каньюнктурай кампанія па стварэньні беларусаў як часткі расейскага народу заклала аснову беларускага нацыяналізму.

Калі Рылееў, Пушкін і Шаўчэнка ўжывалі назву Украіна ў значэньні, суадносным з сучасным (са шматлікімі засьцярогамі), то ў іхняга беларускага сучасьніка не было шанцаў уявіць Беларусь у цяперашнім выглядзе. Для гэтага патрабавалася велізарная праца ўяўленьня і акадэмічная дзейнасьць. Ажно да 60—80-х гг. XIX ст. рэгіёну не ставала культурнай і гістарычнай легітымнасьці. Яе зьяўленьне выклікала пераварот у сьвядомасьці.

Стварыць уяўленьне аб новым усходнеэўрапейскім рэгіёне здалела толькі магутная расейская імпэрская навука. Імпэрскім навукоўцам М. Каяловічу, А. Кіркору і П. Бяссонаву наканавана было стаць беларускім Тэадорам Нарбутам.

Траўма ад падсьвядомага ўсьведамленьня таго, што разьвіцьцё гуманітарных навук спрыяе росту нацыяналістычных настрояў, перасьледавала левыя папулісцкія рэжымы ў Беларусі праз усё наступнае стагодзьдзе. Дакладным знакам узмацненьня жорсткасьці палітычнага рэжыму было лягчаньне гуманітарных навук.

Шлях ад калёніі да нацыі ня быў нейкім выключным для эўрапейскай пэрыфэрыі, Азіі і Афрыкі і іншых тэрыторыяў з абмежаванымі культурнымі рэсурсамі, якія перажылі агрэсіўную калянізацыю. У гэтым сэнсе беларускі выпадак падобны да сярэднеазіяцкіх — там таксама ў буйных этнічных супольнасьцяў існаваў

дэфіцыт кніжнай культуры і гістарычных традыцыяў, які кампэнсаваўся толькі наступным каляніяльным канструяваньнем.

Ягонай цаной была тыпова каляніяльная, навязаная зьверху назва нацыі. Віетнам, Беларусь альбо Верхняя Вольта — тэрміны аднаго ідэалягічнага парадку. Такая нацыянальная назва змушала міжнародную супольнасьць глядзець на падобную нацыю як на памылку прыроды. Пакуты заходніх мэтраполіяў павялічваліся ад спробы правільна перакласьці яе: у асноўных заходніх моваў існуе да 5—7 варыянтаў адаптацыі назвы «Беларусь».

Адрозна ад польскага альбо літоўскага спосабу нацыятварэньня пашырэньне тэрмінаў «Беларусь» і «беларусы» доўгі час было справай каляніяльнай адміністрацыі, а не нацыянальных агітатараў — і кансэрватыўная сялянская маса сустрэла іх з асьцярогай, і ў шэрагу беларускіх рэгіёнаў са спэцыфічнай канфэсійнай сытуацыяй яны не прыняліся і дагэтуль.

Нельга сказаць, што імпэрская ўлада адкідала самую магчымасьць пераходу Беларусі ад статусу калёніі да статусу нацыі. Апякун Віленскай навучальнай акругі І. Карнілаў пісаў публіцысту М. Каткову ў красавіку 1864 г.:

> *Асьцерагацца палітычных тэндэнцыяў і сэпаратызму проста сьмешна на заходняй мяжы. Які тут сэпаратызм, калі Беларусь, перабываючы ў сутыкненьні з моцнымі народнасьцямі і судакранаючыся са згуртаваным польскім грамадзтвам, можа трымацца толькі абапіраючыся на Расею і прыцягваючыся да яе. Яна ніколі ня будзе настолькі моцная, каб ёй да галавы прыйшло дамагацца самастойнасьці*[40].

[40] Русское дело в Северо-Западном крае. Материалы для истории Виленского учебного округа, преимущественно в Муравьевскую эпоху (СПб., 1901). Вып. 1. Сост. И.П. Корнилов. Санкт-Петербург, 1908. С. 71. Цыт. пав.: Токць Сяргей. Беларуская ідэнтычнасць у XIX ст. // Беларускі гістарычны зборнік — Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 24. С. 86—87.

Карнілаў не ўлічыў прынамсі адной паважнай акалічнасьці. У парадыгме імпэрскага разьвіцьця закладзеная разбуральная дыялектыка, бо пасьпяховая мадэрнізацыя стварае ўмовы для краху самой імпэрыі. Калі праграма разьвіцьця пасьпяхова рэалізуецца сярод калянізаваных народаў, ствараючы матэрыяльны дабрабыт, інтэлектуальную традыцыю, стымулюючы ўрбанізм і індустрыялізацыю, імпэрская палітыка адносна «адсталых» народаў пазбаўляецца апраўданьня. Імпэрыялізм значна часьцей стварае ўмовы і стымулюе канструяваньне новых нацыяў, чым душыць нацыятварэньне і нацыяналізм. Невыпадкова на мапе сьвету канца XX ст. апынулася так шмат дзяржаваў, межы якіх былі праведзеныя палітыкай імпэрыялізму і на момант дасягненьня незалежнасьці ў якіх яшчэ не існавала выразна вызначаных і здольных заявіць пра сябе нацый[41].

Мадэрнізацыя імпэрскай эканомікі, запачаткаваная ў другой палове XIX ст., яшчэ мацней прывязвала Беларусь да цэнтру, аднак яе доўгатэрміновы эфэкт быў іншы. Яна кідала выклік унівэрсалісцкай ідэалёгіі імпэрыі. Як эканамічная неабходнасьць яна ўводзіла ў структуру імпэрыі «анклявы» мадэрнасьці, якія паступова зьнішчалі стары лад[42].

Эфэктамі мадэрнізацыі былі рост навуковай веды і ўспрыманьне мадэлі нацыянальнай дзяржавы як пасьпяховага шляху да мадэрнасьці ў тым ліку і беларускай элітай.

---

[41] Суни Рональд. Диалектика империи: Россия и Советский Союз // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань: Центр исследований национализма и империи, 2004. С. 172.

[42] Пар. Nowak Andrzej. Ab Imperio. Nowe spojrzenie na historię Rosji. Przegląd Wschodni. T. VIII. Zeszyt 3 (31). S. 605—630.

# III. Ф. БАГУШЭВІЧ І МІТ БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭНЬНЯ

*Беларусь ніколі не была «адсталай аграрнай ускраінай самаўладнай Расеі». Ня буду дзеля нястачы часу прыводзіць канкрэтных фактаў, прыпамінаць аб нашым адраджэньні, культурным, нацыянальным адраджэньні, якое загучала ў творчасьці Францішка Багушэвіча... Усё гэта характэрна да гэтага пэрыяду.*

Аляксандар Лукашэнка.
Гістарычны выбар Беларусі. 2003.

Асноўнымі каналамі пашырэньня нацыяналістычных ідэяў на ўсходзе Эўропы ў XIX ст. былі школа, унівэрсытэт, царква, грамадзкія аб'яднаньні і гурткі, прэса і іншыя масавыя выданьні, а іх носьбітамі — літаратурныя творы. Дасьледаваньне беларускага нацыяналізму таго часу зь неабходнасьцю круціцца вакол беларускай літаратуры, у гісторыі якой крытыка традыцыйна прыпісвае «вылучнае й вызначальнае месца»[1] Францішку Багушэвічу (1840—1900)[2]. У ёй Багушэвіч паўстае нацыянальным прапа-

[1] Адамовіч Антон. Да гісторыі беларускае літаратуры. Менск: Выдавец З. Колас, 2005. С. 1140.

[2] Аўтар паэтычных зборнікаў «Дудка беларуская» (1891) і «Смык беларускі» (1894), а таксама апублікаванага асобным выданьнем апавяданьня «Траляпёначка» (1892), якія пры ягоным жыцьці выйшлі за межамі Расейскай імпэрыі, на тэрыторыі Аўст-

гандыстам высокіх літаратурных і папулярызатарскіх здольнасьцяў. Ягоная шматгранная асоба апісваецца з дапамогай наступных характарыстык:

*Пачынальнік мадэрнай беларускай літаратуры.* Для Ластоўскага (1910), гістарыёграфа-самавука, філёляга-дылетанта і таленавітага пісьменьніка, Ф. Багушэвіч «першы артыста беларускага слова» і «праўдзівы народны паэт-пясьняр»[3], г.зн. пісьменьнік, чыя творчасьць выклікала рэзананс у народных масах. На мяжы 10-х і 20-х гг. XX ст. З. Жылуновіч лічыў Багушэвіча «заснавальнікам і главой да 1905—1906 гг. беларускай мастацкай літаратуры», М. Гарэцкі — «нашым першым нацыянальным паэтам у поўным значэньні гэтага слова», К. Сваяк — «першародным пісьменьнікам народным, ад каторага пачынаюцца адродзіны беларускага пісьменства».

У 20-х гг. XX ст. А. Бабарэка сьцьвярджаў, што «фактычна гісторыя беларускай літаратуры пачынаецца з пары Ф. Багушэвіча». Багушэвіч — «першы творца таго літаратурна-мастацкага быцьця, якое вызначыла сабою кірунак літаратурнай (а цераз гэта і грамадзкай) сьвядомасьці на такі доўгі час...» Ад Багушэвіча «пачынаецца *жыцьцё* беларускай літаратуры, якое выносіць на сьвет

---

ра-Вугоршчыны і Прусіі. Розным вяхам біяграфіі Ф. Багушэвіча прысьвечана багатая літаратура, аб'ём якой усё павялічваецца. Гл. Александровіч С. Новае пра Францішка Багушэвіча // Полымя. 1960. № 6. С. 188—195; Яго ж. Лісты Ф. Багушэвіча да Э. Ажэшкі // Літаратура і Мастацтва. 1961. № 15. С. 3—5; Яго ж. Рэха дудкі беларускай // Маладосць. 1970. № 3. С. 121—129; Дарашэнка Д. Старонка з маіх успамінаў // Спадчына. 2000. № 1—2. С. 61—67; Кісялёў Г. Мужыцкі адвакат. З жыцця Францішка Багушэвіча // Полымя. 1960. № 6. С. 32—39; Яго ж. Гімназічныя і студэнцкія гады Францішка Багушэвіча // Полымя. 1960. № 10. С. 122—137; Яго ж. Францішак Багушэвіч // Полымя. 1961. № 9. С. 65—79; Яго ж. Дарогаю да людзей // Маладосць. 1975. № 8. С. 188—192; Яго ж. З сузор'я Багушэвіча // Літаратура і Мастацтва. 1982. 6 жніўня; Яго ж. «Эх, скручу я дудку» (Ля вытокаў творчасці Ф.Багушэвіча); Содаль У. Імпульсы. Багушэвічавы юбілеі // Полымя. 1989. № 6. С. 134—156; Яго ж. З крыніц сяброўства // Полымя. 1991. № 10. С. 177—185; Стральцоў М. Дудар беларускі // Маладосць. 1965. № 3. С. 130—137.

[3] Ластоўскі В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. Мінск: Вышэйшая школа, 1992. С. 102.

такіх таленавітых паэтаў, як Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, А. Гарун, З. Бядуля і інш.»[4].

Падзяляючы гэтую ідэю А. Бабарэкі аб Ф. Багушэвічу як заснавальніку новай беларускай літаратуры[5], А. Адамовіч падрабязна ахарактарызаваў існыя ў Беларусі «славяна-кірылаўскі» (X—XIII ст.), «славяна-рускі» (XIV—XVII ст.), агульнапольскі (XVII—XIX ст.), расейскі «абласны» (XIX ст.) літаратурныя працэсы. Беларускі «аўтэнтычны» быў заснаваны Ф. Багушэвічам цаной разрыву з польскім «краёвым» літаратурным працэсам, якому быў уласьцівы сублітаратурны падыход да беларускай мовы і іншыя асаблівасьці.

*Бацька беларускага адраджэньня*. Гэтая парадыгма прадугледжвае выключнае значэньне Багушэвіча для беларускага руху і ўзыходзіць да пачатку XX ст. Паводле сучасьніка Ластоўскага Лявона Гмырака (М. Бабровіча), Багушэвіч «спыніўся на раздарожжы беларускага нацыянальнага адраджэньня. У прадмове да «Дудкі» ён у пастаноўцы беларускай справы ідзе шмат далей ад сваіх папярэднікаў, далёка шырэй глядзіць ня яе...»[6]. Багушэвіч тытулуецца першым, хто высунуў «на першы ўступ... беларускае «я», нацыянальны пачатак»[7].

Для А. Бабарэкі Багушэвіч — «найяскравейшы выявіцель беларускай сьвядомасьці свайго часу як нечага самабытнага. Паэт ацэньвае сябе ня як «дудара простага народу», які гэтаму народу дае «гасьцінцы», а як *актыўнага* ўдзельніка жывой народнай («мужыцкай») справы, справы ўтварэньня сялянскай паэзіі

[4] Бабарэка А. Аб разуменьні мастацкай творчасьці і аб некаторых пытаньнях у вывучэньні беларускай літаратуры // Узвышша. 1927. № 5. С. 143—144.

[5] Адамовіч Антон. Да гісторыі беларускае літаратуры. Менск: Выдавец З. Колас, 2005. С. 1155.

[6] Гмырак Л. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1992. С. 68—69.

[7] Жылуновіч З. Беларуская літаратура (нарысы і агляды). Лекцыя, чытаная ў Беларускім народным унівэрсытэце ў Маскве // Курс Белоруссоведения. Лекции, читанные в белорусском народном университете в Москве летом 1918 года. Москва: Белорусский народный университет, 1920. С. 263.

(«і мы зробім музыку»), новай беларускай культуры, якая пачала адраджацца і дамагацца свайго прызнаньня»[8].

Паводле М. Пятуховіча,

> *ідэалёгія Багушэвіча па нацыянальным пытаньні становіць сабой паважны момант у разьвіцьці беларускай грамадзкай думкі. Гэта ідэалёгія акрэсьлівае сабой галоўныя матывы творчасьці новага беларускага пісьменства. Наступныя беларускія песьняры будуць пашыраць і паглыбляць тэмы, даныя ўжо ў творчасьці Багушэвіча*[9].

Сярод падставаў надзяленьня Багушэвіча такім статусам называліся такія: «адзначыў паважнасьць гэтай мовы як аднаго з найгалоўных сродкаў да разьвіцьця нацыянальнага беларускага руху»[10], паэтызаваў «рамантыку мінулага»[11]; у ягоных творах «разьвертваецца шырокі плян гарачага змаганьня за роўнае, незалежнае быцьцё яго сярод роўнымі свабоднымі народамі»[12].

Падсумаваў гэтыя ідэі А. Адамовіч:

> *Першым, хто паставіў у нас на кон і пачаў разьвіваць ідэалёгію пасьлядоўнага нацыяналізму, быў, бясспрэчна, ніхто іншы, як агульнапрызнаны бацька нашага нацыянальнага руху, і адначасна, адраджэнскае паэзіі, як галоўнае, асабліва на першым этапе, формы гэтага руху — Францішак Багушэвіч... Пачынаючы ўжо ад славутае*

---

[8] Бабарэка А. З літаратурных нататак // Узвышша. 1927. № 1. С. 138.

[9] Піотуховіч М.М. Нарысы гісторыі беларускай літаратуры. Частка першая. Агляд літаратурна-ідэолёгічных плыняў XIX і пачатку XX ст. Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928. С. 92.

[10] Багдановіч А.В. Новая беларуская літаратура. Віцебск: Інбелкульт, 1925. С. 4.

[11] Піотуховіч М.М. Нарысы гісторыі. С. 92.

[12] Жылуновіч З. Беларуская літаратура (нарысы і агляды)... С. 263.

> *прамовы да «Дудкі Беларускае», мы спатыкаемся ўпершыню із спробай тэарэтычна абгрунтаванай нацыяналістычнай ідэалёгіі, зьмест якое, праўда, яшчэ даволі абмежаны й разьвіваецца, галоўна, каля двух пунктаў: «культу роднае мовы», як добра сфармуляваў адну з асноўнейшых Багушэвічавых ідэяў Антон Навіна, і першых спробаў гістарычнага абгрунтаваньня нацыянальнае ідэі*[13].

Разуменьне Багушэвіча як зачынальніка беларускага нацыяналізму з часам стала нарматыўным. І сёньня Ф. Багушэвіча прынята называць першым, хто ўсьвядоміў, што беларускі народ мае сваё адмысловае прадвызначэньне як самастойны суб'ект гісторыі[14]. Ягоная інавацыйнасьць угледжваецца ў дзьвюх пазыцыях — «сьцьвярджэньне мовы як цэнтра духоўнага існаваньня народу і яго культуры» і «імкненьне даць гістарычнае і канкрэтнае этнатэрытарыяльнае абгрунтаваньне рэальнай сувэрэннасьці, самастойнасьці беларускага народу»[15].

Як меркаваў Майхровіч, для паэтычнага мысьленьня і вобразнасьці Ф. Багушэвіча быў уласьцівы прынцып кантраснага супрацьпастаўленьня: наратар супрацьпастаўлены сацыяльнай рэчаіснасьці Расейскай імпэрыі, г.зн. традыцыйная апазыцыя мужык — пан перарастае ў супрацьпастаўленьне наратар — множства дзяржаўна-бюракратычных установаў апарату ўлады. Выразам гэтых супярэчлівых адносінаў і антаганістычных узаемасувязяў ёсьць дысгармонія — найважнейшае эстэтычнае паняцьце, скрозь прызму якога паэт успрымае і ацэньвае жыцьцё[16].

---

[13] Адамовіч А. Пад нацыянальным сьцягам // Фрагмэнты філязофіі, культуралёгіі, літаратуры. 1996. № 1. С. 166—167.

[14] Майхровіч А.С. Францішак Багушэвіч: характар і накіраванасць светапогляду // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. 1992. № 1. С. 99.

[15] Тамсама. С. 99—100.

[16] Тамсама. С. 101—102.

Дысгармонія ўзьнікае дзеля таго, што наратар Багушэвіча валодае асаблівай праўнай сьвядомасьцю. Гэты «прадстаўнік прыгнечанай клясы і прыгнечанай нацыі» дамагаецца праўды, што мае канкрэтны этычны сэнс, зьвязаны з паняцьцем справядлівасьці. Праўда для яго — зусім не абстрактнае, чыста тэарэтычнае паняцьце, зьвязанае з гнасэалёгіяй[17].

Наратар Багушэвіча знаходзіцца ў варожым сацыяльным і праўным асяродзьдзі, характэрным для Расейскай імпэрыі як усходняй дэспатыі і ненатуральным для такой эўрапейскай дэмакратыі, якой была Рэч Паспалітая. Гэтая акалічнасьць рэзка павялічвае адчужэньне паміж ім і пануючымі сацыяльнымі і адміністрацыйнымі інстытутамі. Дзеля гэтага галоўная тэматычная лінія паэзіі Багушэвіча — безабароннасьць чалавека перад жорсткім уціскам абсалютнай, татальнай дзяржаўнай улады і яе так званымі законнымі прадстаўнікамі[18].

У таталітарным і посттаталітарным літаратуразнаўстве пэрсанальныя абвінавачваньні кшталту «Ф. Багушэвіч не адлюстраваў у сваёй творчасьці клясавага разьмежаваньня вёскі пасьля рэформы»[19] былі адносна рэдкія. Часьцей за крытыкай творчасьці віднелася крытыка беларускага нацыяналізму. Так, Багушэвіч прапаведаваў «нацыянальную замкнёнасьць, ізаляванасьць ... ідэалізацыю і ўсхваленьне каталіцызму»[20], шырыў «скажэньне гістарычнай праўды: заваяваньне Беларусі Літоўскай фэадальнай дзяржавай у XIV ст. разглядаецца як добраахвотнае далучэньне Беларусі да Літвы, а жыцьцё беларусаў у Літоўскай дзяржаве — як «залаты век»[21].

Інструмэнтам захаваньня гэтага канону, што набліжаўся да догмы, было простае цэнзураваньне паэзіі Багушэвіча (нават у

[17] Тамсама. С. 102.

[18] Тамсама. С. 103.

[19] Шкраба Р. Заўвагі пра творчасць Ф. Багушэвіча // Літаратура і мастацтва. 1948. № 46.

[20] Бэндэ Л. Невуцтва і абарона нацыяналізму // Літаратура і мастацтва. 1948. № 1.

[21] Тамсама.

акадэмічных выданьнях) і таксама прэзэнтацыя абмежаваным шэрагам адабраных радкоў і ўцятых тэматычных пластоў. Дасьледаваньне канкрэтных адзінак тэксту падмянялася іх цытаваньнем. «Ідэалягічная барацьба» за Багушэвіча давяршалася табу на пэўныя тэмы і мэтады аналізу. Так крытэры пазнаньня, абавязковыя для строгай навуковай дзейнасьці, страчвалі суаднесенасьць з эмпірычным матэрыялам альбо, калі прасьцей, дэфармаваліся. Аб'ект дасьледаваньня зьмяшчаўся ў поле палітычнай барацьбы і ўспрымаўся як прадукт палітычных адносінаў.

Канцэпцыя Барысенкі і Шкрабы была зацыкленая толькі на адным — любымі сродкамі ўзмацніць легітымнасьць і прыцягальнасьць улады цаной каштоўнаснай дэвальвацыі літаратуры. Багушэвіч сам па сабе быў ім нецікавы — яны зьвярталіся да ягонай творчасьці толькі для таго, каб знайсьці пацьверджаньне ідэалягічна правільнай, ужо існуючай догме.

Улада не была зацікаўленая ў цэльным і тоесным самому сабе Багушэвічу. У выніку гэтай дэвальвацыі, ссоўваньня крытэраў пазнаньня фэномэн Багушэвіча расьцярушваўся на мноства дробных дэталяў і фактаў, станавіўся бессыстэмны. Сыстэмнасьць падмянялі рытарычным пералічэньнем фармальных момантаў і выдумваньнем літаратурных уплываў.

Лінія Багушэвіча — «агульнапрызнаны бацька нашага нацыянальнага руху» (А. Адамовіч) аспрэчвалася лініяй Багушэвіч — «палітычны паляк», што жыў насычаным польскім жыцьцём. Польскі дасьледнік С. Элскі ў 1931 г. сьцьвярджаў, што Ф. Багушэвіч «паводле паходжаньня і выхаваньня належыць да палякаў»[22].

Сапраўды, Ф. Багушэвіч быў тыповым чальцом польскай супольнасьці «Паўночна-Заходняга краю»: арганізоўваў падпольныя польскія школкі, зьбіраў грошы на адкрыцьцё помніку А. Міцкевічу ў Вільні, падтрымліваў цёплыя стасункі зь пісьменьніцай

[22] Гл. Ełski S. Sprawa białoruska. Zarys historyczno-polityczny. Warszawa, 1931.

Э. Ажэшкай, быў віленскім карэспандэнтам часопісу «Kraj», які выходзіў у Пецярбургу па-польску. У канцы XIX ст. гэты часопіс адыгрываў значную ролю для польскай інтэлігенцыі «zaboru rosyjskiego».

Пра сутыкненьне ў сьветаглядзе Багушэвіча колькіх сацыяльных і літаратурных ідэнтычнасьцяў мэтафарычна і экспрэсіўна пісаў А. Разанаў:

> *Вонкава Багушэвіч адвакат, які слугуе грамадзкаму ладу, унутры — паўстанец, які ўзрывае гэты лад, вонкава — ён ушчамляе свабоду, унутры — ратуе, вонкава — адзін з мноства, унутры — адзіны з мноства, вонкава — пан, унутры — Мацей Бурачок і Сымон Рэўка*[23].

*Дылема інтэртэкстуальнасьці*. Створаныя Багушэвічам тэксты, як і любыя іншыя, існуюць толькі ў кантэкстах, іншымі словамі, у асяродзьдзі іншых тэкстаў, перажываючы ціск умоўнасьцяў, прэцэдэнтаў, мастацкіх стыляў і ідэалягічных інсьпірацыяў. Пытаньне, якія ідэі дазволілі яму перайсьці ад польскага да беларускага нацыяналізму, стаяла на парадку дня ўсё XX ст.

Храналягічна першым адказам на яго была спасылка на расейскае народніцтва. Яна зьявілася ўжо ў М. Багдановіча, які ахарактарызаваў Багушэвіча як пісьменьніка «народніцкага складу зь відавочнай нацыянальна-радыкальнай ідэалёгіяй», і яшчэ раней у Гмырака («дух расейскага народніцтва», узмоцнены шляхецкапольскімі перажыткамі).

М. Пятуховіч, як і ягоныя эпігоны В. Барысенка і Е. Яршоў-Мазураў, меркаваў, што такая пазыцыя Багушэвіча сфармавалася падчас ягонага навучаньня ў Пецярбурскім унівэрсытэце, дзе ў асяродзьдзі студэнтаў панавалі ідэі Герцэна і Бакуніна і «моцна

---

[23] Разанаў А. Скрыжаванне Францішка Багушэвіча // Дзень паэзіі-1984. Мінск: Мастацкая літаратура, 1984. С. 270.

гучаў» «Колокол» Герцэна[24]. Ён бачыў Багушэвіча найперш як сацыяльнага рэвалюцыянэра, дарма што радыкалізм апошняга ня зводзіўся да сацыяльных аспэктаў.

У сярэдзіне XX ст. афіцыёзная крытыка канчаткова «ўзьяднала» Багушэвіча зь ягоным адзіна «рэальным» кантэкстам, упісаўшы яго ў адзіны ўніфікаваны сьвет Расейскай імпэрыі і дапусьціўшы адно ўплыў імпэрскай культуры на ўзьнікаючую беларускую. Е. Яршоў-Мазураў настойваў на «ўплыве перадавой расейскай ідэалёгіі на фармаваньне поглядаў паэта» і шмат гаварыў пра тое, што нельга сьледам за нацыяналістамі рабіць Багушэвіча то «сэпаратыстам», то ідэолягам польскай шляхты, то вучнем украінскіх нацыяналістаў накшталт Куліша. Хоць Багушэвіч «быў ня толькі паэтам, але і арыгінальным мысьляром» і яго штурхнуў да творчасьці «невыносны сацыяльны і нацыянальны прыгнёт у Беларусі і барацьба супраць яго», ён стаяў на пазыцыях рэвалюцыйнага дробнабуржуазнага дэмакратызму, абмежаванасьць якога выражана ва «ўтапічным сялянскім сацыялізьме»[25].

В. Барысенка сваёй заўвагай аб тым, што Багушэвіча нельга падганяць «пад рубрыку пісьменьнікаў — так званых «адраджэнцаў» у нацыяналістычным разуменьні гэтага тэрміну»[26], таксама недвухсэнсоўна паказваў на захапленьне Багушэвічам творамі расейскіх пісьменьнікаў.

А. Адамовіч, наадварот, бачыў простыя інсьпірацыі для творчасьці Ф. Багушэвіча ў «нацыяналізьме Кастуся Каліноўскага».

Прыватнай праявай праблемы інтэртэкстуальнасьці было пастуляваньне сур'ёзнай ідэалягічнай і эстэтычнай дыстанцыі

---

[24] Піотуховіч М.М. Нарысы гісторыі беларускай літаратуры. Частка першая. Агляд літаратурна-ідэолёгічных плыняў XIX і пачатку XXст. Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928. С. 94.

[25] Ершов-Мазуров Е. Мировоззрение Ф.К. Богушевича: реферат на соискание ученой степени канд. философских наук. Минск: Издательство АН Белоруссии, 1953. С. 10—11.

[26] Барысенка В.В. Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Мінск: Выдавецтва акадэміі навук Беларускай ССР, 1957. С. 184.

паміж паэзіяй Багушэвіча і ягонымі прадмовамі да двух паэтычных зборнікаў. Дзякуючы прадмовам Багушэвіч асэнсоўваўся як асноўная фігура, якая стаіць на скрыжаваньні старой і новай Беларусі, старога і новага беларускага пісьменства (А. Разанаў)[27]. У іх бачылі «спробу тэарэтычна абгрунтаванай нацыяналістычнай ідэалёгіі» (А. Адамовіч), зьмястоўным цэнтрам якой ёсьць нацыянальная мова:

> *Мова — апошні прытулак роднага, тая самая «мая хата», у якой захоўваецца той даўні, той родны дух, які называецца беларушчынай... І адна і другая прадмовы Багушэвіча — гэта прадмовы да ўсёй новай беларускай літаратуры, яны не належаць гісторыі, яны пастаянна сучасныя. Яго прадмовы, як і ўся яго творчасьць, — гэта зьвеставаньне ад Мацея Бурачка, зьвеставаньне ад Сымона Рэўкі з-пад Барысава*[28].

У выніку праблема інтэртэкстуальнасьці творчасьці Багушэвіча, якая ўключае рэмінісцэнцыі, адсылкі, цытаваньні, алюзіі, падтэксты, пародыі, насьледаваньні-пераробкі, а найважнейшае — патрабаваньне чытаць тэксты як адзінае цэлае, бяз штучнай герархіі на прадмовы і астатні тэкст, была разьвязаная безь якога-любя вывучэньня. Фальшывая кампаратывістыка (розьніца паміж пазыцыяй Багушэвіча і «перадавой расейскай ідэалёгіяй» настолькі істотная, што сылягізм, які выводзіць першае з другога, больш зацямняе, чым праясьняе) папросту адмовіла ў існаваньні польскім, украінскім і іншым эўрапейскім ідэалягічным і эстэтычным вытокам. Прызнаючы пэўныя палітычныя, інстытуцыянальныя і ідэалягічныя прымусы, што дзеялі на Багушэвіча, яна лякалізавала іх выключна ў расейскім культурным полі.

---

[27] Разанаў А. Скрыжаванне Францішка Багушэвіча... С. 269.

[28] Тамсама. С. 271—272.

Пазнаньне вызначаецца канцэпцыяй, мэтадамі і інструмэнтаром. Іншымі словамі, якасьць атрыманых адказаў залежыць ад якасьці пастаўленых пытаньняў, а характар выходных палажэньняў абумоўлівае нашыя высновы. Вывучаць Багушэвіча нам даводзіцца, маючы перад сабой ладны багаж ідэалягічных ярлыкоў замест зьмястоўных падыходаў. Пануючым стылем стала імпрэсіяністцкая манера выказваньняў аб усёй творчасьці Багушэвіча: выходзячы з асобна ўзятых і праінтэрпрэтаваных момантаў, робяцца абагульненьні, што прэтэндуюць на высокую ступень унівэрсальнасьці. Разуменьне ўсёй творчасьці Багушэвіча як адзінага ідэалягічнага і нарацыйнага дыскурсу, свайго кшталту прадмовы да новай беларускай літаратуры і ідэнтычнасьці, адсутнічае, а сам Багушэвіч усё яшчэ паўстае як натураліст, рэаліст, матэрыяліст і атэіст, рэвалюцыйны дэмакрат, вучань і паплечнік Някрасава, які гнеўна выкрываў і кляйміў паноў і ўзьнікаючых капіталістаў.

Нягледзячы на хвалебнасьць гэтых ацэнак, яны навеяныя выбарачным прачытаньнем і перабольшанай увагай да асобных момантаў і мадэляў паэзіі Багушэвіча. Яны зацямняюць ролю паэта ў літаратурным і інтэлектуальным працэсе, зьбядняюць агульнае разуменьне яе зьместу. Глыбінны сэнс творчасьці Багушэвіча як духоўнай зьявы лягчаецца: ягоны зьмест зводзіцца да традыцыйных штампаў, да патасу і рыторыкі. Багушэвіч і сёньня застаецца аб'ектам публічнага ўсхваленьня, паколькі пануючыя трактоўкі ягонай творчасьці надзейна падтрымліваюць гэты штучны статус. Называючы ягоным імем плошчы і бібліятэкі, цяперашняя ўлада паказвае, што не баіцца Багушэвіча, які стаў рытуалізаванай, г.зн. санкцыяванай уладай грамадзкай зьявай. Такі Багушэвіч перастае гаварыць сваёй мовай, а пэўны аб'ём і маштабнасьць ягонай постаці задаецца — даруецца зьверху — выключна дзякуючы дэмагагічнаму маналёгу ўлады. Разумеючы, што гэта было б занадта груба, улада пазьбягала простай забароны Багушэвіча. Яна ўзьвялічвала яго дзеля таго, каб прымусіць сумнявацца ў ягонай велічы.

Паколькі творчасьць Багушэвіча ператварылася ў зачэпку для навязваньня догмаў і эмацыйных ды ірацыянальных ярлыкоў,

узятых зь лексыкону папулісцкіх ідэалёгіяў, яе аналіз мы пачнём менавіта зь іх.

— *[Дробнабуржуазны] дэмакрат-рэвалюцыянэр.* Заява аб тым, што Багушэвіч стаяў на «пазыцыях рэвалюцыйнага дробнабуржуазнага дэмакратызму», малазьмястоўная і гаворыць найперш аб ідэалягічнай пазыцыі, у рамках якой яна была выпрацаваная. Багушэвіча праблематычна назваць проста «рэвалюцыянэрам»: нягледзячы на гнеўныя ноткі і крытычнае стаўленьне да сацыяльнай рэчаіснасьці, гэтыя пачуцьці не падмацоўваюцца нейкімі заклікамі да рэвалюцыйнай будучыні. У ягонай пазыцыі няма простых заклікаў да грамадзкай перабудовы і апісаньня яе шляхоў. Тэма палітычных трансфармацыяў таксама адсутнічае, кірункі палітычнага дзеяньня не прапісаныя.

Іншымі словамі, «рэвалюцыянізм» ня зводзіцца да агульнага крытычнага патасу. «Рэвалюцыя» — гэта ня нейкая абстрактная матэрыя, а палітычны акт, які мае свае рухальныя сілы, скіраваны на зьніштажэньне існага статус-кво. У гэтым аспэкце надуманасьць гэтага ярлыка датычна Ф. Багушэвіча асабліва відавочная. Наратару Багушэвіча ўласьціва акурат нейкае чакальнае, адстароненае стаўленьне да сацыяльнай рэчаіснасьці.

— *Утапічны сялянскі сацыяліст.* Гэты ярлык наводзіць на думку аб інтэрпрэтацыйна заганным падыходзе да творчасьці Багушэвіча. Пры ідэнтыфікацыі наратара як аўтара (пра «адналітнасьць псыхікі песьняра з псыхікай народу» гаварыў таксама А. Станкевіч[29]) адбываецца зьмешваньне «мастацка ўмоўнай» асобы літаратурнага наратара (Мацея Бурачка і Шымона Рэўкі) з рэальнай асобай аўтара Ф. Багушэвіча. Ня ўся крытыка грашыць такога кшталту атаесамленьнем. Я. Карскі выказваўся на гэты конт больш карэктна: Багушэвіч «цудоўна ведае беларуса-селяніна і ўсе ягоныя нягоды»[30]. У інтэрпрэтацыі А. Луцкевіча Багушэвіч паўстае

[29] Stankiewič A. Franciš Bahušewič. Jaho žyćcio i tworčaść. U tryccatyja ŭhodki śmierci (1900—1930). Wilnia, 1930. S. 40.

[30] Карский Е.Ф. Белорусы. Т. 3. Вып. 3. Петроград, 1922. С. 197.

як «інтэлігент, узгадаваны ў апалячанай шляхоцкай сям'і — у традыцыях барацьбы за палітычную волю»[31].

— *Нацыянальны прарок.* Тэза пра тое, нібыта Багушэвіч быў нацыянальным прарокам, які заклікаў змагацца за нацыянальную незалежнасьць і прадбачыў зьяўленьне беларускай нацыянальнай дзяржавы, апошнім часам сустракаецца ў беларускай публіцыстыцы. Сьцьверджаньне, быццам Багушэвіч выступаў за нацыянальную незалежнасьць Беларусі, надуманае. Да таго ж яно кепска спалучаецца з польскай ідэнтычнасьцю Багушэвіча. Мадэль ідэальнага грамадзтва ў Багушэвіча заставалася туманная і недафармуляваныя. Беларусь у складзе адроджанай фэдэрацыйнай Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. была ня менш рэалістычнай альтэрнатывай, чым незалежная Беларусь альбо Беларусь як частка нейкай трэцяй дзяржавы. Багушэвіч сапраўды надзяляў расейскую імпэрскую ўладу і яе агентаў значэньнямі варожасьці і адчужэньня, але па сутнасьці застаўся дапалітычным аўтарам, які не настойваў на цьвёрдым палітычным выбары Беларусі, пакінуўшы яго адкрытым. Ён ня мог мець выразнай палітычнай праграмы, бо грамадзтва, для якога ён стаўся голасам, яшчэ толькі тварылася. Загэтым сутнасьць ягонага пасланьня мітычная і фактычна пазбаўленая канкрэтнага палітычнага зьместу, альбо, дакладней, адкрытая дзеля таго, каб запаўняцца рознымі палітычнымі зьместамі. Беларусь ёсьць экзыстэнцыйнай, але не палітычнай катэгорыяй: яна існуе па-за палітычнымі дачыненьнямі і насуперак ім у полі ўяўленьня і перажываньня[32].

Вось жа, Багушэвіч ня быў ні першым нацыяналістам, ні першым барацьбітом за нацыянальную незалежнасьць. Ня быў і антыкаляніяльным барацьбітом — нацыяналістычныя інтана-

---

[31] Навіна А. Нашы песьняры. Літаратурна-крытычныя нарысы. Вільня: Беларускае выдавецкае таварыства, 1918. С. 6.

[32] Пар. Грабович Григорій. Поет як міфотворець. Семантика символив у творчості Шевченка. Київ: Критика, 1998. С. 154—155.

цыі ў ягонай творчасьці больш выразныя, чым антыкаляніяльныя. Яго можна было б назваць нацыянальным геніем, каб жа гэтае паняцьце не было такім расплывістым і не адсылала да рамантычных крытэраў і стылю мысьленьня. Ягоную творчасьць варта разглядаць вузей, як прадмову да ўласна беларускага дыскурсу. Беларусь Багушэвіча заставалася нацыяналістычным мітам, пазбаўленым выразных палітычных патрабаваньняў.

— *Агульнапрызнаны рэаліст.* Сьветагляду Багушэвіча былі ўласьцівыя рамантычныя элемэнты. Само паняцьце Беларусі як няўлоўнай рэальнасьці, якая вымагае вернасьці і існуе без увасабленьня ў дзяржаве, мае яўна рамантычную генэалёгію. Навеяная духам рамантызму, Беларусь у Багушэвіча выступае як годная спачуваньня нявінная ахвяра, якая пакутуе за грахі чалавецтва. Адрозна ад расейскіх альбо нямецкіх рамантыкаў, якія выяўлялі пагружэньне індывіда ў глыбіню свайго ўнутранага сьвету, такая рамантычная пазыцыя прадугледжвала «актывісцкі», сацыяльна актыўны характар. Як у выпадку ўкраінскага рамантызму, яна была прасякнута мэсіянскім духам і вылучалася вялікім інтарэсам да гісторыі і фальклёру[33].

— *Пісьменьнік, які паўплываў на ўсю наступную беларускую літаратуру.* Беларуская крытыка стракацее заявамі, што з Багушэвіча «пачынаецца *жыцьцё* беларускай літаратуры, якое вы-

[33] Як вядома, М. Кастамараў, П. Куліш, Т. Шаўчэнка і іншыя ўкраінскія рамантыкі былі актыўнымі ўдзельнікамі Кірыла-Мяфодзіеўскага таварыства, якое існавала ў Кіеве з 1845 г. і да свайго разгрому расейскімі ўладамі ў 1847 годзе. На думку Д. Чыжэўскага, ідэалёгію кірыла-мяфодзіеўцаў складалі наступныя асноўныя элемэнты: рамантычная традыцыя, «якая на Захадзе ў той час ужо адмірала, а ў славян яшчэ доўгі час заставалася жывой і актуальнай», і сацыяльны радыкалізм 40-х гг. XIX ст., узьнікненьне якога на Захадзе было абумоўлена пэўнымі сацыяльнымі перадумовамі, найперш зьяўленьнем рабочых рухаў. Чыжэўскі адзначаў, што такіх перадумоваў не было ва ўсходнеславянскім сьвеце, дзе радыкалізм набыў нацыянальна-палітычнае аблічча, а спэцыфічна праваслаўны тып рэлігійнасьці, які «надаваў некаторым момантам ідэалёгіі эсхаталягічную афарбоўку, прывёў да веры ў магчымасьць і немінучую патрэбу перабудовы ўсяго жыцьця чалавека і грамадзтва на аснове хрысьціянскай веры».

носіць на сьвет такіх таленавітых паэтаў, як Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, А. Гарун, З. Бядуля і інш.» (А. Бабарэка), альбо «звонкі голас Багушэвічавай «Дудкі» абудзіў не адно пакаленьне беларускіх паэтаў да творчай працы. «Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею, за тое, што ў сэрцы збудзіў ты надзею», — пісаў Адам Гурыновіч. «Ты, Дудка, грай і мне голас дай!» — усклікала Цётка. А Янка Купала проста адзначыў, што «Дудка беларуская» Багушэвіча зрабіла яго беларускім паэтам»[34].

Такі падыход вельмі шырокі і папулісцкі. Ён не пацьвярджаецца тэкстуальна. У раньняй творчасьці Янкі Купалы і Якуба Коласа назіраецца простае засваеньне і адтварэньне каляніяльных мадэляў прэзэнтацыі Беларусі, якія ня маюць анічога супольнага з духам творчасьці Багушэвіча:

*Невясёлая старонка,*
*Наша Беларусь:*
*Людзі — Янка ды Сымонка,*
*Птушкі — дрозд ды гусь.*

*Поле — горы ды каменьне,*
*Потам зьліта ўсё,*
*Сенажаць — адно карэньне,*
*Сівец ды куп'ё*[35].

---

Чижевський Д. Нариси з історії філософії на Україні. Київ: Обрій, 1992. С. 140.

Гэтая тэза Чыжэўскага пацьвярджаецца прыкладам «Кніг быцьця ўкраінскага народу» М. Кастамарава, у якіх нацыянальны радыкалізм цесна зьвязаны з сацыяльным: «[Украіна] не хацела ні цара, ні пана, і хаця і быў цар, але чужы, і хаця былі паны, ды чужыя»*; і ў пэўнай меры на прыкладзе сацыяльнага мысьленьня К. Каліноўскага: «Ад маскаля і паноў няма чаго спадзявацiся, бо яны не вольнасьці, а глуму і зьдзерства нашага хочуць»**.

* Костомаров Н.И. Закон Божий (Книги буття українського народу). Київ: Либідь, 1991. С. 28.

** Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Мінск: Беларускі кнігазбор, 1999. С. 28.

[34] Александровіч С. Рэха дудкі беларускай // Маладосць. 1970. № 3. С. 123.

***
*Край наш бедны, край наш родны!*
*Лес, балота ды пясок...*
*Чуць дзе крыху луг прыгодны...*
*Хвойнік, мох ды верасок.*

*А туманы, як пялёнка,*
*Засьцілаюць лес і гай.*
*Ой ты, бедная старонка!*
*Ой, забыты Богам край!* <...>

*Крыж збуцьвелы пры дарозе,*
*Кучка топаляў сухіх...*
*Сьцішна, нудна, бы ў астрозе*
*Ці на могілках якіх*[36].

Вось жа, пытаньне з пасьлядоўнікамі Багушэвіча не такое простае, як падаецца на першы пагляд. Храналягічны падыход тут недапушчальны, як і ўжываньне квазікрытэраў накшталт супольнай мовы (калі ўсе пісьменьнікі, якія пісалі пасьля Багушэвіча па-беларуску, залічаюцца ў ягоныя простыя пасьлядоўнікі і вучні), альбо літаратурнай псэўданімікі (калі прыкмету ўплыву Багушэвіча ўгледжваюць у выбары сугучнага псэўданіму). Сама па сабе мова не вызначае мастацкага стылю і палітычнай пазыцыі — яны залежаць ад вонкавых што да мовы эстэтычных і ідэалягічных крытэраў. Захапленьне псэўданімамі можа інтэрпрэтавацца як знак культурнага або нацыянальнага адчужэньня паміж аўтарам і яго чытачамі, прасьцей кажучы, як адзнаку вонкавай нарацыі, не накіраванай на завязваньне з чытачамі ўзае-

---

[35] Зь песень аб сваёй старонцы (1905—1907). Купала Янка. Поўны збор твораў. Т. 1. Вершы. Пераклады. 1904—1907. Мінск: Мастацкая літаратура, 1995. С. 192.

[36] Наш родны край. 1906. Колас Якуб. Збор твораў у чатырнаццаці тамах. Т. I. Вершы 1898—1917. Мінск: Мастацкая літаратура, 1972. С. 22.

мазацікаўленага дыялёгу. З гэтага гледзішча ў беларускай літаратуры XX ст. куды больш пасьлядоўнікаў Дуніна-Марцінкевіча, чымся Багушэвіча.

Гэтыя і іншыя ацэнкі Багушэвіча і ягонай творчасьці ў афіцыйным дыскурсе ўсё яшчэ надзяляюцца нейкай навуковай бесьпярэчнасьцю, хаця за імі стаяць танны патас і звычайныя падтасоўкі. Прасеяная праз сіта тэндэнцыйных інтэрпрэтацыяў творчасьць Багушэвіча нібыта не патрабуе дыскусіі, а значыць, ня будзіць інтарэсу.

Падобныя ацэнкі нармалізуюць, падганяюць пад агульны шаблён і ўрэшце недаацэньваюць альбо нават адкідаюць шматмернасьць фэномэну Багушэвіча. Па сутнасьці гэта рытарычныя прыёмы — і ня толькі таму, што непазьбежна зводзяцца да павярхоўных і папулісцкіх вызначэньняў Багушэвіча як барацьбіта, актывіста і энтузіяста альбо культурнага героя, але найперш таму, што такое безаблічнае рытуальнае бачаньне несумяшчальнае з сапраўдным пазнаньнем. Калі паэзія ня служыць ілюстрацыяй жыцьця рэальнага чалавека, яна пачынае служыць ілюстрацыяй для чалавека фікцыйнага.

Любое пазнаньне асуджана ў найлепшым выпадку наблізіцца да аб'екта пазнаньня, высоўваючы новыя тэорыі і падыходы, але няздольнае раскрыць яго канчаткова і ва ўсёй паўніні. Аб'ект пазнаньня, асабліва аддалены ў часе, такі, як літаратурны тэкст, заўсёды выкоўзваецца. Да таго ж нас і тэксты Багушэвіча падзяляе ўзьніклы бар'ер у выглядзе напрацаваных ідэяў, бачаньняў, крытэраў і канцэпцыяў. Ухапіць аб'ект пазнаньня немагчыма толькі з дапамогай іх падрабязнага апісаньня — каб наблізіцца да яго, варта наноў перачытаць іх. Пазнаваць Багушэвіча — значыць умець чытаць яго.

Працаваць сёньня, выкарыстоўваючы інструмэнтар і шаблёны таталітарнага пэрыяду беларускай гісторыі, — значыць кансэрваваць у новых умовах ягоную спадчыну, падтрымліваць канон, які абясцэньвае нацыянальную культуру, адмаўляцца бачыць за

тэкстамі вартасьці, якія могуць быць акурат цяпер агульнанацыянальным здабыткам. І наадварот, гуманізуючы тэксты, закладзеныя ў падмурак нацыянальнай культуры, мы гуманізуем саміх сябе.

Паколькі пытаньні тэкстаў Багушэвіча і зьвязаныя зь імі фармальныя вымераў практычна не закраналіся крытыкай, якая навязвала іх сацыялягізатарскае ўспрыманьне, далей мы зьвернемся да чытаньня тэкстаў, а не пазытывісцка-аб'ектывісцкай рэканструкцыі біяграфіі Багушэвіча. Складанасьць ягонага фэномэну мы пазначым разглядам паасобку абедзьвюх прадмоваў, а таксама ўводзінамі ў ягоную паэзію.

## ПРАДМОВА ДА «ДУДКІ БЕЛАРУСКАЙ»

Перачытаем яшчэ раз прадмову да «Дудкі беларускай» (1891). Тое, на што мы зьвернем увагу, — гэта стыль, моўныя звароты, кантэкст, рамантычныя сымбалі і міталягічныя структуры, нарацыйныя прыёмы, гістарычныя і грамадзкія абставіны, а ня правільнасьць рэпрэзэнтацыі рэалістычнай мадэлі альбо яе адпаведнасьць канструкцыям, прапанаваным крытыкай раней:

*Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маей! Вам афяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя «мужыц-*

*кай» завуць, а завецца яна «беларускай». Я сам калісь думаў, што мова наша — «мужыцкая» мова, і толькі таго! Але, паздароў Божа добрых людцоў, як навучылі мяне чытаць-пісаць, з той пары я шмат гдзе быў, шмат што відзеў і чытаў: і праканаўся, што мова наша ёсьць такая ж людзкая і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая. Чытаў я ці мала старых папераў па дзьвесьце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі, а нашай мовай чысьцюткай, як бы вот цяпер пісалася. Увідзеўшы гэта, я часта думаў: Божа ж мой, Божа! Што ж мы за такія бяздольныя? Якаясь маленькія Булгарыя — са жменя таго народу — якіясьці Харваты, Чэхі, Маларосы і другія пабратымцы нашыя і ружны чужы зброд, жыды маюць па-свойму пісаныя і друкованыя ксёнжачкі і газэты, і набожныя, і сьмешныя, і сьлёзныя, і гісторыйкі, і баячкі; і дзеткі іх чытаюць так, як і гавораць, а ў нас як бы захацеў цыдулкі ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык, можа б, і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што «піша па-мужыцку», і як дурня абсьмяялі б! А можа, і праўды наша мова такая, што ёй нічога добрага ні сказаць, ні напісаць ня можна? Ой, не! Наша мова для нас сьвятая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым жа мы ёй шмат і добрага, але так ужо мы самі пусьцілі яе на зьдзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахотней гавораць па-французску, як па-свойму. Нас жа ня жменька, а з шэсьць мільёнаў — больш і шмат больш, не раўнуючы, як жыдоў, напрыклад, або татар, ці армян, а пакажы ж, ваша, хоць адну ксёнжачку ці аб гаспадарцы, ці так аб жыцьці нашым, каб па-нашаму?*

*Ці ж ужо нам канечне толькі на чужой мове чытаць і пісаць можна? Яно добра, і навет і трэба знаць суседзкую мову, але наперш трэба знаць сваю. Перадумаўшы ўсё гэта, я, братцы, адважыўся напісаць для вас сякія-такія вершыкі: хто іх спадабае, таму дзякуй! А хто па-*

*думае лепш і больш напісаць, таму чэсьць вечная і ад жывых людзей і ад бацькавых касьцей! А пісаць ёсьць шмат чаго!*

*Спрадвеку, як наша зямелька зь Літвой злучылася, як і з Польшчай зьдналася дабравольна, дык усе яе «Беларусяй» звалі, і недарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, ня чорная яна была, а белая, чыстая: нікога ня біла, не падбівала, толькі баранілася.*

*Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананьнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсьць адзежа душы.*

*Ужо больш як пяцьсот гадоў таму, да панаваньня князя Вітэнэса на Літве, Беларусія разам зь Літвой баранілася ад крыжацкіх напасьці, і шмат местаў, як Полацк, прызнавалі над сабой панаваньне князёў Літоўскіх, а посьле Вітэнэса Літоўскі князь Гядымін злучыў зусім Беларусію зь Літвой у адно сільнае каралеўства і адваяваў шмат зямлі ад крыжакоў і ад другіх суседаў. Літва пяцьсот дваццаць гадоў таму назад ужо была ад Балтыцкага мора ўдоўжкі аж да Чорнага, ад Дняпра і Днястра ракі да Нёмна; ад Каменьца места аж да Вязьмы — у сярэдзіне Вялікаросіі; ад Дынабурга і за Крамяньчук, а ў сярэдзіне Літвы, як тое зярно ў гарэху, была наша зямліца — Беларусь! Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывец: яна ад Вільна да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак...*

*Мацей Бурачок*[1].

---

[1] Багушэвіч Ф. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. С. 16—17.

*Пабуджэньне каляніяльных наратываў.* Гэтая цытата раскрывае перад намі рашучага нацыяналіста, які патрабуе радыкальнай перабудовы і мадэрнізацыі беларускай культуры згодна з нацыянальна-палітычнымі патрабаваньнямі. Дыскурс Багушэвіча перабывае ў лабавым сутыкненьні з палітычнымі і літаратурнымі наратывамі, якія фармавалі імпэрскае бачаньне і расейскую ідэнтычнасьць: фактычна перад намі паўстае контрадыскурс нацыянальнага супраціву. Тэкст — гэта свайго роду рэпліка на «Рассказы на белорусском наречии» і, шырэй, на каляніяльны маналёг, спроба зьбіць абвінавачваньне, што беларуская мова прыдатная толькі для апісаньня камічнага і вульгарнага і нyздольная выражаць тонкія пачуцьці.

Калі ў імпэрскім дыскурсе вартасьць беларускай культуры адмаўлялася, каб палегчыць русіфікацыю і навязаць «общерусскую» нацыянальную сьвядомасьць, то Багушэвіч «будуе» цалкам іншую нацыю: ён імкнецца прышчапіць беларусам пачуцьцё гонару за сваю гісторыю, каб у канцавым выніку «адрадзіць» нацыянальную сьвядомасьць пры дапамозе стварэньня «сьвядомага» нацыянальнага руху. У трактоўцы Багушэвіча беларускі народ уяўляе сабой асобную культурную адзінку зь яе ўласнай гісторыяй і ўнікальнай ідэнтычнасьцю, што прадугледжвае культурную і тэрытарыяльную цэльнасьць. Акурат з гэтай мэтай Багушэвіч акрэсьлівае тэрыторыю Беларусі, узяўшы за аснову моўны крытэр.

Багушэвіч у кожным пункце зьбівае сьцьверджаньні каляніяльнага дыскурсу. Ён уводзіць новыя факты і зьвяртаецца да новых фэномэнаў, ён настойвае на вывучэньні забароненай гісторыі. Ідэя аб добраахвотным хаўрусе Беларусі з Польшчай мае на мэце адмаўленьне цэнтральнага палажэньня каляніяльнай ідэалёгіі аб «узьяднаньні» Беларусі і Расеі. Надзяляючы Беларусь гістарычнымі традыцыямі, культурнай і этнаграфічнай легітымнасьцю, Багушэвіч ставіць пад сумнеў і палітычны міт аб Беларусі як аб малодшым браце Вялікаросіі. Белая Русь — не Вялікаросія. Вобразу «запáдлага краю» супрацьпастаўлена рэвалюцыйная пэрспэктыва сваёй зямлі-маткі як аб'екта клопату і любові. Так каляніяльны наратыў, што прыніжаў беларусаў дзеля беларускай мовы, ня-

чыстага паходжаньня, адсутнасьці «вялікіх традыцыяў» і ўласнага культурнага быцьця, станавіўся часткай нацыяналістычнага дыскурсу, матываваў на стварэньне контрадыскурсу супраціву.

*Імпэрскае пранікненьне*. Беларусазнаўчыя творы расейскіх навукоўцаў прывучалі мастацтву ўяўленьня. Па прачытаньні іх можна было ўжо не аб'яжджаць усіх этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, наведваць усіх беларускіх гарадоў, плаваць на ўсіх асноўных беларускіх рэках — усё гэта можна ўявіць, чытаючы навуковыя працы, у якіх быў назапашаны агромністы аб'ём геаграфічных дадзеных. Думаць пра Беларусь азначала практыкавацца ва ўяўленьні.

Зыходнымі пунктамі для ўяўленьня Беларусі былі такія інструмэнты імпэрскага пранікненьня як карты, перапісы насельніцтва, падручнікі і слоўнікі. Названы Багушэвічам лік беларусаў — амаль 6 млн — бліскуча пацьвердзіўся праз шэсьць гадоў пасьля выхаду «Дудкі беларускай» падчас першага агульнаімпэрскага перапісу. Гэтая лічба кажа пра аб'ектывізм Багушэвіча, а таксама пра тое, што ён карыстаўся імпэрскай літаратурай. Ягоная геаграфічная лякалізацыя Беларусі таксама была аб'ектыўная і неімпэрыялістычная. Любы ірэдэнтызм што да суседніх народаў быў бессэнсоўны, бо перад нацыяй стаяць нявырашаныя ўнутраныя задачы.

*Літаратурная творчасьць як вызваленьне*. Стварэньне літаратуры на нацыянальнай мове ёсьць своеасаблівай барацьбой за самапавагу і сымбалізуе разорву з засвоеным у выніку культурнай каляніզацыі комплексам непаўнавартасьці. Багушэвіч настойвае на праве беларусаў гаварыць ад свайго імя, надаючы прыярытэт пытаньням легітымнасьці. Ён прызнае, што беларускай нацыі як такой не існуе, а навязаныя ўяўленьні аб беларускай мове і гісторыі ўзмацняюць прыгнёт ягонага народу, пазбаўляюць яго шанцаў на вызваленьне. Паколькі сфэра асабістай і калектыўнай свабоды ляжыць па-за наратывамі, створанымі іншымі, ён прымае рашэньне ствараць уласныя наратывы і падштурхоўваць іншых да стварэньня наратываў, што спрыяюць вызваленьню. Створаная ім літаратура пакліканая даць імпульс, каб абудзіць народ, адкінуць навяза-

ныя каляніяльнай ідэалёгіяй уяўленьні, дэмаскаваць каляніяльныя міты, якія яго перасьледуюць. Задача палягала ў тым, каб змусіць чытачоў думаць пра Беларусь. Можна сказаць, што акурат Багушэвіч запачаткаваў дыскусію ў беларускім кантэксьце пра нацыю і стасункі паміж імпэрыяй і калёніяй, вылучыў патрабаваньне стварэньня альтэрнатыўнага канону і выцясьненьня ім пануючага.

Вызваленьне — гэта адваротны бок прыгнёту, ляйтматыў паэзіі Багушэвіча, патас якой можна зьвесьці да сьцьверджаньня, што Беларусь прагне волі. Ідэя вызваленьня ў ёй была выражана значна больш выразна, чым вымагаючыя спэцыяльнага прачытаньня мітычныя структуры, і напаўняла зьместам усе тэлеалягічныя сымбалі, ад зьнядоленага байструка Аліндаркі і да «мокрых ям» і «гнілых вуглоў».

Багушэвіч усьведамляе, што нацыянальная сьвядомасьць ёсьць канструкцыяй, якая складаецца з набору вартасьцяў. Каб напоўніць яе спэцыфічным (гістарычным, этнаграфічным і г.д.) зьместам і надаць тым самым нацыянальнай культуры цэльнасьць, нацыянальная эліта павінна выпрацаваць іх у працэсе культурнай, інтэлектуальнай і палітычнай камунікацыі. Чальцам нацыянальнай супольнасьці забаронена «стаяць на месцы» альбо адмаўляць у дыялёгу зь іншымі. Іначай кажучы, нацыянальная сьвядомасьць заснавана ня толькі на вынаходзтве і вытворчасьці вартасьцяў, але й на абмене імі. Прыналежнасьць да нацыі зьвязаная з пашырэньнем у грамадзтве паняцьцяў і вартасьцяў, якія патрабуюць ад яго сьвядомых і ініцыятыўных чальцоў нацыянальнага самавызначэньня, а таксама намаганьняў, скіраваных на культурнае і палітычнае забесьпячэньне існаваньня нацыі.

Нацыянальная сьвядомасьць мае патрэбу ў кантакце, падтрымцы, вонкавай (сацыяльнай) іх легалізацыі. Яна згасае, калі замест вытворчасьці вартасьцяў адбываецца яе сымуляцыя. Такі спосаб функцыянаваньня будзе ўласьцівы і для беларускага нацыяналізму. Гэты скіраваны на прадукаваньне нацыянальнай культуры (яго найважнейшым інструмэнтам выступае беларуская мова) рух згасае, калі культура перастае выраблянцца. Для таго,

каб зьвесьці яго на ніпгго, няма асаблівай патрэбы фізычна зьнішчаць ягоных прыхільнікаў, дастаткова рознымі мэтадамі сымуляваць вытворчасьць нацыянальнай культуры.

Тэкст Багушэвіча насычаны фігурамі, закліканымі даць штуршок да пашырэньня нацыянальнай сьвядомасьці калі ня ў малаадукаваных масах, то, прынамсі, сярод эліт (першым адрасаваныя міты, сымбалі, вобразы, рытуалы, другім — нацыяналістычны тэкст і дыскурс як такі для адаптацыі і паглыбленьня).

*Геаграфія і канструяваньне Іншага.* Разьвіцьцё і выжываньне нацыі Багушэвіч зьвязвае з канструяваньнем іншага, адрознага і канкурэнтнага *alter ego*. Беларусь явіцца шляхам адштурхоўваньня ад сваіх геаграфічных суседзяў, якім надаецца значэньне супрацьлегласьці. Своеасаблівасьць «нас» залежыць ад таго, наколькі глыбока і пераканаўча мы здолеем устанавіць і вытлумачыць нашы адрозьненьні ад «іх». Прастора нацыяналістычнай дзейнасьці палягае ў тым, каб паглыбляць і інстытуцыяналізаваць гэтыя адрозьненьні. І наадварот, падаўленьне нацыяналістычнай актыўнасьці зьвязана са згладжваньнем і разбурэньнем гэтых адрозьненьняў. Хоць ідэнтычнасьць «Беларусі» і ідэнтычнасьць яе «іншага» не статычны, а дынамічны працэс (ступень гэтай іншасьці знаходзіцца ў полі гульні: яна павышаецца альбо паніжаецца палітычнымі, культурнымі і адукацыйнымі інструмэнтамі), яны маюць шэраг адносна сталых прыкметаў. Геаграфічна Беларусь уяўляецца не ў Расейскай імпэрыі, а ў Эўропе, населенай харватамі, чэхамі, баўгарамі і маларосамі. Расея тут ня што іншае як полюс адштурхоўваньня і матэрыял для ідэнтыфікацыі. З прадмовы вынікае, што Беларусь стагодзьдзямі пазьбягала сувязі з Расеяй, аднак, ня маючы для абароны ад яе прыродных межаў, адчувала яе ўплыў.

Ідэнтыфікацыя Беларусі з Эўропай ня ставіць пад сумнеў вагі і значнасьці Беларусі. Эўропа ёсьць супольнасьцю нацыяў, якая функцыянуе ў культурным і палітычным пляне як наднацыянальная супольнасьць, прыналежнасьць да якой не адмаўляе наяўнасьці нацыянальнай суб'ектнасьці. Паміж такой Эўропай (і

Беларусяй як яе часткай) і Расеяй ляжыць анталягічная прорва: Расея ёсьць нацыяй, якая творыцца на аснове этнакультурнай ідэнтычнасьці і вымагае асыміляцыі культур усіх этнасаў, што ў яе ўваходзіць. Зьяднацца зь ёю азначае страціць сваё ўнікальнае «я».

Вось жа, геаграфія Беларусі і яе «іншага» адыгрывае першарадную ролю ў гэтым напоўненым кранальнымі гістарычнымі дэталямі тэксьце. Уяўляючы існаваньне «Іншага», чытач Багушэвіча мог уявіць і існаваньне ўласнага народу і краіны.

Можна сказаць, што мадэрная беларуская культура была пабудаваная на бінарным супрацьстаўленьні сябе і «іншага», дзе іншы быў каланізатарам, чужым, ворагам. За інтарэсам да геаграфіі таксама стаіць жаданьне «прыпомніць», адрадзіць сваю гісторыю і сфармаваць нацыянальную сьвядомасьць перад абліччам мінулых заваёў і цяперашняй моўнай рэчаіснасьці.

*Беларусь як нэалягізм.* Калі «Ўкраіна» мела даўнюю гісторыю як легітымна-карпаратыўнае і ляялісцкае паняцьце і Т. Шаўчэнку не давялося выдумляць яго наноў, то Беларусь/Беларусія ў ягоным цяперашнім значэньні заставалася ідавочным нэалягізмам, які да таго ж дапускаў варыянтнасьць. (Сам Багушэвіч вагаўся, якому з варыянтаў аддаць перавагу.) Гэты тэрмін — простае пазычаньне з імпэрскага слоўніка, як, зрэшты, і тэрмін «беларусы» ў якасьці нацыянальнай назвы. Яшчэ колькі дзесяцігодзьдзяў таму яны ідэнтыфікаваліся як «мужыкі», «тутэйшыя», «палякі», «расейцы», «ліцьвіны», «палешукі».

*Доля-нядоля.* Ужытая катэгорыя «доля-нядоля» не сацыяльная і не культурна-гістарычная, але міталягічная. Яна размыкае наратыў і ўказвае, што мы ўжо знаходзімся ў прасторы міту. Яна адсылае не да аналізу і прычынна-выніковых сувязяў, але да лексыкону нацыянальнай міталёгіі, увасобленым у сымбалях і тэрмінах экзыстэнцыйнай дыхатаміі.

Нацыя тут трактуецца ня толькі як супольнасьць, заснаваная на супольнай тэрыторыі, але і на супольнай долі, ці, кажучы лепш, як супольнасьць, якая вымагае асобнай гісторыі і стварае сваю асобную долю. Такая ідэя долі нясе ў Багушэвіча большую эма-

цыйную нагрузку, чымся ўтапічнае і загэтым адцягненае бачаньне будучыні.

Доля абумоўленая гісторыяй; яна гаворыць аб трансцэндэнтнасьці і вечнасьці. Падобна долі іншых мадэрных нацыяў, доля беларусаў слаўная, як і іх далёкая мінуўшчына. Гераічная мінуўшчына, схаваная суворай сучаснасьцю, зазьзяе яшчэ мацней дзякуючы адраджэньню праўдзівага духу нацыі будучымі пакаленьнямі. У імя сваёй долі кожная нацыя павінна не толькі зьвяртацца да слаўнай мінуўшчыны, але і абнаўляць свой дух у сучаснасьці.

*Гісторыя і тэлеалёгія.* Супольная гісторыя — гэта, разам з мовай і доляй, адзін з нарожных камянёў, што твораць нацыю. Багушэвічава візія беларускай гісторыі палемічная. Каляніяльны наратыў дэмагагічна сьцьвярджаў, што ў беларусаў, прадстаўленых толькі сялянствам, адсутнічае палітычная сьвядомасьць і нацыянальная доля. Багушэвіч зьняпраўджвае гэты імпэрскі маналёг і ўласьцівыя яму асымілятарскія прэтэнзіі. Ён супрацьпастаўляе яму мэтагісторыю Беларусі, унівэрсальную схему гістарычнага разьвіцьця нацыі, што можна трактаваць як падрыў імпэрскай гістарыяграфіі.

Гістарычныя погляды Багушэвіча, ягоная гістарыязофія не зьвязаныя пазытывісцкімі абмежаваньнямі. Ягоная задача — зьняць чары з гісторыі Беларусі, змусіць яе адыграць унікальную, глыбінную ролю — адрадзіць, вылечыць, вызваліць народ, стаць сапраўдным творцам ягонага духоўнага адраджэньня. Гісторыя Беларусі як скарбніцы калектыўнай памяці адкрываецца ў спэцыфічна міталягічным ракурсе. Да гэтага адкрыцьця беларуская гісторыя — гэта нішто; адно вера і жарсьць нацыянальнага будзіцеля надаюць ёй сэнс. Насамрэч, ніхто ня будзе адгукацца на заклікі да нацыянальнай салідарнасьці, пакуль яны выкладзеныя няўцямна.

Тыповаму нацыянальнаму будзіцелю не наканавана стаць прафэсійным гісторыкам — зазвычай ён задавальняецца статусам тлумачальніка рэчаіснасьці. Багушэвіч свае веды аб мінуўшчыне бярэ з розных крыніцаў альбо «падзеяў» — адны з архіўных дакумэн-

таў, другія — з гістарычных працаў і калектыўных уяўленьняў, але ўсе яны абрамленыя ў форму міталягічных структураў. Фраза пра «старыя паперы па дзьвесьце, па трыста гадоў таму пісаныя» выдае мэтад канструяваньня нацыянальнай гісторыі, уласьцівы ўсходнеэўрапейскім нацыяналізмам, калі адвольна абраныя і тэндэнцыйна вытлумачаныя дамадэрныя і раньнемадэрныя тэксты і іншыя артэфакты выкарыстоўваюцца для легітымізацыі мадэрнай нацыянальнай ідэі, разгортваньня нацыянальнага руху і фармаваньня грамадзянскага патрыятызму.

Багушэвіч знаходзіўся ў больш складаным палажэньні, чымся Шаўчэнка, які, дарэчы, не ўжываў слова «ўкраінец». Украіна была гістарычным рэгіёнам з высокай культурнай і палітычнай легітымнасьцю, Беларусі як раўнавартага рэгіёну яшчэ не існавала — ён тварыўся на вачах.

Адсутнасьць такіх палітычных утварэньняў, як Запароская Сеч альбо Гетманшчына, рабіла Беларусь больш уразьлівай з гледзішча канструяваньня гістарычных традыцыяў і ўскладняла задачу канструяваньня гістарычнай памяці, змушала шукаць прыклады раньняй палітычнай сьвядомасьці беларусаў у глыбокай гісторыі, якая ні ў якім разе не была фактам масавай сьвядомасьці і ўяўленьнем пра якую валодалі адзінкі з традыцыйнай эліты. Паводле Багушэвіча, лёсавызначальныя падзеі ў жыцьці нацыі дзеяліся 500—520 гадоў таму. Адзіна магчымым рашэньнем у такой сытуацыі было ссоўваньне гістарычных акцэнтаў і міталягізацыя гістарычных падзеяў, — каб надаць ім нейкі ўнутраны сэнс, што прадвызначае пабудову мадэрнай нацыі, дае глыбокае адчуваньне беларускай гістарычнай долі і калектыўнай душы.

Чаму ж усьведамленьне сваёй гістарычнай своеасаблівасьці было такім важным для нацыяналізмаў безьдзяржаўных нацыяў у XIX ст.? Стан, у якім тады знаходзіліся «іхнія» нацыі, успрымаўся як стан поўнай імабілізацыі: «нацыянальная гісторыя скончылася, вычарпалася — прынамсі ў формах палітычнай актыўнасьці» (А. Забужка). Таму нацыянальны ідэоляг мусіць рэстаўраваць «разабранае» ў часе нацыянальнае цела, г.зн. зрабіцца «па-

літычным археолягам» (Э. Сьміт), наноў адкрыць нацыянальную гісторыю і творча пацьвердзіць гістарычную пераемнасьць нацыі зь яе гераічнай мінуўшчынай.

Выхапленыя Багушэвічам зь мінуўшчыны падзеі пацьвярджаюць росквіт сярэднявечнай і раньнемадэрнай беларускай культуры і тым самым перадвызначаюць яе адраджэньне ў блізкай будучыні. Гэтая парадыгма, праўда, прадугледжвае ссоўваньне бачаньня мінулага: яно служыць адной суцэльнай увэртурай для будучага росквіту нацыі. Такая гісторыя дазваляе кваліфікаваць як нацыянальныя розныя фэномэны — сярэднявечныя дзяржавы і вайсковы гераізм паганскіх князёў, фэадальныя парадкі, вясковыя абрады, этнаграфічныя рытуалы і паўмітычных герояў, а таксама надаваць тагабочнае, трансцэндэнтнае значэньне шараговым гістарычным падзеям.

Такая гісторыя становіцца умовай магчымасьці будучыні: паколькі беларускі народ мае мінуўшчыну, г.зн. гісторыю ў выглядзе дзяржаваў, тэкстаў, падзеяў і герояў, а таксама своеасаблівасьць (этнаграфію), ён мае права і на будучыню. Другая ўмова магчымасьці фармуецца заклікамі да сумеснай дзейнасьці: «патрэбная» будучыня настане, калі яе сумесна набліжаць. Так захаваная ў помніках культура Літвы і Рэчы Паспалітай станавілася сродкам камунікацыі ўнутры беларускай эліты[2].

*Мова і жыцьцёвая энэргія этнасу.* Мова, як гісторыя і доля — найважнейшы атрыбут нацыянальнага быцьця. У адрозьненьне ад мэтафізычнай долі яна мае матэрыяльную прыроду і ўспрымаецца як найважнейшы атрыбут жыцьця/сьмерці народу. Багушэвіч дае зразумець, што жыцьцёвая энэргія этнасу ня вечная. Яна дзейнічае

[2] Для нацыяналіста, які імкнецца пабудаваць будучыню на абраз і падабенства «праўдзівай» мінуўшчыны, ня толькі гісторыя, але і рэлігія ёсьць інструмэнтам мабілізацыі і актывізацыі мас, крыніцай легітымізацыі радыкальных сацыяльныхператварэньняў. У выпадку Багушэвіча адчужэньне ад расейскага праваслаўя наўрад ці тлумачылася рацыянальным разьлікам, будучы барджджэй знакам яго няздольнасьці выйсьці за межы стандартных культурных уяўленьняў свайго сацыяльнага асяродзьдзя.

стыхійна і неўсьвядомлена, таму неабходныя культурныя высілкі, каб «асядлаць» яе і даць напрамак. Бязь іх этнас ня здольны супраціўляцца ўціску чужых гегемоніяў. Неспакой Багушэвіча з прычыны мовы адлюстроўвае ня проста агульныя культурныя погляды, г.зн. ня толькі выражае калектыўнае пачуцьцё страты свабоды і ўлады распараджацца сваёй доляй, але і падсьвядомы страх культуры, якая перабывае пад пагрозай зьнішчэньня. Багушэвіча перасьледуюць прадчуваньні борздай моўнай асыміляцыі беларусаў, бо ў беларускім грамадзтве адсутнічае грамадзкая рэакцыя на моўную і культурную дыскрымінацыю.

Як і іншыя эўрапейскія ідэолягі культурнага нацыяналізму, Багушэвіч быў схільны да сакралізацыі нацыянальнай мовы, дарма што яна ў той час не была мовай біблійных тэкстаў альбо рэлігійнай практыкі. (Да таго ж пасьля сьцьверджаньняў аб сьвятасьці беларускай мовы Багушэвіч апынаўся ў двухсэнсоўнай сытуацыі як носьбіт сакральнасьці, жрэц моўнага культу.) Як і ў разьдзеленай Нямеччыне да 1870 г., так і ва ўяўленай Беларусі канца XIX ст. не існавала дзяржаўных, інстытуцыянальных і ідэалягічных рамак, зыходзячы зь якіх можна было сфармуляваць мадэрную нацыю. Таму нацыя станавілася рэальнасьцю будучыні, якую можна распазнаць цяпер толькі па супольнай мове і культуры: прадвызначанай доляй і гісторыяй расплывістай утопіяй, прыцягальнай хутчэй пачуцьцёва, чым рацыянальна. *«Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець»* — гэта ня што іншае, як парафраз радкоў Эрнста Морыца Арнта зь ягонай «Песьні аб бацькаўшчыне» (1813), якая стала нямецкім нацыянальным гімнам: «Што такое Нямеччына? («das Teutsche Vaterland»)... Нямеччына паўсюль там, дзе гавораць на нямецкай мове». Як і нямецкая, беларуская нацыя, згодна з ідэяй Гердэра аб фундамэнтальнай індывідуальнасьці народнасьці, вызначалася як аб'ектыўная прыкмета, заснаваная выключна на супольнай мове. У гэтым сэнсе нацыя была незалежная ад асабістага выбару: усе, хто гаворыць па-беларуску, абавязкова будуць беларусамі на працягу ўсяго свайго жыцьця.

Выбар мовы як крытэру нацыянальнасьці тлумачыўся таксама тым, што мова была адзіным элемэнтам, які стаяў над сацыяльнымі і рэлігійнымі адрозьненьнямі. У канцы XIX ст. толькі мова магла быць супольным пачаткам для культурна, рэлігійна і сацыяльна разьяднаных беларусаў, чые эліты даўно валодалі разьвітай польскай альбо расейскай нацыянальнай сьвядомасьцю.

Багушэвіч усьведамляў, што імпэрыялізм, каляніялізм і дзікі ідэалягічны дыктат рабілі пэрспэктыву моўнай асыміляцыі беларусаў імавернай. У гэтым акцэнтаваньні беларускай мовы і знакамітым палітычным лёзунгу «*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі!*» можна таксама бачыць рэпліку супраць апяваньня непазьбежнай сьмерці беларускай мовы ў каляніяльным дыскурсе.

У ідэі аб мове як аб адзежы душы і пра сьмерць душы народу разам з мовай асабліва зырка праступае хрысьціянская сымболіка. Яе зыходны пункт — хрысьціянская догма аб выратаваньні душы шляхам яе ачышчэньня ў ланцугу пакутаў.

*Ахвярнасьць/самаадданасьць.* Нацыю ставарае ня толькі супольная мова, доля і гісторыя, але і любоў да яе, выражаная ў вернасьці і ахвярнасьці. Самаадданасьць і чысьціня намераў — адзінае, што шараговы чалец нацыі можа проціпаставіць дыктату дэспатычнай дзяржавы. Багушэвіч гэтым паказвае, што дзейнасьць у імя нацыі наўрад ці прынясе матэрыяльную карысьць. Узнагарода чакаецца ў нематэрыяльнай сфэры прэстыжу. Учорашні селянін, сёньня прасякнуты нацыянальнай самасьвядомасьцю, сымбалічна павышае сваё палажэньне ў грамадзтве. Прыналежнасьць да нацыі, ператварэньне ў грамадзяніна надзяляецца пачэсным, высакародным статусам. Такім чынам пачуцьцё годнасьці і самапавага зьвязваюцца з нацыянальнай прыналежнасьцю. Гэта паклікана забясьпечваць адданасьць чальцоў нацыі і матываваць іх жа павышаць агульнанацыянальны прэстыж.

*Ксэнафанобія.* Словам «зброд» Багушэвіч ясна паказвае, што ўсходнеэўрапейскія нацыяналізмы XIX ст. межавалі з ксэнафобіяй. Гэтая сувязь нацыяналізму і ксэнафобіі — не прыроджаная, а набытая: абодва зьявішчы спараджаюцца канкрэтнай культурнай

традыцыяй і ўбіраюць ужо існыя культурныя і сацыяльныя ўяўленьні.

*Украінскі сьлед. Уплыў Шаўчэнкі*[3]. *«А ў нас як бы захацеў цыдулкі ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык, можа б, і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што «піша па-мужыцку», і як дурня абсьмяялі б!»* — умоўны лад гэтага выказваньня падкрэсьлівае, што яно не магло быць зьдзейсьненае ў рэальнай беларускай сытуацыі. Да Багушэвіча ніхто ў беларускай вёсцы не пісаў лістоў па-беларуску. Ягоная пазыцыя апрыёрная, г.зн. барждкэй пазычаная. Крыніцай пазычэньня, мабыць, былі ўкраінскамоўныя творы Шаўчэнкі. Нападкі на іх форму і зьмест, у якіх называліся бессэнсоўнымі і сьмяхотнымі намаганьні мужыка, які піша па-ўкраінску для мужыкоў, сам Шаўчэнка сарданічна парафразаваў ва ўступе да «Гайдамакаў»:

*А то дурень розказує*
*Мертвими словами*
*Та якого-то Ярему*
*Веде перед нами*
*У постолах. Дурень! Дурень!*

Расейская крытыка «Кабзара» ў 1840 г. збольшага прызнавала талент Шаўчэнкі, але колькі рэцэнзэнтаў выразілі занепакоенасьць ягоным рашэньнем «пісаць мёртвай мовай» альбо «наречием».

[3] Украінскія ўплывы традыцыйна называліся адной з падставаў, «на якіх вырастала беларуская ідэалёгія Багушэвіча» (А. Луцкевіч), найперш на матэрыяле біяграфічных сьведчаньняў, а не кампаратыўнай тэксталёгіі. Паводле Луцкевіча, Багушэвіч падчас свайго перабываньня ва Ўкраіне пісаў вершы па-ўкраінску. Тое, што Багушэвіч добра ведаў украінскую мову і наагул цікавіўся ўкраінскім жыцьцём, пацьвярджае ў сваіх успамінах, датаваных 1938 годам, і ўкраінскі гісторык Д. Дарашэнка, які падчас навучаньня ў Віленскай гімназіі ў 1890-х гг. колькі разоў сустракаўся з Багушэвічам. Паводле Дарашэнкавай ацэнкі, той «вельмі добра навучыўся па-ўкраінску і вось цяпер у дарозе ўвесь час гаманіў... у гэтай мове, апавядаючы шмат цікаўнага з сваіх успамінаў пра Ўкраіну». Дарашэнка Д. Старонка з маіх успамінаў // Спадчына. 2000. № 1—2. С. 61.

Пазьней, кажучы пра ўспрыманьне свайго іншага твору «Гайдамакі» расейскай крытыкай, Шаўчэнка адрэагаваў на яе так:

> *...тут москалі зовуть мене ентузіастом, сиріч дурнем. Бог їм звидить, нехай я буду і мужицький поет, то мені більше нічого і не треба. Нехай собак лає, вітер рознесе*[4].

Можна правесьці паралель паміж прадмовай Багушэвіча да «Дудкі беларускай» і прадмовай Шаўчэнкі да «Гайдамакаў». Багушэвіч пачынае яе са звароту «Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маей», Шаўчэнка — «Брати, одної матері діти».

Нарэшце, клопат Багушэвіча аб «нашай бацькавай спрадвечнай мове» як апірышчы нацыянальнай культуры і патрабаваньне нарошчваць кнігадрукаваньне на нацыянальнай мове як мага больш шырокага тэматычнага дыяпазону (друк на нацыянальнай мове ў XIX ст. як нішто іншае пераконваў у тым, што «ўяўлены сьвет увачавідкі ўкаранёны ў паўсядзённым жыцьці» (Б. Андэрсан)) таксама былі навеяныя ўкраінскім досьведам. Фраза Багушэвіча «Якаясь маленькія Булгарыя — са жменя таго народу — якіясьці Харваты, Чэхі, Маларосы і другія пабратымцы нашыя і ружны чужы зброд, жыды маюць па-свойму пісаныя і друкаваныя ксёнжачкі і газэты, і набожныя, і сьмешныя, і сьлёзныя, і гісторыйкі, і баячкі» перагукаецца з думкай Шаўчэнкі, выкладзенай у прадмове да другога выданьня «Кабзара»: «Чую, а іноді і читаю: ляхи друкують, чехи, серби, болгаре, чорногори, москали — всі друкують, а в нас анітелень, неначе всім заціпило»[5].

Без сумневу, посьпех і жыцьцяздольнасьць украінскага нацыяналізму, які вылучыў на пярэдні плян прынцып культурна-палітычнай цэльнасьці і аўтаноміі Украіны, былі калясальным досьведам для Багушэвіча.

---

[4] Шевченко Тарас. Повне зібрання творів у шести томах. Т. 6. Київ: Академія наук УРСР, 1964. С. 23.

[5] Тамсама. С. 312.

Украінскі нацыяналізм зарадзіўся на зломе XVIII і XIX ст. у Харкаве і Палтаве (каля 80 адсоткаў украінскіх літаратараў 1800—1840 гг. складаліся з жыхароў гэтых горадоў). (Храналягічна нацыянальнае самавызначэньне ўкраінскіх інтэлектуалаў адбывалася практычна адначасова зь іншымі аналягічнымі карпарацыямі эўрапейскай эліты.) З Харкава хваля ўкраінскага адраджэньня хлынула на захад і ў сярэдзіне 40-х гг. XIX ст. дакацілася да Кіева і кіеўскага рэгіёну, у прыватнасьці, да Нежына[6].

Фактар мовы для ўкраінскага нацыяналізму быў больш асноватворным чымся для польскага, дзе, апроч мовы, існавалі іншыя рамкі для нацыянальнай самаідэнтыфікацыі — межы Рэчы Паспалітай 1772 г., адзіная стандартызаваная культура, адзіная агульнанацыянальная царква, сетка навучальных установаў, квазідзяржаўныя структуры і г.д. (Зближала ўкраінскі і польскі нацыяналізмы зацятае супрацьдзеяньне ім адміністрацыйных апаратаў імпэрскіх дзяржаваў.) Загэтым украінская мова асэнсоўвалася як натуральны спосаб існаваньня нацыянальнага духу. У праграме часопісу «Основи» (1861 г.) яна прызнавалася «натуральнай асаблівасьцю народу», на аснове якой фармуецца ягоны натуральны спосаб існаваньня.

Акурат украінскі, альбо ў тэрмінах таго часу маларасійскі, нацыяналізм прапанаваў Багушэвічу гатовыя мадэлі і ўзоры для пераймання. Сьледам за Шаўчэнкам Багушэвіч крытыкуе будучых чальцоў нацыі за квіетызм і самазадаволенасьць. Як і для ўкраінскіх рамантыкаў, паэзіі Багушэвіча ўласьцівая віктымізацыя нацыі, якая малюецца з дапамогай вобразу бездапаможнай

[6] У тым горадзе ў тым часе існаваў юрыдычны ліцэй князя Безбародзькі, заснаваны з ініцыятывы і на кошт маларасійскага дваранства ў 1820 г. Адсюль ва ўкраінскую і расейскую літаратуру прайшлі Н. Кукальнік, Е. Грабінка, Л. Глебаў, А. Афанасьеў-Чужбінскі, браты Селіктоўскія, М. Гербель. Пра тое, наколькі буйным цэнтрам для ўкраінскай культуры была гэтая навучальная ўстанова, сьведчыць той факт, што інспэктар Ф. Марчэўскі ў 60-я гады XIX ст. пераклаў Эвангельле на ўкраінскую мову. З гэтага самага ліцэю прыйшоў у беларускую літаратуру Ф. Багушэвіч, яго навучэнец у 1865—1868 гг.

ахвяры. Мэтафара нявіннай Беларусі надавала права бараніць яе і бараніцца ёю.

Як і ўкраінскім рамантыкам, мысьленьню Багушэвіча ўласьцівы мэсіянізм. Аднак гэта не мэсіянізм нацыі з імпэрскімі амбіцыямі накшталт польскага альбо нямецкага. Своеасаблівае пакліканьне нацыі Багушэвіч бачыў у тым, што Беларусь спрадвеку «нікога ня біла, не падбівала, толькі баранілася». Як ва ўкраінскім выпадку, гэта быў нэгатыўны мэсіянізм, мэсіянізм слабага.

Паводле М. Драгаманава ўнікальнасьць украінскай нацыі была ў яе выключнай клясавай прыродзе, г.зн. у тым, што яна ня мела «ні ўласнага духавенства, ні купцоў, ні дзяржавы, але — заміж гэтага... сялянства»[7]. Гэтая трактоўка нацыянальнай выключнасьці ўкраінцаў не была вычарпальная. «Кнігі быцьця ўкраінскага народу» М. Кастамарава тлумачылі асаблівае нацыянальнае пакліканьне ўкраінцаў іх адданасьцю нормам хрысьціянскай маралі: «Таму што не хацела Ўкраіна ісьці сьледам за іншымі народамі, а трымалася закону Божага, і кожны іншаземец, прыехаўшы ва Ўкраіну, дзіваваўся, што ні ў ніводнай краіне на сьвеце так шчыра ня моляцца Богу, нідзе муж так сваю жонку ня любіць, а дзеці — бацькоў»[8]. У Багушэвіча беларуская нацыянальная выключнасьць палягала ў тым, што беларусаў спакон веку білі, рабавалі, палілі, зьнішчалі, але яны ўсё-ткі перажылі ўсе гэтыя нягоды і дажылі да сучаснасьці. Значыцца, і нацыянальная эліта ў стане, абапіраючыся на рамантычны нацыяналізм, стварыць новую ідэалёгію нацыянальнай кансалідацыі і адраджэньня.

Акурат гэтая мэсіянска-містычная ідэалёгія ўвасабляецца ў форме мэсіянскай веры ў адроджаную Беларусь як крыніцу вызвольных ідэалаў і апірышча барацьбы за нацыянальнае самавы-

---

[7] Цыт. пав.: Химка Дж.-П. Зародження польської соціал-демократії та українського радикалізму в Галичині (1860—1890). Київ: Основні цінності, 2002. С. 67.

[8] Костомаров Н.И. Закон Божий (Книги буття українського народу). Київ: Либідь, 1991. С. 25.

Існавалі і іншыя тлумачэньні ўкраінскай выключнасьці.

значэньне. Беларусь абвяшчалася носьбіткай векавых культурных, праўных і гістарычных традыцыяў.

Як і ў выпадку Шаўчэнкі, патрыятычныя нараканьні Багушэвіча на адсутнасьць «нармальнай», г.зн. нацыянальнай культуры, літаратуры і навукі былі вынікам засваеньня заходняй мадэлі нацыі як пасьпяховага шляху да мадэрнасьці і дэмакратыі. Разьвіцьцё нацыянальнай культуры Багушэвіч падпарадкаваў утопіі, сэнс якой палягае ў тым, каб зьменшыць дыстанцыю паміж уласнай нацыяй і заходнімі мэтраполіямі, адначасова добраахвотна імпартуючы заходнія вартасьці і цывілізацыйныя ўзоры. Жаданьне наблізіцца да заходняга культурнага канону было важным культурным стымулам і адначасова паглыбляла комплекс культурнай няпаўнавартасьці (у малых усходнеэўрапейскіх нацыяў не было шанцаў зраўняцца цэльнасьцю сваіх культур з англасаксонскай, француcкай ці нават расейскай).

Усходнеэўрапейскія культуры (напрыклад, баўгарскую, украінскую і беларускую) збліжалі развагі інтэлектуалаў аб непаўнаце культурнага поля і імкненьне ўсталяваць унутраны грамадзкі і сымбалічны лад згодна з вонкавым узорам. Адначасова гэтае жаданьне стымулявала будаўніцтва паводле заходняй мадэлі сыстэмы адукацыі і простае пазычэньне заходніх інстытутаў: школ, унівэрсытэтаў, акадэмій, прэсы, грамадзкіх арганізацыяў, адміністрацыйных установаў, юрыспрудэнцыі, іншай інфраструктуры. Яны таксама дапамагалі надзяляць лякальныя вясковыя супольнасьці нацыянальнай сьвядомасьцю, якая, як і адукаваная і эмансыпаваная нацыя, таксама ёсьць пазычанай заходняй мадэльлю.

(У сучасным агрэсіўным сьвеце нацыянальная ідэнтыфікацыя з кнігай на нацыянальнай мове загадзя пройгрышная — база нацыянальнай ідэнтыфікацыі павінна нарошчвацца, каб беларус мог у будучыні нацыянальна атаесамляцца ня толькі з кнігай, але і з унівэрсытэтам і акадэміяй.)

Прэзэнтацыя Беларусі як часткі славянскага сьвету, супрацьпастаўленага Расеі, мела таксама кампэнсаторную ролю: беларусам, прыгнечаным навязаным комплексам сваёй нешматлікасьці,

нікчэмнасьці і адсталасьці, псыхалягічна было зручней пачувацца часткай вялікай славянскай сям'і. Тое самае перажылі славакі: невыпадкова першыя панславісты нарадзіліся ў Славаччыне. Магчыма таксама, што Багушэвіч пад уплывам Гэрдэра і Лелявеля падзяляў веру ў спрадвечную славянскую дэмакратыю, пазьней сапсаваную чужымі ўплывамі, і так супрацьпастаўляў дэмакратычную Эўропу дэспатычнай Расеі. За вобразам Беларусі, якая заўсёды абапіралася на культуры народаў Эўропы і павінна рабіць так і далей, магла таксама стаяць непрыняцьце вузкалобага народніцтва ў духу «Гомана».

Нарэшце, украінскі сьлед праглядаецца ў выкарыстаньні Багушэвічам міталягічных структураў для «ўпакоўкі» нацыянальнага наратыву. Стварэньне мадэрнай украінскай нацыянальнай сьвядомасьці адбывалася з прыцягненьнем міталягічнага інструмэнтара. Мадэрная ідэя ўкраінскай нацыянальнасьці абапіралася на два асноўныя міты: міт Украіны — простай і адзінай спадкаемцы Кіеўскай Русі, і міт украінскага казацтва. (Прыняўшы «казацкі міт» як вызначальны элемэнт сваёй ідэнтычнасьці і тым самым пагадзіўшыся забыцца аб стаўленьні казакоў да ўніятаў, галіцкія русіны пацьвердзілі ідэю Эрнэста Рэнана пра важную ролю забыцьця ў імя нацыянальнай згоды.[9])

Ва ўкраінскай гістарыяграфіі міталягічнае бачаньне казацтва і гіпэрбалізаванае перабольшваньне ролі і значэньня Маскоўшчыны і Польшчы ў зьнішчэньні «натуральнага», «арганічнага» парадку, які панаваў да іх прыходу на Ўкраіне, узмацняліся магутным народніцкім пасланьнем і вычварна сьпляталіся з рэальнымі гістарычнымі падзеямі: паўстаньнем Хмяльніцкага, гайдамаччынай, барацьбой супраць Берасьцейскай уніі, культурнымі дасягненьнямі — ад Астрожскай Бібліі і да ўкраінскага «мазэпінскага» барока[10].

[9] Гл. Szporluk Roman. The Making of Modern Ukraine: The Western Dimension. Harvard Ukrainian Studies. Volume XXV (1/2). 2001. P. 57—90.

[10] Яўная міталягізаванасьць наратываў, якімі апісвалася і тлумачылася ўкраінская нацыянальная гісторыя, выклікала зьедлівы камэнтар Э. Сьміта: «Украінцы адшу-

*Міт беларускага адраджэньня.* Падобна Шаўчэнку Багушэвіч камбінуе міталёгіі, каб максымальна прыцягальна вызначыць і данесьці да масаў сваё нацыянальнае пасланьне. Ён канструюе міты, усьведамляючы, што яны ёсьць эфэктыўнай камунікацыйнай сыстэмай, абалонкай для нацыянальнага пасланьня. Сакралізацыя нацыянальнай мінуўшчыны (альбо, кажучы словамі А. Забужкі, «трансфармацыя нацыянальнай гісторыі ў сьвятую») і нацыянальнай мовы дапамагае канструяваць аснаватворны для нацыі міт адраджэньня Беларусі. Ахвяруючы гэты міт «мілым братцам-беларусам», Багушэвіч напаўняе тэкст надзвычайным эмацыйным напружаньнем. Стварэньне такога міту ёсьць кульмінацыяй жыцьця ягонага творцы, уцягнутага ў гераічную барацьбу, каб паскорыць прыход будучыні насуперак пастаянным перашкодам: інэрцыі грамадзкіх традыцыяў, шматлікай і магутнай палітычнай апазыцыі, густой заслоны звычаяў, прымусу варожай дзяржавы[11].

Багушэвічу даводзіцца асвойваць ролю прарока-мітатворцы, які сьвядома нясе міт свайму народу, становячыся пасярэднікам паміж мінуўшчынай, сучаснасьцю і будучыняй. Ён паўстае адзіным прадстаўніком народу, здольным так глыбока і поўна выкласьці ягоную мінуўшчыну і ўявіць будучыню. Гэтую якасьць кантрастна падкрэсьліваюць менавіта прадмовы, у якіх выступае наратар асаблівага, трансцэндэнтнага тыпу, сьвятая місія якога — уваскрашаць мінуўшчыну, аднаўляць калектыўную памяць, прышчапляць сваім прыніжаным і атупелым суродзічам усьведамленьне таго, хто яны такія і хто былі іх продкі, навяртаючы іх да праўдзівага жыцьця. Розьніца ў інтанацыях паміж наратарамі ў прад-

калі свае вытокі і славутую мінуўшчыну ў казацкіх традыцыях і, яшчэ глыбей, у Кіеўскай Русі, тады як зымбабвійцы знайшлі эпоху сваёй велічы ў цывілізацыі, што стварыла помнікі Вялікага Зымбабвэ».

Сміт Ентоні Д. Націоналізм. Теорія, ідеологія, історія. Київ: видавництво К.І.С., 2004. С. 129.

[11] Пар. Химка І.-П. Коротка історія української ідеї // Критика. 2003. № 11. С. 7—9.

мовах і паэтычным тэксьце нагадвае два розныя галасы: з аднаго боку, голас асьвечанага, інтэлектуальнага паэта, а з другога боку — ягонага неасьвечанага зямнога двайніка. Аднак і першы, і другі голас у аднолькавай меры ёсьць праекцыяй Багушэвіча: за фігурай прарока пазнаецца паэт-інтэлектуал, які паўстаў перад абліччам татальнай рабскай пакоры супраць устаноўленага парадку. Другі наратар — гэта таксама сымбалічная праекцыя аўтара — самотны дзед-пакутнік, выгнаньнік, вандроўнік, перасьледаваны ўладамі. Багушэвіч належаў да клясычных маргінальных, пазбаўленых сацыяльнай стабільнасьці постацяў. Учорашні шляхціц, сёньня ён ня можа вярнуцца да сваёй мінуўшчыны. Загэтым ён выбірае ролю пасярэдніка паміж тагабочным і зямным сьветам, прадстаўляе духоўныя вартасьці і выступае голасам ідэальнага грамадзтва. Гэты прыём пашырае структуру нарацыі, робіць яе больш драматычнай, бо выяўляецца, што ідэнтычнасьць наратара выходзіць за межы традыцыйнай літаратурнай альбо палітычнай структуры і сягае глыбейшых ідэалягічных вытокаў.

Першы голас імкнецца да прамэтэеўскай, трыбуннай пазыцыі — гэта голас тлумачальніка, чыё прызначэньне — даць людзям адкрыцьцё, выясьніць, чым была Беларусь і якой яна павінна стаць. Яго прарочая задача як носьбіта міту палягае ў тым, каб перадаць яго далей, укласьці яго ў сэрцы сваіх суайчыньнікаў. Другі, самазасяроджаны і зьлёгку гермэтычны голас — гэта голас апавядальніка, які выяўляе сучасную цяжкую эпоху, каб расшыфраваць міталягічную структуру — падказаць сакрэт «мокрай ямы», таямніцу Беларусі. Адпаведна, у прадмовах акцэнт зроблены на трансцэндэнтнасьці і сакральнасьці, а ў інтэнсіўнай паэзіі-споведзі — на сьвядомасьці і тэлеалёгіі, з выхадам у індывідуальныя і калектыўныя вымеры.

Гэта палімпсэст, дзе пад адным тэкстам (нарацыяй) крыецца іншы (міталягічныя структуры і тэлеалягічныя сымбалі), які патрабуе нават не прачытаньня, а расшыфроўкі. Розьніцца таксама і нарацыйная пазыцыя абодвух галасоў: адрозьненьні закранаюць тып структуры, у якую ён убудаваны, віды вобразаў, тэмаў, матываў, якія паўтараюцца ў тэксьце, у якім ён прысутнічае.

Як і ва ўсялякім іншым міце, у міце беларускага адраджэньня гістарычны матэрыял выкарыстоўваецца для рэпрэзэнтацыі важнай і быццам праўдзівай сувязі паміж зьявамі, выхапленымі з ланцугу гістарычных падзеяў, пацьвердзіць якую, аднак, немагчыма дзеля самой прыроды гэтай рэпрэзэнтацыі. Паводле сваёй структуры ён вызначаецца празьмернасьцю і шматлінійнасьцю, г.зн. гэтае непарыўнае прадукаваньне нарацыйных лініяў адбываецца з дапамогай нанізваньня рознаплянавага, але закончанага шэрагу «падзеяў» альбо структурных адзінак («тэм» альбо «матываў»), якія яго складаюць. У канкрэтных тэкстах адна структура, напрыклад, разуменьне Беларусі як ядра ВКЛ, можа вытвараць бясконцы шэраг варыянтаў, кожны зь якіх будзе мець свой сюжэт і набор пэрсанажаў, але пры гэтым тыя ж базавыя адносіны альбо тую ж самую структуру. Гэтая варыянтнасьць, як што яна ёсьць выражэньнем мітычнага коду, пастаянна спараджае новыя «падзеі»: кожны сапраўдны міт выяўляецца і пазнаецца толькі ў «варыянтах» (альбо «падзеях»); гэта і ёсьць ягонай асноўнай характарыстыкай, ягоным «подпісам»[12].

Міт беларускага адраджэньня сілкуюць ня толькі асобныя гістарычныя падзеі, але і міт паходжаньня нацыі і цесна зьвязаны зь ім міт залатога веку. З рэлігійнымі мітамі яго збліжае зьвязанасьць матывам паходжаньня. Міт заўсёды мае дачыненьне да «тварэньня», ён апавядае нам, як тая ці іншая зьява ўзьнікла ў сьвеце, як сфармаваўся пэўны ўзор паводзінаў, пэўны інстытут, пэўны спосаб дзейнасьці.

Пара, калі «ў сярэдзіне Літвы, як тое зярно ў гарэху, была наша зямліца — *Беларусь*», паводле Багушэвіча, ня толькі час найбольшага росквіту беларускай культуры, але і існаваньня нейкага ідэальнага грамадзтва. У ягоным разуменьні яно цалкам супрацьлеглае сучаснай уладзе і іншым грамадзкім структурам.

[12] Гэтая і шэраг іншых ідэяў паходзяць з кнігі: Грабович Григорій. Поет як міфотворець. Семантика символів у творчості Шевченка. Київ: Критика, 1998. С. 63 і далей.

Само паняцьце ідэальнага (экзыстэнцыяльнага) грамадзтва і падкрэсьліваньне вострай дыхатамічнай апазыцыі паміж імі і існай сацыяльнай структурай (уладай) узьнікае дзеля таго, што наратар успрымае сваё існаваньне ў рамках сучаснай яму сацыяльнай структуры як прыгнечанае, залежнае ад чужога самадурства. Прырода гэтага ідэальнага грамадзтва ня церпіць прыземленасьці — сакральнасьць ёсьць ня проста кампанэнтам яго выяўленьня, а барджэй ягонай анталягічнай базай. Тугу па ідэальным грамадзтве, у якім зьнятыя ўсе асноўныя людзкія супярэчнасьці, падкрэсьлівае выяўленьне другім, паэтычным наратарам рэальнага сьвету як сьвету фальшу, герархіі, чыноў, улады і падману (Р. Грабовіч).

Такім чынам, імкненьне кіраваць часам з дапамогай стварэньня нарацыяў пра мінуўшчыну, якія абгрунтоўваюць нацыянальны шлях да ўтапічнай будучыні, і сакралізацыі асобных гістарычных падзеяў, каб канструяваць зь іх надзейныя мадэлі для вызваленьня ад каляніялізму, прыводзіла Багушэвіча да міталягічных і правідэнцыялісцкіх рашэньняў.

Сказаўшы пра напісаныя «вялікім панамі» старыя (па дзьвесьце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі) паперы, Багушэвіч ставіць істотны сэнсавы акцэнт на адраджэньні беларускага народу. Гэта дазваляе гаварыць пра гістарычныя традыцыі нацыі і, шырэй, шляхам паўторнага адкрыцьця, рэканструкцыі і асваеньня супольнай мінуўшчыны закласьці аснову для ўяўленьня аб яе супольным пакліканьні. Тэза пра тое, што гістарычнае быцьцё нацыі ўзыходзіць да Полацкага княства і Вялікага Княства Літоўскага, у прынцыпе бесьпярэчная. Пазьней яна была зь вялікім энтузіязмам перанятая і разьвітая беларускай гістарыяграфіяй. У сваю чаргу, дасьледаваньне гісторыі Полацкага княства падсілкоўвала міт аб паходжаньні Беларусі, які ўключае ўяўленьне аб эпосе росквіту Вялікага Княства Літоўскага як «залатога веку» беларусаў[13].

---

[13] Lindner R. Historiker und Herrschaft. Nationsbildung und Geschichtspolitik in Weissrussland im 19. und 20. Jahrhundert. Muenchen: R. Oldenbourg Verlag, 1999. S. 85.

Іншую грань міталягічнай структуры асьвятляе характар бачаньня Багушэвічам Літвы. Цяжка ўявіць, што колькі стагодзьдзяў пасьля таго, як Рэч Паспалітая стала для літоўскай шляхты гістарычнай бацькаўшчынай і аб'ектам палітычнай лаяльнасьці, Літва, Вялікае Княства Літоўскае, ім па-ранейшаму заставалася. Хутчэй за ўсё, тут мы не назіраем і ўплыву польскай рамантычнай гістарыяграфіі ў духу Тэадора Нарбута. Перад намі не гістарычны, а міталягічны фэномэн. Літва, як і Полацкае княства, прадстаўленыя негістарычна. Яны існуюць, каб выявіць мінуўшчыну і ейную славу, каб раскрыць глыбінную праўду беларускага быцьця і служыць падмуркам для будаўніцтва ідэальнай будучыні.

Міту «беларускага адраджэньня» падпарадкаваная лёгіка ўсяго тэксту. Ён мае сваё дыяхранічнае вымярэньне ў простым сэнсе, паколькі ўзьнікае з храналягічна разгорнутага экскурсу ў мінуўшчыну народу і ўяўляе сабой шматлінійную нарацыю, зь якой складаецца пасьлядоўная і закрытая сымбалічная сыстэма. Гэты міт прэтэндуе на статус найвышэйшай, прарочай і пазагістарычнай праўды, і Багушэвіч сьпярша канцэнтруе ўвагу на супярэчнасьцях і зьле сучаснасьці, далей пашырае свой погляд і ўлучае ў яго разам з сучаснасьцю мінуўшчыну, і нарэшце яшчэ больш расшырае свой погляд — уключае будучыню і тыя рашэньні, якіх яна вымагае, зыходзячы зь лёгікі нацыянальнага разьвіцьця. Гэтая прагрэсія складаецца ня з простай пасьлядоўнасьці часавых зрэзаў, яна прадугледжвае далейшае паглыбленьне, ускладненьне і ўнівэрсалізацыю мадэлі сьвету. Так узьнікае сымбалічны код, які пашырае «мінуўшчыну» і надае падзеям, якія яе складаюць, сымбалічны сэнс, які шматзначна ўплывае на будучыню і цяперашчыну. Дзякуючы гэтаму коду Багушэвіч факусуе ў выбраным кірунку калектыўную памяць і калектыўную надзею, злучае мінуўшчыну, цяперашчыну і будучыню і дае пазнаць «сьвятую праўду» пра ўтоенае калектыўнае наканаваньне і залаты век, які яшчэ вернецца. Ягоны міт нічога ня ўтойвае: яго функцыя палягае ў ссоўваньні ракурсу і ў зьмене гарызонту чаканьняў, а не ва ўтойваньні.

Такім чынам, прадстаўлены ў міце сьвет выходзіць за межы часу і канкрэтнай прасторы. Размыкаючы межы часу і прасторы, міталягічная структура ў Багушэвіча накладаецца на эмпірычнае ўспрыманьне месца і часу. Дзякуючы гэтаму адабраныя Багушэвічам часавыя і прасторавыя пункты становяцца асноваю прасьвятленьня, у якім спасьцігаецца ня што іншае, як сама сутнасьць міталягічна ўспрынятай Беларусі. Эмацыйнае напружаньне, сымболіка прасьвятленьня і міталягічнае размыканьне часу і прасторы паказваюць, што ў Багушэвічавым міце Беларусь — гэта не прастора, тэрыторыя альбо краіна, яна — стан душы, альбо, калі дакладней, экзыстэнцыйная катэгорыя ў цяперашнім часе, а ў будучыні, пасьля сваёй канчатковай рэалізацыі — форма нейкага ідэальнага грамадзтва.

Лёгіка гэтага міту вітае радыкальныя антытэзы. Адраджэньне Беларусі пастулюецца як унівэрсальная панацэя ад сацыяльнага зла, культурнай няроўнасьці і эканамічнай эксплёатацыі, як простая антытэза «нядолі». У гэтым сэнсе міт не аналізуе і не вырашае праблемаў, а выдае іх за ўжо прааналізаваныя і вырашаныя. Так міталягічныя вобразы надзяляюцца субстанцыянальнасьцю, разумеюцца як рэальна існуючыя.

Лёгіка міту, увасобленая ў гэтых радыкальных антытэзах, не пакідае сумневаў: калі не адраджаць Беларусі, то на яе зямлі будзе панаваць царства нядолі. Іншымі словамі, адраджэньне Беларусі патрабуе ад чальцоў нацыі ўзгадненьня сваёй актыўнасьці з гэтай велічнай мэтай.

Сілавое поле міту дазваляе Багушэвічу спалучаць два розныя стылі мысьленьня. Першы — гэта ўзьніклае толькі пасьля студзеньскага паўстаньня 1863 г. мысьленьне зь ягонай экстатычнай візіяй Беларусі, яе місіі і наканаваньня. Другі — гэта своеасаблівая сьвецкая рэлігія, рамантычны апатэоз народу, які разглядаецца цалкам пазагістарычна. Хаця цяперашняе паняцьце Беларусі замацавалася пасьля 1863 г., Багушэвіч і бясконцае мноства ягоных пасьлядоўнікаў выводзяць яе генэалёгію ня з прац пазытывісцка настроеных навукоўцаў, а з абстрактнага ўяўленьня пра яе як асобнага рэгіёну Вялікага Княства Літоўскага паў-

тысячагадовай даўніны. Гэта папулярна тлумачыць яе гісторыю, але нічога не гаворыць пра прычыны яе цяперашняга стану, бо міталягічная думка ня мае нічога супольнага з рацыянальным або навуковым мысьленьнем. З апошнім яна існуе паралельна, але ў эвалюцыйных адносінах ніяк яму не папярэднічае, яна не «пранавуковая» і не «прарацыянальная».

Так Беларусь становіцца абсалютнай, сакральнай і пазагістарычнай вартасьцю. Паколькі гэта стала мадэльлю Беларусі для амаль усёй далейшай беларускай гісторыі, гэты стыль можна назваць «мітатворчым». Для беларускай культуры ягоны зьмест заўсёды меў вялікае значэньне і стаў сьвятыняй для пэўнай групы людзей.

*Антыкаляніяльны контранаратыў.* Аргумэнты супраць расейскага імпэрскага дыскурсу, выстаўленыя Багушэвічам, можна абагульніць як сукупнасьць адмаўленьняў: адмаўленьне адзінай расейскай дзяржавы, якая ўлучае Беларусь, адмаўленьне прэтэнзіяў на існаваньне нейкай арганічнай расейскай нацыі, адмаўленьне аўтарытарных уяўленьняў аб беларускай культуры і мове, адмаўленьне легітымнасьці заваёвы і заняволеньня Беларусі, адмаўленьне ідэі, што саюз Беларусі з Расеяй добраахвотны і ўзаемавыгадны. Гэтыя аргумэнты ўказвалі, што расейская і беларуская ідэнтычнасьці могуць быць нятоесныя і несумяшчальныя.

Прастора ідэалягічнага сутыкненьня вызначалася праграмнай адмовай каланізаванага народу, голас якога ўвасабляў Багушэвіч, інтэгравацца ў імпэрскую сымбалічную прастору і ўдзельнічаць у асьветным праекце, распрацаваным паноўнай нацыяй. Багушэвіч адным зь першых паказвае беларусаў як удзельнікаў працэсу каланізацыі.

Калі ў імпэрскім дыскурсе «Беларусь зь сярэдзінай Расіі зьвязвае моцная ды жывая сувязь» (М. Каяловіч), то мадэль гістарычнага разьвіцьця Беларусі, сфармуляваная Багушэвічам, абсалютна чыстая ад «общерусскости». Беларуская гісторыя разгортваецца ў прасторы, дзе Расея ёсьць сілай нагэтулькі вонкавай, варожай і чужой, што яе можна пакінуць па-за разглядам. Яшчэ больш

выйгрышная была пазыцыя Багушэвіча што да нацыянальнай мовы. У той час, як імпэрскія ідэолягі прызнавалі за беларускай мовай статус сельскагаспадарчага «наречия», ён ня бачыць прынцыповай розьніцы паміж ёй і галоўнымі заходнеэўрапейскімі мовамі.

## ПРАДМОВА ДА «СМЫКА БЕЛАРУСКАГА»

*А праўду сказаў Бурачок у сваёй «Дудцы», што ўсе мы завём нашу мову «мужыцкай», і так — нічагусенька, як бы так і трэба! Здарывалася і мне чытаць ксёнжачкі, хоць ня надта старыя, друкаваныя навет, якогась пана Марцінкевіча, але ўсе як бы сьмеючыся з нашага брата пісаны; чытаў я і так перапісаныя вершыкі якогасьці Юркі «Панскае ігрышча», гдзе Юрка надта дзівуецца і як бы завідуе панам тым, каторыя, можа, і больш ад Юркі таго працуюць, толькі, ведама, вучоныя, дык лягчэй і спарней. Я перапісаў і сюды тое «Ігрышча», няхай выбачае пан Юрка, але, дальбог, аж злосьць узяла, што Юрка спадабаў тое, што толькі блазну можа спадабацца. Я тыкі і чыркнуў яму «Адказ», але так думаю, што гэта ён, сьмеючыся з нашага цёмнага брата, напісаў; гэтак думаў, што дурны мужык, дык ужо нічога і ня відзе, і ня знае! Ой памыліўся!*

*Не раўня я Бурачку, — ён лепей, можа, знае жыцьцё мужыцкае, больш, можа, відзеў і чуў; але так мне спадабаліся яго тыя вершы, што і я здумаў папрабаваць штоколь-*

*век напісаць. Ёсьць шмат друкованых песьняў нашага народу; пісаў іх Пачабут, Я. Тышкевіч, апісуючы наш Барысаўскі павет, і шмат хто сьпісываў іх, а шмат ёсьць і ня сьпісаных, але ўсе песьні тыя ня надта, каб сказаць праўду, харошыя, і нота наша плакучая, аднастайная, і песьняў васолых ня шмат, да і тых ужо рэдка пачуць. Надта за хлебам народ гоніцца, а хлеба дастане, дык і за крамнай вопраткай, і за ляксаванымі ботамі гоніцца, і ўсё маркоціцца. Даўней, кажуць, людзі, як меншым абходзіліся, то больш мелі і васалейшыя былі. Вот я і напісаў зь дзясятак песьняў «сякіх-такіх». Граю трошкі на скрыпачцы, ну дык няхай і мая ксёнжачка завецца струмантам якім; вот я і назваў яе «Смык». Смык ёсьць, а хтось скрыпку, можа, даробе, а там была «Дудка» — вот і мы зробім музыку як тыя жыдкі, што на цымбалах іграюць.*

*Шымон Рэўка з-пад Барысава*[1].

Як і прадмова да «Дудкі беларускай», прадмова да «Смыка беларускага» была паклікана служыць нацыянальным катэхізісам, які падае з нацыянальных пазыцыяў асноўныя зьвесткі з нацыянальнай гісторыі і культуры. Наратар Багушэвіча, на гэты раз Шымон Рэўка з-пад Барысава, літаральна зь першых радкоў прызнаецца ў сваёй заклапочанасьці станам роднай мовы («А праўду сказаў Бурачок у сваёй «Дудцы», што ўсе мы завём нашу мову «мужыцкай», і так — нічагусенька, як бы так і трэба!»). Далей ён дэкляруе вернасьць традыцыі, пачатай Мацяём Бурачком, робячыся, па сутнасьці, ягоным першым пасьлядоўнікам. Заключае прадмову заклік «не стаяць на месцы»: абменьвацца нацыянальнымі вартасьцямі.

[1] Багушэвіч Ф. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. С. 65.

Багушэвіч застаўся верны сваёй інтэнцыі: на схіле жыцьця ён падрыхтаваў да друку кнігу вершаў «Скрыпачка беларуская», друк якой, аднак, забараніла царская цэнзура. Традыцыя, тым ня менш, не перарвалася: у 1906 г. быў апублікаваны аднайменны паэтычны зборнік А. Пашкевіч-Цёткі.

*Дыскурс этнаграфіі і фальклёру.* Адсутнасьць згадак аб этнаграфічных асаблівасьцях беларусаў у прадмове да «Дудкі беларускай» была, верагодна, сьвядомым рашэньнем Багушэвіча. Гэты дыскурс быў агромністы і патрабаваў свайго спэцыяльнага разгортваньня. Багушэвіч акцэнтуе ўвагу на беларускай песьні, зьвязваючы яе з этнаграфічнымі дасьледаваньнямі. Песьня падкрэсьлівае нацыянальную своеасаблівасьць, паколькі яна разам з унікальнай гісторыяй, доляй і мовай адлюстроўвае нацыянальны дух і ўвасабляе нацыянальную індывідуальнасьць. Калі масы авалодваюць пачуцьцём гонару за нацыянальны фальклёр, справа канструяваньня нацыянальнай сьвядомасьці падыходзіць да канца.

*Сымуляцыя традыцыі.* Багушэвічу надзвычай важна паказаць, што зьяўленьне Беларусі — гэта ня проста нараджэньне *ex nihilo* новай парадыгмы, але кульмінацыя прыгнечанай, адпрэчанай і ўсёткі магутнай традыцыі. Ён схільны ўспрымаць польскую традыцыю як нацыянальную. У папярэдняй прадмове словы «Вітэнэс», «Дынабург» падкрэсьлівалі адданасьць аўтара польскімі гістарычным наратывам, хоць касьцяк уяўленьняў пра Беларусь і яе гісторыю быў відавочна расейскага паходжаньня. Дзеля гэтага бессэнсоўна разьбірацца, пад уплывам якіх польскіх гісторыкаў знаходзіўся Багушэвіч, распрацоўваючы сваё бачаньне беларускай гісторыі.

Багушэвіч настойвае, што да творчасьці яго схілілі працы польскіх навукоўцаў — асьветніка, прафэсара Віленскага ўнівэрсытэту Марціна Пачабута-Адляніцкага (1728—1810) і этнографа, аўтара кнігі на польскай мове «Апісаньне Барысаўскага павету» (Вільня, 1847) Яўстаха Тышкевіча (1814—1873). Спасылка на іх мае сымбалічнае значэньне — працы гэтых навукоўцаў акрэсьліваюць нейкую перададраджэнскую фазу беларускай гісторыі. Без сумневу, гэтая аўтарская рэканструкцыя традыцыі ёсьць гранічна ідэалягізаванай і тэндэнцыйнай.

*Ідэалягічны канфлікт з ранейшай літаратурнай традыцыяй.* У апошнія дзесяцігодзьдзі XIX ст. сытуацыя зьмянілася: цяпер, калі імпэрская ўлада ўцягнула беларусаў у працэс пабудовы «вялікай расейскай нацыі», погляды Дуніна-Марцінкевіча альбо Ф. Тапчэўскага («Юркі») на беларускую справу служаць апраўдань-

ню імпэрскага панаваньня. Захаваньне за беларускай культурай яе традыцыйнага статусу пасіўнай і архаічнай культуры, няздольнай ствараць сугучныя эпосе культурныя вартасьці, робіць беларускі народ безабаронным перад русіфікацыяй. Багушэвіч паказвае, што каляніяльнае ўспрыманьне беларускай культуры як узору некранутай прагрэсам і эўрапейскай цывілізацыяй культуры, як чагосьці непаўнавартага, годнага толькі насьмешкі, у цяперашніх умовах недапушчальнае. «Сублітаратурны падыход» да беларускай літаратуры павінен быць адкінуты, як і творчасьць на беларускай мове ў заніжаных стылях і нізкіх, травэстыйных жанрах.

Гэтая крытыка Багушэвічам Дуніна-Марцінкевічам, якая мела важнае культурнае значэньне і важныя ідэалягічныя інсьпірацыі, пасьля А. Бабарэкі атрымала вульгарную трактоўку. Згодна з Бабарэкам, калі Дунін-Марцінкевіч пісаў з дыдактычнымі мэтамі, дык Багушэвіч зьвярнуўся да больш строгіх нацыянальных нарацыяў і сваёй творчасьцю прапаведаваў ідэалы, накіраваныя на фармаваньне нацыянальнай сьвядомасьці:

> *Для яго [Багушэвіча] ідэальным ёсьць тое слова, каторае здольна несьці на сабе функцыю захаваньня нацыянальнага аблічча ад немінучай гібелі, надыход якое для свайго стану ён так востра адчуваў. Таму Багушэвіч адмаўляе ідэальнасьць у Марцінкевічавым павучальным слове. Для яго ідэальным зьяўляецца слова, якое выконвае функцыі ўсьведамленьня сябе, як падлеглае нацыі*[2].

Пазьней гэты эстэтычны, культурны і ідэалягічны канфлікт доўга асэнсоўваўся ў вульгарна марксісцкім рэчышчы як сутыкненьне «клясава аднародных» пісьменьнікаў, дыстанцыя паміж якімі ўзьнікла дзеля таго, што адзін схіляўся да сацыяльнай тэ-

[2] Бабарэка А. Узвышэнская паэзія (аналіз паняцьця) // Узвышша. 1929. № 6. С. 90—91.

матыкі, а другі — да фальклёрных стылізацыяў[3]. Прычына праграмнага непрыняцьця Багушэвічам творчасьці Дуніна-Марцінкевіча ўгледжвалася нават у тым, што першы стаяў бліжэй да народу і карыстаўся выключна рэалістычным мастацкім стылем[4].

Нарэшце былі спробы вытлумачыць гэтае непрыняцьце як header нематываваны эстэтычна альбо ідэалягічна капрыз Багушэвіча і парушэньне прынцыпу гістарызму:

> *...Прызнаньне да Дуніна-Марцінкевіча прыйшло не адразу. Успомнім Ф. Багушэвіча зь яго крыўдай, што творы Дуніна-Марцінкевіча напісаныя, «як бы сьмеючыся з нашага брата». Несправядлівая была нярэдка да беларускага дудара і нашаніўская крытыка. Справа ў тым, што пры ацэнцы спадчыны Дуніна-Марцінкевіча парушаўся прынцып гістарызму*[5].

Прычыны гэтага канфлікту былі куды глыбейшыя. Для Дуніна-Марцінкевіча, творчасьць якога, кажучы словамі А. Цьвікевіча,

---

[3] Да фальклёру часта зьвярталіся і іншыя беларускія пісьменьнікі, у прыватнасьці, В. Дунін-Марцінкевіч. Але Багушэвіч ня проста працягваў гэтую традыцыю. Ён у адпаведнасьці са сваімі поглядамі на жыцьцё, са сваім творчым мэтадам зьвярнуўся да новых крыніц народнай творчасьці. Не пабытовыя ці абрадавыя, як у Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, а сацыяльныя сюжэты і матывы пераважна цікавяць яго.

Лазарук М. Прысяжны паверaны праўды // Полымя. 1978. № 1. С. 237.

[4] *Пану* Марцінкевічу супрацьпастаўлены *Мацей Бурачок*; чульлівасьці з выпадку гаротнага жыцьця сялянства, спагадзе мужыку, ідылічнасьці погляду на народнае жыцьцё проста як на літаратурны матэрыял супрацьпастаўлены самы бязьлітасны рэалізм, дух няскоранасьці і пратэсту, нечуванае па сацыяльнай і мастацкай сьмеласьці зьліцьцё аўтарскага «я» з народным поглядам на рэчы, на сьвет, на становішча і месца працаўніка ў ім — тое месца, якое належыць цяпер і тое, якое пасапраўднаму павінна належаць.

Стральцоў М. Дудар беларускі // Маладосць. 1965. № 3. С. 130.

[5] Кісялёў Генадзь. Героі і музы. Гісторыка-літаратурныя нарысы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1982. С. 12.

«была занадта моцна прасякнута польскім зьместам... мела сваёй крыніцай сантымэнтальна-панскую альбо ў лепшым выпадку навукова-этнаграфічную зацікаўленасьць да Беларусі як аднэй з польскіх правінцый»[6], беларуская культура была «нізкай» культурай, а літаратурная творчасьць на беларускай мове патрабавала заніжанай паэтычнай стылістыкі. Для Багушэвіча яна была культурай паўнавартаснай, аксіялягічна нэўтральнай. Падобны канфлікт ва ўкраінскай літаратуры першай паловы XIX ст. апісаў украінскі філёзаф і гісторык літаратуры Д. Чыжэўскі. Згодна зь ім, нешматлікая колькасьцю прафэсійных літаратараў і аб'ёмам створаных імі літаратурных твораў літаратура на ўкраінскай мове да 1825 г. пісалася ў травэстыйных жанрах. Новае пакаленьне ўкраінскіх пісьменьнікаў, захопленае рамантычнымі ідэаламі і заклапочанае адраджэньнем нацыі, адчувала адчужэньне да такой літаратуры. Украінскія рамантыкі не без падставаў бачылі ў ёй насьмешку з народу, народнай паэзіі і ўкраінскай мовы. І дзякуючы іх літаратурнай творчасьці гэтую насьмешку з «украінскага правінцыяналізму» патрапілі замяніць модай на ўсё ўкраінскае[7].

Нарэшце, выпад на адрас Дуніна-Марцінкевіча (кніжкі якога «ўсе як бы сьмеючыся з нашага брата пісаны») збліжае гэты тэкст Багушэвіча з другой прадмовай Шаўчэнкі да «Кабзара», дзе «Энэіда» Катлярэўскага акрэсьлівалася як «сміховина на московський шталт»[8].

*Вонкавая нарацыя*. І першую і другую паэтычную кнігу Багушэвіч не наважыўся падпісаць уласным імем. Іншымі словамі, фундамэнтальнае адрозьненьне Багушэвіча ад украінскіх рамантыкаў Шаўчэнкі альбо Куліша палягае ў тым, што ён карыстаўся

---

[6] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 54.

[7] Чижевський Д. Історія української літератури. Від початків до доби реалізму. Тернопиль: МПП Презент, 1994. С. 363.

[8] Тыпалягічны эквівалент Ф. Багушэвіча ва ўкраінскай літаратуры сярэдзіны XIX ст. — «захоплены ідэалёгіяй рамантызму малады пісьменьнік», напрыклад, П. Куліш, пра якога адзін з крытыкаў пісаў: «І трэба было зьявіцца Кулішу, каб... спрыяць заняпаду пацяшальнай «сьмехавой» традыцыі і нараджэньню рэалістыч-

літаратурнымі псэўданімамі, пакліканымі схаваць сваю сапраўдную ідэнтычнасьць. Ва ўкраінскай літаратуры за псэўданімы чапляліся пісьменьнікі найперш ранейшага, «катлярэўскага» тыпу, для якіх яны выконвалі псыхалягічна важную ролю «маскі-шчыта», якая дае аўтару магчымасьць выкарыстоўваць парадыйна-падрыўную ўстаноўку, высьмейваць «чужога» і падкрэсьліваць уласную своеасаблівасьць. Такая маска давала таксама магчымасьць выказаць праўду, якая ў той час не дазвалялася ў выглядзе простага аўтарскага тэксту[9].

У такіх наратараў адсутнічае аўтабіяграфізм, дакладней, ён роблены і фікцыйны ад пачатку і да канца. З гэтай прычыны «катлярэўшчына» хоць і аддзяляе найноўшую ўкраінскую літаратуру ад ранейшага этапу, але інтэрпрэтуецца як прыклад мастацкага стылю, уласьцівага данацыянальнаму этапу ўкраінскай нацыянальнай сьвядомасьці.

Факт, што Багушэвіч выкарыстоўваў уяўных наратараў у якасьці такой маскі, спараджаў ягоную ацэнку як польскага нацыяналіста, які ўжываў беларускую мову з утылітарнымі мэтамі і хаваў такім чынам сваю сапраўдную польскую ідэнтычнасьць. Згодна з гэтай трактоўкай, псэўданімы прадугледжвалі дыстанцыю і інтэлектуальны кантроль і не дазваляюць клясыфікаваць Багушэвіча як носьбіта беларускай ідэнтычнасьці, а ягоны паэтычны сьвет успрымаць як рэальны і беспасярэдні. Пры гэтым выкоўзвалася з-пад увагі тое, што Багушэвіч сам недвухсэнсоўна падкрэсьліваў умоўнасьць гэтай маскі-тарчы, карыстаючыся ёй знарочыста неахайна. Наратар «Смыка беларускага», Шымон Рэўка з-пад Барысава, як вынікае зь вершу «Свая зямля», жыве... у вёсцы Селявічы каля Слоніма (за пару соцень кілямэтраў ад Барысава) і езьдзіць «у Гродну пад самы Рок Новы».

нага (? — Аўт.) адлюстраваньня Ўкраіны ў расійскай і ўкраінскай літаратуры».
Романченко І. Куліш — біограф і критик Гоголя. Ромни, 1943. С. 4—5.

[9] Пар. Грабович Г. До історії української літератури. Дослідження, есеї, полеміка. К.: Критика, 2003. С. 300.

# УВОДЗІНЫ Ў ПАЭЗІЮ БАГУШЭВІЧА

*Рамантычныя структуры.* Загалоўныя вершы абодвух зборнікаў Багушэвіча прасякнуты музычнай сымболікай і пачынаюцца энэргічнымі заклікамі да музыкаваньня:

*Эх, скручу я дудку!*
*Такое зайграю,*
*Што ўсім будзе чутка*
*Ад краю да краю!*[1]

***

*Ой, дайце ж мне смык,*
*Каб усюды граў!*
*Хоць бы сам я зьнік,*
*Абы голас даў...*[2]

У крытыцы выказвалася думка, што ў паэзіі Багушэвіча «пачатковымі мэтафарамі зьяўляюцца ўжо назвы вершаў, паколькі дудка — гэта ня проста музычны інструмэнт, а сымбаль мастацкай творчасьці, гэтак жа як і смык, і названая ў «Маёй дудцы» жалейка»[3].

Гэтая думка патрабуе ўдакладненьня.

Музычная сымболіка, альбо, іначай, катэгорыя музычнага, мае

[1] Багушэвіч Ф. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. С. 18.

[2] Тамсама. С. 66.

[3] Тарэлкіна Н.В. Станаўленне стылю Францішка Багушэвіча // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1984. № 4. С. 87.

ў творчасьці Багушэвіча відавочна рамантычныя інсьпірацыі. Філёзафы і пісьменьнікі часоў рамантызму падкрэсьлівалі значэньне музыкі ў сыстэме жанраў мастацтва. Для Ф. Шлегеля музыка была «мастацтвам гэтага стагодзьдзя», а на думку Гегеля музыка дзякуючы сваім іманэнтным уласьцівасьцям дасягнула «статусу найвышэйшай абстракцыі ўнутранай самасьці і адначасова найбольшай унівэрсальнасьці»[4].

Дасьледаваньні, прысьвечаныя эстэтыцы рамантычнай творчасьці, дазваляюць з поўным правам далучыць катэгорыю «музычнага» да асноўнай парадыгмы рамантычнай паэтыкі. Яна ня толькі ўстанаўляе палажэньне мастацкага суб'екта, але адначасова вызначае мадэль арганізацыі паэтычнага тэксту[5].

Пад уплывам эстэтыкі рамантызму Багушэвіч мысьліць горад як месца зла і маральнай дэградацыі. Возьмем, напрыклад, верш Багушэвіча «Немец»:

*Не люблю я места (па-расейску — горад).*
*Надта там цяснота і вялікі смурод.*
*А паноў як маку ды сярод гароду,*
*Апроч таго пропасьць рознага народу!*[6]

---

[4] Цыт. пав.: Naumann B. Musikalisches Ideen-Instrument. Das Musikalische in Poetik und Sprachtheorie der Frühromantik. Stuttgart: Metzler, 1990. S. 55.

[5] Lubkoll Christine. Mythos Musik. Poetische Entwürfe des Musikalischen in der Literatur um 1800. Rombach Wissenschaften. Reihe Litterae, Bd., 32. Freiburg i. Br., 1995. S. 163.

[6] Багушэвіч Ф. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. С. 32.

Падобная ўстаноўка была ўласьцівая і ўкраінскім рамантыкам. Напрыклад, незадавальненьне расейскім дэспатызмам у аўтара «хутарскай філязофіі» Куліша набывала ня столькі палітычны, колькі маральна-філязофскі характар. Пасьля разгрому Кірыла-Мяфодзіеўскага брацтва Куліш прапаведаваў «хутаранства» як панацэю ад усіх нягод гарадзкога жыцьця. Непрыняцьце палітыкі ў Куліша канвэртавалася ва ўцёкі ад гарадзкой цывілізацыі на «простую прыроду».

Горад — гэта складаны сэміятычны мэханізм, генэратар культуры, які ўяўляе сабой кацёл тэкстаў і кодаў, разнаякасных і гетэрагенных, прыналежных да розных моваў і розных узроўняў. Горад задае пэўную граматыку сацыяльных дачыненьняў, вызначае разьмеркаваньне асноўных сацыяльных функцыяў і роляў, фармуе сыстэму нормаў, якія вызначаюць лад жыцьця і паводзінаў розных пластоў гарадзкога насельніцтва. Як сьцьвярджаў Маркс, уся найноўшая гісторыя — гэта пранікненьне гарадзкіх адносінаў у вёску, у той час як у старавечным сьвеце, наадварот, адбывалася пранікненьне сельскіх адносінаў у горад[7].

Акурат прынцыповы сэміятычны поліглятызм кожнага гораду робіць яго полем разнастайных і ў іншых умовах немагчымых сэміятычных калізіяў. Рэалізуючы стыкоўку разнастайных нацыянальных, сацыяльных, стылёвых кодаў і тэкстаў, горад зьдзяйсьняе разнастайныя гібрыдызацыі, перакадаваньні, сэміятычныя пераклады, што ператварае яго ў магутны генэратар новай інфармацыі[8].

Горад — месца народзінаў нацыі (Ёрг Бабяроўскі). У горадзе рэалізоўваюцца разнастайныя сацыяльныя разьмежаваньні, неактуальныя па-за яго межамі. Акурат гарадзкая прастора дае досьвед дыфэрэнцыяцыі, зь якога нараджаецца супольнае пачуцьцё згуртаванасьці.

Бунт супраць гораду азначае бунт супраць існай сацыяльнай сыстэмы (горад — частка грамадзтва, жыцьцё ў горадзе прадугледжвае валоданьне суцэльнай сыстэмай сацыяльнай веды). Гэты рамантычны патас Багушэвіч агрубляе наіўным біяграфізмам, а таксама надзяляе свайго наратара поўнай адсутнасьцю іроніі і адстароненасьці ды зьмешвае антыўрбанізм з антыфэмінізмам:

*А што ценкія паненкі,*
*А высокі у іх зад,*

---

[7] Маркс К. Экономические рукописи 1857—1861 годов // Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2-е изд. Т. 46. Ч. 1. Москва: Политиздат, 1968. С. 470.

[8] Лотман Ю. Избранные статьи в трёх томах. Том II. Статьи по истории русской литературы XVIII — первой половины XIX века. Таллинн, 1992. С. 13—14.

*Ото ж розум у іх ценкі,*
*Дык і выйшаў такі склад*[9].

Сьвету гарадзкой цывілізацыі было ўласьцівае іншае ўспрыманьне жаночай прыгажосьці, і рустыкальны эстэтычны ідэал нататара Багушэвіча ўступае зь ім у канфлікт. Пачаткі асэнсаваньня гэтага канфлікту мы знаходзім яшчэ ў М. Пятуховіча, які беспадстаўна атаесамляў Багушэвіча зь ягоным наратарам: «*Das ewig weibliche*, адвечна жаноцкае, адсутнічае ў гэтай творчасьці. Багушэвіч — гэта беларускі Стрынбэрг. Жанчына для яго — гэта не прадмет усхваленьня, але аб'ект досыць жоўчнай сатыры»[10].

Гэтае неабгрунтаванае збліжэньне было ўласьціва і для мысьленьня А. Станкевіча: «І рэч дзіўная — Багушэвіч так праняты горам народу, што струн яго ліры не кранулі ані краса прыроды, ані чары жаночага каханьня»[11].

Абарот «высокі у іх зад» апісвае элемэнт эўрапейскай дамскай моды канца XIX ст. — турнюры. Мацей Бурачок рэагуе на «чужое» ў жанчынах (моду) як адзнаку «ценкага розуму». Ягонае бачаньне гарадзкой цывілізацыі тут не «антыэратычнае», але акурат «антыфэмінісцкае», бо фэмінізм — прадукт мадэрнізацыі і ўрбаністычнай цывілізацыі.

Так стылізацыя і фікцыйнасьць наратара, выражаная ў адсутнасьці лібідальнай энэргіі і гендэрнай амбівалентнасьці, дасягае свайго піку і максымальна аддаляе яго ад аўтарскага «я». Ператвараючы Мацея Бурачка ў бесьцялеснага духа, чыста віртуальную постаць, але не рэальнага чалавека з полам, аўтар змушае нас глядзець на яго як на інфантыльную істоту.

---

[9] Багушэвіч Ф. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. С. 90.

[10] Піотуховіч М.М. Нарысы гісторыі беларускай літаратуры. Частка першая. Агляд літаратурна-ідэолёгічных плыняў XIX і пачатку XX ст. Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928. С. 101—102.

[11] Stankiewič A. Franciš Bahušewič. Jaho žyćcio i tworčaść. U tryccatyja ŭhodki śmierci (1900—1930). Wilnia, 1930. S. 43.

Момант антыфэмінізму прыкрывае ня так боязь перад сэксуальнасьцю, як яшчэ глыбейшую боязь перад гарадзкой рэчаіснасьцю. (Характэрна, што фатальныя прыгоды Мацея Бурачка ў вершы «Як праўды шукаюць» пачынаюцца зь ягонага падарожжа да сына, які — як падкрэсьліваецца — жыве ў Вільні.)

Зь іншага боку, мэтадам агрубленьня дасягаецца публічная праява новай аўтаномнай ідэнтычнасьці. Антыфэмінізм разам з панурым тонам узмацняюць гэты эфэкт і паказваюць, што разьвіцьцё новай беларускай ідэнтычнасьці зьвязана з парушэньнем умоўнасьцяў гарадзкога сьвецкага грамадзтва: мова і манеры наратара нагэтулькі грубыя, што мяжуюць зь непавагай да імпэрскай улады, кансэрватыўных вартасьцяў і герархіі. Узятыя разам, яны прадстаўляюць яшчэ адно «Іншае» — праз нэгатыўнае супрацьпастаўленьне ім беларус набывае пачуцьцё сваёй ідэнтычнасьці.

Паэзія Багушэвіча таксама прасякнутая рамантычнай сымболікай крызісу і канфлікту. Прасторай крызісу ёсьць як усё грамадзтва, так і індывідуальнасьць наратара, што выражаецца ў ягонай негатоўнасьці існаваць у навязанай сацыяльнай рэчаіснасьці па-за комплексамі традыцыйных сацыяльных сувязяў і дачыненьняў. Наратару ўласьцівыя настроі разгубленасьці і страты пачуцьця супольнасьці:

*Ой, раняць і ногі, і сэрца*
*У сэрцы нянавісьць, злосьць родзяць,*
*Дзяржаць у тваёй паняверцы,*
*Да здрады вядуць, ад праўды адводзяць*[12].

Вось жа, перад намі разгортваецца ўласьцівы для эстэтыкі рамантызму каштоўнасны канфлікт, які закранае асобу і грамадзтва. Багушэвіч, як да яго Шаўчэнка альбо Славацкі, у

[12] Багушэвіч Ф. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. С. 87.

сэрцы апісанага ім сьвету бачыць глыбокую і ўсёабсяжную дысгармонію і канфлікт. Гэтае паняцьце ўлучае ня проста рэальную дынамічную барацьбу паміж двума бакамі, але больш шырокую апазыцыю, супярэчнасьць, што абумоўлівае ненармальны стан быцьця. Яно выяўляецца на трох узроўнях: на ўзроўні асобнага героя і яго долі, на ўзроўні сям'і, базавай адзінкі грамадзкай арганізацыі, а таксама на ўзроўні сацыяльнага макракосму з акцэнтам на дынаміцы і ўнутраных памкненьнях усяго грамадзтва.

Хаця канфлікт, як назірае Багушэвіч, мае шмат узроўняў і шмат абліччаў, ён спароджаны адной важнай прычынай — зьнішчэньнем першапачатнага ідэальнага ладу (што падкрэсьлівае мэтафорыка зьніклай «праўды»), аднаўленьне якога, як вынікае з прадмоваў, у цяперашніх умовах магчыма адно ў форме адраджэньня Беларусі. Гэты лад жыцьця праяўляецца ў вобразах ідэальнай роўнасьці, ідэальнага чалавечага грамадзтва і, уласна, служыць крытэрам Багушэвічавага міталягічнага ўспрыманьня Беларусі. У сваю чаргу, уяўленьне як аб ідэальным чалавечым грамадзтве, так і аб яго супрацьлегласьці выклікана ўласьцівай рамантыкам ідэяй распаду сьвету на дабро і зло[13].

Наратар Багушэвіча перабывае ў нясьцерпным чаканьні нейкіх якасных зьменаў, якія могуць пахіснуць існуючы лад і прывесьці да ўзьнікненьня нейкага ідэальнага грамадзтва, што ня зводзіцца да элемэнтаў новых прадукцыйных дачыненьняў і гарадзкога ладу жыцьця. Пры гэтым у наратара Багушэвіча адсутнічаюць простыя заклікі да зьмены адвечных культурных і сацыяльных дачыненьняў, што лішні раз паказвае на сувязь з ідэальным грамадзтвам. Іншымі словамі, сучасная Беларусь разарваная канфліктам паміж бясьсільлем заняволеных сялян і зьнядоленых байструкоў і разбэшчаным ладам амаральнай аўтарытарнай улады. Канфлікт здымаецца з дапамогай выбудовы

[13] Грабович Григорій. Поет як міфотворець. Семантика символив у творчості Шевченка. Київ: Критика, 1998. С. 78.

міталягічных структураў і спадзяваньня на тое, што ідэальнае грамадзтва паўстане само сабой, у выніку натуральнай хады гісторыі.

Герой — гэта ахвяра сваволі і гвалту (адзін зь вершаў «Смыка беларускага» так і называецца — «Ахвяра»). Аднак, дзякуючы татальнасьці траўмы, нанесенай сацыяльнай структурай, і далейшаму адчужэньню і пакутам, становіцца ясна, што ён прадстаўляе нешта большае, чым простае «я»: адбываецца атаесамленьне героя і ягонай бацькаўшчыны. Абое пакутуюць і абодва тым самым дасягаюць сьвятасьці; у канцавым выніку ён становіцца Беларусяй. Сама пакута ўзьнікае ня толькі ў выніку ўціску «чужога», а таксама дзякуючы асаблівай пачуцьцёвасьці, выражанай у здольнасьці бачыць праўду і не прымаць ідэалягічных забабонаў свайго часу (афіцыйную царкву, «отечество», веру ў перавагу «цывілізацыі» над «цёмным людам»), быць адчувальным да людзкой крыўды, фальшу і злосьці. Блізінёй да тагабочнай рэальнасьці дасягалася пранікнёнасьць паэтычнага слова. Набліжаючыся да сьвятасьці, чытач дасягаў прасьвятленьня.

Тая акалічнасьць, што доля наратара знаходзіцца ва ўладзе нейкіх вышэйшых сілаў, за што ён расплачваецца ўласным пакліканьнем, збліжае яго з аўтарам. Гэты адваротны бок паэзіі, таленту як кары альбо праклёну — матыў паэзіі Багушэвіча; ён яшчэ раз выяўляе глыбокую псыхааналітычную ісьціну: сіляць з глыбокага калектыўнага несьвядомага — непазьбежна значыць ссоўваць цэльную структуру свайго «я».

Канфлікт вартасьцяў — ключавы элемэнт для разуменьня пазыцыі наратара, які ні ў якім разе ня ёсьць праекцыяй «селяніна-беларуса», але самога аўтара, калі не самой Беларусі. Гэты канфлікт пераламляецца ў выглядзе барацьбы сілаў дабра і зла, праўды і крыўды. Трэці па парадку верш у «Дудцы беларускай» называецца «Як праўды шукаюць»:

*Як простая праўда згінула ў сьвеце,*
*Дык праўды із сьвечкай шукаюць,*

*І золатам маняць, і людзей склікаюць,*
*І Бога цалуюць, — а ўсё-такі прэце...*[14]

«Праўда», дарма што яна тут выступае з вызначэньнем «простая», сымбалізуе шырокі спэктар пераўжываньняў ад рамантычнага расчараваньня ў хрысьціянскім веравучэньні да боязі перад пераходам беларускай культуры ў нэгатыўную якасьць, ад статычнага тыпу адтварэньня, які забясьпечваў просты *status quo* культуры, да дэструкцыйнага тыпу, які ў канцавым выніку вядзе да ейнага зьнікненьня.

Пастаянна прысутныя пачуцьці самаізаляцыі, зьняверанасьці і разгубленасьці, страты сэнсу жыцьця і разбурэньня культурнай карціны сьвету таксама маюць відавочна рамантычную генэзу. Эмацыйная гама творчасьці Багушэвіча падкрэсьлена змрочная. Яна не мяняецца нават тады, калі ў жыцьці адбываюцца падзеі зь яскрава дадатным сэнсам:

*Як я толькі нарадзіўся —*
*Бацька сказаў: «Кепска будзе!»*
*Ну дык жа ж не памыліўся:*
*Зьдзеквалісь Бог і людзе*[15].

Вынікам перажываньня крызісу была канфрантацыя і канфлікт з навакольнай рэчаіснасьцю. Сацыяльная рэчаіснасьць з такога гледзішча падаецца сатканай з мноства супярэчнасьцяў. Гэтыя церці з рэчаіснасьцю для наратара Багушэвіча маюць экзыстэнцыйны вымер. У пэўным сэнсе ягоны сацыяльны досьвед зводзіцца да блуканьняў паміж жыцьцём і сьмерцю. Іхні апагей мы бачым у вершы «Быў у чысцы!», дзе развагі наратара аб новым сацыяльным ладзе прыводзяць яго нацянькі ў чысьцец.

---

[14] Багушэвіч Ф. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. С. 22.

[15] Тамсама. С. 48.

Дэстабілізацыю сацыяльнай рэчаіснасьці падкрэсьлівае ня толькі каштоўнасны крызіс, але і ламаньне эканамічных стасункаў. У вёсцы павялічваецца ціск імпэрскай бюракратыі — на гаспадарчую сцэну выходзяць новыя эканамічныя агенты: пасярэднікі, асэсары і г.д. Самі сяляне таксама мяняюць свой статус, калі становяцца «часова абавязанымі» арандатарамі. Некаторыя зь іх пачынаюць узаемадзейнічаць з крэдытнымі ўстановамі.

Менавіта каштоўнасны крызіс правакуе выбухі агрэсіі і варожасьці, іх адрасатамі найчасьцей становяцца носьбіты іншай культуры, якія дзякуючы свайму культурнаму капіталу здолелі адаптавацца да новых сацыяльных, а разам зь імі і эканамічных рэаліяў:

*То, брат, панскія задушкі:*
*Усё праелі, прапілі,*
*Цяпер жыдам ідуць у служкі*
*І нас цягнуць, каб ішлі*[16].

Несуладнасьць паміж наратарам і ягоным жыцьцёвым сьветам выражаецца, у прыватнасьці, у разбурэньні сям'і:

*Маіх шэсьць сыночкаў — здаецца, ці мала?*
*Усе разыйшліся! — Адзін у наборы,*
*Адзін пайшоў прочкі, за чорныя моры,*
*Адзін за Дунаем заўсім асядліўся,*
*Адзін у Сібіры — з старшынёй пабіўся;*
*Пяты на пісарстве гдзесь у Патарбурку,*
*Кінулі у хаце вот крывога Юрку!..*[17]

За пачуцьцём дысгармоніі стаіць перажываньне дэгуманізацыі грамадзтва. Яна закранула ня толькі звычныя культурныя вар-

[16] Тамсама. С. 90.

[17] Тамсама. С. 35.

тасьці, але і сацыяльна значэнныя мэтавыя ўстаноўкі, арыенціры будзённага жыцьця. Ранейшая этыка адкідаецца на карысьць навязанай дзяржавай сыстэмы праўных дачыненьняў. Для рэгуляцыі сацыяльнага жыцьця ўсё большую ролю пачынае адыгрываць дзяржаўны апарат і ягоныя функцыянэры (у тэрміналёгіі Багушэвіча «ўраднік», «соцкі», «аконам»).

Несуладнасьць, дыскамфорт, канфлікт і канфрантацыя спараджаюць трагічнае стаўленьне да рэчаіснасьці, якое ў дадзеным кантэксьце ёсьць элемэнтам рамантычнай эстэтыкі. Выходзячы за рамкі канкрэтнага сацыяльнага канфлікту і становячыся прынцыпам разуменьня і ацэнкі рэчаіснасьці, варожай ідэалу людзкасьці і прыгажосьці, трагічнае накладае зыркі адбітак на сьветапогляд наратара, на яго маральна-этычную пазыцыю, ператвараецца ва ўстойлівы матыў паэтычнай нарацыі[18].

Пастаянна прысутнае ў паэзіі Багушэвіча пачуцьцё дысгармоніі толькі ўзмацняецца пры «лабавым» сутыкненьні наратара з вонкавай рэчаіснасьцю. Практычна любое сутыкненьне зь ёй абарочваецца ў лепшым выпадку каскадам непрыемнасьцяў, а ў горшым — асабістай трагедыяй. Так, напрыклад, за спробу «бічыскам» падняць ўпалую на ногі кабылу (верш «Скацінная апека») наратара аддаюць пад суд, які прызначае пакараньне, несувымернае з маштабам праступку. Ці ўзяць верш «У астрозе» — наратар трапляе за краты дзеля фармальнага абвінавачаньня ў псаваньні межавога знаку — «калка на капцы», «гнілога, як бурак». Падобны сюжэт распрацоўваецца і ў вершы «Як праўды шукаюць» — наратар, паехаўшы «ў Вільню адведаць сынка», выпадкова становіцца сьведкам аднаго злачынства, за што яго ў рэшце рэшт кінуць за краты:

*І ня сеяў, ня жаў, не касіў сенажаць,*
*У арэнду аддаў, бо ня мог дадзяржаць.*

---

[18] Гл. Заркова Г.Л. Праблема трагічнага ў эстэтыцы Ф. Багушэвіча // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1988. № 1. С. 35.

*І што меў, то прадаў, пераеў,*
*Па судах агалеў, як шэсьць разы згарэў;*
*І ў казе адсядзеў нядзель шэсьць,*
*За няўку плаціў, можа, трэйчы і штраф*[19].

Акурат тут, у абсягу права, Багушэвіч праводзіць культурную мяжу, якая аддзяляе ягоных наратараў, зь іх праўнай сьвядомасьцю, разьвітай Літоўскім статутам і працяглым быцьцём іх зьніклай дзяржавы ў праўнай эўрапейскай прасторы, і карумпаваную, бяздушную расейскую бюракратыю, якая рэалізуе на практыцы якасна іншае паняцьце права, пазычанае з усходніх дэспатыяў. Рэгулярнае, цынічнае і бесцырымоннае парушэньне права — ляйтматыў творчасьці Багушэвіча («У судзе», «У астрозе», «Кепска будзе», «Скацінная апека» etc.). Наратар Багушэвіча пастаянна перажывае сацыяльныя канфлікты ў выніку парушэньня ўладай права, якое вызначае ягонае сацыяльнае жыцьцё. (У гэтым пункце Багушэвіча можна параўнаць з Гогалем — і першага і другога не пакідала адчуваньне іншароднасьці расейскага права.)

Так уладныя структуры зь іх законамі і сацыяльная герархія ў Багушэвіча пачынаюць увасабляць царства зла. Яго можна вызначыць як сьвет улады і рангаў, сваволі і ўціску, і аніводзін з гэтых момантаў ніколі не атрымаў у Багушэвіча нават нэўтральнай, ня тое што пазытыўнай ацэнкі.

Багушэвіч пазьбягае гаварыць пра найвышэйшы ўзровень гэтай сацыяльнай структуры, увасоблены ў дэспатызьме імпэрскай аўтакратыі. Яго цікавіць больш канкрэтны і беспасярэдні ўзровень: дэспатызм мясцовага судзьдзі, бюракрата альбо пана, а таксама інстытуцыяналізаваная сыстэма эксплёатацыі і прыгнёту — эканамічнага, палітычнага, маральнага і праўнага, якую Багушэвіч бачыў вакол сябе паўсюль. Выявы гэтага прыгнёту і ягонае асуджэньне мы сустракаем у большасьці вершаў Багу-

[19] Тамсама. С. 23—24.

шэвіча. Па сутнасьці, кожны вобраз беднага і няшчаснага заўсёды гаворыць пра віну, закладзеную ў сыстэму і ейных прадстаўнікоў. Аліндарка становіцца сымбалем абуральнага прыгнёту.

*Украінскі сьлед.* Мэтрычная структура загалоўнага верша «Дудкі беларускай» узыходзіць да паэзіі Т. Шаўчэнкі[20]. У першым паэтычным зборніку Шаўчэнкі «Кабзар» па прыкладзе ўкраінскай народнай песьні сустракаюцца пары васьмiскладовых і шасьцiскладовых радкоў, якія афармляюцца з дапамогай рознай рытмікі. Паколькі розныя рытмічныя хады паўтараюцца цягам аднаго і таго ж радка, узьнікае яго свабоднае мэлядыйнае афармленьне. Абедзьве першыя пары радкоў згаданага верша Багушэвіча складаюцца толькі з шасьцiскладовых, зь іх першая напісана трыма трахеямі, а другая — двума амфібрахіямі:

*Эх, скручу я дудку!*
*Такое зайграю,*
*Што ўсім будзе чутка*
*Ад краю да краю!*

Дзеля параўнаньня прывядзём радкі Шаўчэнкі зь вершаванага апавяданьня «Кацярына», якое складае частку «Кабзара»:

*Єсть на світі доля,*
*А хто її знає?*
*Єсть на світі воля,*
*А хто її має?*[21]

[20] Scholz F. Die Entwicklung der weißrussischen Dichtung im 19. und zu Beginn des 20. Jahrhunderts im Rahmen der europäischen Literatur // Weißrußland und der Westen. Beiträge zu einem internationalen Symposium in Münster vom 3.—6. Mai 1990. Dresden University Press, 1998. S.162—164.

[21] Шевченко Тарас. Повне зібрання творів у шести томах. Київ: Академія наук УРСР, 1964. Т. 1. С. 29.

Далей у Багушэвіча фрагмэнты, напісаныя трахеем і амфібрахіем, не чаргуюцца паміж сабой, як у першых дзьвюх парах радкоў, але захоўваюць падобную мэтрычную структуру.

Багушэвіч тут насьледуе Шаўчэнку: у Шаўчэнкавым фрагмэньце, складзеным з 12-ці радкоў (чыім пачаткам ёсьць вышэй прыведзены чатырохрадковік), таксама выкарыстоўваюцца радкі, напісаныя трахеем і амфібрахіем. Пры гэтым васьмiскладовыя і шасьцiскладовыя чаргуюцца, як, напрыклад, у «Каламыйцы». Шольц таксама зьвяртае ўвагу на тое, што радок з працытаванай страфы Багушэвіча «Ад краю да краю» — гэта даслоўная цытата з «Катерини» Шаўчэнкі (Тому доля запродала / Од краю до краю).

*Гісторыя і нацыянальная самасьвядомасьць.* Наратары Багушэвіча фактычна не валодаюць гістарычнай сьвядомасьцю. Затое ім уласьцівае ўяўленьне аб сваёй этнічнай унікальнасьці; таксама яны маюць саманазву («тутэйшы»). «Беларусь», «беларусы» для іх — зусім непрадметная дадзенасьць, якая не існуе ў цяперашнім часе. Між тым у гэтым часе ў іх рэгіёне адбываецца працэс тварэньня польскай нацыі, і сярод «тутэйшых» пашыраецца польская нацыянальная сьвядомасьць, што пацьвярджаецца пэрспэктывай пераходу «з тутэйшага ды у палякі»[22].

У вершы «Хрэсьбіны Мацюка» канфлікт паміж калянізатарамі і калянізаванымі абвастраецца ў выніку відавочнай міжэтнічнай варажнечы з рэлігійнымі абэртонамі. У вёску прыяжджаюць казакі на чале з князем Хаванскім для таго, каб перахрысьціць мясцовае «рускае» насельніцтва з каталіцкай у праваслаўную веру. Вяскоўцы, занепакоеныя такой пэрспэктывай, кажуць, што калі мясцовы аўтарытэтны жыхар Мацей пагодзіцца на гэта, то ўсе яны («дзьве тысяч душ») прымуць праваслаўе. Але Мацей рэзка адкідае прапанову князя Хаванскага: «...каб сто катоў / Дралі мне скуру, пяклі на агню / Я веры сваей тыкі не зьмяню!» Фінал гэтай гісторыі вытрыманы ў рамках узьніклай

---

[22] Багушэвіч Ф. Творы... С. 38.

у першай палове XIX ст. у польскім дыскурсе маральнай максімы, паводле якой зьмена нацыянальнасьці азначае ня проста маральнае падзеньне, а духоўную сьмерць:

*Хапілі мяне якісьць гайдукі,*
*І розаг далі чатыры пукі,*
*І б'юць — не баліць, хоць за сэрца бярэ:*
*За што ж ён мне гэта ды скуру дзярэ?!*
*Як крыкну гэта: «Эй, бійце ж мацней,*
*Мацнейшы ад веры вашай Мацей!»*
*О так хрысьцілі мяне казакі*
*З* тутэйшага *ды у палякі*

Адначасова Багушэвіч дае зразумець, што працэс ператварэньня «тутэйшых» у «палякі» яшчэ не дасягнуў крытычнай адзнакі і што саманазва «тутэйшы» сярод мясцовых жыхароў больш пашыраная, чымся «паляк». Стан нацыянальнай сьвядомасьці наратараў Багушэвіча парогавы: у іх яна альбо адсутнічае наагул (у гэтай парадыгме этнічная ідэнтычнасьць «тутэйшы» супрацьпастаўленая нацыянальным ідэнтычнасьцям — «палякам»-«маскалям»-«жыдам»-«немцам») альбо яны пачынаюць засвойваць польскую нацыянальную сьвядомасьць.

«Паляк» у лірыцы Багушэвіча можа быць сынонімам «пана»: у сьвядомасьці наратараў усё яшчэ захоўваюцца адгалоскі старога паняцьця шляхецкай нацыі з дыхатаміяй «паноў-палякаў» і «мужыкоў-тутэйшых». «Пан» — гэта далёка не найгалаўнейшы прыгнятальнік «тутэйшых», якія значна мацней пакутуюць ад рэпрэсіўнага апарату каляніяльнай адміністрацыі. Тым ня менш, пан ёсьць прадстаўніком сацыяльнай структуры і падзяляе віну за існы стан рэчаў, за занядбаньне і мадзеньне Беларусі. Паны не вінавацяцца ў тым ці іншым злачынстве, проста будучы тым, кім яны ёсьць, яны ўяўляюць сабой сытуацыю зла. І як гэта ні парадаксальна, у такой прэзэнтацыі пана Багушэвіч далёка не арыгіналь-

ны: ён насьледуе Шаўчэнку, для якога «ператварэньне ў паніча эквівалентна падзеньню ў грэх»[23]:

*Маліся ж, бабулька, да Бога,*
*Каб я панам ніколі ня быў:*
*Не жадаў бы ніколі чужога,*
*Сваё дзела як трэба рабіў*[24].

Наратар Багушэвіча далёкі ад юдафобіі. Хоць жыд як «радыкальны мадэрніст» і нёс пэўны выклік ягонаму сьветагляду і вартасьцям, ён успрымаўся як прыклад сацыяльнага посьпеху. Як і палякі, жыды былі найбольш дыскрымінаванай меншасьцю «Паўночна-Заходняга краю». Абедзьве нацыянальнасьці з гледзішча расейскай бюракратыі ды й масавай расейскай сьвядомасьці ўспрымаліся як небясьпечныя для расейскай дзяржавы, а іхнія прадстаўнікі — як патэнцыйныя здраднікі. Як і палякам, жыдом забаранялася аддаваць пад заклад, набываць ва ўласнасьць і нават пэўны час арандаваць зямельныя ўладаньні. Адзінай магчымасьцю для выжываньня ў сельскай мясцовасьці была праца вінакурам альбо арандатарам корчмаў. Зрэшты, пры гэтым жыды часта выступалі фінансавымі агентамі польскай шляхты (дзейкалі, што ў кожнага шляхціца ёсьць свой жыд — кіраўнік маёнтку). Жыды таксама былі галоўнымі крэдыторамі польскіх земляўласьнікаў, а многія іхнія маёнткі былі закладзеныя ў жыдоў[25].

---

[23] Грабович Григорій. Поет як міфотворець. Семантика символив у творчості Шевченка. Київ: Критика, 1998. С. 116.

[24] Багушэвіч Ф. Творы... С. 77.

Сьледам за панамі ва ўкраінскім народніцкім дыскурсе палякі-шляхцічы асуджаліся як «пярэваратні», якія паддаліся асыміляцыі і тым самым здрадзілі свайму народу: «Ляхаў дзякуючы таму і стала ведаць гісторыя, што яны разбурылі стары лад славянскі і, замест народнага раўнапраўя, завялі шляхецкае панства». Куліш П. Первий період козацтва // Куліш П. Твори в 6-и томах. Т. 6. Львів, 1910. С. 310.

Паказальна, што наратар «Дудкі беларускай» Мацей Бурачок жыве ў мясцовасьці, дзе сёньня праходзіць беларуска-літоўская мяжа, але постаці літоўца ён ані разу не прыгадвае. Тлумачыцца гэта тым, што ў другой палове XIX ст. этнаграфічная мяжа паміж гэтымі народамі праходзіла далей на паўночным захадзе ад сёньняшняй беларуска-літоўскай граніцы.

Стан нацыянальнай самасьвядомасьці а-ля Мацей Бурачок ня быў чымсьці незвычайным для ўсходу Эўропы таго часу. Большасьць украінскага насельніцтва канца XIX ст. таксама сутыкнулася з праблемай ідэнтычнасьці і яе выбару, у імя якой даводзілася адмаўляцца ад сацыяльных (казакі, прыгонныя, сяляне), канфэсійных (праваслаўныя, грэка-каталікі), рэгіянальных (русіны, маларосы, палешукі, бойкі, гуцулы) і іншых самавызначэньняў на карысьць агульнанацыянальнага паняцьця «ўкраінец». Як у беларускім выпадку, нацыянальная сьвядомасьць украінцаў існавала на самым прымітыўным узроўні: яны ведалі, кім яны не былі — рыма-каталікамі, расейцамі і г.д. (адрозьненьні ў мове, рэлігіі, адзежы, традыцыях і г.д. лёгка адгадваліся на побытавым узроўні), аднак ня ведалі, часткай якога народу яны ёсьць[26].

---

[25] Клиер Джон. Почему российские евреи не были верноподдаными (Kaisertreu) // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань: Центр исследований национализма и империи, 2004. С. 555—558.

У 1880 г. было прынятае палажэньне, якое забараняла жыдом і каталіком служыць вайсковымі лекарамі ў Варшаўскай ваеннай акрузе. У 1887 г. жыдоў і каталікоў забаранілі прымаць на службу справаводамі і пісарамі ў вайсковыя канцыляры Віленскай, Варшаўскай і Кіеўскай вайсковых акругаў. З 1893 г. пасады машыністаў, мэханікаў і іх памочнікаў, а таксама старшых майстроў і сьлесараў-наладчыкаў на прамысловых прадпрыемствах кантраляваліся вайскоўцамі, і на іх не дапускаліся жыды і каталікі. Жыдоў і каталікоў збліжала таксама існаваньне ў іх адносінах адсоткавага цэнзу («numerus clausus») на паступленьне ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы, які пасьпяхова пераажыў крах Расейскай імпэрыі і дэ факта ўжываўся да скону СССР.

[26] Грицак Ярослав. Нарис історії України. Формування модерної української нації XIX—XX століття. К.: Генеза, 2000. С. 12.

*Працяг тварэньня міту.* У адпаведнасьці з рамантычнай эстэтыкай, для якой уласьцівая ўвага да прамежкавых станаў, Багушэвіч, зьвяртаючыся да Беларусі, факусаваў увагу на сытуацыях «парогу» ў яе гісторыі і сучаснасьці, г.зн. на яе блуканьнях і пераходах з аднаго да другога стану. Выяўлены ім сьвет фармуецца найперш у рэчышчы прыгнёту і маргінальных грамадзкіх зьяваў.

Адсутнасьць гістарычнага фону і поўная палітычная бессуб'ектавасьць падкрэсьліваюць, што лірычная нарацыя разгортваецца не ў гістарычнай, але ў міталягічнай роўніцы. Беларусь, праекцыяй якой ёсьць Шымон Рэўка і Мацей Бурачок, знаходзіцца ў парогавым стане — на гэта паказваюць канкрэтныя факты і супярэчнасьці. На ёй ляжыць пячатка канфлікту і бяды, а сама яна прэзэнтаваная маргінальнымі вобразамі — найперш ня так даўно вызваленага ад прыгоннай залежнасьці селяніна, які страціў бацькоў неўзабаве пасьля нараджэньня (паэма «Кепска будзе!»). Ён, ягоныя сваякі і блізкія, а таксама нарацыйныя тэмы і сюжэты ствараюць вычарпальны каталёг маргінальных постацяў грамадзтва таго часу — зьнядоленых і бясьсільных, мучанікаў за грахі чалавецтва, ахвяраў судовага самадурства і палітычнага бяспраўя. У іх можна заўважыць праекцыі асобы самога паэта, вымушанага стаць носьбітам праўды, які сваімі мукамі выкупляе грахі сваіх суродзічаў і служыць пасярэднікам паміж імі і Богам. Сацыяльныя структуры ўлады ўзмацняюць пачуцьцё адзіноты выгнаньніка на сваёй зямлі.

Гэтыя прэзэнтацыі, аднак, раскрываюць адно павярхоўны слой сапраўднай Беларусі, поўныя вымеры і сутнасьць якой схаваныя ў «мокрых ямах», «халодных зямлянках» і «гнілых вуглах» (пунктах судакрананьня зь Беларусяй), спасьцігнуць якую здольны толькі паэт. Сымболіку «мокрых ям», «халодных зямлянак» і «гнілых вуглоў» яднае супольны мэсіянскі падтэкст: Беларусь мусіць узьняцца зь ямы палітычнага прыгнёту і рушыць па шляху свабоды і роўнасьці, усталяваўшы новы, справядлівы лад.

Калі зірнуць толькі на бачныя рысы Беларусі, дык можна ўбачыць толькі Паўночна-Заходні край Расейскай імпэрыі. Як фэно-

мэн, што ляжыць па-за межамі гістарычнай неабходнасьці і законаў палітычнага існаваньня, Беларусь Багушэвіча набывае, такім чынам, рысы ідэальнай зьявы і становіцца найважнейшым складнікам міту беларускага адраджэньня. Гэты міт атрымлівае нечаканы працяг — праўдзівая Беларусь зазьзяе ў будучыні, цёмная і беспрасьветная сучаснасьць толькі адцяняе ейны бліск, служыць ілюстрацыяй для кантрасту. Прыкметай бягучага моманту ёсьць стан маргінальнасьці, у якім злучаецца адсутнасьць праўнага статусу, мукі і прыгнёт, слабасьць і залежнасьць, адзінота і абстрактная «нядоля». Надыход праўдзівай Беларусі непазьбежны і падрыхтаваны гэтымі калектыўнымі пакутамі.

Распрацаваны Багушэвічам міт беларускага адраджэньня ўлучае тры стадыі: дапарогавую, парогавую і постпарогавую. Праходжаньне Беларусяй гэтых трох стадыяў уяўляе сабой пераходны абрад. Першая і трэцяя стадыі вынесеныя за рамкі паэтычнага тэксту і апісваюцца ў прадмовах. Яны малююць ідылічную «далёкую мінуўшчыну» і заклікаюць будаваць ідэальную «будучыню» як складнік сьвету суладзьдзя, «залатога веку», які быццам калісьці быў на Беларусі і да якога яна вернецца. Сярэдзінная фаза апісаная ў самой паэзіі. Гэты парог, які адпавядае «нядаўняй мінуўшчыне» і «сучаснасьці», выпуклены асабліва востра. Багушэвіч надае яму непрапарцыйна шмат часу. Гэта сьвет глыбокай дысгармоніі, загрузлы ў бяспраўі і несправядлівасьці. Будучы не палітычнай, але экзыстэнцыйнай катэгорыяй, Беларусь набліжаецца да маральнага ідэалу, які спараджае ідэальнае грамадзтва.

# DEUS EX MACHINA

Дагэтуль Багушэвіч у крытыцы зьяўляўся зь небыцьця бы *deus ex machina*, г.зн. тое інтэлектуальнае асяродзьдзе, у якім адбывалася ягонае творчае высьпяваньне, альбо заставалася па-за разглядам, альбо фальшавалася. Складанасьць фэномэну Багушэвіча, ягоная здольнасьць выкоўзвацца са звычных уяўленьняў аб нацыянальным абуджальніку падкрэсьліваюць прыпісваньне яму дабратворнага ўплыву расейскіх пісьменьнікаў і народнікаў альбо ж разгляд яго як польскага актывіста, чуйнага да беларускай экзотыкі. Фэномэн Багушэвіча агаломшваў прадстаўнікоў пануючых культур, якія былі перакананыя, што яны значна больш прагрэсіўныя і асьвечаныя і загэтым могуць асыміляваць, але ня могуць быць асыміляваныя. У польскім друку пачатку XX ст. адзін зь вядучых польскіх інтэлектуалаў таго часу Л. Васілеўскі сьцьвярджаў, што як Янка Лучына, так і Ф. Багушэвіч былі «безь пяці хвілін палякамі»[1]. Сацыёляг Шчэнсны Браноўскі меркаваў, што «Беларуская літаратура за выключэньнем некалькіх кніжак, да слова кажучы, напісаных палякамі беларускай гаворкай, не існуе...»[2]. Публіцыст Т.-С. Грабоўскі ня грэбаваў нават простымі тэкставымі фальсыфікацыямі: «Вялікі таксама плён дае творчасьць Францішка Багушэвіча (Мацея Бурачка), які першы кінуў покліч: «Ня кідайце мовы *вашай* (вылучана намі. — Аўт.) беларускай, каб ня ўмёрлі»[3]. Нарэшце, у гісторыка міжваеннай пары С. Элскага Ф. Багушэвіч выступае як чысты паляк, хаця і «гарачы прыхільнік беларускага

---

[1] Wasilewski L. Litwa i jej ludy. Warszawa, 1907. S. 14.

[2] Szczęsny Bronowski. Państwo polskie a kwestia białoruska. Warszawa — Lublin — Łódź — Kraków, 1919. S. 40.

[3] Grabowski T.S. Białoruś pod rządami Rosyi. Kraków, 1916. S. 20.

руху»: «Сёньняшнія беларусы лічаць яго бацькам беларускага адраджэньня»[4].

Гэтая традыцыя была надзіва жывучая і пры канцы стагодзьдзя атрымала працяг у працах беларускіх гісторыкаў. Адкрыты закід Багушэвічу ёсьць у Ю. Туронка:

> *Нават Францішак Багушэвіч, якога часам лічаць бацькам беларускага нацыянальнага адраджэньня, у 1891 г., у прадмове да зборніка сваіх вершаў «Дудка беларуская», заклікаў: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі», — і таго ж лета ў Вільні пачаў арганізоўваць нелегальныя польскія школкі. Нарэшце, аніводзін з абуджальнікаў XIX ст. ня ўзяўся за стварэньне беларускага лемантара, гэтага найпрасьцейшага сродку разьвіцьця нацыянальнай культуры*[5].

Бесцырымонны выпад супраць Багушэвіча як паляка, які быў бясконца далёкі ад беларускага нацыяналізму, адносна нядаўна дазволіў сабе гісторык Я. Мірановіч. У яго Багушэвіч «не адчуваў ніякіх эмацыянальных сувязяў з узьнікаючай нацыянальнай ідэяй» і толькі «з прычыны салідарнасьці зь сялянскім асяродзьдзем напісаў вядомы заклік да беларусаў: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі»[6].

Нельга сказаць, што такія ацэнкі зусім пазбаўленыя грунту. У біёграфаў Багушэвіч паўстае ня толькі прыхільнікам сацыяльнага радыкалізму і заўзятым русафобам, які адчуваў «заўсёдную варожасьць да ўсяго расейскага», у тым ліку і да расейскіх грамадзка-палітычных рухаў, у прыватнасьці, да нарадавольцаў, але

---

[4] Ełski S. Sprawa białoruska. Zarys historyczno-polityczny. Warszawa, 1931. S. 16—17.

[5] Гл. Turonek Jerzy. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi. Warszawa: Oficyna Wydawnicza «Gryf», Instytut Historii PAN, 1992.

[6] Мірановіч Я. Навейшая гісторыя Беларусі. Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства, 1999. С. 11.

і як тыповы польскі нацыяналіст таго часу, які стаяў на плятформе палітычнай незалежнасьці Польшчы[7].

У такім падыходзе прысутнічае патрабаваньне чыстага нацыяналізму і незаплямленай нацыянальнай ідэнтычнасьці. Іначай кажучы, калі ты беларускі актывіст, а тым больш «бацька адраджэньня», то мусіш закладаць беларускія школкі і весьці толькі «беларускае» публічнае жыцьцё. Як яго весьці, калі беларускага грамадзтва наагул не існавала, з-пад увагі выпадала.

Такі падыход грэшыць мадэрнізацыяй і адмаўляецца прызнаваць таго факту, што ў XIX ст., як і на працягу ўсяго раньняга пэрыяду мадэрнасьці, індывіды маглі яшчэ жыць у дзьвюх культурах, падтрымліваць двайную нацыянальную ідэнтычнасьць і ляяльнасьць. У тую эпоху культурныя дзеячы часьцяком апыналіся на скрыжаваньні дыскурсаў, ссоўвалі і зьмянялі сваю пазыцыю, схіляліся сьпярша да адной традыцыі, потым да другой, вызначаючы тым самым рамкі дыскурсійных канфліктаў. Такое скрыжаваньне палітычнай і культурнай ідэнтычнасьцяў, спароджанае рознымі рэакцыямі на паняцьце імпэрыі і нацыі, нельга зводзіць да спрошчаных фармулёвак. Ва ўкраінскім выпадку пераарыентацыя на аднамоўныя сыстэмы адбылася толькі ў канцы XIX ст.[8], г.зн. амаль праз сто гадоў пасьля старту нацыянальнага руху. Гэта было зьвязана з узмацненьнем русіфікацыі і ўсё больш відавочным атаесамленьнем паняцьця палітычнай нацыі з адзінай этналінгвістычнай альбо культурнай нацыяй — «русским народом», на што ўкраінскія нацыяналісты адрэагавалі ўсё больш гарачымі заклікамі да суродзічаў адкідаць імпэрскую ідэнтычнасьць і пісаць на роднай мове ў імя стварэньня ўласнай нацыі. (У беларускім выпадку гэтая пераарыентацыя пачала дзеяцца адно ў першай палове XX в., аднак, здаецца, так дагэтуль і не завяршылася.)

---

[7] Луцкевіч А. Жыцьцё і творчасьць Фр. Багушэвіча ва ўспамінах сучасьнікаў // Спадчына. 2001. № 1—2. С. 42.

[8] Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 67.

Яшчэ пакаленьне М. Драгаманава прызнавала сваю дваістую ідэнтычнасьць («маларус» і адначасова «расеец»). У сярэдзіне XIX ст. Гогаль выяўляў прыймальную для ўладаў дваістую ідэнтычнасьць: у палітычным аспэкце быў імпэрскім расейцам, а ў культурным — украінцам. Нават Шаўчэнка быў ня толькі ўкраінскім кабзаром, але і пладавітым расейскім (расейскамоўным) пісьменьнікам і мастаком, які актыўна ўдзельнічаў у культурным жыцьці сталічнага Пецярбургу.

Украінскае грамадзтва давала вельмі багата прыкладаў павольнай асыміляцыі і дэнацыяналізацыі, перасоўваньня праз дэмаркацыйныя лініі ідэнтычнасьці, а напару і вяртаньня назад. Калі большасьць прымала расейскую (альбо на правабярэжнай Украіне — польскую) ідэнтычнасьць, меншасьць, наадварот, мяняла сваю расейскую (альбо польскую) ідэнтычнасьць на ўкраінскую. Прычыны, што змушалі да выбару ўкраінскай ідэнтычнасьці, былі палітычныя: гаворка вялася пра атаясамленьне зь сялянствам, з сукрытым антыімпэрыялізмам і абуджаным украінскім нацыяналізмам. На Правабярэжнай Украіне Ўладзімер Антановіч і Тадэвуш Рыльскі ў 1860-х гг. публічна прадэманстравалі сваю пазыцыю, зьмяніўшы польскую ідэнтычнасьць на ўкраінскую. Мікалай Кастамараў і Марка Ваўчок (Марыя Вілінская) — гэта прыклады зьменаў расейскай самасьвядомасьці на ўкраінскую[9].

Але калі нават у пляны Багушэвіча не ўваходзіла пабудова беларускай нацыі, а ягоныя творы на беларускай мове былі напісаныя дзеля таго, каб задаволіць нейкі інтэлектуальны капрыз, гэта не адпрэчвае факту, што яны леглі ў аснову мадэрнай беларускай культуры. Супраць атаясамленьня твораў з воляй аўтара заходняя крытыка выступіла больш як паўстагодзьдзя таму праграмнай адмовай «ілюзіі інтэнцыянальнасьці», што выйшла з-пад пяра Вімзата і Бірдзлі. Намер альбо воля аўтара ня можа быць мернікам альбо стандартам:

[9] Тамсама. С. 68.

*Паэзія не належыць ні крытыку, ні аўтару (яна аддзяляецца ад аўтара пры нараджэньні і ходзіць па сьвеце незалежна ад ягоных намераў альбо кантролю). Паэзія належыць публіцы. Яна ўвасабляецца ў мове, якая ёсьць асаблівай публічнай уласнасьцю, і яна гаворыць пра чалавека, які ёсьць аб'ектам публічнай веды*[10].

Для Фуко любая размова аб аўтару і творы (oeuvre) мусіць быць замененая паняцьцем ананімнага дыскурсу. Для Дэрыда любое сьцьверджаньне ў тэксьце належыць не да вонкавай рэчаіснасьці, а да цэлага суплёту іншых сьцьверджаньняў дадзенага тэксту і іншых тэкстаў; а паміж словам і вонкавым сьветам няма ніякай простай сувязі.

Аднак у гэтым дапушчэньні няма асаблівай неабходнасьці, таму што такія гіпэркарэктныя трактоўкі будуюцца на выбарачным прачытаньні тэкстаў Багушэвіча альбо на тэндэнцыйным разглядзе ягонай біяграфіі. Тым самым яны робяць мядзьведжую паслугу навуцы, таму што ўзьнікненьне беларускага нацыяналізму становіцца загадкавым і незразумелым працэсам. Калі Багушэвіч ня быў «бацькам беларускага адраджэньня», то хто ім быў, становіцца канчаткова няясна. Ня [Полацкае] княства ж, як наіўна меркаваў Алесь Анціпенка ў 1994 г.[11]?

Апрача таго, гэтыя трактоўкі ігнаруюць вастрыню моманту, г.зн. пару зьяўленьня твораў Багушэвіча і першыя рэакцыя на ягоную творчасьць. Акурат яны і могуць даць нам ключ да раз-

---

[10] Цыт. пав.: Грабович Григорій. Шевченко, якого не знаємо (З проблематики символічної автобіографії та сучасної рецепції поета). Київ: Критика, 2000. С. 160.

[11] Анціпенка Алесь. Этнас, нацыя й нацыянальная сьвядомасьць. Да вызначэньня падставовых паняткаў // Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня. СПб: Невский простор. 2003. С. 42.

«Пераход ад этнасу да нацыі не зьяўляецца аднамомантнай падзеяй, паміж этнасам і нацыяй існуюць прамежкавыя формы, ці пераходныя этапы. У якасьці такога этапу можна вылучыць пэрыяд узьнікненьня, фармаваньня й існаваньня

гадкі. Адным зь першых новую дынаміку ў беларускай літаратуры прыкмеціў акадэмік Карскі, на думку якога «белорусское наречие» стала інструмэнтам літаратуры, якая мела мэтай «возмутить простой народ против православной церкви и русских». У творчасьці Багушэвіча ён жа ўбачыў удалую праклямацыю ў лацінскім духу зь безумоўнай мэтай «вызвать смуту в русском семействе»[12].

Рэпліка Карскага ўказвае, што творы Багушэвіча несьлі набой асаблівай ідэнтычнасьці са сваёй уласнай дынамікай разьвіцьця, адчувальнасьцю і гарызонтам спадзяваньняў. У іх упершыню Беларусь пачала мысьліцца як нацыя, якая патрабуе, каб «тутэйшая» ідэнтычнасьць і «тутэйшая» літаратура ператварылася ў ідэнтычнасьць і літаратуру нацыянальную. Пасьля Багушэвіча ўжо немагчыма было адмаўляць, што беларуская мова можа быць мовай паўнавартаснай мастацкай літаратуры. Дзякуючы ягонай творчасьці адбывалася дывэрсыфікацыя інтэлектуальнага дыскурсу: у ягоных рамках сталі магчымыя палемікі, дыскусіі, жанравае і тэматычнае ўзбагачэньне, рост творчай канкурэнцыі. Неўзабаве якасна зьмяніліся правілы гульні — каляніяльная ўлада вымушаная была дапускаць існаваньне асобных анкляваў беларускасьці, каб захоўваць фасад прыстойнасьці.

Крытэр вонкавай нарацыі, які быццам зьбліжае Багушэвіча зь пісьменьнікамі ранейшай, марцінкевіцкай школы, абсалютызуецца тымі, хто ня любіць альбо ня ўмее чытаць саміх тэкстаў. Яны застаюцца закладнікамі цяперашняга моманту, калі насаджаная культурная асыміляцыя альбо брутальна навязаная культурная гібрыднасьць вымушаюць зусім іначай глядзець на гэ-

старажытных княстваў ... Княства як этнадзяржаўнае ўтварэньне ёсьць пачатковым элемэнтам нацыяўтваральнага працэсу». Думка Анціпенкі здаецца такой дзіўнай праз зьмешваньне ім працэсу нацыятварэньня і фармаваньня нацыянальнай міталёгіі, у якім вядучую ролю адыгрывае ўзьвелічэньне раньніх формаў этнічнай дзяржаўнасьці.

[12] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 336.

тую цалкам дапушчальную ў XIX ст. дыхатамію, робячы немагчымым яе гульнёвае выкарыстаньне з мастацкай мэтай. У выпадку Багушэвіча псэўданіміка была знакам, што беларуская ідэнтычнасьць як масавы фэномэн яшчэ не існуе і што ў сьвядомасьці пісьменьніка адбываецца сутыкненьне колькіх ідэнтычнасьцяў. Гэтая псэўданіміка таксама тлумачылася тым, што аўтару як польскаму актывісту і літоўскаму шляхціцу зь цяжкасьцю давалася атаясамленьне з новай і пастаянна прыніжанай беларускай нацыянальнасьцю, якая ня мела моцных пазыцыяў, застаючыся нечым накшталт ганебнага кляйма. Пасьля Багушэвіча гэтае самапрыніжэньне як вынік інтэрнацыяналізацыі клясавых, культурных і нацыянальных стэрэатыпаў таксама стане тэмай твораў беларускіх пісьменьнікаў.

Асаблівасьць Багушэвіча часта бачаць там, дзе яна не была нейкай асаблівай. Напрыклад, што ён на падставе моўнага крытэру ўпершыню з такой яснасьцю акрэсьліў арэал пражываньня беларускай нацыі. Альбо зь нечуванай сілай выступіў у абарону беларускай мовы. Альбо намацаў сілавыя кропкі беларускай гісторыі. Выключнасьць Багушэвіча палягае ў іншым. Яму выпала важная культурная роля стваральніка міту беларускага адраджэньня, які адно і змог падштурхнуць «больного белоруса Северо-Западного края» да ўдзелу ў нацыянальным руху зь недвухсэнсоўнымі палітычнымі мэтамі.

Гэты міт ссоўваў пэрспэктыву і оптыку, дазваляў глядзець на Беларусь як на спадкаемніцу нейкага цудоўнага казачнага каралеўства. Акурат гэты анталягічны міт ляжыць у падмурку ўсёй мадэрнай беларускай культуры. Беларуская нацыянальная культура ня мовацэнтрычная, але мітацэнтрычная. Як ні дзіўна сёньня гучыць, толькі ўсьведамленьня асаблівасьці беларускай мовы пастаянна неставала для старту беларускага нацыяналізму. Так уладкаваная чалавечая псыхіка — мова была нечым будзённым і як бы само сабой зразумелым. Яна ляжала на паверхні, была даступная і нібы значыць — была банальная. За выняткам буйных гарадоў, у XIX ст. беларуская мова гаворка гучала ўсюды на беларускай этнічнай тэрыторыі. Асаблівага рэзону адраджаць яе не

існавала, што нельга было сказаць пра велічныя традыцыі згаслай беларускай дзяржаўнасьці.

Адно дотык да вечнасьці і трансцэндэнтнасьці матывavaў да ахвярнасьці і дзейнасьці ў імя нейкай абстрактнай нацыянальнай супольнасьці, якая не прыносіць імгненнай матэрыяльнай выгады і, больш за тое, часта суправаджаецца палітычным перасьледам.

Тое, што Багушэвіч намагаўся ўпісаць беларускую ідэнтычнасьць ў больш шырокую польскую, не прасочваецца тэкстуальна. Ягоны нацыяналізм быў сынтэтычны, маральна фарбаваны і дэзынтэграцыйны што да паноўнай ідэалёгіі. У адрозьненьне ад Украіны у Беларусі да інкарпарацыі ў Расейскую імпэрыю наўрад ці існавалі ўяўленьні аб уласнай гістарычнай традыцыі, адрознай ад гістарычнай традыцыі Рэчы Паспалітай зь яе палітычнай мінуўшчынай і культурнымі дасягненьнямі. Багушэвічу давялося гэта ўлічыць, і загэтым Рэч Паспалітая, у параўнаньні зь Літвой і Полацкім княствам, у ягоным наратыве ссунутая на задні плян. Тым самым паміж польскай і беларускай культурнай, палітычнай і гістарычнай спадчынай была створаная пэўная дыстанцыя. Гэтая канцэпцыя азначала разорву з традыцыямі польскага культурнага патэрналізму ў Беларусі. Зь яе вынікала, што беларуская і польская нацыі маглі ўвайсьці ў адзіную эўрапейскую наднацыянальную супольнасьць як два раўнапраўныя суб'екты.

Ды і мы ці не застаёмся ў палоне каляніяльнага мысьленьня, калі мяркуем, што мэта Багушэвіча палягала ня столькі ў тым, каб выклікаць да жыцьця беларускі нацыяналізм, колькі пахіснуць ідэалягічны дыктат і ўладную магутнасьць імпэрскай мэтраполіі, у прыватнасьці, канцэпцыю трыадзінай расейскай нацыі? (Маўляў, ва ўмовах нарастаючай мадэрнізацыі і адсутнасьці хоць якіх значных культурных рэсурсаў беларускі рух асуджаны быць аб'ектам маніпуляцыі з боку больш магутных суседзяў.) І што ўдар у адказ на ўзмацненьне русіфікацыі маглі нанесьці толькі палякі, бо беларусы на яго былі арганічна нyздольныя?

Трактоўка Багушэвіча як польскага пісьменьніка, які пісаў на палітычную замову, сама ў найвышэйшай ступені палітызаваная. Багушэвіч здолеў выйсьці за межы гэтай польска-расейскай дыхатаміі, хаця і выкарыстоўваў паэзію для адлюстраваньня пэўных палітычных настрояў (яе немагчыма разглядаць у адрыве ад адносінаў нацыянальныя ідэалёгіі — імпэрскія галасы — галасы народнага супраціву).

Значэньне Багушэвіча шмат у чым супадае са значэньнем Шаўчэнкі для ўкраінскага нацыяналізму. І першы і другі, кажучы словамі Р. Грабовіча, зьдзейсьнілі пералом, які «палягае ня так у тэматызаваным («гістарыязофскім», «нацыятворчым») зьмесьце [іх] слова... як у самім голасе, у пераацэнцы, нават адкрыцьці суб'екта, індывідуальнасьці»[13].

Багушэвіч — цэнтральная постаць у мадэрнай беларускай гісторыі. Ён прапанаваў новы тып слоўніка і граматыкі нацыянальнай традыцыі. У ягоных творах упершыню ў беларускай гісторыі аб'ект каланізацыі, палітычнага, клясавага і сацыяльнага прыгнёту набыў свой голас. Селянін-беларус у ягонай паэзіі — суб'ект нацыянальнага дыялёгу і зацікаўлены адрасат нацыянальнага пасланьня, чалавек з разьвітай этнічнай інакшасьцю. Няма сэнсу дадаваць, што гэты вобраз быў ідэалягічнай канструкцыяй, якая разыходзілася з рэальным станам рэчаў. Усьведамленьне ўтапічнасьці гэтага бачаньня прыводзіла нацыянальных актывістаў да дэпрэсіяў і разгубленасьці пасьля прайграных у чарговы раз палітычных кампаніяў.

Ранейшая літаратурная і ідэалягічная традыцыя адмаўляла самадастатковы сэнс творчасьці на беларускай мове і чалавечнасьць мужыка-беларуса саму па сабе (яна быццам зьяўляецца ў меру ягонага ператварэньня ў паляка альбо расейца), і Багушэвічу выпала важная роля парушыць гэтую мадэль. На зьмену зьяднаньня грамадзкай асобы — уласна аўтара — зь ягонай літаратурнай праекцыяй, ягоным голасам прыйшла тэматызацыя адсутнага

[13] Грабович Г. До питання про критичне самоусвідомлення в українській думці XIX ст.: Шевченко, Куліш, Драгоманов // Сучасність. 1996. № 12. С. 92.

ўперад суб'екта. Адкінуўшы пашыраны сярод паноўных клясаў звычай ганіць ніжэйшыя слаі, Багушэвіч зрабіў стаўку на іх гуманізацыю і ачалавечваньне, ператварэньне ў бок, які можа быць зацікаўленай аўдыторыяй.

Выяўленыя ім наратары пазытыўныя: нягледзячы на свой сацыяльны статус, яны прытрымліваюцца статычных поглядаў і хрысьціянскіх ідэалаў, валодаюць унутранай свабодай. Яны разважлівыя і дасягаюць высокага ўзроўню самасьвядомасьці, жывучы ў згодзе з розумам і прыродай. Такая пазыцыя мела далёкасяжныя наступствы. Калі маральнае права на баку селяніна, то можна апраўдаць і супраціў уладзе[14].

Унутрана шляхетны селянін паказаны больш свабодным, чым разбэшчаны і ганарысты пан, раб грамадзкіх умоўнасьцяў і асабістых жарсьцяў. Аддаючы перавагу ўнутранай сфэры, сьвету індывідуальных пачуцьцяў і перажываньняў, але не публічным драмам, Багушэвіч сьцьвярджаў, што людзі ў сваіх паводзінах павінны кіравацца не пустой пыхай і палітычнай ляяльнасьцю, а імкненьнем выконваць маральныя законы, усталяваныя Госпадам і прызнаныя сельскім грамадзтвам.

Багушэвіч заклаў базу, на якой узьнік беларускі нацыянальны рух, базу, на аснове якой пазьней пачаў фармавацца новы палітычны кансэнсус. Зь цягам часу пэўныя распрацаваныя ім культурныя сымбалі і міты сталі агульнапрынятымі ў беларускім грамадзтве. Візія Багушэвіча здолела стаць агульным пунктам, на якім стваралася новая нацыянальная сьвядомасьць, якраз таму, што яна заставалася ўсяго толькі праектам, агульным накідам, дапалітычным і сфармуляваным адно ў агульных рысах. Паэтычнае мысьленьне Багушэвіча па-свойму значна шырэйшае за дыскурс палітыкі зь ягонай утылітарнасьцю, прыземленасьцю, масай умоўнасьцяў. Яму ўласьціва візіянэрская сіла і асаблівая пранікнёнасьць, глыбінная эмацыйнасьць і павышаная адчувальнасьць да дабра і зла.

[14] Пар. Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 212.

Да Багушэвіча беларускага нацыяналізму як суцэльнага каштоўнаснага сьветагляду, а таксама палітычнай і культурнай ідэалёгіі не існавала, а літаратурная творчасьць на беларускай мове была ў найлепшым разе аргумэнтам на карысьць мадэрнай нацыянальнай сьвядомасьці, а не фундатарам гэтай сьвядомасьці. Ды і ў першыя гады XX ст. было ўсяго толькі двух беларускіх нацыяналістаў, здольных весьці эфэктыўную арганізацыйную дзейнасьць. Гэтым двум людзям, якія перажылі ўплыў Багушэвіча, Вацлаву Іваноўскаму і Івану Луцкевічу, мы абавязаныя стварэньнем мадэрнай беларускай літаратуры, якая заклала аснову для пашырэньня нацыянальнай ідэнтычнасьці, а таксама пачаткамі ўласна беларускага палітычнага мысьленьня.

# ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ

*__Чорная дзюра Беларусь.__ Існуюць мясьціны, якія выпалі з новай Эўропы. Яны выбіліся з часу і ўтрацілі сілу. Існуюць буйныя, значныя, некалі ажыўленыя гарады, якія падупалі ў нянавісьці, у самаізаляцыі і ўрэшце ў вайне: такі прыклад дае Бялград — гораду, які калісьці быў скрыжаваньнем Эўропы, больш не пазнаць. Але можна сустрэць цэлыя мясцовасьці, краіны і дзяржавы. Такі выпадак уяўляе Беларусь, хаця праз гэтую краіну пралягаюць найважнейшыя транспартныя шляхі паміж Усходам і Захадам. Хваля зьменаў у найбліжэйшых суседзяў — у Польшчы, Літве, Украіне, нават у Расеі — не закранула яе, ня выклікала нават зьмякчэньня рэжыму. Наша карціна Эўропы будзе няпоўнай і абсалютна фальшывай, калі мы заплюшчым вочы на магчымасьць, больш за тое, на існаваньне «чорных дзюр» у Эўропе.*

Шлёгель Карл. Архіпэляг Эўропа.
Osteuropa. 2005. № 8.

*Беларусь — гэта перажытак, выспа ў моры дэмакратыі і свабоды, якое ўвесь час пашыраецца. Выспы часам вельмі патрэбныя, але гэтая — зусім не. Чым хутчэй зьнікне, тым лепш для нас усіх.*

Качынскі Лех, прэзыдэнт Польшчы.
Gazeta Wyborcza. Травень 2006.

Відавочнае спазьненьне беларускага нацыяналізму ў параўнаньні нават з запозьненым украінскім, ягонае павярхоўнае

разьвіцьцё, няздольнасьць ня толькі заваяваць сур'ёзнай палітычнай падтрымкі, але і выклікаць масавай эмацыйнай ляяльнасьці спараджалі шматлікія, часам супярэчлівыя, часам камплемэнтарныя трактоўкі. На пытаньне, чаму элемэнтарная ў сутнасьці беларуская ідэя была вызначана так позна, спрабавалі даць адказ зьвяртаючыся да *камунікацыйных* каналаў. Яны падкрэсьлівалі аддаленасьць Беларусі ад асноўных транспартных шляхоў сярэднявечнай і раньнемадэрнай Эўропы і тлумачылі позьняе ўзьнікненьне беларускага нацыяналізму дыстанцыяй да асноўных культурных цэнтраў Захаду таго часу. Як пісаў Ян Станкевіч, супрацьпастаўляючы Беларусь больш пасьпяховай у пляне нацыятварэньня Прыбалтыцы альбо аўстрыйскай Галіччыне:

> *Народы, падпалыя пад заходнеэўрапейскі ўплыў (швэдзкі, нямецкі, ангельскі і інш.), барзьдзей адроджуюцца, чымся народы, падпалыя пад уплыў расейскі*[1].

*Энэргетычныя* інтэрпрэтацыі завастралі ўвагу на эканамічнай адсталасьці Беларусі, адсутнасьці ў беларускага этнасу жыцьцёвай энэргіі і беднасьці гаспадарчых рэсурсаў, якіх заледзьве ставала на простую рэпрадукцыю насельніцтва, ня кажучы ўжо пра нейкую інтэнсіўную культурную дзейнасьць. Нямецкі гісторык Бэрнард К'яры[2] называў Беларусь часоў апошняй нямецкай акупацыі краінай экстрэмальнага земляробства, крайне адсталым рэгіёнам, дзе немцы маглі дазволіць сабе больш бесчалавечныя акцыі, чым, напрыклад, на Ўкраіне. Гэтае сьцьверджаньне можна экстрапаляваць і да эпохі расейскага імпэрскага, польскага і літоўскага панаваньня.

*Культурныя* трактоўкі ўлічвалі адсутнасьць высокай культуры, заснаванай на беларускай мове ў дамадэрны і раньнемадэрны час,

---

[1] Станкевіч Ян. Гістарычныя творы. Менск: Энцыклапедыкс, 2003. С. 475.

[2] Гл. К'яры Бернгард. Штодзённасць за лініяй фронту. Мінск, 2005.

забарону кнігадрукаваньня на ёй у сувязі з ростам нацыяналістычных настрояў сярод імпэрскай бюракратыі і яшчэ раней — самой назвы Беларусь, зацьверджанай царом Мікалаем І.

Пры спасылках на *рэлігійную* спэцыфіку рыма-каталіцкае нацыянальна сьвядомае пераважна памешчыцкае асяродзьдзе супрацьпастаўлялася данацыянальнаму пераважна праваслаўнаму сялянству. Скасаваньне ўніяцкай канфэсіі ўзводзілася ў ранг нацыянальнай катастрофы, якая нанесла аграмадную шкоду беларускаму адраджэньню, а на канфэсійную разьяднанасьць паміж сялянамі праваслаўнага і каталіцкага веравызнаньня ўскладалася адказнасьць за перашкоды ва ўстанаўленьні трывалых нацыянальных сувязяў ва ўсім грамадзтве.

Час і ўмовы ўзьнікненьня беларускага нацыяналізму часта разглядаліся праз прызму *эканамічных* фактараў. А менавіта, сэпаратысцкія і нацыяналістычныя настроі ў Беларусі былі выкліканыя нераўнамерным эканамічным разьвіцьцём пасьля рэформаў Аляксандра II, а таксама эканамічным прыгнётам карэнных землеўласьнікаў і капіталістаў, які радыкальна зьменшыла гаспадарчае значэньне Польшчы для Беларусі і наадварот — Беларусі для Польшчы.

Рост чыгуначнай сыстэмы, увядзеньне ўсеагульнай вайсковай павіннасьці ў 1874 г., міграцыйныя працэсы і ўрбанізацыя былі «нашмат больш эфэктыўнымі інструмэнтамі русіфікацыі, чымся рэпрэсіўныя законы»[3].

Гэтыя працэсы разбуралі ранейшую станавую структуру беларускага грамадзтва, перад учорашнім прыгонным селянінам нарэшце адкрылася пэрспэктыва прасоўваньня па сацыяльнай лесьвіцы. У другой палове XIX ст. у Беларусі расьце прадукцыйнасьць сельскай гаспадаркі, назіраецца імклівы рост насельніцтва, павышаецца ягоная геаграфічная і сацыяльная мабільнасьць[4].

---

[3] Химка І. Коротка історія української ідеї // Критика. 2003. № 11. С. 8.

[4] У 1863—1897 гг. гарадзкое насельніцтва вырасла з 330 тыс. да 648 тыс. Нарысы гісторыі Беларусі. Мінск: Беларусь, 1994. С. 318.

Зьмяншэньне польскага эканамічнага, палітычнага і культурнага ўплыву ў Беларусі ўзмацняла сацыяльнае напружаньне і ўтварала пэўны культурны вакуўм, які вымагаў запаўненьня новым культурным зьместам. Сама дэпалянізацыя абарачалася пратэкцыянізмам да мясцовага няпольскага сялянства, а таксама часткова і інтэлігенцыі. (Падобны сцэнар быў апрабаваны ў 80-х гг. XIX ст. і ў Прыбалтыцы, дзе дэгерманізацыя суправаджалася пратэкцыянізмам і папулізмам адносна латыскага і эстонскага сялянства.)

Вызваленьне сялянства зьнішчыла галоўную перашкоду для выхаду на арэну беларускай сялянскай інтэлігенцыі. Дабрабыт мясцовай паўпольскай шляхты грунтаваўся на натуральнай сельскай гаспадарцы, «складаючы адно цэлае з гаспадаркай рэшты Польшчы»: «Польшча душыла Беларусь сваім зямельным капіталам з такой сілай, што... нават Расійская імпэрыя з усёй грамадай яе дзяржаўных, палітычных і культурных засабаў нічога тут не магла парабіць»[5].

Вялікія рэформы, экспансія расейскага капіталу, а таксама канцэнтрацыя ўласна польскага капіталу ў карэннай Польшчы, дзе імкліва разьвіваюцца капіталістычныя адносіны[6], а таксама ўсё больш відавочная перавага расейскіх капіталістаў «у тэхналёгіі, багацьці, зброі і досьведзе» (Э. Сьміт) канчаткова пахіснулі пазыцыі польскіх земляўласьнікаў і прымусілі прызнаць Беларусь асобнай нацыяй, каб не аддаць яе ў «лапы» Масквы.

Пры вытлумачэньні прыроды беларускага нацыяналізму гаворка ішла і пра ягоныя *матэрыяльныя* перадумовы. Вырашальным фактарам ягонай запозьненасьці абвяшчалася няразьвітасьць капіталістычных адносінаў у краіне, бо акурат капіталізм адыгры-

[5] Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. Менск: Навука і тэхніка, 1993. С. 188.

[6] Згодна з расейскім законам 1877 г., мыта на ўвоз у імпэрыю замежных тавараў павінна было выплачвацца золатам; нямецкія і іншыя заходнія прадпрымальнікі ў адказ на гэта пачалі інвэставаць свае капіталы ў прамысловасьць памежнага зь Нямеччынай раёну Варшава—Лодзь, адкуль разьвітая сетка чыгункі дазваляла вывозіць выробленую таварную прадукцыю ўглыбкі Расеі.

ваў вырашальную ролю ў «зборцы» (Б. Андэрсан) друкаваных моваў, выпрацоўцы з мноства роднасных мясцовых дыялектаў стандартызаванай нацыянальнай мовы з адзінымі граматычнымі і сынтаксычнымі нормамі.

У гэтай парадыгме запозьненасьць беларускага нацыяналізму наўпрост зьвязвалася зь ягонай няздольнасьцю дасягнуць узаемадзеяньня паміж сыстэмай вытворчасьці (капіталізмам) і тэхналёгіямі моўнай камунікацыі, а таксама наладзіць эфэктыўную сыстэму адукацыі і адтварэньня культурных эліт.

Гісторыкі ўказвалі на поўную адсутнасьць у дамадэрны час кансалідаванай *эліты*, якая б узяла пад сваю апеку культуру на «простай» мове[7]. Вядучая роля ў ідэалягічнай легітымізацыі нацыяналізму на каляніяльных тэрыторыях належыць мясцовым субэлітам — чынавенству, афіцэрам, асобам вольных прафэсіяў, гандлярам і інтэлектуалам. Ва Ўсходняй Эўропе элітамі, прадстаўленымі зьбяднелай і азлобленай шляхтай і ніжэйшым духавенствам (М. Грох выключае з «групы падтрымкі» беларускага нацыяналізму праслойку шляхты), часта і абмяжоўваецца «мазгавы штаб» нацыянальнага руху. Толькі зрэдку буйнымі нацыяналістамі станавіліся работнікі і сяляне, якія звычайна ставілі клясавую салідарнасьць вышэй за нацыянальную. Работнікі пераходзілі на нацыяналістычныя пазыцыі адно тады, калі абвастралася працоўная канкурэнцыя паміж пралетарыятам рознага этнічнага паходжаньня, як, напрыклад, у Чэхіі канца XIX ст. У цэлым рост нацыянальнай сьвядомасьці ня ёсьць неабходным адказам на павышэньне мабільнасьці масаў. Запозьненыя нацыянальныя рухі былі вымушаныя канкураваць з клясавымі і сацыяльнымі рухамі, а грамадзкія ўмовы маглі дыктаваць іншыя адказы, калі прыгнечанае насельніцтва змушана адмаўляцца ад этнічнай спадчыны і разьвіваць сацыяльную і палітычную сьвядомасьць. Выбар, адкрыты для яго, улучаў таксама разьвіцьцё альтэрнатыўных нацыянальных лаяль-

[7] Сагановіч Генадзь. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мінск: Энцыклапедыкс, 2001. С. 182.

насьцяў. Для беларускага селяніна сацыялізм і асыміляцыя ў расейскую альбо польскую нацыю былі значна больш прыцягальнымі альтэрнатывамі беларускаму нацыяналізму.

У пару ўзьнікненьня беларускага нацыяналізму якасьць і колькасьць беларускай эліты заставаліся вельмі нізкімі. М. Грох ставіць у адзін шэраг беларускі, македонскі і эстонскі нацыяналізмы на той падставе, што эліта гэтых нацыяў складалася з прадстаўнікоў ніжэйшай інтэлігенцыі: настаўнікаў ніжэйшых школаў, дзяржаўных клеркаў і фэрмэраў. Яна практычна не ўлучала вышэйшых слаёў інтэлігенцыі, а менавіта выкладнікаў сярэдніх школаў, дзяржаўнага чынавенства і асобаў вольных прафэсіяў[8]. Да таго ж, беларускі нацыяналізм вымагаў зьмены традыцыі і паводзінаў эліты, а нацыянальныя дзеячы дзеля іхняга сацыяльнага паходжаньня не патрапілі таго зрабіць.

Гісторык Генадзь Сагановіч абгрунтоўваў «складанасьць і марудлівасьць» беларускага нацыятварэньня (этнакансалідацыйных працэсаў, згодна зь ягонай тэрміналёгіяй) таксама суіснаваньнем розных самавызначэньняў насельніцтва і позьнім зьяўленьнем назвы «Беларусь», «беларусцы». Акрамя ўсяго гэтага, ён зважаў на *вайсковыя* абставіны, а менавіта на разбуральныя войны XVI—XVII ст. як на важны рэзон невыразнасьці нацыянальнай ідэнтычнасьці беларусаў («этнічнай сьвядомасьці», згодна зь ягонай тэрміналёгіяй). Задоўга да Г. Сагановіча «нячыстай», не мабілізуючай назвай «Беларусь» тлумачыў слабасьць беларускага нацыяналізму мовазнаўца і гісторык Я. Станкевіч.

Сярод фактараў, якімі тлумачаць спазьненьне беларускага нацыяналізму, фігуруюць таксама неўнармаванасьць, граматычная нестандартызаванасьць беларускай мовы і нераспрацаванасьць гістарычнай традыцыі, і адсутнасьць унівэрсытэту ў Віленскай навучальнай акрузе пасьля польскага паўстаньня 1830—1831 гг.[9].

---

[8] Грох Мирослав. Ориентация в типологии // Ab Imperio. 2000. № 2.

[9] Сталюнас Дарюс. Національна політика Російської імперії в Північно-Західному краї

Акурат *адукацыйнымі* рэсурсамі — існаваньнем унівэрсытэтаў у Харкаве і Кіеве і іх адсутнасьцю на беларускай этнічнай тэрыторыі — тлумачыць якасныя адрозьненьні беларускага і ўкраінскага нацыяналізмаў А. Мілер. Калі ў Нямеччыне, Францыі і Вялікабрытаніі ўнівэрсытэты былі эфэктыўнымі праваднікамі цэнтралізатарскага нацыяналізму, у Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе яны станавіліся апірышчам супраціву асымілятарскім высілкам уладаў. Харкаўскі і Кіеўскі ўнівэрсытэты, насуперак жаданьню ўладаў, аб'ектыўна спрыялі разгортваньню ўкраінскага нацыяналізму. У першай палове 60-х гг. XIX ст. студэнты складалі больш чым 70 % ягоных актывістаў[10].

Для Тыматы Снайдэра найважнейшай прычынай няўдачы беларускага нацыяналізму ў XIX ст. ёсьць адсутнасьць нацыянальнага «П'емонту» і, шырэй, вымываньне з краіны нацыянальных актывістаў і няздольнасьць прыцягнуць звонку рэсурсы, неабходныя для нацыянальнай дзейнасьці:

> *Тыя нешматлікія дзеячы, якія спрабавалі надаць імпульс беларускаму нацыянальнаму руху з далёкага Кракава, амаль што не знаходзілі ахвотных да супрацы ды й самі мелі ўсе шанцы захлынуцца ў навакольнай польскай стыхіі. Усё, што яны выдавалі па-беларуску на тэрыторыі Ўсходняе Прусіі, каб быў нейкі плён, даводзілася перапраўляць на вялізныя адлегласьці*[11].

---

та питання про вищий навчальний заклад після польського повстання 1863—1864 років, Схід-Захід. Історико-культурологічний збірник, Вип.7: Спеціальне видання «Університети та нації в Російській імперії». Харків — Київ: Критика, 2005, С. 214.

[10] Миллер А. Украинский вопрос в политике властей и русском общественном мнении (вторая половина XIX в.). Санкт-Петербург: Алетейя, 2000. С. 147—148.

[11] Гл. Snyder Timothy. The Reconstruction of Nations. Poland, Ukraine, Lithuania, Belarus 1569—1999. New Haven: Yale University, 2003. P. 367. Цыт. пав.: Снайдэр Тыматы. Адбудова нацый. Польшча, Украіна, Летува, Беларусь. Спрэчкі за літоўска-беларускую Айчыну // Дзеяслоў. №11—13. 2004.

Надзвычай цікавыя *сынтэтычныя* сацыялягічныя трактоўкі беларускага нацыяналізму, якія тлумачаць спэцыфіку ўзьнікаючага беларускага нацыяналізму з пэрспэктывы сацыяльнай структуры беларускага і суседніх грамадзтваў. Аўтарам наватарскага сацыялягічнага дасьледаваньня быў сацыёляг зь Мічыганскага ўнівэрсытэту Стывэн Л. Гут'е[12].

Гут'е выходзіў з канцэпцыі нацыяналістычнай мабілізацыі Карла Дойча, паводле якой нацыяналізм — гэта зь неабходнасьцю масавы фэномэн, які ёсьць адным з магчымых адказаў на новыя формы сацыяльнага прыгнёту. Здольнасьць нацыі да мабілізацыі залежыць ад масавай падтрымкі, якую здольная выклікаць нацыянальная ідэя, а посьпех альбо крах нацыянальнага руху нельга аналізаваць, выходзячы толькі з факту ўзьнікненьня палітычных альбо інтэлектуальных элітаў у той ці іншай нацыі.

Скарыстоўваючы дадзеныя першага перапісу насельніцтва Расейскай імпэрыі ў 1897 г. і зробленыя на іх падставе ўласныя разьлікі, Гут'е прааналізаваў такія сацыялягічныя паказьнікі, як пісьменнасьць, прафэсійная кваліфікацыя, узровень адукацыі, суадносіны сельскага і гарадзкога насельніцтва і дэмаграфічныя тэндэнцыі.

У 1897 г. з гледзішча ўзроўню ўрбанізацыі, індустрыялізацыі і адукацыі Беларусь знаходзілася ззаду большасьці іншых рэгіёнаў у Расеі і была надзвычай адсталым рэгіёнам у параўнаньні са стандартамі Заходняй і Цэнтральнай Эўропы. У эўрапейскай Расеі толькі на Ўрале і ў Волга-Вяцкім раёне быў ніжэйшы ўзровень урбанізацыі, чым у Беларусі.

Паводле Дойча, гарадзкое насельніцтва ёсьць адным зь відаў сацыяльна і палітычна актыўнага насельніцтва. Беларусь была ня толькі адсталым рэгіёнам з гледзішча ўрбанізацыі, але і самі беларусы былі найменш урбанізаванай нацыянальнай групай у

[12] Guthier Steven L. The Belorussians: National Identification and Assimilation, 1897—1970. Part I: 1897—1939. Soviet Studies. Jan., 1977.Vol. 29. № 1 P. 37—81. Part 2. Vol. 29. Apr., 1977. № 2 P. 270—283.

сваім этнічным рэгіёне. У 1897 г. толькі 8,2 % беларускага насельніцтва жыло ў гарадох, якія налічвалі больш за 10 тыс. жыхароў. (Характэрна, што ў 1897 г. нават этнічна расейскія гарады і сёлы, што налічвалі 2 тыс., 5 тыс., нават 10 тыс. жыхароў, ня мелі такіх мабілізуючых фактараў, як рэгулярныя газэты, сярэднія школы і буйныя прамысловыя прадпрыемствы.)

Узровень урбанізацыі беларускамоўнага насельніцтва быў вельмі нізкі. У 1897 г. заледзьве 1 % беларусаў жыў у гарадох, што налічвалі больш як 20 тыс. чалавек. Яны складалі толькі 10 % насельніцтва гэтых гарадоў. У Беларусі сярод гарадоў з насельніцтвам, меншым за 50 тыс. чалавек, якія не былі губэрнскімі цэнтрамі, да 1905 г. толькі ў Гомелі выдавалася газэта. Яе выхад доўжыўся... 3 тыдні.

Яшчэ адным крытэрам вызначэньня актыўных сацыяльных групаў, паводле Дойча, ёсьць прафэсійная структура насельніцтва. Нацыянальна сьвядомых беларусаў было мала і паводле гэтага крытэру. Пераважная большасьць беларусаў была занятая ў традыцыйнай сельскай гаспадарцы — 92 % у 1897 г. Толькі 1,1 %, альбо 59 тыс., былі занятыя ў прамысловасьці, працавалі на заводах і фабрыках, у будаўніцтве альбо на транспарце. У той час як беларусы складалі тры чвэрткі насельніцтва ў сельскай мясцовасьці, яны давалі ўсяго толькі адну чвэртку занятых на заводах і фабрыках, у будаўнічай індустрыі і транспарце.

Яшчэ адной крытычнай праблемай для патэнцыйнага нацыянальнага руху ў 1897 г. была скрайняя нешматлікасьць сярод беларусаў прадстаўнікоў свабодных прафэсіяў і сярэдняй клясы. Дзеля гэтага на мяжы стагодзьдзяў у беларусаў адсутнічала адукаваная і самаахвярная праслойка, на якую кладзецца асноўны цяжар пашырэньня нацыяналістычных ідэяў і якая выдае асноўныя фінансавыя рэсурсы, каб падтрымаць намаганьні для эфэктыўнай нацыянальнай прапаганды. Яе пераважная большасьць не зьбіралася забясьпечваць кадры альбо фінансава памагаць беларускамоўным школам, нацыяналістычнаму друку, тэатрам альбо музэям. Мізэрная колькасьць беларускамоўных, занятых у сыстэме адукацыі, юрыспрудэнцыі, мэдыцыне альбо адміністрацыі,

не пажадала падтрымаць першых ініцыятываў беларускага нацыяналізму.

Вынікам нястачы кваліфікаваных спэцыялістаў і сярэдняй клясы быў нізкі ўзровень пісьменнасьці і адукацыі. У 1897 г. звыш трох чвэртак беларускамоўнага насельніцтва ў веку паміж 10 і 49 гадамі былі непісьменныя. Толькі тры з тысячы беларусаў атрымалі сярэднюю альбо вышэйшую адукацыю. З гледзішча пісьменнасьці беларусы апынуліся далёка ззаду ўсяго астатняга насельніцтва Паўночна-Заходняга краю. Толькі ў дзьвюх самых заходніх губэрнях, Гарадзенскай і Віленскай, узровень пісьменнасьці быў значна вышэйшы і супастаўны зь іншымі нацыянальнасьцямі.

У 1897 г. 58,5 % беларусафонаў у Віленскай губэрні і 30,3 % у Гарадзенскай губэрні былі рыма-каталікі. Аднак высокі ўзровень пісьменнасьці сярод беларусаў у заходніх губэрнях не суправаджаўся большай доляй беларусаў сярод гараджан, кваліфікаваных спэцыялістаў, сярэдняй клясы альбо пралетарыяту. Тым ня менш, прынамсі, паводле такога крытэру мабілізацыі, як пісьменнасьць, беларусы Віленскай і Гарадзенскай губэрняў значна выпярэджвалі сваіх суродзічаў на ўсходзе.

Вось жа, на мяжы XIX і XX ст. беларусы былі горш падрыхтаваныя да выклікаў мадэрнізацыі, чым жыды, расейцы і палякі. У параўнаньні зь імі беларусы былі бяднейшыя, больш непісьменныя і менш урбанізаваныя. Сярод іх амаль не было прадстаўнікоў сярэдняй клясы і кваліфікаваных спэцыялістаў. З гледзішча нацыянальнай сьвядомасьці, адукаванай праслойкі і фінансавых рэсурсаў беларусы адставалі ад усіх іншых нацыянальнасьцяў рэгіёну, за выняткам, мабыць, літоўцаў:

> *У 1897 г. рэсурсы, даступныя беларускаму нацыянальнаму руху, былі скрайне абмежаваныя... Сярод беларусаў амаль не было сярэдняй клясы альбо кваліфікаваных спэцыялістаў, групаў, якія паўсюль служаць апірышчам актывістаў нацыяналізму на ягоных раньніх стадыях. Урбанізацыя і індустрыялізацыя яшчэ не стварылі хоць якога знач-*

*нага беларускага пралетарыяту, здольнага служыць фокусам нацыяналістычнай агітацыі. Непісьменнасьць нагэтулькі дамінавала ў населеных беларусамі мясцовасьцях, што нацыяналісты па сутнасьці апынуліся ня ў стане знайсьці спосаб данесьці свае ідэі масам. Калі нацыяналісты хацелі заснаваць беларускамоўныя школы, каб вырашыць гэтую праблему, яны мелі ў распараджэньні толькі 64 настаўнікі на 100 тыс. беларусаў, чыя родная мова была беларускай.*

*У 1897 г. колькасьць сьвядомых, падрыхтаваных беларусаў з адпаведнымі ўменьнямі была недастатковая для таго, каб весьці інтэнсіўную і шырокамаштабную нацыяналістычную агітацыю сярод пяці з паловай мільёнаў беларусаў. Яшчэ адной сур'ёзнай перашкодай быў факт, што скрайне абмежаваныя рэсурсы, даступныя беларускаму нацыяналізму, былі шырака расьцярушаныя*[13].

У тагачаснай Беларусі не існавала таксама буйнога гораду, здольнага сканцэнтраваць абмежаваныя інтэлектуальныя і матэрыяльныя рэсурсы беларускага народу. Ягоны этнічны арэал ня меў гораду, супастаўнага значнасьцю з Рыгай у Латвіі альбо Талінам ці Тарту ў Эстоніі. У 1897 г. ніводзін буйны горад ня быў беларускім паводле свайго характару. Адно ў Магілёве беларусы складалі прыблізна чвэрць насельніцтва. У гарадох, дзе насельніцтва перавышала 20 тыс. жыхароў, беларусы складалі толькі адну сёмую частку занятых ня ў сельскай гаспадарцы работнікаў, адну пятую кваліфікаваных спэцыялістаў і адну сёмую ад тых, хто меў адукацыю, вышэйшую ад пачатковай. Вось жа, пераважная большасьць слаба мабілізаванага насельніцтва была сканцэнтраваная ў вёсках і мястэчках. Таму імавернасьць кантакту і ўзаемадзеяньня паміж нацыянальна сьвядомымі беларусамі была нізкая. Так-

[13] Guthier Steven L. The Belorussians: National Identification and Assimilation, 1897—1970. Part I: 1897—1939. Soviet Studies. Vol. 29. Jan., 1977. № 1 P. 48.

сама гарадзкая меншасьць кваліфікаваных спэцыялістаў была расьцярушаная па розных гарадох:

> *Наяўнасьць буйнога гораду, які быў бы беларускім паводле этнічнага складу і нацыянальных прыхільнасьцяў, была крытычнай умовай беларускага нацыянальнага руху. Эфэктыўны нацыяналізм меў патрэбу ў магніце, які прыцягваў бы бедныя матэрыяльныя і інтэлектуальныя рэсурсы беларускага народу. Пакуль гэтыя рэсурсы заставалася расьцярушаныя ў рэгіёне, нацыяналісты не маглі заручыцца адэкватнай падтрымкай такіх мабілізуючых фактараў, як друк, школы і тэатры на нацыянальнай мове і эфэктыўная палітычная арганізацыя. Больш за тое, прыцягваючы беларусаў з шырокага арэалу, буйны горад стымуляваў бы інтэграцыю розных беларускіх рэгіёнаў, якія ў тую пару былі слаба зьвязаныя. У першай чвэрці дваццатага стагодзьдзя Вільня і Менск спаборнічалі міжсобку на права дамінаваць у Беларусі. Аднак у 1897 г. аніводзін з гэтых гарадоў ня быў цэнтрам нацыяналізму беларусаў, якія складалі менш чым 10 адсоткаў насельніцтва кожнага гораду, а ў Вільні іх пераўзыходзілі колькасьцю тры другія нацыянальнасьці. Толькі пасьля ўтварэньня БССР у 1922 г. у Беларусі пачаў разьвівацца горад, які стаў канчатковым нацыянальным цэнтрам*[14].

Такім чынам, на мяжы XIX і XX ст. беларусы былі народам, не гатовым да доўгай нацыянальнай барацьбы. У 1897 г. такая перавага, як колькаснае дамінаваньне ў Паўночна-Заходнім краі, была патэнцыйная, але не рэальная, бо беларускія масы былі палітычна пасіўныя і нацыянальна несьвядомыя. Надзвычайную сла-

[14] Guthier Steven L. The Belorussians: National Identification and Assimilation, 1897—1970. Part 2. 1897—1939. Soviet Studies. Vol. 29. Jan., 1977. P. 48—49.

басьць беларускага нацыяналізму, якая выразілася ў яго нядольнасьці кантраляваць палітычны лёс свайго народу, Гут'е тлумачыў тым, што ягоныя патэнцыйныя прыхільнікі былі сельскай масай зь неакрэсьленым усьведамленьнем нацыянальнай ідэнтычнасьці альбо наагул безь яе[15].

Пасьля Гут'е мэтады гістарычнай сацыялёгіі для аналізу вытокаў беларускага нацыяналізму скарыстаў Павал Церашковіч[16]. Паводле яго ў пару ўзьнікненьня мадэрных нацыяналізмаў беларусы і ўкраінцы былі народамі, якія былі ў роўнай ступені падатлівыя да імпэрскіх асыміляцыйных пагрозаў. Сярод агульных прычынаў, што абцяжарылі іхнюю нацыянальную кансалідацыю, ён называе недастатковую гістарычнасьць (адсутнасьць рэальнай дзяржаўнасьці ў дамадэрнай мінуўшчыне), канфэсійную блізіню да расейцаў і запозьненую кадыфікацыю літаратурных моваў. Беларусы прайгралі спаборніцтва з украінцамі ў нацыятварэньні з прычыны большай мадэрнізацыйнай адсталасьці беларускага грамадзтва і меншай этнічнай і канфэсійнай гамагеннасьці[17].

Большы размах украінскага руху тлумачыцца розьніцай сацыяльных рэсурсаў, неабходных для нацыянальнай мабілізацыі, — адноснай шматлікасьцю ўкраінскай інтэлігенцыі і мабілізуючай сацыяльнай роляй гістарычнай памяці пра гетманшчыну. Ва ўкраінскім грамадзтве ня толькі існавалі сацыяльныя групы, здольныя рэкрутаваць са свайго асяродзьдзя нацыянальных актывістаў, але і агульная мадэрнізацыйная гатоўнасьць да ўспрыняцьця нацыянальнай ідэалёгіі была вышэйшая[18].

---

[15] Guthier Steven L. The Belorussians: National Identification and Assimilation, 1897—1970. Part 2. 1897—1939. Soviet Studies. Vol. 29. Apr., 1977. № 2. P. 282.

[16] Терешкович Павел. Украинцы и белорусы: сравнительный анализ формирования наций на фоне истории Центрально-Восточной Европы XIX — начала XX ст. // Перекрёстки. Журнал исследований восточноевропейского пограничья. 2004. № 1—2. С. 10—32.

[17] Тамсама. С. 11.

[18] Тамсама. С. 13, 15.

Грамадзтва Ўкраіны вылучалася большай этнічнай гамагеннасьцю і большай удзельнай вагой карэннага насельніцтва. Адрозна ад Беларусі, удзельная вага палякаў і жыдоў у дэмаграфічнай структуры грамадзтва была меншая, а колькасьць фармальна вольнага сельскага насельніцтва (маларасійскага казацтва) — большая (у 1817 г. 496 тыс. мужчын). Менш жорсткія формы на Ўкраіне меў прыгон — у 1834 г. 56,85 % украінскіх сялян проці 64,8 % беларускіх былі прыгонныя. У 1858 г. колькасьць прыгонных сялян на Ўкраіне ўпала да 44,24 %, а ў той жа час у Беларусі толькі да 61,8 % усяго насельніцтва. Гэта быў найвышэйшы паказьнік прыгоннай залежнасьці ў эўрапейскай частцы імпэрыі. Напрыклад, у Ковенскай губэрні колькасьць прыгонных складала ўсяго 36,9 % насельніцтва. Ва ўсёй Цэнтральна-Ўсходняй Эўропе беларусы да канца 1850-х гг. заставаліся найбольш прыгнечаным народам[19].

У сярэдзіне 1850-х гг. беларусы адставалі ад украінцаў і ў такім паказьніку сацыяльнай мабільнасьці, як колькасьць сялян у структуры гарадзкога насельніцтва. У гарадох Палтаўскай губэрні сяляне складалі 31,4 % насельніцтва, Чарнігаўскай —23,1 %, Харкаўскай — 56,5 %. У той жа час у гарадох Менскай губэрні сяляне складалі толькі 0,9 % насельніцтва, Віленскай — 1,8 %, Віцебскай — 2,4 %, Гарадзенскай —2,6 %, Магілёўскай — 6,9 %.

Нарэшце, канфэсійная структура насельніцтва на Ўкраіне, асабліва на Левабярэжжы, таксама ў большай ступені спрыяла ўзросту нацыяналізму. Для ўкраінцаў гетманшчына была не адцягненым мітам, а нядаўняй мінуўшчынай, калі палажэньне сялян было значна лепшае.

Найважнейшай прычынай, якая запавольвала разьвіцьцё ўкраінскага і беларускага нацыяналізмаў, быў выключна нізкі ўзровень ахопу насельніцтва сыстэмай адукацыі. У 1856 г. доля навучэнцаў у структуры насельніцтва Валынскай губэрні складала 0,23 %, у Падольскай — 0,25 %, Палтаўскай — 0,44 %, Кіеўскай — 0,5 %,

[19] Тамсама. С. 20—22.

Чарнігаўскай — 0,54 %, Екацярынаслаўскай — 0,92 %, Віленскай — 0,52 %, Віцебскай — 0,34 %, Гарадзенскай — 0,37 %, Менскай — 0,33 %, Магілёўскай — 0,5 %, у той час як у Ліфляндзкай губэрні — 4,62 %. Сярод украінцаў група асобаў з адукацыяй, вышэйшай ад пачатковай, складала 44 721 чалавек, сярод беларусаў — 8 320, пры гэтым на кожныя 10 тыс. украінцаў прыпадала 27,2 чалавекі з адукацыяй вышэй за пачатковую, у беларусаў — толькі 17,8. Колькасьць сялян з унівэрсытэцкай адукацыяй на Ўкраіне была ў 20 разоў большая, чым у Беларусі (348 супраць 17). Перапіс 1897 г. зафіксаваў 442 украінцы, занятых прыватнай юрыдычнай дзейнасьцю, і 467 — навукай, літаратурай і мастацтвам, сярод беларусаў такіх было адпаведна 60 і 89[20].

Калі ў Беларусі гадавы абарот складаў 25,79 руб. на душу насельніцтва, то ва Ўкраіне — 70,26. Пры гэтым паказьнікі Ўкраіны, хаця і значна саступалі латыскім (204,87), былі блізкія да эстонскіх (85,54) і значна апярэджвалі супастаўныя зь беларускімі літоўскія (39,07). У той жа час у нацыяналістычна настроенай Валынскай губэрні разьмяшчаліся найменш разьвітыя раёны — Камень-Кашырскі і Ковельскі (гадавы даход 4 і 5 руб. адпаведна). Сярэдні паказьнік разьвіцьця паўночных Валынскай і Чарнігаўскай губэрняў (адпаведна — 26,3 і 28,1) мала чым розьніўся ад сярэдніх паказьнікаў у Беларусі. Прыблізна такія ж паказьнікі былі і ў Літве[21].

Церашковіч заўважае, што асаблівую ролю ў разьвіцьці нацыянальных рухаў у Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе адыгрывала настаўніцкае асяродзьдзе, якое ўяўляла сабой масавы сацыяльны рэсурс, сацыяльную групу, зь якой рэкрутаваліся шараговыя ак-

---

[20] Терешкович Павел. Украинцы и белорусы: сравнительный анализ формирования наций на фоне истории центрально-восточной Европы XIX — начала XX ст. // Перекрёстки. Журнал исследований восточноевропейского пограничья. 2004. № 1—2. С. 10—32. С. 25.

Застаецца толькі гадаць, ці ўвайшоў Ф.Багушэвіч у лік тых 60-ці чалавек.

[21] Тамсама. С. 24. Зона эканамічнай адсталасьці супадала з тэрыторыяй пашырэньня буйнога польскага землеўладаньня на этнічна няпольскіх землях.

тывісты нацыянальных рухаў. Перапіс зафіксаваў 9 459 украінцаў і 3 207 беларусаў настаўнікаў (адпаведна 57,6 на 100 тыс. украінцаў і 67,4 на 100 тыс. беларусаў). Сярод літоўскага насельніцтва прапорцыя была яшчэ меншая — 43,6 на 100 тыс. літоўцаў. Гэты дэфіцыт быў кампэнсаваны вельмі шматлікім прадстаўніцтвам літоўцаў сярод духавенства неправаслаўных хрысьціянскіх веравызнаньняў. 958 каталіцкіх сьвятароў мелі літоўскае паходжаньне і дамінавалі сярод сваёй нацыянальнай групы (55 %), у той час як палякі ў ёй складалі толькі 37,5 %. Ва ўкраінцаў і беларусаў колькасьць праваслаўнага духавенства таксама была значная ў абсалютных паказьніках — адпаведна 18 144 і 2 363. У структуры сваіх прафэсійна-канфэсійных групаў украінцы і беларусы былі прэзэнтаваныя амаль на тым жа ўзроўні, што і літоўцы[22].

Прадстаўніцтва карэнных групаў насельніцтва ў «адміністрацыі, судзе і паліцыі», на думку Церашковіча, адлюстроўвае ўзыходную сацыяльную мабільнасьць насельніцтва. Паводле перапісу 1897 г., у гэтай сфэры былі занятыя 12 728 украінцаў (77,5 на 100 тыс.) і 3 486 беларусаў (73,2 на 100 тыс.).

Украінская і беларуская сытуацыя кардынальна адрозьніваліся доляй карэннага насельніцтва ў станавай групе купцоў. Колькасьць купцоў-украінцаў складала 4 434 чалавекі (у беларусаў толькі 225), адпаведна іх удзельная вага сярод украінскага насельніцтва складала 27 чалавек на 100 тыс., у беларусаў — толькі 4,7. Аднак у літоўцаў яна была яшчэ меншая — 4,2 на 100 тыс. Такая сытуацыя тлумачыцца ў першую чаргу слабым разьвіцьцём рынкавых адносінаў і толькі ў другую — традыцыйным дамінаваньнем у сфэры прадпрымальніцтва жыдоў. На Ўкраіне жыды складалі толькі 58,3 % купцоў у Беларусі — 91,5 %, а ў Літве — 83,1%[23].

З фармальнага гледзішча беларусы ў 1897 г. былі… найменш «сялянскім народам» захаду расейскай імпэрыі. Толькі 92,14 %

[22] Тамсама. С. 26.

[23] Тамсама. С. 27.

належала да стану сялян, у той час як у эстонцаў — 96,3 %. Зьвяртае на сябе ўвагу высокая ўдзельная вага і колькасьць шляхты ў літоўцаў (2,56 %), беларусаў (1,77 %) і ўкраінцаў (0,54 %).

У 1897 г. гарадзкая ўкраінская супольнасьць налічвала 904 тыс. чал. (32,2 % гарадзкога насельніцтва), беларуская — толькі 107 тыс. чал. (16,5%)[24]. Удзельная вага гараджан складала 5,5 % украінцаў, а сярод беларусаў — 2,2 %. Найменш урбанізаваным народам Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы былі цалкам пасьпяховыя ў пляне нацыятварэньня літоўцы: толькі 1,7 % зь іх жылі ў гарадох і складалі там толькі 7,7 % насельнікаў.

Найменшыя абсалютныя паказьнікі пісьменнасьці — адносіны колькасьці пісьменных да ўсяго насельніцтва наагул — былі сярод украінцаў (12,93 %) і беларусаў (13,5 %), між тым як у літоўцаў яны былі амаль у тры разы вышэйшыя (36,8 %), а ў латышоў — 70,93 % і эстонцаў — 80,0 %.

Гэты паказьнік не знаходзіўся ў беспасярэдняй залежнасьці ад узроўню эканамічнага разьвіцьця. У латышоў ён быў ніжэйшы, чым у эстонцаў, а ў украінцаў вышэйшы, чым у беларусаў. Хоць узроўні эканамічнага разьвіцьця Беларусі і Літвы былі блізкія, паказьнікі адукаванасьці адрозьніваліся даволі заўважна. Прычыны адрозьненьняў палягалі ў рэгіянальных і канфэсійных традыцыях. Прыналежнасьць да пратэстантызму ў найбольшай, а да праваслаўя ў найменшай ступені спрыяла пашырэньню пісьменнасьці[25].

Маркерам каталіцкай і праваслаўнай традыцыяў быў падыход да адукацыі жанчын. Дадзеныя з чатырох губэрняў (Менскай, Магілёўскай, Віцебскай і Гарадзенскай) сьведчаць, што адукаванасьць сярод каталікоў (29,9 %) у 2,6 разы перасягала гэты паказьнік сярод праваслаўных (11,1 %). Пры гэтым калі розьніца ў адукацыі паміж мужчынамі-каталікамі (33,5 %) і праваслаўнымі (19,5 %) складала 1,7 разы, дык паміж жанчынамі-каталічкамі

[24] Тамсама. С. 28.

[25] Тамсама. С. 28—29.

(24,9 %) і праваслаўнымі (3,0 %) — восем разоў. Акурат вялікая ўдзельная вага каталікоў сярод пісьменных беларусаў (13,4 %) у параўнаньні з украінцамі (2,0 %) і забясьпечыла беларусам вышэйшы сярэдні ўзровень адукацыі.

Такім парадкам, масавая пісьменнасьць была вырашальным фактарам падтрымкі нацыянальных рухаў, а маштаб украінскага нацыянальнага руху значна перасягаў беларускі з прычыны вышэйшага ўзроўню мадэрнізацыі:

> *Посьпех шмат у чым залежыць ад балянсу паміж тымі, хто можа сфармуляваць нацыянальную праграму, і крытычнай масай тых, хто здольны на яе адэкватна адрэагаваць. Украінцы валодалі значнымі сацыяльнымі рэсурсамі, якія забясьпечылі выпрацоўку нацыянальнай дактрыны, але адсутнасьць масавай падрыхтаванай аўдыторыі рабіла іхні рух надзвычай уразьлівым што да імпэрскай рэпрэсіўнай палітыкі. Беларускі рух таксама сутыкаўся з праблемай адсутнасьці аўдыторыі, валодаў значна меншымі інтэлектуальнымі рэсурсамі, што ня мелі ўласных цэнтраў інстытуцыяналізацыі. Аднак літоўскаму руху, які адчуваў ня меншы ціск, чым украінскі, знаходзіўся ў куды больш складаных мадэрнізацыйных умовах, акурат дзякуючы балянсу сацыяльных рэсурсаў удалося стаць масавым і ўрэшце дамагчыся посьпеху*[26].

У *каляніяльнай* лёгіцы позьні старт беларускага нацыяналізму ёсьць прыватнай праявай усеагульнай зьмешанасьці, забітасьці і безжыцьцёвасьці беларусаў-плебеяў. Гэты ўгрунтаваны на *расісцкім* мысьленьні падыход сьцьвярджае, што з гледзішча слабасьці кансалідуючых нацыянальных сувязяў, нізкай ступені нацыянальнай сьвядомасьці беларусы ёсьць самым адсталым грамадзтвам Эўропы.

[26] Тамсама. С. 30.

Паводле Радзіка[27], прычыны слабасьці беларускага нацыяналізму былі зьвязаныя са зьместам культуры беларусаў, асаблівасьцю сацыяльнай структуры («сялянская» нацыя) і палітыкай уладаў. Нацыянальная ідэалёгія фармуецца з дапамогай звароту да нацыянальнай культуры. Калі культура польскага плебсу апэратыўна засвойвала культурныя ўзоры, выпрацаваныя польскімі элітамі, дык беларускае грамадзтва ў непрапарцыйна высокай ступені падпала пад уплыў сялянскай культуры. У беларускай вёсцы XIX ст. элемэнты гістарычнага мысьленьня былі невыразныя. Гэтым беларусы сур'ёзна адрозьніваліся ад украінцаў і іншых суседніх сялянскіх народаў. Адрозна ад украінцаў, беларусам не ставала ўсьведамленьня былой дзяржаўнасьці. У беларускім фальклёры не было папулярных песень, легенд і іншых вусных паданьняў, у якіх бы культываваліся традыцыі ўласнай палітычнай своеасаблівасьці, апяваліся б уласныя перамогі і героі, папулярызаваліся б былыя правы і адчувалася б туга за былой свабодай. Апрача таго, Беларусь ніколі не была вэстэрнізаванай тэрыторыяй — і гэта заўважалі паэты і падарожнікі.

У гэтай лёгіцы важным элемэнтам, які затрымаў разьвіцьцё нацыянальнай культуры, была прыземленая і пазбаўленая вытанчанасьці ці то мова, ці то пераходнае «наречие» паміж польскай і расейскай мовамі, а таксама разумовае ўбоства беларусаў:

> *Сучасная літаратурная беларуская мова пачала фармавацца ў XX стагодзьдзі... Сьвядомасьць беларускіх сялян увасаблялася ў паняцьцях, якія адпавядалі іх разуменьню акаляючай сацыяльнай рэчаіснасьці. Іх мова не была распрацаваная настолькі, каб ёй можна было апісваць сьвет у нацыянальных катэгорыях. Яна ня мела адпаведнага багацьця абстрактных паняцьцяў. Эма Яленьска пісала пра палешукоў*

[27] Гл. Радзік Рышард. Прычыны слабасці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX і XX стагоддзях // Край. 2002. № 5.

*на мяжы 80-х і 90-х гадоў XIX стагодзьдзя: «Паняцьці абстрактныя ня маюць ніякага доступу да іхняга розуму»*[28].

Урадавыя абмежаваньні на выкарыстаньне беларускай мовы ня выклікалі росту нацыяналістычных настрояў, бо беларуская мова была блізкай да польскай і расейскай:

> *У Расейскай імпэрыі ані ў царкве, ані ў школе не вучылі грамаце па-беларуску. Пісьменныя сярод беларусаў ужо ўмелі чытаць па-польску ці па-расейску. Таму з забароны на беларускую мову беларускім дзеячам не было ніякай карысьці: не было людзей, якім бы не ставала беларускай мовы, як летувісам не ставала летувіскай... Беларуская мова апынулася ў самым незайздросным становішчы: некадыфікаваны славянскі дыялект нізкага статусу, які, паводле сваіх марфалягічных рысаў, знаходзіўся паміж польскай і расейскай мовамі, а ягоныя носьбіты ў грамадзтве знаходзіліся паміж польскай культурай і расейскай уладай. Гэтак лінгвістычная выпадковасьць перадвызначыла ступень уплыву нацыянальных дзеячоў на мясцовае насельніцтва*[29].

Повязі, якія лучылі масы з Праваслаўнай Царквой альбо Каталіцкім Касьцёлам, іх культурнай і цывілізацыйнай базай, што атаесамлялася з расейскасьцю альбо польскасьцю, былі настолькі магутныя, што «прабіцца» празь іх беларускі нацыя-

---

[28] Гл. Радзік Рышард. Прычыны слабасці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX і XX стагоддзях // Край. 2002. № 5.

[29] Гл. Snyder Timothy. The Reconstruction of Nations. Poland, Ukraine, Lithuania, Belarus 1569—1999. New Haven: Yale University, 2003. 367 p. Цыт. пав. перакладу: Снайдэр Тыматы. Адбудова нацый. Польшча, Украіна, Летува, Беларусь. Спрэчкі за літоўска-беларускую Айчыну. Дзеяслоў. № 11—13. 2004.

[30] Гл. Радзік Рышард. Прычыны слабасці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX і XX стагоддзях // Край. 2002. № 5.

нацыяналізм ня здужаў. Беларуская культура не ўспрымалася масамі ў якасьці рэальнай, прывабнай альтэрнатывы расейскай і польскай культураў. Яна атаесамлялася з простым людам, што адсякала ад яе «клясава варожую» эліту і падзеі шматвекавой гісторыі.

Таму беларускі нацыяналізм пачаў фармавацца позна і быў слабы. Беларускія масы былі адсталыя і няздольныя засвоіць ідэі ўжо ўзьніклага беларускага нацыяналізму. Сацыяльная база ягонага ўплыву ў выніку рэпрэсіўнай актыўнасьці царскай адміністрацыі была вузкая. Падобнымі значнасьцю прычынамі ягонай запозьненасьці былі:

> *З аднога боку, няздольнасьць — прынамсі да канца мінулага стагодзьдзя [XIX — Аўт.] — пераважнай большасьці беларускага сялянства да ўспрыняцьця хоць якой-небудзь нацыянальнай ідэі, а з другога — адсутнасьць у беларускім грамадзтве праслойкі, якая была б зацікаўленая ў стварэньні нацыі і адначасова магла б пасьпяхова падтрымаць працэс яе разьвіцьця. Такой праслойкай стала ва Ўсходняй Галіччыне грэка-каталіцкае духавенства, у Літве — значная частка рыма-каталіцкага духавенства літоўскага паходжаньня*[30].

Напасьледак, ёсьць вэрсія, што няздольнасьць беларускага нацыяналізму пабудаваць мадэрную беларускую нацыю — «вынік выпадковага зьбегу грамадзка-палітычных акалічнасьцяў, якіх ня вытлумачыць з гледзішча тэорыі нацыяналізму, і таму ён заслугоўвае на ўвагу гісторыкаў»[31].

Вайсковыя, камунікацыйныя і энэргетычныя інтэрпрэтацыі ўяўляюць сабой абстрактныя тэарэтычныя канструкцыі, якія ігна-

[31] Гл. Snyder Timothy. The Reconstruction of Nations. Poland, Ukraine, Lithuania, Belarus 1569—1999. New Haven: Yale University, 2003. P. 367. Цыт. пав. перакладу: Снайдэр Тыматы. Адбудова нацый. Польшча, Украіна, Летува, Беларусь. Спрэчкі за літоўска-беларускую Айчыну // Дзеяслоў. № 11—13. 2004.

руюць той факт, што Беларусь часоў Рэчы Паспалітай была крайняй пэрыфэрыяй заходняга сьвету, і падспудна адмаўляюць дамінаваньне заходняй польскай высокай культуры аж да сярэдзіны XIX ст. на беларускіх землях. Да таго ж, нацыятварэньне пасьпяхова ішло на тэрыторыях з прыблізна аднолькавым узроўнем прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі, напрыклад, на паўночным захадзе Ўкраіны (Валынь). На нямецкіх землях, дзе падчас вайны 1618—1648 гг. людзкія страты склалі амаль да паловы насельніцтва, яно мінімум на стагодзьдзе апярэджвала беларускае. Квазіаб'ектыўныя і неймаверныя культурныя трактоўкі, што зводзяцца да забароны назвы Беларусь, кнігадрукаваньня на беларускай мове і пад. Слабая нацыянальная назва альбо неразьвітае кнігадрукаваньне — не прычына, але вынік слабага нацыятварэньня. Адну з прычын ягонай запаволенасьці можна бачыць у тым, што «Беларусь» як нацыянальная назва, адрозна ад «Украіны», была імпэрскім ноў-хаў, і асноўная праца дзеля яе пашырэньня легла на імпэрскі апарат, а не на нацыянальных актывістаў. З гэтай прычыны яе нацыянальнае, а не геаграфічнае або племянное вымярэньне зь цяжкасьцю ўспрымалася народнымі масамі. Асобныя нацыяналісты паглыблялі праблему сваімі заклікамі адмовіцца ад гэтай слабай назвы на карысьць больш моцнай, але значна больш чужой і незразумелай масам. Замест таго, каб пашыраць нацыяналістычныя ідэі, яны ўвязваліся ў схалястычныя дыспуты і безвыніковыя ідэалягічныя кампаніі.

Роля рэлігійных фактараў, у прыватнасьці ўніяцкай канфэсіі, у справе беларускага нацыяналізму беспадстаўна пераацэньваецца. Мовай Уніяцкай Царквы ў Беларусі стагодзьдзямі была польская, і яшчэ пытаньне, як бы паявіла сябе ўніяцкая герархія, калі б сутыкнулася зь беларускім нацыяналізмам. Зьнішчэньне Ўніяцкай Царквы ў беларускім выпадку ў найлепшым разе паўплывала не на нараджэньне нацыяналізму, а на гіпатэтычную хуткасьць ягонага пашырэньня. Досьвед украінскай Галіччыны паказвае, што посьпех нацыяналізму прадугледжвае ўзаемадзеяньне розных сацыяльных слаёў. Патрабуюцца ня толькі нацыянальныя ідэолягі, але і адносна лібэральны палітычны рэжым, а так-

сама каналы сацыяльнай камунікацыі, празь якія ідэі авалодваюць масамі. (Ва ўкраінскім выпадку яны забясьпечваліся ўніяцкім духавенствам.)

Іншымі словамі, уніяцкая герархія магла б стаць адным з каналаў пашырэньня ідэалёгіі беларускага нацыяналізму, але ня стала. Цяпер ролю такіх каналаў выконваюць сыстэма адукацыі, мас-мэдыі і армія — і ўлада спакойна дазваляе на спробы адраджаць Беларусь у малатыражных выданьнях, няздольных уплываць на масавую грамадзкую думку.

Навеяныя марксісцкай мэтадалёгіяй эканамічныя трактоўкі ў прынцыпе ігнаруюць кантэкст канфліктных дыскурсаў і канкурэнтных нацыянальных ідэнтычнасьцяў. Апрача таго, ідэя, што беларускі нацыяналізм узьнік дзеля жаданьня польскай шляхты насаліць расейскай уладзе, прыніжае культурны і этнічны капітал беларусаў (своеасаблівасьць мовы, традыцыяў, этнаграфічных адметнасьцяў, этнічнай салідарнасьці) і рэдукуе сацыяльныя перадумовы беларускага нацыяналізму да кароткатэрміновай прыхамаці сацыяльных груп, што нібыта стаялі за ягоным узьнікненьнем. «Вялікія рэформы» былі толькі адным з фактараў, які пахіснуў традыцыйныя сацыяльныя дачыненьні і ідэнтычнасьці ў Беларусі. Існавалі і іншыя катэгорыі шокаў вонкавага, заходнеэўрапейскага паходжаньня, незалежныя ад дзяржаўнай палітыкі.

Трактоўкі, якія падкрэсьліваюць адсутнасьць або нізкую якасьць беларускіх эліт, часьцяком мэханічна насьледуюць заходняй тэорыі нацыяналізму. Прынята ўважаць, што посьпех нацыяналізму залежыць ад узроўню культурных рэсурсаў і адукацыі: там, дзе культурныя рэсурсы бедныя, «як у славян і афрыканцаў» (Джон Пламенац), нацыяналізм ёсьць пераймальным і канкурэнтным. Паводле Гроха, мадэль пасьпяховага нацыянальнага руху ўлучае ў сябе сама меней чатыры элемэнты: 1) крызіс легітымнасьці, зьвязаны з сацыяльнымі, маральнымі і культурнымі дэфармацыямі; 2) базісны ўзровень вэртыкальнай сацыяльнай мабільнасьці (пэўная колькасьць адукаваных людзей павінна прыйсьці зь недамінантнай этнічнай групы); 3) даволі высокі ўзровень сацыяльнай камунікацыі, у тым ліку адукацыі,

школьнай падрыхтоўкі і рынкавых адносінаў; 4) канфлікты інтарэсаў нацыянальнага характару[32].

Адзіны сродак, які застаецца ў распараджэньні мясцовых эліт на каляніяльных тэрыторыях, — гэта маса народу; а іхні нацыяналізм ёсьць вынікам пратэсту супраць уварваньня аўтарытарных, мілітарысцкіх дзяржаваў у сфэру сямейнага жыцьця, рэлігіі і адукацыі. Акурат адчужэньне, якое ўзьнікае ў выніку расколу паміж дзяржавай і грамадзтвам пры наяўнасьці дзяржаўнай цэнтралізацыі і капіталістычных адносінаў, сілкуе нацыяналізм. Бунт усходнеэўрапейскіх інтэлектуалаў быў выкліканы іхняй няздольнасьцю перасоўвацца па бюракратычнай лесьвіцы, бо іх адукацыя, таленты і годнасьці адкідаліся непразрыстай, але ўсёпранікальнай імпэрскай дзяржавай[33].

Эўрыстычная вартасьць гэтага падыходу ў выпадку «беспасьпяховага» беларускага руху невысокая: ён можа хіба што патлумачыць індывідуальныя матывацыі таго ці іншага актывіста далучыцца да нацыянальнага руху. Да таго ж ягоныя адэпты часта спрабавалі даказаць недаказальнае — маўляў, сьпярша зьявіліся нацыяналістычна настроеныя эліты, а потым выпадкова замацавалася няправільная нацыянальная назва, упала літаратурная актыўнасьць і сышла на нішто грамадзкая дынаміка.

Адукацыйная гіпотэза ніяк не праясьняе, чаму заснаваны ў 1803 г. Віленскі ўнівэрсытэт не паўплываў на разьвіцьцё беларускага нацыяналізму альбо, хутчэй, інтэгральным польскім нацыяналізмам сваіх студэнтаў і выкладчыкаў толькі адсунуў у часе ягонае ўзьнікненьне, між тым як заснаваны ў 1805 г. Харкаўскі, можна сказаць, і спарадзіў украінскую нацыянальную ідэю. Тэорыя «П'емонту» таксама няздольная патлумачыць, чаму нара-

---

[32] Грох Мирослав. От национальных движений к полностью сформировавшейся нации: процесс строительства наций в Европе // Нации и национализм. Москва: Праксис, 2002. С. 133.

[33] Смит Энтони. Национализм и модернизм. Критический обзор современных теорий наций и национализма. Москва: Праксис, 2004. С. 179.

джэньне ўкраінскага руху адбылося на ўсходзе Украіны, інкарпарацыя якога ў склад Расейскай імпэрыі адбылася на сто гадоў раней за першы падзел Рэчы Паспалітай.

Сацыялягічныя тлумачэньні пакутуюць на хранічную падмену паняцьцяў. Замест аналізу прычынаў запозьненасьці беларускага нацыяналізму яны прапануюць аналіз эканамічных (сацыяльная мабільнасьць), адукацыйных і дэмаграфічных перадумоваў ягонага ўзьнікненьня і сацыяльных каналаў (школа, друк, царква) ягонага пашырэньня.

Яны навязваюць атаясамленьне ягоных інтэлектуальных рэсурсаў з сацыяльнымі (ролю ідэяў і мадэляў тут выконваюць сацыяльныя праслойкі, напрыклад, адвакаты). Ім таксама ўласьцівае ўспрыманьне беларускага нацыяналізму і нацыянальнай ідэнтычнасьці як нейкай сталай велічыні.

Сакрамэнтальная выснова пра «апераджальнае разьвіцьцё ўкраінскага руху ў параўнаньні зь беларускім у другой палове XIX стагодзьдзя»[34] да таго ж паказвае неразуменьне элемэнтарнага: беларускі нацыяналізм не вытрымлівае параўнаньня з украінскім у XIX ст., бо ў той час як грамадзкая зьява ён проста не існаваў.

Нараканьні на нераспрацаванасьць і беднасьць беларускай мовы як першапрычыну адсталасьці беларускага нацыяналізму і краху беларускай дэмакратыі ў сярэдзіне 90-х гг. XX ст. зазвычай выходзяць ад асобаў, якія трывала засвоілі каляніяльны пагляд на беларускую культуру. Навуковая вартасьць гэтага аргумэнту прыблізна роўная аргумэнту «я не гавару па-беларуску, бо гэтая мова кепская». Беспадстаўнасьць гэтых сьцьверджаньняў выразна паказвае факт узьнікненьня на пачатку XIX ст. мадэрнага ўкраінскага нацыяналізму. У ягонай аснове ляжаў культ украінскай мовы, лексычны склад якой амаль на 90% супадае зь беларускай.

---

[34] Терешкович Павел. Украинцы и белорусы: сравнительный анализ формирования наций на фоне истории Центрально-Восточной Европы XIX — начала XX ст. // Перекрёстки. Журнал исследований восточноевропейского пограничья. 2004. № 1—2. С. 23.

Яўна анахранічныя каляніяльныя тэорыі і цяпер палымяна адмаўляюць Беларусі ў праве на суб'ектнасьць і пры яе абмеркаваньні карыстаюцца двухбаковым польска-расейскім дыскурсам. Толькі Расея і Польшча прызнаюцца гульцамі ў геапалітычнай гульні, у часе якой нібыта ў адказ на стварэньне асобнага расейскага рэгіёну з мэтай пахіснуць польскую магутнасьць у заходняй частцы імпэрыі палякі сканструявалі на базе таго самага рэгіёну новую эўрапейскую нацыю з мэтай аслабіць усю імпэрскую сыстэму.

У варыянце Радзіка яны грунтуюцца на апрыёрным дапушчэньні асаблівай культурнай місіі Польшчы як культуртрэгера і самі па сабе ёсьць прадуктам польскай нацыяналістычнай міталёгіі.

Тэзу, што разгортваньню беларускага нацыяналізму перашкаджаў нізкі культурны ўзровень беларусаў, лёгка зьбіць на польскім жа матэрыяле. Адносна выразная артыкуляцыя нацыянальнай ідэнтычнасьці сярод сялян этнічна польскага паходжаньня прыпадае на пару рэвалюцыі 1905—1907 гг. і ў большай ступені на пару першай сусьветнай вайны. У канцы XIX ст. польскім сялянам «zaboru rosyjskiego» была таксама ўласьцівая высокая ступень непісьменнасьці, адсутнасьць нацыянальнай сьвядомасьці і інтарэсу да грамадзкіх справаў.

Не вытрымлівае крытыкі і аргумэнт аб сацыяльнай структуры беларускага грамадзтва. За выняткам палякаў, усе этнічныя нацыі заходняй часткі Расейскай імпэрыі ўвайшлі ў эпоху т.зв. нацыянальнага адраджэньня ў няпоўным сацыяльным складзе, распадаючыся на дзьве непрапарцыйныя часткі — сялянскую масу і вузкую інтэлігенцкую праслойку.

Вось жа, прычына ня ў простым народзе — ён паўсюль у Эўропе меў патрэбу ў культурных узорах, вытворчасьць якіх нідзе на кантынэнце не была ягонай функцыяй.

Разнабой гэтых трактовак прыпазьненьня беларускага нацыяналізму ўзьнік дзеля таго, што іх аўтары прытрымліваліся парадыгмы марксісцка-ленінскай альбо нацыяналістычнай тэлеалёгіі, выходзячы зь якой, нацыя ёсьць лягічным вынікам усяго папярэдняга гістарычнага разьвіцьця. Паколькі ўсё папярэдняе разьвіцьцё мела мэтай узьнікненьне беларускай нацыі, патлумачыць яе зьяў-

леньне можна любой падзеяй альбо фактам з гісторыі Беларусі. У рамках гэтай парадыгмы любы тэкст на беларускай мове сьведчыў пра схаваную альбо яўную беларускую нацыянальную сьвядомасьць (досыць паслухаць спарадычныя прамовы прэзыдэнта Лукашэнкі па-беларуску, каб зразумець, што гэта ня так).

Гэтая парадыгма ўладарна скрыўляе нашае бачаньне мінулага. Застаючыся закладніцай тэксту, зразуметага як знак нацыянальнай ідэнтычнасьці, яна груба падганяе час узьнікненьня беларускага нацыяналізму пад дату зьяўленьня нейкай літаратуры на беларускай мове. Мабыць, каб неяк патлумачыць фэномэн Яна Баршчэўскага, Ігар Бабкоў перанёс час нараджэньня беларускага нацыяналізму на канец XVIII ст.:

> *Ад канца XVIII ст. на адной тэрыторыі, у межах аднаго грамадзтва адбываліся тры адрозныя нацыягенэзы, тры працэсы фармаваньня сучасных нацыяў: польскай, беларускай і літоўскай. Гэтыя працэсы сутыкаліся між сабой у межах адной прасторы, і ў выніку ўзьнікла тая шматлікасьць рэпрэзэнтацый і праектаў, якая была характэрнай рысай XIX ст.*[35].

Яе ахвярамі сталіся Раман Шпарлюк, які зьвязаў старт беларускага нацыяналізму зь літаратурнай творчасьцю Яна Чачота і іншых гадаванцаў Віленскага ўнівэрсытэту, што калісьці штосьці напісалі па-беларуску[36], і Дж. Стэнлі, які ўбачыў у дзейнасьці К. Каліноўскага зародкі беларускага нацыяналізму[37].

---

[35] Ігар Бабкоў. Філасофія Яна Снядэцкага. Мінск — Вільня. Фрагмэнты; І. Логвінаў. 2002. С. 20.

[36] Пар. Roman Szporluk. The Making of Modern Ukraine: The Western Dimension. Harvard Ukrainian Studies. Volume XXV (1/2). 2001. P. 57—90.

[37] Stanley J.T. The Birth of a Nation: The January Insurrection and the Belorussian National Movement // The Crucial Decade: East Central European Society and National Defense, 1859—1870. New York: Columbia University Press, 1984. P. 195.

Больш рэалістычнай была ацэнка апалягета цяперашняй афіцыёзнай гістарыяграфіі Якава Трашчанка. Праўда, намагаючыся прадвызначыць зьяўленьне Багушэвіча і будучы відавочна пад уплывам паведамленьняў А. Цьвікевіча аб беларускіх гуртках сярод студэнцкай моладзі ў апошнія дзесяцігодзьдзі XIX ст., ён так і ня здолеў уцяміць, што сьпярша зьявіліся творы Багушэвіча, і толькі пасьля іх узьніклі нацыяналістычныя гурткі:

> *Пачынаючы з 80-х гг. XIX ст. у асяродзьдзі дробнай каталіцкай шляхты, якая яшчэ не забылася пра сваё паходжаньне, сталі ўзьнікаць беларускія нацыяналістычныя гурткі. Яны сьпярша высоўвалі патрабаваньні культурнай аўтаноміі, але, не займеўшы падтрымкі ні ва ўласным палянізаваным асяродзьдзі, ні сярод народу, нацыянальнай праблемай ніяк не заклапочанага і які бачыў у іх панічоў, якім «лой скуру пад'ядае», хутка радыкалізаваліся. Дзеячы гурткоў прыйшлі да перакананьня, што для таго, каб «будзіць сьпячы народ», прыдатныя ўсе сродкі, а чым вастрэйшыя, тым лепш*[38].

Безумоўна, перад намі складаны культурны рэфлекс, які дэфармуе крытэры пазнаньня і ссоўвае сэнсавыя акцэнты. Вялікая частка беларускіх аўтараў рэфлекторна архаізуе і міталягізуе беларускі нацыяналізм, намагаючыся схаваць ягоныя вытокі як мага глыбей у гісторыю і тым самым асьвяціць, увекавечыць нацыянальную традыцыю. Заходнія аўтары, наадварот, тыпізуюць ягоны фэномэн, падганяючы пад агульны стандарт, лёгіку і храналёгію нармальнага эўрапейскага нацыяналізму. Пры гэтым яны ўнікаюць самастойнай працы зь беларускімі тэкстамі і змушаныя некрытычна ўспрымаць гатовыя чужыя тэзы.

---

[38] Трещенок Я.И. История Беларуси. Досоветский период. Часть 1. Могилев: МГУ имени А.А. Кулешова, 2004. С. 252.

Гэтая парадыгма таксама прадугледжвае наступны ланцужок высноваў: запозьнены нацыяналізм — слабае разьвіцьцё нацыянальнай сьвядомасьці — Беларусь як культурна адсталы рэгіён, адпаведны больш Азіі ці Афрыцы, чымся Эўропе. У яе рамках прынята таксама лічыць, што беларускі нацыяналізм запачаткаваў гістарычна першы працэс нацыятварэньня ў Беларусі. Як пісаў Р. Ліндэр, «параўнаньне з украінскай сытуацыяй дазваляе гаварыць аб блякаваньні разьвіцьця інтэлектуальных перадумоваў пабудовы нацыі ў Беларусі»[39].

Чытаньне твораў Багушэвіча дае іншую пэрспэктыву, якая ў нечым супадае з ацэнкамі Э. Сьміта і М. Гроха, а дзе-нідзе ўдакладняе іх.

Асноўная прычына запозьненасьці беларускага нацыяналізму — не матэрыяльная, а ідэйная. З чатырох асноўных этнічных супольнасьцяў Рэчы Паспалітай рэгіён пражываньня беларусаў быў найбольш уразьлівы з пункту гледжаньня ўласных гістарычных традыцыяў.

Натуральным зыходным пунктам для канструяваньня ўяўленьняў аб мінуўшчыне беларусаў была гістарычна першая форма дзяржаўнасьці на беларускіх землях — Полацкае княства, якое ўзьнікла і ўмацавалася на мяжы першага і другога тысячагодзьдзяў. Адной з найбольш трагічных падзеяў для беларускага нацыяналізму было выцясьненьне ў летапісаньні ВКЛ усялякай памяці аб Полацкім княстве як форме дзяржаўнасьці беларусаў і як апатэоз — сымбалічны перанос княжаньня першага летапіснага полацкага князя Рагвалода з Полацку ў Пскоў у хроніцы Мацея Стрыйкоўскага[40].

---

[39] Lindner R. Historiker und Herrschaft. Nationsbildung und Geschichtspolitik in Weissrussland im 19. und 20. Jahrhundert. München: R. Oldenbourg Verlag, 1999. S. 69.

[40] Болей на тэму выцясьненьня памяці аб сярэднявечнай беларускай гісторыі ў гістарыяграфіі ВКЛ гл. Łatyszonek O. Polityczne aspekty przedstawienia średniowiecznych dziejów ziem białoruskich w historiografii Wielkiego Księstwa Litewskiego XV—XVI w. // Беларускі гістарычны зборнік — Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 25.

Ужо ў XV—XVI ст. ня толькі этнічны арэал беларусаў пазбаўляўся глыбокай гістарычнай традыцыі, але і руская культура згубіла ўсялякі прэстыж, пра што сьведчыла імклівая палянізацыя рускай арыстакратыі яшчэ да ўкладаньня Люблінскай уніі[41].

Усходнеславянскія землі былі інкарпараваным у ВКЛ дамініёнам. Каб эфэктыўна кіраваць ім, яна зьнішчала парасткі асаблівай гістарычнай, рэлігійнай альбо культурнай сьвядомасьці беларусаў. У гэтым сэнсе мэханізмы панаваньня надзвычай кансэрватыўныя і не мяняюцца стагодзьдзямі. Рэжым Лукашэнкі выкарыстоўвае мэтады, з посьпехам апрабаваныя яшчэ літоўскімі фэадаламі.

Тое, што рэгіён «Беларусь» не валодаў хоць якой значнай гістарычнай традыцыяй і адсутнічаў на мэнтальнай мапе Ўсходняй Эўропы аж да другой паловы XIX ст., траўмавала сьвядомасьць навасьпечаных беларускіх нацыяналістаў і штурхала іх на спробы атрыбуцыі гісторыі альбо літаратуры ўсяго Вялікага Княства Літоўскага як беларускай. Грубай кампэнсацыяй гэтай траўмы выглядае прэзэнтацыя князя Міндоўга альбо Вітаўта як беларускага Хмяльніцкага.

У адрозьненьне ад літоўцаў альбо ўкраінцаў, на пачатку XIX ст. у беларусаў не было гістарычнай традыцыі дзяржаўнасьці, якую можна было лёгка прысвоіць. Апрача таго, літоўцы здалелі пазьбегнуць буйнамаштабнай асыміляцыі, а як выявілася, украінцы валодалі важным нацыятворчым рэсурсам у выглядзе

[41] Сацыяльны вобраз рускага недарэкі быў настолькі трывалы ў шляхецкай культуры Рэчы Паспалітай, што, як паказаў Дэвід Фрык, рускім інтэлектуалам XVII ст., каб дасягнуць статусу «палітычнага паляка», даводзілася ўсяляк дыстанцыявацца ад яго і мяняць пазыцыі ў канфэсійных і культурных войнах. Пар. Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 69.

Імкненьне Яна Станкевіча альбо Вацлава Ластоўскага ў XX ст. адмовіцца ад «рускасьці», прапагандуючы альтэрнатыўныя Беларусі нацыянальныя назвы — «Крывія» і «Вялікалітва», можна вытлумачыць узьдзеяньнем гэтай застарэлай псыхалягічнай траўмы.

праваслаўнай шляхты карэннага паходжаньня. У адрозьненьне ад Украіны, у XIX ст. не ўзьнікала хоць якой значнай літаратуры на беларускай мове, напісанай праваслаўнай шляхтай — у момант далучэньня беларускіх земляў да Расейскай імпэрыі фактычна ўся шляхта была каталіцкага веравызнаньня.

Запозьненасьць беларускага нацыяналізму што да іншых усходнеэўрапейскіх нацыяналізмаў была зьвязаная з тым, што для ягонага ўзьнікненьня доўгі час адсутнічала крытычная ўмова ў выглядзе асьвечанага традыцыяй гістарычнага рэгіёну «Беларусь». Ня столькі мадэрнізацыя грамадзтва, колькі канструяваньне ўяўленьняў аб такім рэгіёне было рамкавай умовай ягонага зьяўленьня. Гэтая праца ў другой палове XIX ст. легла на расейскую навуку. Сфармуляваць дактрыну беларускага нацыяналізму можна было толькі ў Расейскай імпэрыі, а не па-за яе межамі.

Пасьля *канструяваньня імпэрскага рэгіёну* другой паводле значнасьці прычынай зьяўленьня нацыяналізму былі *украінскія інсьпірацыі*, што далі Ф. Багушэвічу гатовыя мадэлі і ўзоры для вырабу міту нацыянальнага адраджэньня. Нельга і скідаць з рахунку і *заходнеэўрапейскія ўплывы*, што проста ці ўскосна ўзьдзейнічалі на створаныя Ф. Багушэвічам наратывы. Далей варта адзначыць і *крызіс польскага нацыяналізму* пасьля студзеньскага паўстаньня 1863 г. Да гэтай падзеі прастора Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. успрымалася палякамі як тэрыторыя будучай польскай імпэрыі, а Смаленск і Кіеў — як яе неад'емная частка. Панавала імпэрская вера польскіх рамантыкаў, што Польшча можа стаць палітычным лідэрам усёй усходняй Эўропы, незалежным ад царскай Расеі і аб'яднанай Нямеччыны.

Хоць беларусы, што мелі польскую нацыянальную сьвядомасьць, і ўдзельнічалі ў паўстаньні 1863 г., цягам яго стала відавочна, што паміж польскай шляхтай і беларускім сялянствам існуе непераадольны культурны і клясавы бар'ер, а таксама нарастае рэлігійная дыстанцыя. Выкліканы разьвейваньнем утапічных спадзеваў на мужычка крызіс справакаваў хвалю крытыкі гэтай рамантычнай веры. Узьнікае канцэпт будучай Польшчы як талерантнай палітычнай супольнасьці, а рамантычная вера ў

спэцыфічныя цноты палітычнай культуры і цывілізацыі Рэчы Паспалітай паступова згасае. Гісторыкі кракаўскай школы вяртаюцца да разуменьня Рэчы Паспалітай як адсталай краіны, якая патрабавала мадэрнізацыі паводле заходняй мадэлі і прыняцьця традыцыі, прадстаўленай такімі цэнтралізаванымі дзяржавамі, як Францыя і Прусія. Яны аддаюць перавагу малой Польшчы, сканструяванай строга паводле заходніх цывілізацыйных і палітычных узораў.

Фэдэралісцкая ідэалёгія палякаў пасьля 1863 г. прадугледжвала адмову і ад уцягненьня любым коштам сялян няпольскага паходжаньня ў працэс польскага нацыятварэньня. Этнічным супольнасьцям былой Рэчы Паспалітай было нарэшце дазволена выбудоўваць свае асаблівыя нацыянальныя ідэнтычнасьці. Беларусь, Украіна і Літва пачынаюць успрымацца як фэдэрацыйныя часткі будучай польскай дзяржавы. Гэты зрух санкцыяваў большую свабоду для польскай інтэлігенцыі няпольскага этнічнага паходжаньня ў выбары і маніфэстацыі сваёй ідэнтычнасьці.

Нарэшце, апошняя прычына *глыбока асабістая* і зьвязаная з *індывідуальнасьцю* Ф. Багушэвіча. У сацыяльнай псыхалёгіі існуе гіпотэза, што неабходнасьць у новай ідэнтычнасьці варта разумець як вынік крызісу ранейшых ідэнтычнасьцяў, як адказ на паразу старых вартасьцяў і сацыяльных сувязяў ва ўмовах няпэўнасьці, выкліканай сацыяльнымі і палітычнымі трансфармацыямі[42].

Скрыжаваньне ідэнтычнасьцяў у Багушэвіча гаворыць пра іхні крызіс. Ягоная польская ідэнтычнасьць станавілася анахранічнай — яна не дазваляла жыць без згрызотаў сумленьня згодна з мадэрным часам і сацыяльным ладам.

У паэзіі і эпісталярыі[43] Багушэвіча адлюстравана рэакцыя на шырокі сацыяльны і культурны крызіс, які ня зводзіцца да кры-

---

[42] Гл. Hroch Miroslav. From ethnic group toward the modern nation: the Czech case // Nations and Nationalism. № 1/2. 2004. P. 95—107.

[43] Пар. ліст Багушэвіча да Яна Карловіча, напісаны менш чым за паўгоду па ягоным вяртаньні ў Вільню, у канцы 1884 г.:

зісу польскага нацыяналізму на беларускіх землях. У яго ўмовах асабліва відавочнай стала непаўнавартасьць беларускай сялянскай культуры ў параўнаньні з дамінуючымі культурамі, нацэленымі на яе асыміляцыю. Зварот да беларускай гісторыі і да ключавых элемэнтаў беларускай культуры быў сымбалічным адказам ня толькі на невырашальныя палітычныя альбо сацыяльныя праблемы, але і пагрозу яе зьнішчэньня.

Апрача таго, каб уявіць Беларусь у XIX ст. так, каб гэтае ўяўленьне магло служыць для нацыяналістычнай мабілізацыі, патрабавалася магутная праца ўяўленьня і выдатны інтэлект. (Невыпадкова, што і цяпер так шмат людзей не ўяўляюць Беларусь як нешта самастойнае.) Узмацненьнем уяўленьня, успрымальнасьці і творчасьці Багушэвіч быў абавязаны свайму выгнаньню: людзкі дух часта знаходзіць свае глыбінныя рэсурсы акурат пры такіх гранічна неспрыяльных абставінах[44].

Фэномэн Багушэвіча быў немагчымы яшчэ ў 1860-я гг. — ён ёсьць прадуктам крызісу і дэстабілізацыі самой польскай ідэнтычнасьці. Гэтая і іншыя перадумовы склаліся толькі ў апошнюю траціну XIX ст. А ў апошняе дзесяцігодзьдзе XIX ст. Багушэвіч сфармуляваў праграму беларускага нацыяналізму. Спатрэбіўся яшчэ дзясятак гадоў, каб беларуская ідэнтычнасьць стала ідэнтычнасьцю больш як дзясятка чалавек.

---

*Jakiś dziwny nastrój przygniata mnie: dopóki byłem daleko od stron rodzinnych i od swoich, chciałem niby zbawienia, być tutaj, a dzisiaj... Nie widzę swoich i szukam ich we wspomnieniach. Co to? Gdzie jest to, czego szukałem, gdzie te brzegi, do których nie będzie sięgać myśl. Skąd ten niezrozumiały nastrój duszy?...Powinno to oznaczać, że nie potrafię żyć rzeczywistością albo nie chcę do tego się przyznać!..*

Беларускі пераклад гл.: Багушэвіч Ф. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. С. 182.

[44] У выпадку індывідуальнасьці Багушэвіча мы заходзім на маладасьледаваную тэрыторыю. Шмат зьвязаных зь ёй пытаньняў пакуль застаюцца без адказу.

Гісторыя беларускага нацыяналізму налічвае няпоўныя 150 гадоў. Ён узьнік, калі ў поліканфэсійнай Беларусі ішлі актыўныя працэсы мадэрнізацыі. У той час прасунутыя нацыяналізмы ва Ўсходняй Эўропе ўжо прайшлі акадэмічную стадыю свайго разьвіцьця (1800 да 1840 гг.), культурную стадыю (1840 да 1890 гг.), і пачынаючы з 1890-х г. сталі фармаваць палітычныя партыі і дасягаць масавай мабілізацыі[45].

Адставаньне беларускага нацыяналізму ад запозьненага ўкраінскага склала прыблізна 60—80 гадоў. Калі першая газэта на ўкраінскай мове пачала выходзіць у Львове ў 1848 г. («Зоря Галицька»), дык першая беларускамоўная «Наша Доля» выйшла праз 58 гадоў, у 1906 г. у Вільні. Першы раман на ўкраінскай, «Чорна рада» Панцеляймона Куліша, быў створаны ў 1857 г., а «Сокі цаліны» Зьмітра Жылуновіча (тры кнігі) выйшлі ў 1922 г. Нарэшце, зроблены ў другой палове XIX ст. Панцеляймонам Кулішом, Іванам Пулюем і Іванам Нечуй-Лявіцкім першы пераклад Бібліі на ўкраінскую мову быў выдадзены ў 1903 г., пераклад жа поўнага тэксту Бібліі на беларускую Яна Станкевіча пабачыў сьвет толькі ў 1973 г.

Да першай сусьветнай вайны ідэі беларускага нацыяналізму фактычна не дасягнулі сялянства, а ў работнікаў фармаваньне клясавай сьвядомасьці магло апярэджваць фармаваньне нацыянальнай (якая была беларускай хутчэй як вынятак). Дзеля такога позьняга ўзьнікненьня яму быў уласьцівы празэлітызм, г.зн. перацягваньне пад свае сьцягі тых, хто ўжо раней засвоіў пэўную нацыянальную ідэнтычнасьць, і па першым часе выключна культурны характар і сьвядомае пазьбяганьне палітычных патрабаваньняў[46].

---

[45] Гл. Hroch M. Social Preconditions of National Revival in Europe. Cambridge University Press, 1991. P. 312.

[46] Сярод беларускіх нацыяналістаў першага дзесяцігодзьдзя XX ст. была непрапарцыйна вялікая доля рыма-каталікоў, прычым літаральна адзінкі здолелі атрымаць вышэйшую адукацыю.

Паводле клясыфікацыі Гроха, які вылучыў чатыры тыпы нацыяналізмаў — «інтэграваны», «паўстанцкі», «запозьнены» і «дэзынтэграваны», — беларускі нацыяналізм нават не «запозьнены», а «дэзынтэграваны». У такім выпадку нацыянальная агітацыя адбываецца пасьля буржуазнай і індустрыяльнай рэвалюцыяў і неабавязкова пераходзіць у стадыю масавага руху.

У гэтым палягае ягоная ўнікальная асаблівасьць, якую ігнаруюць альбо замоўчваюць тэарэтыкі і гісторыкі нацыянальных рухаў. Паколькі беларускі нацыяналізм узьнікае ўваднaчас з азіяцкім і афрыканскім нацыянальнымі рухамі, у пабудовах Э. Сьміта яму проста няма месца:

*Нацыяналізм быў зарадзіўся ў апошнюю чвэрць XVIII ст. Яго станаўленьне адбывалася на працягу сарака рэвалюцыйных гадоў, ад падзелу Польшчы, Амэрыканскай і Францускай рэвалюцыяў і аж да рэакцыяў на заваёву Напалеонам Прусіі, Расеі і Гішпаніі. З таго часу нацыяналізм пашырыўся ў іншых частках Эўропы, улучна з Сэрбіяй, Грэцыяй і Польшчай (з новай сілай). На працягу 1810—1820 гг. ідэі нацыяналізму пераняла крэольская эліта Лацінскай Амэрыкі. Першая вялікая хваля нацыяналізму, так званая «Вясна народаў», пракацілася па Эўропе ў 1848 г. Ейным галоўным дасягненьнем стала аб'яднаньне Нямеччыны і Італіі вакол Прусіі і П'емонту, а таксама павышэньне статусу Вугоршчыны ў складзе Габсбурскай імпэрыі. У апошнюю чвэрць XIX ст. ва Ўсходняй і Паўночнай Эўропе сярод чэхаў, славакаў, румынаў, баўгар, літоўцаў, фінаў, нарвэжцаў і жыдоў завірaвала другая хваля нацыяналізму, тады ж зарадзілася і некалькі рухаў за межамі Эўропы — у Японіі эпохі Мэдзі, Індыі, Армэніі і Эгіпце. На пачатку XX ст. да іх далучыліся азіяцкія этнічныя нацыяналістычныя рухі — турэцкі, арабскі, пэрсыдзкі, бірманскі, яванскі, філіпінскі, віетнамскі і кітайскі, а таксама зьявіліся першыя парасткі афрыканскага нацыяналізму ў Нігерыі, Гане і Паўднёвай*

*Афрыцы. У трыццатых-саракавых гадох XX ст. на ўсёй зямлі не было кутка, якога б не зачапіла хваля нацыяналізму*[47].

Гісторыя беларускага нацыяналізму разьвівалася паводле зусім неймавернага для Эўропы сцэнару. Толькі ў другой палове XIX ст. Беларусь была ўяўленая як імпэрскі рэгіён і надзеленая этнакультурнай катэгарыяльнасьцю. Толькі пасьля колькіх дзясяткаў год каляніяльнага асваеньня, адштурхоўваючыся ад каляніяльнага наратыву, была створана праграма беларускага нацыяналізму. Увесь гэты час у Беларусі па сутнасьці не існавала канкурэнцыі паміж расейскім і беларускім нацыяналізмамі, а нізкі ўзровень адукацыі пазбаўляў насельніцтва ўсялякага крытыцызму ў дачыненьні да ідэалягічных пасланьняў улады.

За гэту паўзу ў 30—40 гадоў і непадзельнае панаваньне каляніяльнай ідэалёгіі беларусы заплацілі масавай асыміляцыяй у XX ст.: моўная сытуацыя ў Беларусі цяпер не была б такая фатальная, калі б беларускі нацыяналізм узьнік раней альбо аднachасова з расейскім. Ва ўмовах панаваньня апошняга канкурэнтную ідэалёгію можна было выдаваць за маргінальную і чалавеканенавісьніцкую.

Інстытуцыяналізаваныя ў нефармальную ідэалёгію, гэтыя наратывы каляніяльнага нацыяналізму захоўвалі непадзельную магутнасьць у Беларусі цягам усяго XX ст. Фактычна ідэалягічная гісторыя Беларусі гэтага стагодзьдзя зводзіцца ў цэлым да ўдалых намаганьняў для захаваньня іх гегеманічнага палажэньня.

Здабыцьцё Беларусяй незалежнасьці і наступны кароткі дэмакратычны эпізод парадаксальным чынам выявілі, што першы беларускі прэзыдэнт, як і іншыя кансэрватыўна настроеныя альбо адчувальныя да кансэрватыўнага фэрмэнту грамадзяне, успры-

[47] Сміт Ентоні Д. Націоналізм. Теорія, ідеологія, історія. Київ: видавництво К.І.С., 2004. С. 83.

маюць гэтыя тэндэнцыйныя наратывы як пэўную спаконвечную, бясспрэчную ісьціну, а адданасьць ім разглядаюць як пазытыўную маральную ўстаноўку.

Гістарычна асыміляцыя беларусаў у расейскую культуру і мову была часткай расейскага нацыяналістычнага праекту, які пачаўся ў 1860-я г., а ня вынікам натуральнага прагрэсу і аб'ектыўнай лёгікі гісторыі. (Ідэолягі расейскамоўя пэрыядычна чыняць нахабнае ашуканства, калі спрэс маскуюцца пад антынацыяналістаў і касмапалітаў.) Зарукай ягонага посьпеху было ўзьвядзеньне ў ранг дзяржаўнай палітыкі сілавога падаўленьня іншых культур і ідэнтычнасьцяў на дадзенай тэрыторыі. Ва ўмовах жа адносна лібэральнага палітычнага рэжыму ён сутыкаўся з сур'ёзнымі цяжкасьцямі.

Усюдыіснасьць каляніяльнай спадчыны тлумачыцца тым, што Беларусь спачатна была сканструяваная як калёнія. Каляніяльны дыскурс доўгі час захоўваў ідэалягічную манаполію. Дзякуючы свайму глыбокаму засваеньню масамі ён станавіўся дэпэрсаналізаваным і ананімным. Выказваньне агіды да беларускай мовы цяпер успрымаецца як выраз нейкай калектыўнай волі і масавай сьвядомасьці. Дзякуючы гэтаму забясьпечваецца беспакаранасьць таго, хто выказваецца, хаця ў такім выказваньні выражаны асабісты погляд на рэчы і ягоны аўтар павінен несьці прынамсі маральную адказнасьць за яго. І аўтарытарная ўлада, і каляніяльны наратыў прагнуць быць пазачасавымі і трансцэндэнтнымі.

Падобна каляніяльнаму, дыскурс аўтарытарнай улады, адзіна здольнай улоўліваць і ажыцьцяўляць спадзяваньні насельніцтва, стаўся надзвычай жывучым і пераўжыў крах расейскай і савецкай імпэрыі. Усёмагутнасьць такой улады наўпрост залежыць ад яе здольнасьці выбудоўваць і перабудоўваць ідэнтычнасьць беларусаў, маніпулюючы ўсёпранікальнымі каляніяльнымі нарацыямі.

І ўсё-ткі голыя вызначэньні беларускага нацыяналізму як запозьненага альбо дэзынтэграцыйнага і беларускага нацыятварэньня як правальнага малазьмястоўныя: яны ўтойваюць шэраг важ-

ных абставінаў. У іх імя даводзіцца ігнараваць культурную і рэлігійную спэцыфіку раньнемадэрнай Беларусі, і, кажучы пра нацыятворчы патэнцыял рыма-каталіцкай герархіі, Віленскага імпэратарскага ўнівэрсытэту альбо Полацкай езуіцкай акадэміі, рабіць выгляд, як гісторык Я. Грыцак, што яны працавалі толькі на этнічных палякаў:

> *Розныя ўсходнеславянскія этнічныя групы («дамадэрныя этнічныя субстраты») гаварылі на ўзаемазразумелых дыялектах, захавалі пэўную, але досыць размытую гістарычную памяць пра сваю прыналежнасьць у мінулым да Кіеўскай Русі, і ўсіх іх яднала ўсьведамленьне прыналежнасьці да адной — Праваслаўнай — Царквы. Адно паступова, у выніку цэнтрабежных уплываў, якія радыявалі з галоўных палітычных і культурных цэнтраў гэтага рэгіёну — Львову, Вільні, Кіева і г.д., — сярод іх пачалі выкрышталізоўвацца асобныя мадэрныя нацыянальныя ідэнтычнасьці*[48].

Вобраз такой гамагеннай культуры ў беларускім выпадку ўзьнікае ў выніку некрытычнай экстрапаляцыі ўкраінскага альбо расейскага досьведу і неразуменьня таго, што польская сьвядомасьць жыхароў Заходняй Беларусі ёсьць не адвечнай дадзенасьцю, а палітычным і культурным артэфактам з параўнаўча кароткай генэалёгіяй, выпрацаванай у XIX — першай палове XX ст.[49].

---

[48] Грицак Ярослав. Страсті за націоналізмом. Історічні есеї. Київ, Критика, 2004. С. 206—207.

[49] Як паказвае Багушэвіч сваім «з тутэйшых у палякі», беларусы ўжо ў XIX ст. пасьпяхова засвойвалі польскую нацыянальнасьць. Калі скласьці разам колькасьць асоб, якія выехалі зь Беларусі ў Польшчу пасьля другой сусьветнай вайны і зьвесткі аб беларускіх паляках паводле савецкага перапісу 1959 г. (і ў першай, і ў другой групе дамінавалі этнічныя беларусы), дык колькасьць беларусаў, якія трывала засвоілі польскую нацыянальнасьць, можна ацаніць больш як на мільён чалавек.

Нацыятварэньне (натуральна, польскае) у Беларусі пачалося бадай адначасова зь іншымі эўрапейскімі рэгіёнамі. З самага пачатку XIX ст. тут рэалізоўваўся раньнемадэрны тып нацыятварэньня паводле францускай мадэлі на рубяжы XVIII і XIX ст., г.зн. бяз моўнай асыміляцыі. Акурат на яго ў першай палове XIX ст. працавала ўся ўспадкаваная ад Рэчы Паспалітай на беларускіх землях культурная і адукацыйная інфраструктура: бібліятэкі і музэі, унівэрсытэты і акадэміі, школы і гімназіі, касьцёлы і кляштары. Постаці Чачота, Баршчэўскага, Міцкевіча і Дуніна-Марцінкевіча былі спароджаныя польскім мадэрным нацыяналізмам, які аказаўся неймаверна прадукцыйным на літаратурныя тэксты.

Пасьля Студзеньскага паўстаньня 1863 г. польскае нацыятварэньне ў Беларусі сутыкнулася з сур'ёзнымі цяжкасьцямі і абмежавалася найперш рыма-каталікамі ў ейнай паўночна-заходняй частцы. Як паказаў перапіс 1897 г., найвышэйшая роўня пісьменнасьці сярод беларусаў была ў Віленскай і Гарадзенскай губэрнях, дзе існавалі сотні таемных польскіх школак.

Гістарычна гэтыя землі ніколі не былі ні рускія, ні чыста праваслаўныя: яны ніколі не ўваходзілі ў т.зв. Кіеўскую Русь ці былі ейнай крайняй пэрыфэрыяй. Яшчэ на пачатку другога тысячагодзьдзя іх насялялі балцкія плямёны, якія прынялі рыма-каталіцтва ў 1387 г. На момант краху Рэчы Паспалітай доля рыма-каталікоў у канфэсійнай структуры беларускага насельніцтва складала 14—15 %. Зь іх ільвіная доля пасьля 1863 г. безь відавочных цяжкасьцяў засвоіла польскую нацыянальнасьць.

Пасьля студзеньскага паўстаньня 1863 г. у Беларусі стартуе храналягічна другі, расейскі праект нацыятварэньня. Ён быў блізкі да поўнага посьпеху ў другой палове XX ст., і толькі крах савецкай імпэрыі паставіў яго вынікі ў двухсэнсоўнае становішча.

Нарэшце, у апошнія дзесяцігодзьдзі XIX ст. у паўднёва-заходніх землях цяперашняй Беларусі бярэ пачатак праект украінскага нацыятварэньня. Дзейнасьць украінскіх школ на Берасьцейшчыне (у тым ліку ўкраінскай гімназіі ў самым Берасьці) у міжваенны

пэрыяд, размах украінскага партызанскага руху ў гэтым рэгіёне падчас другой сусьветнай вайны і адразу пасьля яе, нарэшце, навуковыя дасягненьні ўкраінскіх навукоўцаў — ураджэнцаў Берасьцейшчыны (напрыклад, ураджэнца Кобрыншчыны Івана Сідарука) — важная, але зусім забытая частка беларускай культурнай прасторы.

У сёньняшні час пра ўкраінскі рух на паўднёвым захадзе Беларусі нагадваюць найперш зьвесткі агульнанацыянальных перапісаў люднасьці Беларусі. Перапіс 1999 г. паказаў, што ў Жабінкаўскім, Кобрынскім, Берасьцейскім, Брагінскім, Камянецкім і Маларыцкім раёнах украінцы складаюць больш за 5 %. Без сумневу, перад намі ня вынік нейкіх міграцыяў, а праява ўкраінскай нацыянальнай сьвядомасьці жыхароў гэтых тэрыторыяў.

Беларускі нацыяналізм прапанаваў чацьверты паводле ліку на тэрыторыі Беларусі праект нацыятварэньня, які запрацаваў толькі ў першае дзесяцігодзьдзе XX ст.

Вось жа, у канцы XVIII — пачатку XX ст. на беларускай этнічнай тэрыторыі адбываўся працэс распаду дамадэрных нацыяў, прыналежнасьць да якіх была заснаваная на станавай прыкмеце (польскай шляхецкай і часткова расейскай імпэрска-шляхецкай), і ўзьнікненьне мадэрных нацыяў, якія абапіраліся на канфэсійныя, моўныя альбо культурныя асаблівасьці і імкнуліся ахапіць усе пласты грамадзтва (у храналягічнай пасьлядоўнасьці — польскай, расейскай, украінскай і беларускай). Узьнікаючыя нацыі зазвычай змагаліся за адно і тое ж насельніцтва і затым знаходзіліся ў стане жорсткага ідэалягічнага супрацьстаяньня. Гэткі парад нацыяналізмаў доўгі час мог фармаваць у аднаго і таго ж індывіда гібрыдныя герархічна арганізаваныя ідэнтычнасьці, якія прадугледжвалі ляяльнасьць да розных нацыянальных мэтраполіяў.

Таму далёка не дэфіцыт нацыяналізму ёсьць адрознай рысай беларусаў і беларускай сытуацыі, але старт на беларускай тэрыторыі на працягу фактычна аднаго стагодзьдзя чатырох канкурэнтных нацыянальных праектаў. Старт кожнага новага нацыянальнага праекту меў характар культурнага шоку і падрываў сфар-

маваны балянс культурных сіл. Гэта было неўласьціва для «нармальнай» заходнеэўрапейскай сытуацыі і ссоўвала оптыку дасьледнікаў, дазваляючы лексыконы, ідэалёгіі і эстэтыкі адной нацыянальнай традыцыі прыпісваць да другой.

Прабуксоўка ўласна беларускага нацыятварэньня тлумачыцца не адсталасьцю беларусаў, а сілай і дзейснасьцю ранейшых і магутнейшых нацыяналізмаў у Беларусі. Слабасьць беларускай нацыянальнай сьвядомасьці — адваротны бок сілы польскай і «общерусской» ідэнтычнасьці сярод нас.

# «СІКАВЫ БУРБУЛІК» І «ВЛАСЯКОВЫ ЖУЖАЛЬ»: КАЛЯНІЯЛІЗМ І НАЦЫЯНАЛІЗМ У БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ XX СТ. ПАСЬЛЯСЛОЎЕ

*У Беларусі ёсьць два паэты: Якуб Колас і Янка Купала — вельмі цікавыя хлапчукі! Так прымітыўна-проста пішуць, так ласкава, тужліва, шчыра. Нашым бы крышку гэтых якасьцяў! О, госпадзе! От бы добра было!*

Максім Горкі, 1911.

*Напрыканцы 80-х — пачатку 90-х гадоў цяпер ужо мінулага стагодзьдзя... Беларусь зусім нечакана ператварылася ў прыгожы культурніцкі міт... Стаўленьне да гэтага міту было living рознае, і часта — варожае, аднак зусім пэўна можна сьцьвярджаць, што ў часткі маладых беларускіх навукоўцаў і інтэлектуалаў ён абуджаў новыя і невядомыя дагэтуль пачуцьці. Міт быў загадкавы і гаварыў пра былую культурніцкую, палітычную і гістарычную веліч краіны. Па нейкім часе, аднак, сталася відочна — міт кепска стасаваўся, што рэальна ўяўлялі зь сябе краіна, ейная культура, інтэлектуальны чын і тагачасная мэнтальнасьць большасьці беларускага насельніцтва.*

Алесь Анціпенка. Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня: Пра кнігу, выклікі й кантэкст. 2003.

*Цікава, што беларуская мова, у адрозьненьне ад украінскай, не ўспрымаецца носьбітам расейскай моўнай сьвядомасьці як сьмешная. Хутчэй — як нямова, артаграфічныя варыяцыі на дыялектную тэму.*

Раман Лейбаў. Адзин рубель. Русский Журнал. 2006.

Калі карыстацца ня строгім сацыялягічным матэрыялам, які сьведчыць пра распаўсюд ідэяў беларускага нацыяналізму сярод беларусаў, але наіўнай мэтафізыкай палітычных дэклярацыяў, агульнанацыянальных кангрэсаў і зьездаў, старанна прэпараваных нацыяналістычна настроенымі гісторыкамі, можа скласьціся ўражаньне, што адразу па сваім нараджэньні беларускі нацыяналізм выцесьніў усе канкуруючыя рухі:

*Пры нязначным аслабленьні палітычнага ціску, усяго за 15 год самастойнага разьвіцьця [паміж рэвалюцыямі 1905 і 1917 гг. — Аўт.], «беларускі рух» прайшоў усе стадыі і канстытуяваўся ў вядучую культурную і палітычную сілу краю, якая імкнулася інтэграваць у сябе* іншае *ўжо не на народніцка-рэвалюцыйнай плятформе, а на ідэі нацыянальнага дэмакратызму*[1].

Аднак гэта ня што іншае, як аптычны падман. Можна не пагадзіцца з гісторыкам Юр'ем Туронкам, што беларускі нацыяналізм у XIX ст. быў хімэрай. Ён заставаўся хімэрай і ў 1917 г., калі на свабодных выбарах ва Ўстаноўчы сход адзіная беларуская партыя, Беларуская Сацыялістычная Грамада, набрала, паводле розных ацэнак, ад 17 да 29 тыс. галасоў, г.зн. менш за паўадсотка галасоў беларускіх выбарцаў[2].

[1] Бабкоў Ігар. Генэалёгія беларускай ідэі. Зь лекцыяў для Беларускага Калегіюму // ARCHE. 2005. № 3. С. 156.

[2] Нікалас Вакар кажа пра 29 тыс. галасоў («In the general elections to the Constituent Assembly the nationalist ticket was not able to collect more than 29.000 votes in the

Як такі беларускі рух пачаў існаваць толькі ў 1905—1906 гадох — у пару зьяўленьня першых легальных беларускіх выданьняў і беларускіх культурных арганізацыяў. Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі з расейскім і польскім нацыяналізмамі, якія мелі непараўнальна болей рэсурсаў, у беларускага руху не было шанцаў «канстытуявацца ў асноўную культурную і палітычную сілу краю». Каналы пашырэньня ідэалёгіі беларускага нацыяналізму аказаліся вельмі вузкімі. Яны ўлучалі ў сябе карпарацыйныя саюзы (у прыватнасьці, настаўніцкі), прэсу і, нягледзячы на аграмадны супраціў, ніжэйшае рыма-каталіцкае духавенства. Праваслаўная герархія аказалася значна больш кансалідаванай і ажно да падзеяў 1917 г. не дапускала заўважных праяваў беларускага нацыяналізму ў сваім асяродзьдзі.

Для ўжо ўзьніклага беларускага нацыяналізму фатальныя наступствы мела палянізацыя беларускай дамадэрнай эліты — пры нястачы сваёй казацкай клясы, як на Ўкраіне, беларускую палітычную эліту тэарэтычна магла сфармаваць навасьпечаныя капіталісты, праваслаўнае дваранства або рыма-каталіцкая шляхта. Аднак у першыя дзесяцігодзьдзі XX ст. яны амаль аднагалосна адкінулі мадэрную беларускую ідэнтычнасьць. Вынятак склалі літаральна колькі індывідаў.

Ідэя самастойнай Беларусі заставалася чужой і незразумелай для мас — мовазнаўца Ян Станкевіч прыпамінаў, што ён быў адзіным з цэлай клясы навучэнцаў ашмянскай школы ў 1905—1909 гг., каго яна захапіла. Гісторык Мікалай Улашчык, ураджэнец вёскі Віцкаўшчына ў 30 км на паўднёвы захад ад Менску, адзначаў, што першая газэта на беларускай мове трапіла ў ягоную вёску толькі ў канцы другога дзесяцігодзьдзя XX ст. Да рэвалюцыі 1917

---

whole country»; Гл. Vakar Nicholas P. Belorussia: The Making Of A Nation. A case study. Russian Research Center studies, number 21. Harvard University Press, Cambridge, Mass, 1956. P. 97).

Паводле Захара Шыбекі, «беларускія партыі і арганізацыі атрымалі мізэрны працэнт галасоў (0,3 %)». Шыбека Захар. Нарыс гісторыі Беларусі. 1795—2002. Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. С. 188.

г. ідэі беларускага нацыяналізму так і не пранікл на ўсход Беларусі.

Ужо ў канцы XIX ст. насельніцтва беларускіх гарадоў у цэлым стала расейскамоўным. Захаваліся ўспаміны аднаго з раньніх беларускіх нацыяналістаў Вацлава Іваноўскага пра моўную сытуацыю Віцебску ў 1910 г.:

> *Вітэбск — гэта стары беларускі горад, але цяпер беларускае мовы на вуліцах не чуваць, — асабліва ў сярэдзіне гораду. Затое па краёх гораду скрозь пануе наша мова...*[3]

З 1917 г. беларусаў у БССР выхоўвалі не нацыянальныя агітатары, але таталітарная ўлада. Пасьля пэўнай разгубленасьці, якая выразілася ў правядзеньне беларусізацыі, зьмест яе палітыкі ў БССР у цэлым зводзіўся да таго, каб перашкодзіць пераўтварэньню беларусаў у самастойную нацыю. Таталітарная ўлада разгледзела момант магчымасьці такой палітыкі на мяжы 20-х і 30-х гг. XX ст. — фізычна вынішчаючы нацыянальных актывістаў, яна рабіла выгляд, што русіфікацыя непазьбежная. Дзякуючы таму, што беларускі нацыяналізм узьнік позна, літаратурная беларуская мова ў вуснах не-пісьменьнікаў і не-выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры стала разглядацца як адзнака палітычнай неляяльнасьці і скрайне правага сьветагляду.

Палітычная гегемонія насаджвалася і крышталізавалася з дапамогай санкцыяванага ўладай мэханізму забароны пертварэньня «несьвядомых» беларусаў у беларускамоўных з нацыянальнай сьвядомасьцю. Культурныя і навуковыя інстытуты, сыстэма адукацыі і творчых саюзаў рабілі ўсё, каб зьнеахвоціць да беларускай мовы, літаратуры, гісторыі і культуры, г.зн. па сутнасьці выкарыстоўваліся як інструмэнт асыміляцыі.

Улічваючы існаваньне беларускага нацыяналізму і ягоных недвухсэнсоўных моўных патрабаваньняў, улада ўжо не магла про-

[3] Наша Ніва. 1910. № 34.

ста адмовіць беларускай мове ў праве на існаваньне. Яна прызнала інакшасьць беларусаў і не шкадавала рэсурсаў для іх асыміляцыі. (Блытаніна ў паняцьцях узьнікае тады, калі палкую любоў улады да асыміляцыі беларусаў успрымаюць як яе любоў да беларусаў.) Беларусы не дыскрымінаваліся за сваё этнічнае паходжаньне. Але за любыя несанкцыяваныя праявы нацыянальнай сьвядомасьці, асабліва ў форме выступу супраць русіфікацыі, наступала суровае пакараньне ў юрыдычным, сацыяльным і палітычным аспэктах. Дзьверы для поўнай асыміляцыі былі адчыненыя, а за адмову ад такога запрашэньня сурова каралі[4].

З 30-х гг. XX ст. бярэ пачатак палітыка жорсткага культурнага апартэіду ў Беларусі. Беларуская мова ўжывалася як дапаможная ў працэсе навучаньня ў пачатковай і сярэдняй школе. Але яе практычна поўная адсутнасьць у вышэйшай школе недвухсэнсоўна паказвала на ейны праўдзівы сацыяльны і функцыянальны статус. Тое самае датычыла і мас-мэдыяў — мова была дапушчаная ў мясцовую прэсу і правадное радыё, але ў меру ўзрастаньня іх цэнтральнасьці яе ўдзельная вага падала. Функцыянальная пазыцыя, адведзеная беларускай мове ўладай, была загадзя пройгрышнай: яе можна апісаць як мову субкультуры сельскай мясцовасьці.

У выніку шараговы беларус перажываў культурную траўму хутчэй з прычыны свайго адрозьненьня ад культурнага стандарту мэтраполіі (напрыклад, «каравага», немілагучнага прозьвішча альбо падобнай акалічнасьці; згодна са статыстыкай, нават на пачатку XXI ст. найбольш частым матывам зьмены прозьвішча была яго кепская эўфанія — сотні Балвановічаў, Ёлупаў і Бараноў штогод ператвараліся ў высакародных Івановых, Пятровых і Захаравых), але не з прычыны непрыкметнай асыміляцыі ў расейскую культуру[5].

---

[4] Пар. Шкандрий Мирослав. В обіймах імперії. Російська і українська літератури новітньої доби. Київ: Факт, 2004. С. 49.

[5] «Сікавы бурбулік» і «власяковы жужаль» — выразы, што існуюць у расейскай мове беларусаў для асьмяяньня і дыскрэдытацыі беларускай мовы. Сьцьвярджа-

Як паказалі падзеі, зьвязаныя з другой сусьветнай вайной, і ў 40-х г. XX ст. «вядучымі культурнымі і палітычнымі сіламі» ў краіне па-ранейшаму заставаліся расейскі (савецкі) і польскі нацыяналізмы. Толькі яны, калі ня ўлічваць дзеяньняў УПА на Палесьсі, здолелі разгарнуць эфэктыўны партызанскі рух на акупаваных немцамі беларускіх землях.

Умовай ягонай магчымасьці ў ваенных і паваенных варунках была магутная падтрымка з боку мясцовага насельніцтва. Аб ступені спачуваньня, напрыклад, да польскіх партызанаў, гаворыць той факт, што частку іх фармаваньняў у Налібоцкай пушчы (усяго 60—80 км на захад ад Менску) нейкі час складала кавалерыя.

У той жа час падзеі другой сусьветнай вайны ў Беларусі выявілі абмежаваньні, зь якімі сутыкнуліся польская і ўкраінская ідэнтычнасьці ў Беларусі. Іх апэратыўнай прасторай сталі, адпаведна, захад Беларусі зь пераважна рыма-каталіцкім насельніцтвам і прылеглае да Валыні Палесьсе. Наступныя гады былі лебядзінай песьняй для польскага і ўкраінскага нацыяналізму ў Беларусі як масавых рухаў. Рэпрэсіўная машына савецкай імпэрыі без асаблівых цяжкасьцяў здолела зламіць супраціў польскіх і ўкраінскіх партызанаў і пачаць масава вырабляць з жыхароў Заходняй Беларусі савецкіх людзей. Рэакцыяй на гэта была эміграцыя з БССР у 1945—1959 гг. у Польшчу рыма-каталікоў, якія трывала засвоілі польскую нацыянальнасьць. Масавы выезд амаль паўмільёна чалавек меў рысы нацыянальнай трагедыі. Дзеля ўтраты гэтага празаходняга грамадзкага фэрмэнту ў Бе-

---

ецца, што «мачавы пузыр» па-беларуску называецца «сікавы бурбулік», а «махнаты чмель» — «власяковы жужаль» (мае запісы 2002 і 2005 гг.). Запісы сьведчаць, што і ў часы трыюмфу русіфікацыі беларуская мова чыніла траўму масавай сьвядомасьці. Як паказвае ейнае актыўнае выцясьненьне, яна была дастаткова магутнай. Яе наяўнасьць была ўласьцівая для тых, хто быў уцягнуты ў каляніяльную гульню, успрымаючы сваё паходжаньне і мову як нешта заганнае, як хваробу ці траўму, і адпаведна выцясьняючы яе — у залежнасьці ад сваіх магчымасьцяў — са свайго цела альбо грамадзкай прасторы.

ларусі слабелі пратэставыя настроі і расла ляяльнасьць да савецкай улады[6].

Русіфікацыі Беларусі спрыяла і новая прамысловая палітыка савецкага кіраўніцтва. Традыцыйна лічыцца, што яна была выклікана агульнымі гуманітарнымі меркаваньнямі:

> *Падчас другой сусьветнай вайны Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара. Разумеючы гэта, савецкае кіраўніцтва па-свойму аддзячыла Беларусі, зрабіўшы яе ў часе паваеннай адбудовы «зборачным цэхам» усяго Саюзу. У Беларусь выпраўлялі інжынэраў і кваліфікаваных работнікаў, тут пасяліліся і многія адстаўнікі. Гэты працэс, разам са стратай карэннага насельніцтва падчас вайны, інтэрнацыяналізаваў рэспубліку, якая стала флягманам тэхналягічнага разьвіцьця ў СССР*[7].

Падобны падыход ёсьць грубым спрашчэньнем. Падчас нямецкай акупацыі насельніцтва Беларусі выявіла значна большую ляяльнасьць да савецкай імпэрыі, чымся ўкраінцы альбо прыбал-

---

[6] Палескі рух Міколы Шаляговіча пазьней падкрэсьліў крызіс украінскай сьвядомасьці на паўднёва-заходніх землях Беларусі. Усю другую палову XX ст. колькасьць беларускіх палякаў падала. Пра ранейшую сілу польскага нацыяналізму ў Беларусі сёньня нагадвае толькі настойлівае нежаданьне каталіцкіх духоўнікаў дапускаць беларускую мову ў набажэнствах на тэрыторыі Гарадзенскай вобласьці — натуральна, на шматлікія просьбы вернікаў.

Набыцьцё польскай нацыянальнасьці ішло насуперак рэпрэсіям царскай улады. Ужо гэтым фактам беларускія палякі заслугоўваюць павагі. Разам з тым сваімі як палітычнымі паводзінамі, так і непрыняцьцем беларускай нацыянальнай культуры, сёньня ў масе сваёй яны практычна ня розьняцца ад асноўнай масы беларускіх выбарцаў.

Расейскамоўныя палякі этнічна беларускага паходжаньня, якія востра ненавідзяць беларускую мову, — часты факт беларускай рэчаіснасьці, сфармаваны асаблівымі гістарычнымі раскладамі і геапалітычнымі траекторыямі Беларусі ў XIX і XX ст.

[7] Мацузата Кімітака. Рэжым Лукашэнкі як выспа папулізму ў акіяне кланавай палітыкі. // ARCHE. 2005. № 4. С. 98.

ты. Акурат прызам за гэтую ляяльнасьць і адначасова стымулам для яе нарошчваньня была імклівая паваенная індустрыялізацыя Беларусі. Падобна сучаснаму заходняму капіталу, які імкнецца ў зоны, у якіх адсутнічаюць інстытуцыянальныя рызыкі, савецкія інвэстыцыі памкнуліся ў зону, дзе адсутнічала сур'ёзная пагроза імпэрскай стабільнасьці.

Калі адштурхоўвацца ад статыстычных паказьнікаў тэмпаў эканамічнага росту і забесьпячэньня сацыяльных стандартаў, паваенная эканамічная сыстэма ў Беларусі была, напэўна, найбольш эфэктыўная ў ейнай гісторыі. Адрозна ад іншых усходнеэўрапейскіх грамадзтваў у пару паваеннай савецкай мадэрнізацыі беларусы яшчэ не сфармаваліся як нацыя, і ў беларускай масавай сьвядомасьці гэты час пазьней надзяляўся атрыбутамі нейкага «залатога веку».

І ўсё ж савецкі пэрыяд беларускай гісторыі зьмяшчаў відавочную двухсэнсоўнасьць. Трактоўку Савецкага Саюзу як дзяржавы, ідэалягічна чужой інтарэсам нацыянальнага разьвіцьця сілком улучаных у яе склад этнічных групаў або нелегітымнага палітычнага ўтварэньня, здольнага стрымліваць нацыянальныя памкненьні толькі пастаяннымі рэпрэсіям і русіфікатарскімі намаганьнямі[8], нельга назваць вычарпальнай.

У 1917—1918 гг. беларускія эліты ўпершыню выставілі свае палітычныя патрабаваньні найбуйнейшым актарам эўрапейскай палітыкі. У выніку ўласнага папулізму і жаданьня павялічыць палітычную ляяльнасьць беларускіх мас савецкая ўлада пагадзілася на стварэньне беларускай рэспублікі як квазінацыянальнай дзяржавы з уласнымі межамі, заканадаўствам, парлямэнтам, адміністрацыйным апаратам, культурнымі і навуковымі інстытутамі і іншай інфраструктурай. У ёй беларуская нацыянальнасьць была інстытуцыяналізаваная як сацыяльная катэгорыя. Улада кідала

---

[8] Смит Джереми. Оценка советской национальной политики: к построению количественной модели // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань: Центр исследований национализма и империи, 2004. С. 354—355.

сур'ёзныя рэсурсы на падтрымку тых формаў беларускай культуры, якія, на яе думку, не маглі сур'ёзна ўплываць на сфармаваны культурны балянс. Пры канцы савецкай эры Беларусь і беларуская нацыянальнасьць успрымаліся як спрадвечныя і самадастатковыя катэгорыі. Катэгорыя нацыянальнасьці, заснаваная на этнічных катэгорыях,

> *служыла ня толькі статыстычнай катэгорыяй, фундаментальнай адзінкай грамадзкай бухгальтэрыі, але таксама, што яшчэ больш важна, азначала абавязковы і прадпісаны статус. Гэты статус надаваўся чалавеку дзяржавай пры нараджэньні, паводле ягонага паходжаньня. Ён быў зарэгістраваны ў асабістых дакумэнтах і практычна ва ўсіх афіцыйных паперах, анкетах і г.д. Зь яго карысталі дзеля кантролю над доступам да вышэйшай адукацыі і прэстыжных працоўных месцаў, абмяжоўваючы магчымасьці для адных нацыянальнасьцяў, у прыватнасьці, для жыдоў, і гарантуючы доступ іншым з дапамогай палітыкі ільготаў — напрыклад, т.зв. «тытульных» нацыянальнасьцяў у іхных «уласных» рэспубліках*[9].

Тым самым было створана асяродзьдзе, якое спрыяла росту нацыяналістычных настрояў. У пару гарбачоўскай перабудовы катэгорыі заснаванай на этнічным паходжаньні нацыянальнасьці і нацыянальнай рэспублікі як этнічнай радзімы былі з посьпехам палітызаваныя адроджанымі нацыянальнымі рухамі. Уявіць Беларусь як нацыянальную дзяржаву больш не складала асаблівай цяжкасьці.

У 1990—1991 гг. выявілася, што адзінай савецкай палітычнай прасторы не існуе: яе месца занялі нацыі. З гэтай прычыны крах

[9] Гл. Роджерс Брубейкер. Мифы и заблуждения в изучении национализма // Ab Imperio. 2000. № 2.

савецкага рэжыму выліўся ў распад СССР: калі ўлада і легітымнасьць цэнтру аслаблі, імпэрская пэрыфэрыя распалася на нацыянальныя дзяржавы[10].

Падзеі, зьвязаныя з распадам СССР, здабыцьцём Беларусяй незалежнасьці і спаўзаньнем назад у аўтарытарызм, выявілі дзьве супрацьлеглыя дынамікі.

З аднаго боку, распад Савецкага Саюзу пахіснуў тэлеалёгію русіфікацыі — імпэрскі цэнтар зьнік, а разам зь ім быў аслаблены імпэратыў набыцьця імпэрскай ідэнтычнасьці для пасьпяховага прасоўваньня ў існуючай сацыяльнай і палітычнай прасторы. У параўнаньні з пачаткам стагодзьдзя беларускі нацыяналізм перажыў нечуваны пад'ём. На адносна свабодных прэзыдэнцкіх выбарах 1994 г. каля 23 % палітычна актыўных беларусаў аддалі за яго свае галасы (у вэрсіі Пазьняка альбо Шушкевіча). Прапорцыя прыхільнікаў беларускага нацыяналізму і савецкага кансэрватызму склала прыблізна 1 да 3. Ды і самі белавескія пагадненьні 1991 г. наўрад ці былі магчымыя, калі б за плячыма беларускіх лідэраў С. Шушкевіча і В. Кебіча не стаяла беларуская палітычная традыцыя і ім была б радыкальна чужая беларуская нацыянальная сьвядомасьць.

Нацыяналістычны ўздым, узмоцнены імкненьнем падганяць беларускую сытуацыю пад агульнаэўрапейскі шаблён, ствараў у заходніх назіральнікаў падманлівае ўяўленьне аб прыблізна аднолькавым узроўні нацыянальнага разьвіцьця былых савецкіх рэспублік заходняй часткі СССР. Адразу пасьля распаду СССР здавалася, што нацыі заходняй часткі Савецкага Саюзу знаходзяцца на прыблізна адным узроўні нацыянальнага разьвіцьця. Адсюль бярэ пачатак фатальная заходняя стратэгія палітычнага інжынэрынгу што да Беларусі. Замест таго, каб дабудоўваць беларускую нацыю, робячы стаўку на падтрымку культурных праектаў, было пастаноўлена ар-

[10] Бейкер Сеймур. Россия и концепт империи // Новая имперская история постсоветского пространства. Казань: Центр исследований национализма и империи, 2004. С. 79.

ганізаваць па ўсёй краіне сетку дарагіх рэсурсных цэнтраў, абапіраючыся на якія, на думку іх стваральнікаў, грамадзянская супольнасьць здолее за кароткі час зрынуць дыктатуру.

Зь іншага боку, адна з самых навязьлівых фрустрацыяў Багушэвіча, што беларусы без асаблівага супраціву амаль пагалоўна будуць асыміляваныя ў расейскую культуру і мову, стала явай. Ва ўмовах свабоднага волевыяўленьня аказалася, што ў Беларусі імпэрыя як нідзе яшчэ была блізкая да поўнай асыміляцыі мясцовага насельніцтва ў расейскую нацыю. Стала відавочна, што трыюмф нацыянальнага руху не запраграмаваны загадзя, а ідэалёгія беларускага нацыяналізму — усяго толькі адна з альтэрнатыўных ідэалёгіяў разьвіцьця Беларусі. Апрача таго, выявіліся ня толькі колькасныя, але і геаграфічныя абмежаваньні беларускага нацыяналізму. Рухам вялікага напружаньня ён быў найперш у Менску. Акурат у гэтым горадзе ў 1988—1995 гг. віравалі палітычныя працэсы, названыя пазьней «Беларускім адраджэньнем», а ягонае насельніцтва выявіла большую ўспрымальнасьць да ягонай рыторыкі і мэтафізыкі, чым у іншых рэгіёнах Беларусі.

Беларускі нацыяналізм аказаўся цэнтральным рухам зь відавочна правальнымі пазыцыямі на ўсходзе і паўднёвым захадзе Беларусі. Апрача Менску, някепскіх вынікаў ён дасягнуў на паўночным захадзе Беларусі, у паласе, што ідзе ад Менску ў бок Вільні, а гэта засьведчыла, што праца нацыянальных агітатараў у XX ст. не прайшла марна.

1994 г. прынёс дэжавю. Краіна пагрузілася ў пэрыяд суровай палітычнай рэакцыі. Дэспатычная дзяржава рэпрэсавала грамадзянскую супольнасьць і навязвала ўсебаковы ідэалягічны дыктат. «Так званая» беларуская мова і нацыянальная культура былі абвешчаныя ўласнасьцю не ўсяго народу, але вузкай групы асобаў, якім было забаронена мець сацыяльны посьпех, і ізноўператварыліся ў прадмет публічнага асьмяяньня і выцясьненьня з публічнай прасторы.

Прыняцьце беларускай ідэнтычнасьці, ізноў стала справай асабістага выбару, ажыцьцёўленага, як правіла, у сталым веку. Масы

засталіся інэртнымі і абыякавымі. Беларускае кіраўніцтва ўзялося аднаўляць ранейшы тып дачыненьняў з былой імпэрскай мэтраполіяй, вытаргоўваючы рэсурсы, падачкі і ільготы наўзамен за ўзьведзеныя ў ранг дзяржаўнай палітыкі моўную дыскрымінацыю і культурны апартэід. Ізноў запрацавала забарона дзяржаўным органам (школе і г.д.) вырабляць беларускамоўных беларусаў. Жыць у краіне псыхалягічна і культурна камфортна стала толькі тым, хто гаворыць па-расейску.

Нацыянальная ідэя была зьведзеная да ідэі ўзмацненьня дэспатычнай дзяржавы і тэхнакратычнай ідэі павышэньня матэрыяльнага дабрабыту. За нацыянальныя адметнасьці ўлада пачала выдаваць якасьці фэадальнага парадку (кшталту калектывізму) і ўсходнія этнічныя асаблівасьці (кшталту абшчыннага ўкладу), а за выяўленьне вечнай і бясспрэчнай волі беларускага народу — інтэрналізаваныя каляніяльныя ўстаноўкі[11].

Мас-мэдыі пагружалі беларускае грамадзтва ў «общерусскую» інфармацыйную прастору і працягвалі фармаваць агістарычную культурную пазыцыю, паводле якой гісторыя пятроўскай Расеі — неад'емная частка беларускай гісторыі.

Рэфэрэндум 1995 г. засьведчыў сілу й непахіснасьць каляніяльнай традыцыі і няздатнасьць беларускай культуры і мовы ў прафанізаваных, дэфармаваных каляніялізмам формах выклікаць масавую падтрымку грамадзянаў. (З гэтага гледзішча прыход Лукашэнкі да ўлады можна разглядаць як рэфлекс культуры, якая забараняе сваю кадыфікацыю ў прафанных, дэгуманізаваных формах.) Павучыньне расізму, культурных стэрэатыпаў і дэгуманіза-

---

[11] У гэтым пункце надзвычайную ідэалягічную блізіню да ўлады дэманстравала частка расейскамоўнай лібэральнай інтэлігенцыі, якая ўспрымала вяшчаньне беларускай (!) службы радыё «Свабода» на беларускай мове як навязваньне вонкавай волі. На іх думку, каб радыё стала запатрабаваным, дастаткова толькі ліквідаваць гэтую прыкрую недарэчнасьць.

Згодна з гэтай лёгікай, акурат нацыяналісты, а не ідэалягічны дыктат уладаў і ўзмацненьне дэспатычнай дзяржавы, несьлі простую пагрозу беларускай дэмакратыі.

тарскіх ідэалёгіяў, у якое трапілі беларусы, аказаліся занадта моцным, а каляніяльная сыстэма сацыялізацыі — фэнамэнальна эфэктыўнай. Большасьць беларусаў уважала існуючыя культурныя і палітычныя дачыненьні за нармальныя (і сваімі павозінамі іх узмацняла), а таксама прызнавала герархію вартасьцяў, якая надавала найвышэйшую каштоўнасьць творам каляніяльнай, расейскай культуры. Нацыянальныя патрабаваньні па-ранейшаму ўспрымаліся імі як праявы абмежаванасьці і заідэалягізаванасьці палітычных экстрэмістаў.

У масавай сьвядомасьці беларуская мова трывала асацыявалася зь перашкодаю да пасьпяховага сацыяльнага прасоўваньня. Пасьля непрацяглага падвышэньня яе сацыяльнага статуту грамадзтва санкцыявала ейнае выцясьненьне з публічнай прасторы. Яна была прызнаная элемэнтарна нецікавым аб'ектам, якому няма месца ў сучаснай эпосе. Нацыянальнай культуры быў вернуты статус лякальнай экзотыкі. Яе працягвалі разглядаць праз прызму этнаграфізму і атаясамліваць з правінцыйнасьцю і непаўнавартасьцю.

Ужо першыя гады незалежнасьці прынесьлі дэбаты на тэмы кшталту «ці існуе праўдзівая беларуская мова», «якая ў нас нацыянальная мова — расейская ці беларуская», і выявілі, што мысьленьне беларускае эліты нязначна зьмянілася за апошнія 150 год. Таксама выявілася, што ідэі, якія яшчэ ў XIX ст. увайшлі ў архіў расейскага нацыяналізму, а таксама ўзятыя з імпэрскага лексыкону штампы пра «ўзьяднаньне», «старэйшага» і «малодшага» брата, «мёртвую беларускую мову» і г.д. могуць забясьпечыць скрышальны электаральны посьпех.

У ход ізноў пайшла каляніяльная экспэртыза, якая сымулюе грамадзкі аўтарытэт і навуковую веду ў пытаньнях беларускай гісторыі, палітыкі і культуры, толькі месца царкоўнікаў занялі навукоўцы і аналітыкі. Як і раней, першай яе ахвярай сталася беларуская мова, якой каляніяльныя экспэрты па-ранейшаму адмаўлялі ў праве на існаваньне. Як пераконваў знаны расейскі арыенталіст, намесьнік дырэктара Інстытуту ўсходазнаўства АН Расейскай Фэдэрацыі Ўладзімер Алпатаў,

> *гаварыць, што ёсьць расейская мова і беларуская мова, а з другога боку — паморскія альбо вяцкія дыялекты расейскай мовы, зь лінгвістычнага гледзішча немагчыма, бо паморскія дыялекты ад расейскай літаратурнай мовы стаяць значна далей, чым беларуская мова... Цяжка назваць — зь лінгвістычнага гледзішча — асобнай мовай беларускую*[12].

Як і сто пяцьдзясят гадоў таму, існаваньне каляніяльнага дыскурсу пастаянна патрабуе аўтарытэтных ацэнак і сьцьверджаньняў. Культурныя архівы расейскага нацыяналізму сталіся скарбніцай рытарычнага стылю і палітычнага мысьленьня і для дырэктара Маскоўскага інстытуту палітычных дасьледаваньняў Сяргея Маркава:

> *Пераважная большасьць грамадзян Беларусі за ўзьяднаньне з Расеяй. Гэта не аб'яднаньне двух народаў. Гэта ўзьяднаньне адзінага народу, штучна падзеленага ў выніку крызісу*[13].

У выніку Беларусь з фарпосту русіфікацыі ў СССР ператварылася ў краіну, узровень дэмакратычных свабодаў у якой мала розьніцца ад сярэдняга на ўсю Афрыку. Гэта дапамагае зразумець, што русіфікацыя не павышала сярэдняга культурнага ўзроўню насельніцтва і была заснаваная на аўтарытарных, несумяшчальных з хоць якім крытычным падыходам нарацыях.

Палкая адданасьць улады культурнаму апартэіду і расісцкім ідэалам тлумачыцца тым, што яны складаюць стрыжань мэханізму палітычнай гегемоніі, што ажыцьцяўляецца ў краіне. Найбліжэйшы аналяг сучаснай Рэспублікі Беларусі ў эўрапейскай палі-

---

[12] Интервью с Владимиром Алпатовым «В современной России нет определенной языковой политики» // Ab Imperio. 2005. № 2. С. 103.

[13] Тэлеканал «ТВ-центр». Праграма «Прогнозы». 29.05.2005.

тычнай прасторы — эўрапейскія абсалютысцкія манархіі, якія пераЖылі крах на кантынэнце на працягу XVIII—XX ст. у выніку росквіту нацыянальных рухаў.

За выняткам фактару каляніяльнай спадчыны, нацыянальныя вартасьці, найперш нацыянальная мова, не прымаюцца цяперашнім беларускім рэжымам таму, што яны выступаюць эфэктыўнай плятформай для ідэнтыфікацыі грамадзян, альтэрнатыўным полюсам грамадзкай лаяльнасьці. Падобна абсалютысцкім манархам, прэзыдэнт Лукашэнка патрабуе ад народу пакланеньня і ідэнтыфікацыі зь дзяржавай, г.зн. з матэрыяльным выражэньнем свайго кіраваньня (і тым самым з самім сабою) коштам аслабленьня альбо прафанацыі ўсіх альтэрнатыўных цэнтраў грамадзкай ідэнтыфікацыі. У Беларусі, згодна зь лёгікай уладаў, народ існуе дзеля таго, каб узмацняць уладу, якая блякуе любыя значэнныя магчымасьці нацыятварэньня. У сучасных жа эўрапейскіх грамадзтвах, наадварот, дзяржава — усяго толькі інструмэнт нацыянальнага разьвіцьця. Сёньня ў Эўропе, бадай, ужо не існуе народаў, якія, як у Беларусі, фармуюцца мэханічным аб'яднаньнем насельніцтва зьверху: на іхняе месца прыйшлі нацыі, чальцы якіх валодаюць устойлівым кансэнсусам што да нацыянальных вартасьцяў.

Нацыяналізм як стаўляньне нацыі абсалютным грамадзкім аўтарытэтам непрымальны для аўтарытарных кіраўнікоў кшталту Аляксандра Лукашэнкі, якія імкнуцца любым коштам прымусіць грамадзян ідэнтыфікаваць сябе ў сацыяльнай прасторы перш за ўсё зь дзяржавай і ейным кіраўніком, бо ён падрывае пануючы палітычны лад, прапаноўваючы нацыю ў якасьці рэальнай альтэрнатывы існым найвышэйшым грамадзкім аўтарытэтам — «дзяржаве» і «вярхоўнаму кіраўніку». З гэтага гледзішча цяперашні палітычны рэжым у Беларусі ёсьць простым прадаўжальнікам аўтарытарных і дэспатычных традыцыяў Расейскай імпэрыі зь яе паняцьцем імпэратара як «бацькі айчыны». «Бацька Лукашэнка» ёсьць паўнаўладным кіраўніком бюракратычнай дзяржавы, якая пазбаўляе сацыяльныя групы палітычнага прадстаўніцтва і вядзе палітыку моўнай і культурнай дыскрымінацыі. Да-

чыненьні паміж такім кіраўніком і падданымі будуюцца не на выбарчым праве і асабістым удзеле, а на накінутым ім зьверху абавязку служыць дзяржаве[14].

Намагаючыся захаваць сваю палітычную гегемонію на доўгатэрміновую пэрспэктыву, такая ўлада зацікаўленая ў тым, каб гуманітарная веда кадыфікавалася ў прафанных формах, узмацняла стойкасьць каляніяльных забабонаў і не магла б быць скарыстаная для ўплыву на масавую сьвядомасьць альбо ўзмацненьня нацыянальнай ідэнтычнасьці.

Нягледзячы на сваю вонкавую маналітнасьць, рэжым Аляксандра Лукашэнкі, зьмястоўна тоесны з абсалютысцкай манархіяй, мае сур'ёзныя канструктыўныя недахопы. Ягоная ідэалягічная ідэнтычнасьць застаецца надзвычай уразьлівай. Ягоная мэтанакіраваная і пасьлядоўная праца для захаваньня каляніяльнага статусу беларускай мовы і культуры лішні раз паказвае, што русіфікацыя беларусаў не набыла незваротнага характару. Дзяржава змушаная выдаткоўваць процьму энэргіі і рэсурсаў, каб падтрымліваць масавае ўяўленьне аб тым, што нацыянальная культура мае нікчэмную вартасьць, а беларуская мова кепская. У імя гэтага ёй даводзіцца аплятаць грамадзтва павучыньнем сьмеху вартых ідэалягічных абмежаваньняў.

Пазыцыя ўлады нарцысічная, ейнае слабае месца — брак самакрытычнасьці. Яна цалкам беспадстаўна праінтэрпрэтавала палітычны крах беларускага нацыяналізму ў сярэдзіне 90-х XX ст.

---

[14] У сьцьверджаньні Якава Трашчанка, які назваў калябарацыянізм «прыроджаным ганам беларускага нацыяналізму»*, ёсьць доля праўды. З моманту свайго ўзьнікненьня беларускі нацыяналізм адмаўляў права Расейскай імпэрыі самаўладна кіраваць Беларусяй. Каб рэалізаваць свае палітычныя задумы, ён шукаў падтрымкі ў вонкавых сілаў. У першыя дзесяцігодзьдзі XX ст. такім спонсарам, з пэўнымі засьцярогамі, была Нямеччына, пасьля другой сусьветнай вайны — ЗША. Без сумневу, посьпех нацыянальнага руху ўзмоцніць палітычную ляяльнасьць Беларусі да Захаду, у якога яна будзе шукаць рэсурсы для разьвіцьця і дамагацца гарантыяў бясьпекі.

*Трещенок Я.И. История Беларуси. Досоветский период. Часть 1. Могилев: МГУ имени А.А. Кулешова, 2004. С. 252.

як канчатковы і беспаваротны. Да яе не адразу прыйшло разуменьне таго, што ва ўмовах дзяржаўнай незалежнасьці рэсурсная база нацыянальнага руху значна ўзмацнілася і што незалежнасьць стварае цяплічныя ўмовы для нацыянальнай агітацыі. Прабуксоўка беларускага нацыяналізму ў першай палове ХХ ст. была зьвязаная таксама з тым, што ўлада магла сабе дазволіць фізычную ліквідацыю нацыянальных актывістаў. На свой жах, цяперашні аўтакратычны рэжым ня можа насьмеліцца на гэта. Да таго ж палітычная будучыня Беларусі пазбаўленая такога дэтэрмінізму, які стаіць перад «братняй» Расеяй, асуджанай быць альбо аўтарытарнай дзяржавай альбо ўпасьці ў анархію і разваліцца на нацыянальныя ўтварэньні.

Сваімі паводзінамі ўлада сама недвухсэнсоўна паказвае, што ўнутры краіны яна найболей баіцца ператварэньня беларусаў у нацыю. Хаця ягоныя асноўныя каналы заблякаваныя, яна ня можа цалкам прыпыніць гэты працэс.

Палітычныя кампаніі 1994—1995 гг. паказалі, што каляніялізм трансьляваўся зьверху ўніз праз жорстка цэнтралізаваную герархічную структуру. Далёка ня ўсе расейскамоўныя беларусы пазытыўна прымалі ягоныя пасланьні. Адсюль вынікае, што нават поўнае выкараненьне беларускай мовы ня будзе аўтаматычна азначаць краху беларускага нацыяналізму. З дапамогай няхітрых арытмэтычных разьлікаў можна давесьці, што ў 1994 г. пераважную частку электарату дэмакратычных палітыкаў складалі расейскамоўныя беларусы, якія галасавалі ня столькі Пазьняка альбо Шушкевіча, колькі супраць каляніяльнага статусу нацыянальнай культуры. Гэтыя людзі складаюць актыў беларускіх дэмакратычных сіл і барацьба павінна ісьці за ягонае павелічэньне.

Тую акалічнасьць, што большасьць беларусаў гаворыць па-расейску, цяжка назваць сур'ёзным аргумэнтам у дыскусіі пра пабудову беларускай нацыі — да моманту аб'яднаньня Італіі ў 1861 г. толькі два з паловай адсоткі насельніцтва краіны гаварылі на «правільнай» італьянскай.

Як і сто пяцьдзясят гадоў таму, ідэалягічная палітыка цяперашняй улады сваім прыніжэньнем беларускай мовы стварае спа-

жыўнае асяродзьдзе для ўсялякага кшталту папулісцкіх дбаньняў пра яе. Сваім настойлівым жаданьнем захаваць каляніяльны *status quo* у незалежнай дзяржаве рэжым Лукашэнкі як ні што іншае радыкалізуе нацыяналістаў. Адмова ў прызнаньні нацыянальных і культурных правоў, прызнаных за лінгвістычнымі і культурнымі групамі ў Эўропе, толькі ўзмацняе супрацiў і падвышае шанцы нацыянальнага руху.

Нарэшце, як у XIX ст. перад польскай шляхтай, якая адкінула беларускую ідэнтычнасьць, так і цяпер перад дзяржаўнай намэнклятурай, здаецца, замаячыла пэрспэктыва палітычнага самагубства.

Беларусь ужо ніколі ня будзе такой, якой яна была ў 1994 г. Беларусь пры Лукашэнку разьвівала інстытуты і сымбалі незалежнай дзяржаўнасьці, мела пасольствы, войска, міліцыю, нацыянальныя зборныя і г.д. Нацыянальная ідэнтыфікацыя перамясьцілася з прац тэарэтыкаў у сфэру практычнай дзейнасьці. Пачуцьцё прыналежнасьці да краіны ўзмацняюць нацыянальныя пашпарты, нумарныя знакі і г.д.

Многія ідэі і ўяўленьні, што ўваходзяць у расейскі імпэрскі архіў векавой даўніны (напрыклад, уяўленьне аб беднай і ўбогай Беларусі, якая можа дасягнуць эканамічнага росквіту адно ў складзе Расеі), дыскрэдытаваныя самой гісторыяй беларускай незалежнасьці. У гэтым палягае геапалітычная іронія: падтрымліваючы лукашэнкаўскі рэжым і тым самым дабрабыт беларусаў на ўзроўні, супастаўным альбо нават большым за расейскі, Масква ўскосна ўзмацняе беларускі нацыяналізм і разбурае нарожны камень каляніяльнай сьвядомасьці — што незалежнасьць Беларусі немагчымая дзеля няздольнасьці беларускай эканомікі самастойна прадукаваць нацыянальнае багацьце.

Наступныя свабодныя выбары ў Беларусі пакажуць, як у грамадзтве зьмянілася пашырэньне нацыяналістычных настрояў.

Пабудова нацыі застаецца адзіным рэалістычным мэтадам пераходу Беларусі да дэмакратычнага кіраваньня. Толькі нацыянальная супольнасьць, а ня публіка, якая цьвёрда засвоіла каляніяльныя ўстаноўкі, можа быць у Беларусі суб'ектам, зацікаўленым у

ім. Здаецца, Рубікон ужо пройдзены — усё большай колькасьці сур'ёзных назіральнікаў становіцца ясна, што раз і назаўсёды дэмантаваць цяперашні беларускі рэжым можна толькі пазбавіўшы палітыкаў накшталт Лукашэнкі іх спажыўнага асяродзьдзя — насельніцтва, апантанага комплексам сваёй культурнай непаўнавартасьці.

У беларускім выпадку актам нацыянальнага самавызначэньня будзе разьвітаньне з каляніяльнай спадчынай і палітычным аўтарытарызмам. Толькі пасьля яго Беларусь здолее стаць паўнавартым чальцом эўрапейскай палітычнай і культурнай прасторы.

Ня варта думаць, што беларускі нацыяналізм узмацніцца толькі дзеля таго, што беларусы жывуць у незалежнай дзяржаве. Іншымі словамі, толькі ад гэтага «грамадзянскі» беларускі нацыяналізм сам сабою ня ўзьнікне. Само паняцьце «грамадзянскага нацыяналізму» ўсё часьцей крытыкуецца ў заходняй сацыялёгіі на той падставе, што ўсе нацыі, у тым ліку «грамадзянскія», паводле вызначэньня і эмпірычна ёсьць пэўнага роду этнакультурнымі супольнасьцямі.

Катэгорыя грамадзянскай нацыі зьмешвае два розныя паняцьці: грамадзянства, якое датычыць членства ў пэўнай палітычнай супольнасьці, вядомай як дзяржава, і нацыянальнасьць, якая датычыць членства ў этнакультурнай супольнасьці альбо нацыі. У выніку «антынацыяналістычнае» паняцьце «грамадзянскай нацыі» пачынае працаваць на цэнтральны догмат усіх відаў нелібэральнага нацыяналізму, які атаясамлівае нацыю і дзяржаву[15].

Спэкуляцыі, якія сьцьвярджаюць, што беларуская дзяржава, ейная палітычная юрысдыкцыя і міжнародная правасуб'ектавасьць і таму падобнае выступаюць фактарамі, што ўзмацняюць нацыянальную ідэнтычнасьць, заснаваныя на элемэнтарнай падмене паняцьцяў.

[15] Мотиль О. Національно-визвольні змагання націоналізму з лібералізмом // Критика. 2003. № 11. С. 5.

Рост нацыянальнай сьвядомасьці наўпрост не залежыць ад усьведамленьня таго, што незалежнасьць Беларусі дазваляе пасьпяхова рэалізаваць эканамічныя, палітычныя, культурныя і іншыя інтарэсы краіны. У Беларусі дзяржава падаўляе нацыю, і залежнасьць разьвіцьця краіны ад яе фармальнага дзяржаўна-адміністрацыйнага статусу, якая зь вялікай сілай выявілася яшчэ ў часы СССР, у якім саюзныя рэспублікі мелі значна больш прывілеяваны статус у параўнаньні з аўтаномнымі рэспублікамі альбо краямі, больш дарэчная ў якасьці аргумэнту ў дыскусіі пра тое, якім чынам мацаваць сілу дэспатычнай дзяржавы.

У дэмакратычных грамадзтвах існуе працэдура натуралізацыі, дзеля якой імігранты вымушаныя колькі гадоў засвойваць традыцыі і культуру сваёй новай бацькаўшчыны перш як атрымаюць сваё новае грамадзянства. Іншымі словамі, грамадзянства і чалецтва ў нацыі прадугледжвае палітычны ўдзел і пэўны каштоўнасны кансэнсус. У цяперашніх умовах да беларускай нацыі належыць той, хто не падзяляе барбарскіх, дэгуманізаваных, садысцкіх уяўленьняў аб беларускай мове і культуры.

Многія выстаўленыя Багушэвічам задачы дагэтуль ня выкананыя. Усё яшчэ застаецца актуальнай і высунутая ім палітычная стратэгія — павелічэньне палітычнай актыўнасьці мас шляхам надзяленьня іх нацыянальнай сьвядомасьцю. Адсутнічае нацыянальны ўнівэрсытэт. Нацыя не валодае ўяўленьнем пра сваю жывую і цікавую гісторыю. Стан гуманітарных навук, літаратуры і сыстэмы адукацыі карэлюе з маштабам пашырэньня каляніяльных забабонаў. Навука і літаратура не імкнуцца ўплываць на масавую сьвядомасьць, узмацняць нацыянальную ідэнтычнасьць і фармаваць чаканьне сацыяльных перамен. Культурная эліта не зацікаўленая ў сваім пастаянным абнаўленьні і — што істотна — наяўнасьці адваротнай сувязі з грамадзтвам. Яна ня можа пахваліцца ўменьнем выпрацоўваць і навязваць культурныя ўзоры і нормы паводзінаў усяму грамадзтву і наагул не вытрымлівае канкурэнцыі на ўнутраным рынку.

Стратэгіяй нацыяналістаў у аўтарытарнай дзяржаве застаецца выпрацоўка альтэрнатыўных культурных, навуковых і г.д. кано-

наў, якія пры ўмове сваёй прыцягальнасьці і эфэктыўнасьці ва ўмовах палітычнага крызісу маглі б выпхнуць пануючыя каляніяльныя ўзоры.

Пачуцьцё беларускага нацыяналізму сёньня нараджаецца з прычыны ўсьведамленьня моўнай дыскрымінацыі і культурнага апартэіду, якія квітнеюць у краіне. Можна думаць, што пры дэмакратычным урадзе ў Беларусі ў культурных расістаў і моўных прыгнятальнікаў будзе небагата шанцаў захаваць за беларускай мовай ейны цяперашні сацыяльны і функцыянальны статус. Ад беларускага нацыяналізму ідзе вялізарная энэргія вызваленьня — і ў гэтым зарука ягонай будучыні.

## Валер Булгакаў

# Гісторыя беларускага нацыяналізму

Сяргей Дубавец і рэдактар «ARCHE» Валерка Булгакаў (напрыклад, у артыкуле «Пагібель "беларускіх пісьменьнікаў"» (№1/2002)), наадварот, імкнуцца сьціснуць прастору Беларускага Тэксту, спрабуюць скласьці новы канон нацыянальнае літаратуры — і дзеля гэтага выкрэсьліваюць з гісторыі пісьменьнікаў ледзь ня цэлымі пакаленьнямі, як за сваім часам рабілі бальшавікі.

**Юрась Барысевіч**
Зь лекцыяў для Беларускага калегіюму
Лекцыя 2. Пра нігілізм у сучаснай літаратуры й інтэрнэце
Плян:
1. «Паміж», «Навінкі», Бум-Бам-Літ.
2. Акцыі з кнігамі.
3. Schmerzwerk: постнігілізм.

У інтэлектуальнай глухаце, прамаўляючы на хвалях самага свабоднага радыё, можна абвясціць [як Валер Булгакаў] ледзьве не ўсяму свету, што беларусы не стварылі ў літаратуры нічога вартага прэміі Нобеля; і гэтым безадказным пасажам (ці не свядома!) далучыцца да слоў таго самага палітыка, які сцвярджае, што па-беларуску наогул немагчыма выказаць анічога разумнага. Паспрабуйма ўявіць сабе, напрыклад, шараговага эстонца, славака, літоўца ці фіна (ды іхніх палітыкаў), якія гэтак грэбліва выказваліся б пра нацыянальную літаратуру.

**Леанід Дранько-Майсюк, Рыгор Сітніца**
Пісьменнік і перамога.
«Народная Воля». 2005. 20 лістапада
Рубрыка «Адкрытым тэкстам»

Валер Булгакаў

Гісторыя беларускага нацыяналізму

